Установа адукацыі
“Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”

А. М. Вабішчэвіч

# ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

Вучэбна-метадычны комплекс
для студэнтаў гістарычнага факультэта

Брэст
БрДУ імя А.С. Пушкіна
2016

УДК 008(476)(091)(075.8)
ББК 63.3(4Беи)-7я73
В 12

Рэкамендавана рэдакцыйна-выдавецкім саветам Установы адукацыі
"Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна"

Рэцэнзенты:

кафедра гісторыі Беларусі і славянскіх народаў
Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка"

доктар культуралогіі, прафесар, загадчык кафедры культуралогіі
УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
**А. І. Смолік**

доктар гістарычных навук, прафесар
**А. А. Гарбацкі**

**Вабішчэвіч, А. М.**

В 12 Гісторыя культуры Беларусі : вучэб.-метад. комплекс / А. М. Вабішчэвіч ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2016. – 194 с.

ISBN 978-985-555-517-0

Вучэбна-метадычны комплекс змешчае тэарэтычны і метадычны матэрыял (лекцыйны курс, тэматыка семінарскіх заняткаў і інш.), неабходны для арганізацыі аўдыторнай і самастойнай працы студэнтаў па вывучэнні гісторыі культуры Беларусі. У спіс рэкамендаванай літаратуры ўключаны пералік карысных сайтаў.

Адрасуецца студэнтам гістарычнага факультэта, а таксама ўсім тым, хто цікавіцца гісторыяй культуры Беларусі.

**УДК 008(476)(091)(075.8)**
**ББК 63.3(4Беи)-7я73**

**ISBN 978-985-555-517-0**

© УА "Брэсцкі дзяржаўны
ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна", 2016

# ЗМЕСТ

**Уводзіны** …………………………………………………………………4
**Змест вучэбнага матэрыялу** ……………………………………………..6
**Лекцыйны курс**………………………………………………………………17
Тэма 1. Культура, побыт, вераванні насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў эпоху першабытнасці ……………………………………………………...…17
Тэма 2. Культура беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст. ………24
Тэма 3. Культура беларускіх зямель у другой палове XIII – XV ст. ……...37
Тэма 4. Культура эпохі Адраджэння і Рэфармацыі на Беларусі (XVI ст.).. 47
Тэма 5. Культура Контррэфармацыі і барока.Асветніцтва на Беларусі ..…58
Тэма 6. Культура беларускіх зямель у канцы XVIII – XIX ст. ……………74
Тэма 7. Культура Беларусі ў пачатку XX ст. ………..……………………..88
Тэма 8. Культурнае жыццё ў БССР у 20–30-я гг. XX ст. …………………101
Тэма 9. Культура Заходняй Беларусі ў 1920–30-я гг. …………………….115
Тэма 10. Культурнае жыццё ў БССР у 1940–1980-я гг. ………………….127
Тэма 11. Сучаснае культурнае жыццё Беларусі ………………………..…144
Тэма 12. Культура беларускага замежжа …………………………….……158
**Тэматыка семінарскіх заняткаў**…………………………………….……171
**Кантрольныя пытанні да экзамену (заліку)** …………………………...186
**Літаратура** …………………………………………………………………..188

# Уводзіны

У сучасным глабалізаваным свеце актуальным становіцца праблема вывучэння і захавання нацыянальных культур. Менавіта гэтым тлумачыцца важнасць вывучэння гісторыі культуры Беларусі ў ходзе прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў гістарычнага профілю.

Аб’ектам вывучэння гэтай дысцыпліны з’яўляецца культурнае жыццё беларускага народа на працягу яго існавання – ад старажытнасці да сучаснасці.

Прадметам выступаюць культурныя працэсы, культуратворчая дзейнасць людзей на тэрыторыі Беларусі ў розныя храналагічныя перыяды.

Мэта курса: атрыманне студэнтамі цэласнага комплексу ведаў аб гісторыі айчыннай культуры ў кантэксце рэгіянальнага (усходнееўрапейскага), кантынентальнага (еўрапейскага) і сусветнага культурнага жыцця. Такі падыход дазваляе выявіць пастаянныя рысы, традыцыі пераемнасці і запазычванні, іх перапрацоўку і ўласныя культурныя навацыі.

Для рэалізацыі пастаўленай мэты будуць выконвацца наступныя задачы:

– фарміраванне ў студэнтаў цэласнай і абгрунтаванай навуковай карціны гісторыі культуры беларускага этнасу (у цеснай сувязі з яго эканамічнай і палітычнай гісторыяй, з культурнымі працэсамі, што адбываліся ў суседніх краінах, на агульнаеўрапейскім узроўні, пры паказе культуратворчага працэсу праз канкрэтную дзейнасць славутых дзеячаў, прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі);

– выпрацоўка навыкаў і ўменняў самастойнай працы пры вывучэнні вучэбнай і навуковай літаратуры гісторыка-культуралагічнай тэматыкі, абмеркаванні разнастайных пытанняў гісторыі айчыннай культуры;

– выхаванне ў студэнтаў адказных і паважлівых адносін да гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

Пасля вывучэння дадзенай вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ведаць:

– праблематыку сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства, асаблівасці развіцця яго матэрыяльнай і духоўнай культуры ў розныя гістарычныя перыяды;

– асноўныя тэндэнцыі, падзеі і факты, асобаў з гісторыі культуры Беларусі;

– катэгорыі, тэрміны і паняцці па тэорыі і гісторыі культуры.

Таксама студэнт павінен умець:

– характарызаваць асноўныя перыяды культурна-гістарычнага развіцця Беларусі і вызначаць адметныя асаблівасці кожнага з іх;

– аналізаваць дзейнасць персаналій, якія ўнеслі значны ўклад у айчынную культурную спадчыну;

– ідэнтыфікаваць па візуальнаму (ілюстрацыйнаму) матэрыялу асобы, помнікі культуры Беларусі;

– карыстацца навейшымі навуковымі дасягненнямі па пытаннях культурна-гістарычнага развіцця беларускага народа;

– прымяняць атрыманыя веды па гісторыі культуры Беларусі пры напісанні курсавых, дыпломных праектаў, дакладаў і рэфератаў, у час вытворчай (педагагічнай) практыкі, пры далейшай самастойнай навукова-даследчыцкай і краязнаўчай працы.

У выніку засваення вучэбнага матэрыялу ў студэнтаў павінна выхоўвацца пачуццё павагі да айчыннай культурнай спадчыны, беражлівыя і адказныя адносіны да помнікаў гісторыі і культуры, паважлівае стаўленне да людзей творчых прафесій, народных майстроў.

Кантроль якасці атрыманых ведаў, навыкаў і ўменняў ажыццяўляецца наступнымі сродкамі дыягностыкі: вуснае апытванне ў час семінарскіх заняткаў, ацэнка дакладаў (прэзентацый) па пытаннях тэм семінарскіх заняткаў, ацэнка падрыхтаваных вучэбных даследчыцкіх заданняў (праектаў), вусны (пісьмовы) адказ у час заліку, экзамену.

Вучэбна-метадычны комплекс (ВМК) прызначаны для студэнтаў спецыяльнасцей гістарычнага профілю. Выданне накіравана на рэалізацыю патрабаванняў Адукацыйнага стандарта і вучэбнай праграмы. Падрыхтаваны ВМК нацэлены на спрыянне арганізацыі і ўпарадкаванню як аудыторнай, так і самастойнай працы студэнтаў па авалодванні ведамі і набыцці навыкаў у адпаведнасці з вучэбнай праграмай.

Структуру ВМК вызначаюць тэарэтычны, практычны, кантрольны і дапаможны кампаненты. Тэарэтычны прадстаўлены зместам вучэбнага матэрыялу (вытрымка з вучэбнай праграмы) і лекцыйным курсам (у канцы кожнай тэмы змешчаны слоўнік паняццяў, дзеячаў культуры і мастацтва), практычны – тэматыкай семінарскіх заняткаў (да кожнай з тэм рэкамендаваны спіс неабходнай літаратуры). Для кантролю ведаў плануюцца кантрольныя пытанні да экзамену (заліку) па гісторыі культуры Беларусі. Дапаможны кампанент рэпрэзентуюць інфармацыйна-метадычныя звесткі – агульны спіс літаратуры (вучэбных дапаможнікаў, манаграфічных, энцыклапедычных і даведачных выданняў) і пералік карысных сайтаў, якія могуць спатрэбіцца для самападрыхтоўкі пры вывучэнні дысцыпліны.

## Змест вучэбнага матэрыялу

***Уводзіны***

Азначэнне паняцця “культура”. Матэрыяльная і духоўная культура. Агульначалавечы сэнс культурнай спадчыны. Мастацтва ў сістэме культуры. Віды і жанры мастацтва. Інтэлігенцыя і яе месца ў культурным жыцці грамадства. Нацыянальная культура як частка сусветнай, адметнасць і самабытнасць народа.

***Тэма 1. Культура, побыт, вераванні насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў эпоху першабытнасці***

Асноўныя археалагічныя культуры бронзавага і жалезнага вякоў. Узнікненне прадметаў побыту, зброі, твораў мастацтва ў людзей першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі. Першыя творы першабытнага мастацтва. Асавецкія знаходкі. Упрыгожванні. Пачатак вытворчасці шкла.

Татэмізм, фетышызм, анімізм як дахрысціянскія вераванні і ўяўленні. Культ сонца, зямлі, вады, дрэў, звяроў, агню. Капішчы. Ідалы. Пантэон язычніцкіх багоў. Персанажы народнай дэманалогіі (ваўкалак, лясун, русалка і інш.).

Вытокі беларускага народнага календара. Каляды. Гуканне вясны. Вялікдзень. Культ продкаў (Радаўніца, Дзяды). Купалле. Абрады і звычаі. Сямейныя святы. Фальклор як адлюстраванне паганскіх уяўленняў. Архетыпы менталітэту.

***Тэма 2. Культура беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст.***

Увядзенне хрысціянства на Беларусі. Узнікненне Полацкай і Тураўскай епархій. Будаўніцтва цэркваў і манастыроў. Хрысціянства і язычніцтва. Уплыў прыняцця хрысціянства на культурнае жыццё.

***Дойлідства.*** Візантыйскія традыцыі архітэктуры. Полацкая і гродзенская архітэктурныя школы. Храмы Полацка (Сафійскі сабор, Спаса-Прэабражэнская царква і інш.), Віцебска, Навагрудка, Гродна (Барысаглебская царква і інш.). Полацкі дойлід Іаан. Інтэр’еры храмаў, фрэскі.

***Пісьменнасць і помнікі пісьменства.*** Пісьменнасць. Помнікі эпіграфікі (берасцяныя граматы, графіці, Барысавы камяні). Пачатак летапісання. Полацкі летапіс. Рукапісныя кнігі. Тураўскае евангелле. Мастацкае афармленне кнігі. Школы пры манастырах.

Е. Полацкая, яе роля ў айчыннай культурнай спадчыне. Аратарскае майстэрства К. Тураўскага, яго малітоўная паэзія. К. Смаляціч. Агіяграфічная (жыційная) літаратура. Беларуская тэматыка ў “Слове аб палку Ігаравым”.

***Выяўленчае мастацтва.*** Узнікненне і развіццё цэнтраў манументальнага жывапісу ў Полацку, Гродне, Віцебску. Фрэскі Спаса-Прэабражэнскай царквы ў Полацку. Дробная пластыка.

***Музыка.*** Народная музыка. Праваслаўная царкоўная музыка.

***Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.*** Прадметы са скуры, косці, шкла. Кавальскае і ганчарнае мастацтва. Ювелірныя вырабы. Крыж Лазара Богшы і яго лёс.

Роля візантыйскай і старажытнарускай культуры ў дойлідстве, жывапісе, музыцы. Адметнасці побыту (жыллё, адзенне, стравы, ванне).

***Тэма 3. Культура беларускіх зямель у другой палове XIII–XV ст.***

Утварэнне ВКЛ, яго полікультурны характар. Фарміраванне беларускай народнасці. Станаўленне старажытнабеларускай мовы, яе дзяржаўны статус.

***Рукапісная кніга і летапісанне.*** З'яўленне перакладной царкоўнай і свецкай літаратуры. Творчасць Г. Цамблака. Летапісанне ў Полацку і Лаўрышаве.

***Дойлідства.*** Рост гарадоў як цэнтраў культуры. Адметнасці тагачасных архітэктурных пабудоў. Асноўныя стылі (раманскі, готыка). Мураванае дойлідства, яго абарончы характар. Камянецкая вежа. Замкі ў Лідзе, Крэве, Навагрудку, Гродне.

***Выяўленчае мастацтва.*** Манументальны жывапіс. Праца беларускіх майстроў у польскіх гарадах. Станаўленне беларускай школы іканапісу. Нараджэнне свецкага жывапісу (партрэт), яго параднасць. Мастацкае аздабленне рукапісных евангелляў з Лаўрышава, Жыровічаў, Гродна. Разьба па дрэве, каменю. Скульптура.

***Тэма 4. Культура эпохі Адраджэння і Рэфармацыі на Беларусі (XVI ст.).***

Перадумовы пашырэння ідэй Адраджэння на Беларусі. Агульнае і адметнае ў айчынным і заходнееўрапейскім Рэнесансе. Пашырэнне Рэфармацыі на Беларусі.

***Кнігадрукаванне.*** Ф. Скарына як пачынальнік усходнеславянскага і беларускага кнігадрукавання. Пражскія і віленскія выданні Ф. Скарыны. Працяг друкарскай справы ў другой палове XVI ст. у Вільні, Брэсце, Нясвіжы, Заблудаве, Лоску. Роля І. Фёдарава, П. Мсціслаўца ў нараджэнні кнігавыдавецкай традыцыі на рускіх і ўкраінскіх землях.

***Дойлідства.*** Будаўніцтва палацава-замкавых комплексаў (Мір, Геранёны). Цэрквы-крэпасці (Сынкавічы, Мураванка, Супрасль). Ляхавіцкі замак. Адміранне абарончых рыс і пашырэнне свецкасці ў дойлідстве. Кальвінскія зборы з рысамі готыкі і рэнесансу.

***Выяўленчае мастацтва.*** Манументальны жывапіс. Фрэскі царквы Дабравешчання ў Супраслі. Фарміраванне беларускай школы іканапісу.

Сармацкі партрэт. Мініяцюра і кніжная графіка. Гравюры Ф. Скарыны. Разьба па дрэве. Майстар Ананія з Пінска.

***Грамадска-палітычная, прававая культура.*** Летапісанне, рукапісная кніга. Статут ВКЛ, яго 3 рэдакцыі. Л. Сапега. Культурна-асветніцкая дзейнасць Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, С. Буднага, В. Цяпінскага, гуманістычныя ідэі ў іх духоўнай спадчыне. “Аль-Кітаб”.

Нараджэнне мецэнацкай традыцыі. М. Радзівіл-Чорны.

***Адукацыя.*** Канфесійны характар асветы. Пратэстанцкія школы. Вучоба моладзі ў еўрапейскіх універсітэтах.

Асноўныя рысы менталітэту эпохі Адраджэння і Рэфармацыі. Уклад нацыянальнай культуры ў стварэнне агульнаеўрапейскіх каштоўнасцей эпохі Рэнесансу.

***Тэма 5. Культура Контррэфармацыі і барока. Асветніцтва на Беларусі***

Контррэфармацыя. Брэсцкая царкоўная ўнія 1596 г., яе ўплыў на стан беларускай культуры. Негатыўнае ўздзеянне вынікаў разбуральных войн на культурнае жыццё. Праблема самазахавання беларускай культуры ва ўмовах узмацнення паланізацыі.

Асветніцтва ў Еўропе, яго асноўныя рысы. Распаўсюджванне асветніцкіх ідэй, іх плыні на Беларусі. Г. Каніскі.

***Дойлідства.*** З’яўленне і сцвярджэнне новага мастацкага стылю – барока. Помнікі ранняга, сталага, позняга (віленскага) барока, іх характэрныя рысы. Распаўсюджванне палацава-сядзібнага будаўніцтва (комплексы ў Гальшанах, Смалянах, Нясвіжы, Слоніме, Воўчыне, Гродне). Спалучэнне рысаў позняга барока і ракако. Культавыя пабудовы. Драўлянае дойлідства на Палессі, яго адметнасці. Складванне асноўных рысаў нацыянальнага дойлідства. Спалучэнне рысаў барока і класіцызму ў помніках пераходнага стылю (Ружанскі палац і інш.). Уплыў Асветніцтва і класіцызму на архітэктуру.

***Выяўленчае мастацтва.*** Фрэскавы роспіс (Богаяўленская царква Куцеінскага манастыра ў Магілёве, Святадухаўская царква Тупічэўскага манастыра ў Мсціславе і інш.). Афармленне і выдзяленне мясцовых школ жывапісу. Віленская і куцеінская школы гравюры. Кніжная графіка (С. Собаль, Л. Тарасевіч і інш.). Узмацненне рэалістычных тэндэнцый у станковым жывапісе. Рост уплыву заходнееўрапейскага мастацтва. Адлюстраванне барочнай эстэтыкі ў іканапісе. Росквіт барочнага жывапісу ў першай трэці XVIII ст. Стварэнне родавых партрэтных галерэй у палацах. Барочная драўляная скульптура.

Дзейнасць беларускіх майстроў у Маскве. “Беларуская рэзь”.

Панаванне барока ў манументальным жывапісе (роспісы касцёла Божага Цела ў Нясвіжы, касцёла Св. Станіслава ў Магілёве, езуіцкага

касцёла ў Гродне і інш.). Пашырэнне рэалістычных тэндэнцый у іканапісе. Уплыў ракако і класіцызму на скульптуру.

***Музыка і тэатр.*** Народныя гульні. Скамарохі. Батлейка. Станаўленне самабытнага жанру кантавай песеннай культуры. Музыка ў касцёле. Арган і хор. Узнікненне нотадрукавання. Музыка барока – “Полацкі сшытак”. Школьны тэатр. Прыдворныя капэлы, тэатры, аркестры, балетныя трупы, музычныя школы ў Нясвіжы, Слоніме, Слуцку, Гродна, Шклове і іншых гарадах, іх еўрапейская слава. Мецэнацтва магнатаў. М.К. Агінскі, яго “сядзіба музаў” у Слоніме.

***Асвета.*** Праваслаўныя брацтвы на Беларусі, іх культурна-асветніцкая дзейнасць. Каталіцкія ордэны, іх асветніцкая і дойлідская праца. Полацкі езуіцкі калегіум.

Узнікненне гісторыка-мемуарнага, палемічнага, сатырычнага літаратурных жанраў (“Дзённік” Ф. Еўлашэўскага, Баркалабаўская хроніка, М. Сматрыцкі, Л. і. С. Зізаніі, А. Філіповіч).

Прадстаўнікі грамадска-палітычнай думкі (К. Лышчынскі і інш.). Культурна-асветніцкая дзейнасць С. Полацкага, значэнне яго спадчыны для ўсходніх славян. Праца грамадска-культурных дзеячаў, навукоўцаў па-за межамі беларускіх земель (І. Капіевіч, К. Семяновіч і інш.).

Школьная рэформа. З’яўленне свецкага навучання. Адукацыйная камісія (1773–1794 гг.), яе ўклад у развіццё асветы. Поспехі навукоўцаў у прыродазнаўстве, астраноміі, матэматыцы, гісторыі (М. Пачобут-Адляніцкі, К. Нарбут і інш.). Дзейнасць Галоўнай школы ВКЛ. Гродзенская медыцынская акадэмія. Ж. Жылібер.

Літоўская метрыка – дзяржаўны архіў ВКЛ.

Я. Храптовіч як збіральнік гісторыка-культурнай спадчыны.

***Побыт.*** Побыт сялян, мяшчан, шляхты. Заняткі, звычаі. Жыллё. Адзенне. Шляхецкая мода. Стравы. Адпачынак. Адметныя рысы менталітэту.

***Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.*** Выраб дэкаратыўнай кафлі. Мастацкае шкло. Налібоцкая і Урэцкая шкляныя мануфактуры. Ткацтва. Слуцкія паясы. Карэліцкія шпалеры.

***Тэма 6. Культура беларускіх земель у канцы XVIII – XIX ст.***

Уключэнне беларускіх земель у склад Расійскай імперыі, уплыў палітычных падзей на стан культуры. Працяг паланізатарскай практыкі ў пачатку XIX ст. Нелегальныя таварыствы (філаматаў, філарэтаў), легальныя культурна-асветніцкія гурткі ў Вільні, Мінску, Віцебску. Ліквідацыя ўніяцкай царквы. Уздзеянне польскай і рускай культур на беларускую. Адток дзеячаў культуры з Беларусі. Шматнацыянальны характар культуры на Беларусі. Уплыў падаўлення паўстання 1863–1864 гг. на грамадска-культурнае жыццё. К. Каліноўскі. Рост

нацыянальнай самасвядомасці, станаўленне беларускай мовы, літаратуры як сведчанні фарміравання нацыі.

***Асвета і навука.*** Полацкая езуіцкая акадэмія. Віленскі ўніверсітэт як цэнтр культурнага жыцця краю. Фарміраванне “краёвай” інтэлігенцыі. Пачаткі навуковага беларусазнаўства (Я. і К. Тышкевіч, А. Кіркор і інш.). Русіфікацыя сістэмы адукацыі пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. Горы-Горацкі земляробчы інстытут.

Пашырэнне сеткі школ у другой палове XIX ст. Прапаганда ідэалогіі “заходнерусізму”. Віленская археаграфічная камісія (1864–1915 гг.). Віленскі музей старажытнасцей. Шырокае развіццё беларусазнаўства. Працы П. Шпілеўскага, П. Шэйна, І. Насовіча, М. Федароўскага, М. Нікіфароўскага, Е. Раманава і інш.

***Літаратура, друк, бібліятэкі.*** Станаўленне новай беларускай літаратуры. Паэмы “Энеіда навыварат”, “Тарас на Парнасе”. Беларуская плынь у польскамоўнай “краёвай” літаратуры. А. Міцкевіч і рамантычны культ нацыянальнай гісторыі, народнага побыту. Я. Чачот. В. Дунін-Марцінкевіч, У. Сыракомля, П. Багрым і інш.

Дзяржаўныя і прыватныя друкарні. Губернскія перыядычныя выданні, іх накіраванасць, мова. Публічныя бібліятэкі. Прыватныя бібліятэчныя зборы (Радзівілаў, Храптовічаў і інш.).

Газета “Мужыцкая праўда”. Часопіс “Гоман”. Аднаўленне беларускага кнігадрукавання. Працяг развіцця нацыянальнай ідэі ў творах Ф. Багушэвіча, А. Гурыновіча, Я. Лучыны. Развіццё яўрэйскай літаратуры ў Беларусі.

***Тэатр і музыка.*** Прыватныя тэатральныя трупы. З’яўленне прафесійнай беларускай драматургіі. Тэатр В. Дуніна-Марцінкевіча. Гастролі польскіх і рускіх тэатраў. Творы М.К. Агінскага. Рамантычная плынь у музычным мастацтве. Нараджэнне беларускай оперы (“Сялянка”). Беларускі перыяд жыцця і творчасці С. Манюшкі. Народная музыка. Збіранне беларускага песеннага фальклору, яго папулярызацыя. А. Абрамовіч, яго творы (“Беларускае вяселле” і інш.). Асноўныя публікацыі песеннага фальклору. Батлейка. Мінскае таварыства аматараў выяўленчага мастацтва і музыкі.

***Дойлідства.*** Перапланіроўка гарадоў на прынцыпах класіцызму. Разбурэнне гістарычнай архітэктурнай спадчыны ў Брэсце, Бабруйску, узвядзенне крэпасцей. Панаванне класіцызму ў палацава-сядзібным дойлідстве, горадабудаўніцтве (палацавы комплекс у Гомелі і інш.).

Змяненне знешняга аблічча гарадоў. Адыход ад класіцызму ў бок эклектыкі і гістарызму. Тыпы мураваных храмаў. Будаўніцтва палацаў-сядзіб. Драўлянае дойлідства.

***Выяўленчае мастацтва.*** Пашырэнне класіцызму і рамантызму ў жывапісе (Ф. Смуглевіч, І. Аляшкевіч, В. Ваньковіч, І. Хруцкі, Я. Дамель, Я. Сухадольскі і інш.). Вядучыя жанры: бытавы, гістарычны, партрэт, краявід. Архітэктурна-гістарычныя малюнкі Н. Орды. Росквіт народнага лубка. Медальёны, барэльефы Р. Слізеня. Драўляная культавая скульптура. Саломапляценне. Царскія брамы (з в. Лемяшэвічы на Піншчыне і інш.).

Жанравая разнастайнасць жывапісу. Рамантычныя тэндэнцыі і ўплывы польскага жывапісу. Уздзеянне рускіх "перасоўнікаў", фарміраванне рэалізму. Творы беларускіх мастакоў у зборах П. Траццякова. Віленская рысавальная школа (1866–1914 гг.). Гістарычны жанр (К. Альхімовіч, І. Трутнёў). Развіццё бытавога жанру, краявіду і партрэта ў творах Н. Сілівановіча, А. Ромера і інш. А. Гараўскі – майстар беларускага пейзажу.

***Матэрыяльная культура і побыт.*** Беларускае народнае жыллё. Хата, яе знешняе і ўнутранае аздабленне. Мэбля, хатняе начынне. Сялянская сядзіба. Беларускі нацыянальны касцюм, яго асноўныя элементы (у мужчын і жанчын), лакальныя разнавіднасці (народныя строі). Стравaванне. Беларускі народны каляндар. Абрады і звычаі. Народная мараль, этыкет. Адзенне, ежа, забавы вышэйшых саслоўяў. "Літоўская гаспадыня".

***Тэма 7. Культура Беларусі ў пачатку XX ст.***

Узмацненне шавінізму ў палітыцы царызму. Змаганне за адраджэнне беларускай культуры, мовы.

***Друк. Кнігадрукаванне.*** Газета "Наша Ніва", яе роля ў развіцці беларускай літаратуры, друку, складванні і згуртаванні нацыянальнай інтэлігенцыі. Беларускія выдавецтвы ў Вільні, Пецярбургу. Б. Эпімах-Шыпіла. Браты І. і А. Луцкевічы, іх культурна-асветніцкая дзейнасць. Рускія выданні ў Беларусі.

***Асвета і навука.*** Пашырэнне сеткі пачатковых, сярэдніх школ. Рух за дэмакратызацыю школы і стварэнне нацыянальнай адукацыі. Станаўленне беларускіх школ у 1915–1918 гг. Культурна-нацыянальнае развіццё ў час існавання БНР.

Навуковыя даследаванні гісторыі Беларусі, мовы і этнаграфіі беларусаў. Я. Карскі як заснавальнік беларускага мовазнаўства. В. Ластоўскі і яго "Кароткая гісторыя Беларусі".

***Літаратура.*** Адметнасці беларускай літаратуры нашаніўскага перыяду. Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, Цётка, Ц. Гартны, З. Бядуля і інш.

***Музыка і тэатр.*** Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. Беларускія вечарыны. І. Буйніцкі і яго тэатральная трупа. Папулярызацыя

беларускай народнай музыкі і песні. А. Грыневіч. Хор У. Тэраўскага. Ф. Аляхновіч, яго тэатральныя пастаноўкі.

***Дойлідства.*** Знешняе аблічча гарадоў. Панаванне эклектызму, аднаўленне стыляў мінулага (класіцызму, готыкі, раманскага, рускага). Распаўсюджванне стылю мадэрн. Драўлянае дойлідства.

***Выяўленчае мастацтва.*** Абнаўленне рэалістычных прынцыпаў. Выставы ў Беларусі. Перавага краявіду ў жывапісе (В. Бялыніцкі-Біруля, Ф. Рушчыц, С. Жукоўскі). Бытавы жывапіс яўрэйскіх мастакоў (Я. Кругер, Ю. Пэн, Л. Альпяровіч). Графіка (А. Каменскі, К. Каганец і інш.). Беларускі перыяд творчасці М. Шагала.

Водгукі на беларускае адраджэнне ў славянскім і неславянскім свеце. Уплыў Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў на стан культуры.

***Тэма 8. Культурнае жыццё ў БССР у 20–30-я гг. ХХ ст.***

***Палітыка беларусізацыі. Асвета і навука.*** Афармленне палітыкі беларусізацыі, яе сутнасць, мэты і задачы. Арганізацыя культурна-асветніцкай работы. Меры па ліквідацыі непісьменнасці. Станаўленне і развіццё сістэмы народнай асветы. Дзейнасць Наркамасветы па ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі. Навучальныя ўстановы для розных нацыянальных груп насельніцтва.

Дзейнасць Інстытута беларускай культуры. У. Ігнатоўскі, Я. Лёсік, У. Пічэта і інш. Навуковая распрацоўка тэрміналогіі беларускай мовы. Вяртанне з эміграцыі грамадскіх, культурных дзеячаў (В. Ластоўскага, А. Цвікевіча, А. Смоліча і інш.). Развіццё краязнаўства, часопіс “Наш край”. Музеі. Пачаткі беларускага мастацтвазнаўства. М. Шчакаціхін. Даследаванні ў біялогіі, геалогіі, медыцыне і іншых галінах ведаў. Адкрыццё Беларускай акадэміі навук. Фарміраванне нацыянальнай інтэлігенцыі.

Дасягненні і цяжкасці беларусізацыі. Узмацненне каманднаадміністрацыйных падыходаў у кіраўніцтве нацыянальна-культурным будаўніцтвам.

***Літаратура.*** Літаратурныя аб’яднанні. Лепшыя творы беларускай літаратуры (Я. Купалы, Я. Коласа, М. Чарота, М. Гарэцкага, К. Чорнага, Ц. Гартнага, А. Мрыя і інш.).

***Выяўленчае мастацтва.*** Разнастайнасць і супярэчлівасць творчых пошукаў мастакоў. Супрэматызм. К. Малевіч. Аб’яднанне “УНОВИС” (“Сцвярджальнікі новага мастацтва”). Віцебскі мастацкі тэхнікум. Выцясненне мадэрнізму строгім рэалізмам. Увядзенне дзяржзаказаў.

***Музыка. Тэатр. Кіно.*** Творы кампазітараў М. Чуркіна, М. Аладава. Адкрыццё тэатраў БДТ-І у Мінску, БДТ-2 у Віцебску. У. Галубок і яго вандроўны тэатр. Тэатральнае і музычнае мастацтва нацыянальных супольнасцей Беларусі. Станаўленне беларускага кіно. Ю. Тарыч.

Ваяўнічы атэізм. Закрыццё і разбурэнне храмаў.

Разгром “нацыянал-дэмакратызму”. Згортванне беларусізацыі. Рэпрэсіі супраць нацыянальнай інтэлігенцыі. Курс на фарміраванне новай інтэлігенцыі. Барацьба з рэлігіяй.

***Асвета і навука.*** Пашырэнне сеткі ўстаноў адукацыі і навукі, крокі ў справе ліквідацыі непісьменнасці. Панаванне дагматызму ў грамадскіх навуках. Узнікненне сістэмы ідэалагічных забарон.

***Літаратура.*** Увядзенне сацрэалізму як адзінага метаду творчасці ў літаратуры і мастацтве. Праўда часу і адступленне ад яе. Новыя матывы ў творчасці Я. Купалы. Я. Коласа, К. Чорнага, М. Лынькова і інш.

***Дойлідства.*** Усталяванне прынцыпаў канструктывізму. Змены ў абліччы гарадоў. Узвядзенне значных грамадскіх пабудоў у Мінску (Дома ўрада, Акадэміі навук, тэатра оперы і балета і інш.). Архітэктары І. Лангбард, А. Воінаў і інш.

***Выяўленчае мастацтва.*** Перавага гісторыка-рэвалюцыйнай і працоўнай тэматыкі, сюжэтнага жанру (палотны П. Гаўрыленкі, А. Шаўчэнкі, Я. Зайцава і інш.). Краявіды В. Бялыніцкага-Бірулі, У. Кудрэвіча. Інтэр’еры грамадскіх будынкаў. Працы М. Манізера, З. Азгура, А. Бембеля. Партрэты В. Волкава, М. Тарасікава.

***Тэатр. Музыка. Кіно.*** Змены рэпертуарнай палітыкі. Цяжкасці станаўлення БДТ-І і БДТ-2. Развіццё жанраў у музыцы. Творы кампазітараў А. Багатырова, Я. Цікоцкага, М. Аладава і інш. Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР, яго рэпертуар, салісты (Л. Александроўская, Р. Млодэк і інш.). Гісторыка-рэвалюцыйная тэматыка ў першых беларускіх фільмах. Дзейнасць У. Корш-Сабліна. Экранізацыя беларускай прозы.

***Тэма 9. Культура Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг.***

Уключэнне Заходняй Беларусі ў склад Польшчы і далейшы лёс беларускай культуры. Паланізацыя.

***Асвета. Гісторыка-этнаграфічныя даследаванні.*** Рух за адкрыццё і захаванне беларускіх школ. Дзейнасць Таварыства беларускай школы, Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. Беларускія гімназіі ў Вільні, Навагрудку, Радашковічах, Клецку і інш. Вучоба заходнебеларускай моладзі за мяжой. Дзейнасць Беларускага навуковага таварыства ў Вільні. Працы М. Гарэцкага, А. Луцкевіча, А. Станкевіча, Б. Тарашкевіча і інш. Віленскі беларускі музей імя І. Луцкевіча, яго роля ў культурным жыцці краю. Ажыўленне краязнаўчага руху, адкрыццё музеяў.

***Літаратура і друк.*** Асноўныя плыні, тэматыка заходнебеларускай літаратуры. Творы Н. Арсенневай, М. Танка, У. Жылкі, К. Сваяка і інш. Беларускія выдавецтвы. Часопісы і газеты (“Маланка”, “Шлях моладзі”, “Летапіс ТБШ”, “Беларускі летапіс”, “Беларуская крыніца” і інш.).

***Мастацкая культура.*** Народная творчасць. Збіранне і прапаганда беларускага фальклору. Р. Шырма. Хор Беларускага студэнцкага саюза ў Вільні, яго рэпертуар, папулярнасць.

Адметнасці твораў мастакоў П. Сергіевіча, М. Сеўрука. Мастацкая студыя пры Віленскай беларускай гімназіі. Гістарычная, касмічная тэматыка ў творчасці Я. Драздовіча. Карыкатуры Я. Горыда. Краязнаўчая фатаграфія. Я. Булгак.

Змены ў грамадска-культурным жыцці пасля ўключэння заходнебеларускіх зямель у склад БССР.

***Тэма 10. Культурнае жыццё ў БССР у 1940–1980-я гг.***

Беларуская інтэлігенцыя ў час вайны. Страты, нанесеныя беларускай культуры вайной. Рээвакуацыя і вяртанне нацыянальных рэліквій.

***Асвета і навука.*** Аднаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы адукацыі, навукі, сеткі культурна-асветніцкіх устаноў. Развіццё асветы, яе дасягненні. Абвастрэнне супярэчнасцей у галіне адукацыі. Заідэалагізаванасць культурна-асветніцкай працы. Праблема аховы помнікаў гісторыі і культуры. Захады навуковай, творчай інтэлігенцыі ў справе захавання гісторыка-культурнай спадчыны (правядзенне даследаванняў, рэстаўрацыйных прац і інш.).

Складванне навуковага патэнцыялу ў рэспубліцы. Дзейнасць Акадэміі навук Беларусі, уклад яе вучоных у развіццё дакладных, прыродазнаўчых і іншых галін ведаў.

***Літаратура.*** Падзеі вайны і пасляваеннага аднаўлення ў беларускай літаратуры. Творы Я. Коласа, М. Лынькова, А. Куляшова, К. Крапівы, А. Маўзона і інш. Усталяванне рамана ў якасці вядучага жанра прозы. Спробы пераадолення крайнасцей сацрэалізму ў літаратуры і мастацтве. Тэмы вайны і сучаснасці (В. Быкаў, Я. Брыль, А. Адамовіч, І. Мележ, І. Чыгрынаў, М. Танк і інш.). Адраджэнне тэмы гістарычнага мінулага Беларусі. У. Караткевіч.

***Тэатр. Музыка. Кіно.*** Тэатры, рэпертуарная палітыка. Творы кампазітараў Я. Цікоцкага, М. Аладава, А. Багатырова, А. Туранкова, Д. Лукаса і інш. Творчасць вядучых майстроў тэатральнай сцэны – Л. Александроўскай, Л. Ржэцкай, Г. Глебава, П. Малчанава, Б. Платонава, У. Дзядзюшкі, У. Уладамірскага і інш. Дзяржаўныя музычныя калектывы. Г. Цітовіч. Р. Шырма.

Выдатныя майстры сцэны ў акадэмічных тэатрах (С. Станюта, Г. Макарава, Ф. Шмакаў і інш.). Балетмайстар В. Елізар’еў і беларуская школа балету, яе міжнароднае прызнанне. Кампазітары У. Алоўнікаў, Ю. Семяняка, І. Лучанок, Э. Ханок, Л. Захлеўны і інш. Вакальна-інструментальныя ансамблі “Песняры”, “Верасы”, “Сябры”. Самадзейныя калектывы.

Дзейнасць кінастудыі “Беларусьфільм” Творы рэжысёраў В. Турава, М. Пташука, В. Дашука і інш.

***Выяўленчае мастацтва.*** Ваенная тэматыка ў творах мастакоў Я. Зайцава, В. Волкава, М. Савіцкага, В. Цвіркі і інш. Стан народнага мастацтва. Тэма Бацькаўшчыны, яе гісторыі і культуры (А. Анікейчык, А. Кашкурэвіч, Л. Шчамялёў, Я. Ціхановіч, Г. Вашчанка, А. Марачкін і інш.). Працы скульптараў З. Азгура, А. Бембеля, А. Глебава, С. Селіханава. Адыход ад параднасці ў бок псіхалагічных вобразаў. Стварэнне мемарыяльных комплексаў (“Хатынь”, “Брэсцкая крэпасць-герой” і інш.). Стан народных промыслаў, рамёстваў.

***Дойлідства.*** Аднаўленне і рэканструкцыя гарадоў. Стварэнне манументальных масіваў-ансамбляў (згодна генпланаў) у Мінску і іншых гарадах Беларусі. Асноўныя напрамкі горадабудаўніцтва. Сельская архітэктура.

Аўтарытэт і прызнанне творчасці дзеячаў культуры і мастацтва Беларусі ў свеце.

***Тэма 11. Сучаснае культурнае жыццё Беларусі***

Выпрацоўка асноўных напрамкаў культурнай палітыкі ва ўмовах незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Заканадаўчая база (Законы “Аб культуры”, “Аб мовах”, “Аб адукацыі”, “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны” і інш.), яе рэалізацыя.

Грамадскі рух за захаванне помнікаў гісторыі і культуры, вяртанне нацыянальных каштоўнасцей на Бацькаўшчыну. Адраджэнне рэлігіі, аднаўленне храмаў і вяртанне іх вернікам.

Перабудова работы творчых арганізацый. Камерцыялізацыя сферы культуры, мастацтва. З’яўленне неафіцыйных творчых аб’яднанняў. Легалізацыя нефармальнага, альтэрнатыўнага мастацтва. Вяртанне забароненых твораў і імёнаў дзеячаў навукі і культуры. Уключэнне беларускай культуры ў сусветную культурную прастору. Пашырэнне “масавай культуры”.

Творчасць дзеячаў беларускай літаратуры на сучасным этапе. Сучасная музычная культура на Беларусі. Сучаснае выяўленчае мастацтва: асноўныя тэмы, імёны. Сучаснае тэатральнае мастацтва Беларусі. Сучаснае беларускае кіно. Навуковыя, грамадска-палітычныя, літаратурныя, мастацкія выданні. Індывідуальная творчая свабода інтэлігенцыі, яе суадносіны з інтарэсамі беларускага народа. Дзейнасць культурна-асветніцкіх таварыстваў нацыянальных меншасцей.

Чарнобыльская трагедыя і праблемы захавання культурнай спадчыны. Пытанне аб суадносінах нацыянальнага і агульначалавечага ў беларускай культуры. Глабалізацыя і беларуская культура. Перспектывы захавання і развіцця беларускай культуры на сучасным этапе.

***Тэма 12. Культура беларускага замежжа***

Асноўныя этапы беларускай эміграцыі. Буйныя цэнтры беларускай дыяспары. Эвалюцыя ўзаемаадносін Бацькаўшчыны і дыяспары. Пашырэнне з канца 1980-х гг. сувязяў і кантактаў з беларусамі замежжа. З’езды беларусаў свету. Сучасныя праблемы нацыянальна-культурнага развіцця беларускай дыяспары.

***Навуковыя даследаванні.*** Навуковыя арганізацыі беларусаў замежжа: Беларуская бібліятэка і музей імя Ф. Скарыны ў Лондане, Беларускі інстытут навукі і мастацтва ў Нью-Ёрку, кафедра беларусістыкі ў Варшаўскім універсітэце і інш. Працы ў галіне айчыннай гісторыі, культуры В. і З. Кіпеляў, Я. Станкевіча, Я. Запрудніка, В. Тумаша і інш. Беларускі грамадска-асветніцкі цэнтр “Полацак” у Кліўлендзе (ЗША). Грамадска-культурная дзейнасць беларусаў у Расійскай Федэрацыі і іншых краінах СНД. Дзейнасць ураджэнцаў Беларусі на карысць культур іншых народаў свету. Б. Кіт.

***Друк. Літаратура.*** Часопісы “Беларуская думка”, “Полацк” і інш. Газеты “Беларус”, “Ніва” і інш. Творчасць прадстаўнікоў літаратуры беларускай дыяспары. Літаратурнае аб’яднанне “Белавежа” у Беластоку.

***Мастацкае жыццё.*** Адметнасці творчасці мастакоў П. Мірановіча, Т. Стагановіч-Кольбы, В. Целеша, Г. Русак, Л. Тарасевіча і інш. Дзеячы музычнага мастацтва (спявак М. Забэйда-Суміцкі, кампазітары М. Равенскі і інш.). Б. Андрусішын (Данчык). Танцавальны гурт “Васілёк”.

# Лекцыйны курс

## Тэма 1. Культура, побыт, вераванні насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў эпоху першабытнасці

**Першабытная культура і мастацтва.** Пры разглядзе гэтага пытання неабходна адзначыць найбольш значныя асаблівасці першабытнай культуры: сінкрэтызм (сінтэз, цеснае ўзаемапераплященне ўсіх відаў і элементаў культуры), гамагеннасць (аднароднасць), утылітарнасць (арыентаванасць на задавальненне практычнай карысці, выгоды людзей), магічны рытуалізм.

У эпоху палеаліту чалавек займаўся паляваннем, збіральніцтвам, выкарыстоўваў каменныя і касцяныя прылады працы. У сярэднім палеаліце пачалося здабыванне агню, з’явіліся больш дасканалыя спосабы апрацоўкі каменю, разнастайныя прылады працы (скрабкі, ручныя рубілы, праколкі). У палеаліце адбыўся пераход ад першабытнага статку да мацярынскага роду, сфарміраваўся чалавек сучаснага выгляду (краманьёнец), узніклі рэлігійныя вераванні.

Прымітыўнае мастацтва эпохі палеаліту прадстаўлена арнаментам (спачатку пераважна геаметрычным – у выглядзе хвалістых, ламаных ліній, зігзагаў, рысак, кропкавых паглыбленняў, пазней больш складаным) і скульптурай. Ва ўмовах матрыярхату выраблялiся невялікія па памерах фігуркі жанчын з падкрэсленым біялагічным пачаткам.

Найбольш старажытныя помнікі мастацтва на тэрыторыі Беларусі адносяцца да верхняга палеаліту – фігуркі людзей і жывёл абрадавага прызначэння. Самыя раннія ўзоры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва – арнаментаваныя абломкі біўня маманта, падвескі з ракавінак і зубоў жывёл, пацеркі з трубчастых касцей (каля 30 тыс. гадоў назад).

У эпоху мезаліту (IX–V тыс. да н. э.) адбыліся значныя падзеі: вынаходніцтва лука і стрэл з крэмневымі наканечнікамі, прыручэнне дзікіх жывёл, больш аселы лад жыцця. На бытавых прадметах, упрыгожваннях у асноўным пашыраўся просты арнамент, які часцей за ўсё складаўся з рысак, хвалістых палос, кропкавых паглыбленняў.

У эпоху неаліту (V–III тыс. да н. э.) адбывалася развіццё і ўскладненне прымітыўнага мастацтва, што было звязана з пераходам да вытворчых форм вядзення гаспадаркі (земляробства, жывёлагадоўлі), ад матрыярхату да патрыярхату, больш сталага ладу жыцця. Па-ранейшаму выкарыстоўваліся каменныя прылады працы, але больш дасканалай стала іх апрацоўка.

У эпоху неаліту з’явілася кераміка, ткацтва. Гліняны посуд (пераважна з востраканечным ці шарападобным дном) вырабляўся

ўручную. Назіралася разнастайнае выкарыстанне і размяшчэнне геаграфічнага арнаменту. Для мастацтва гэтага часу характэрны арнаментаваныя касцяныя вырабы, дробныя пластычныя выявы людзей, жывёл, птушак з каменю, дрэва, косці, упрыгожванні з бурштыну (падвескі, гузікі, пацеркі і інш.). Гліняны посуд аздаблялі наколкамі, нарэзкамі, грабеньчатым і ямкавым арнаментам.

У познім неаліце знікла аднастайнасць форм і арнаментацыі посуду, з’явіліся рэгіянальныя адрозненні ў межах археалагічных культур (грабеньчата-ямачнай керамікі, лейкападобных кубкаў, нарвенскай, нёманскай). Сярод неалітычнай керамікі былі сасуды з выявамі жывёл, птушак, фігурак людзей.

На стаянцы позняга неаліту і ранняга бронзавага веку Асавец Бешанковіцкага раёна (канец III – першая палова II тыс. да н. э.) выяўлены шматлікія творы першабытнага мастацтва: выразаная з рога статуэтка лася, некалькі выяў галавы чалавека, часткі фігурак птушак, змяі, упрыгожванні (падвескі, гузікі, пацеркі з бурштыну, касцяных трубачак, прасвідраваных зубоў жывёл), касцяныя арнаментаваныя накладкі і інш. Скульптуры з выявай галавы чалавека ўласцівы дасканаласць выканання, рэалістычнасць і адначасова абагульненасць форм.

У эпоху бронзы (канец III тыс. да н. э. – VI ст. да н. э.) матэрыяльная дзейнасць чалавека стала больш разнастайнай. На тэрыторыі Беларусі склаліся некалькі археалагічных культур. Прылады працы вырабляліся як з традыцыйных матэрыялаў (каменю, косці, рога, дрэва), так і новых (медзі, бронзы). Адбывалася фарміраванне разнастайных культаў (касмаганічнага, агню, урадлівасці, продкаў), пра што сведчаць пахаванні. Сярод шматлікага пахавальнага інвентару з магільнікаў і курганоў былі посуд, наканечнікі коп’яў і стрэл, клінападобныя сякеры, упрыгожванні і інш. Абрад трупаспальвання стаў дамінуючым. Разнастайнасцю форм, арнаментаў вылучалася кераміка. Посуд упрыгожваўся геаметрычным арнаментам (пераважна ў верхняй частцы вырабу) – адбіткамі шнура (культура шнуровай керамікі), гарызантальнымі лініямі, салярнай і лунарнай сімволікай (кругамі з крыжыкамі ўсярэдзіне, кропкамі і інш.). Атрымалі пашырэнне металічныя ўпрыгожванні (грыўні, дыядэмы, пярсцёнкі, бранзалеты, падвескі, скроневыя кольцы і інш.).

У жалезным веку (VI стст. да н. э. – VIII ст. н. э.) адбыліся карэнныя змены як у матэрыяльным, так і духоўным жыцці першабытнага грамадства. Разнастайнымі былі творы мастацтва: металічныя ўпрыгожванні, рознакаляровыя шкляныя пацеркі, гліняныя фігуркі жывёл, вырабы з каляровымі эмалямі і інш. Па ўсёй Еўропе адбывалася перамяшчэнне асобных этнічных груп, праходзілі складаныя асіміляцыйныя працэсы, фарміраваліся арэалы рассялення плямён, узнікалі

і змяняліся асобныя культуры. У жалезным веку назіралася ўздзеянне антычнага Прычарнамор'я. У V–VI стст. н. э. на поўдні Беларусі з'явіліся славянскія плямёны.

У жалезным веку атрымалі распаўсюджанне разнастайныя па форме пасяленні. Умацаваныя паселішчы – гарадзішчы – служылі не толькі для жылля і абароны, але і з'яўляліся гаспадарчымі, грамадскімі, культавымі цэнтрамі. Вакол гарадзішчаў размяшчаліся неўмацаваныя селішчы. З узмацненнем у IV–V стст. н. э. працэсу распаду патрыярхальна-родавых адносін узводзіліся пераважна селішчы.

У жалезным веку мастацтва ўсё больш абмяжоўвалася керамікай і ўпрыгожваннямі. Разнастайнасць керамікі (па асартыменту, формах, дэкору) тлумачыцца адрозненнямі ў матэрыяльнай дзейнасці насельніцтва асобных культур (мілаградскай, зарубінецкай, днепра-дзвінскай, штрыхаванай керамікі і інш.). Высокім узроўнем вылучаліся творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва – металічныя і шкляныя ўпрыгожванні (шпількі, заколкі, фібулы, скроневыя кольцы, пярсцёнкі, грыўны, бранзалеты, лунніцы і інш.). У арнаменце прысутнічалі выявы круга і ромба. Адбывалася паступовае ўскладненне арнаментацыі. Скульптурныя выявы жалезнага веку мелі пераважна культавы характар. На паселішчах паўднёвай Беларусі сустракаюцца гліняныя фігуркі жывёл (Гарошкаў Рэчыцкага раёна). Сярод манументальных скульптурных выяў былі каменныя ідалы: Шклоўскі ідал (вышыня – 1,2 м), Слонімскі ідал (вышыня – 46 см), 2 каменныя "бабы" (Жабінкаўскі раён) і інш.

У духоўным жыцці ўсё большае значэнне набывала язычніцтва. Язычніцкія вераванні (анімізм, фетышызм, татэмізм, магія) ахоплівалі ўсе бакі паўсядзённасці, побыту людзей. Язычнікі прыносілі разнастайныя ахвяры шматлікім божаствам, пакланяліся духам рэк, азёр, лясоў, асобным жывёлам, дрэвам, камяням, крыніцам і г.д. У пантэон язычніцкіх багоў славянскіх плямён уваходзілі бог грому і маланкі Пярун, бог жывёлагадоўлі Вялес, бог неба Сварог, яго сын – бог сонца Дажбог і інш.

З эпохай жалеза і з'яўленнем славянскіх плямёнаў звязаны язычніцкія свяцілішчы – капішчы (трэбішчы, кумірніцы). Сярод іх – капішча каля возера Святое ў в. Ходасавічы Рагачоўскага раёна (X – пачатак XI ст.). Уяўляла сабой пляцоўку дыяметрам да 7 м са слупом-ідалам у цэнтры, была абкружана востраколам, па-за пляцоўкай размяшчаліся 4 месяцападобныя ямы, арыентаваныя па баках свету (верагодна, там запальваліся знічы – нязгасныя ахвярныя агні).

***Вытокі беларускага народнага календара.*** З эпохі першабытнасці на аснове шматвекавой практыкі быў выпрацаваны народны (аграрны) каляндар. З'яўляючыся састаўной часткай беларускай традыцыйнай культуры, аграрныя звычаі і абрады выконвалі важныя функцыі

працоўнага і маральнага выхавання, перадачы вопыту, ведаў і духоўных традыцый ад пакалення да пакалення.

Старажытныя народныя святы былі звычайна прымеркаваны да найбольш значных момантаў астранамічнага і каляндарна-земляробчага цыклаў: дні зімовага (Каляды) і летняга (Купалле) сонцастаяння, вясенняга (Саракі) і асенняга (Багач) раўнадзенства, пачатак і заканчэнне сяўбы, уборкі ўраджаю (зажынкі, дажынкі).

У беларускім народным календары найбольш прадстаўнічымі з’яўляюцца святы веснавога (гуканне вясны, Саракі, Вялікдзень, Юр’е, Радаўніца) і восеньскага (Багач, Пакровы) цыклаў. Менш там прадстаўлены святы зімовага (Каляды, Грамніцы) і летняга (Купалле, Спас) цыклаў. Адметнасцю з’яўляецца жывучасць і доўгатрываласць язычніцкіх элементаў у календары беларусаў з эпохі першабытнасці да сучаснасці.

Хрысціянскі каляндар аказаў значны ўплыў на народны каляндар, а таксама паспытаў адваротны ўплыў. Грамніцы, Вялікдзень, Радаўніца, Сёмуха, Іван Галавасек – гэта не кананічныя хрысціянскія назвы святаў. Прынядце і распаўсюджванне хрысціянства на беларускіх землях прывяло да таго, што некаторыя царкоўныя святы паступова былі прымеркаваны да ранейшых (дахрысціянскіх) святаў, надалі ім істотнае змястоўна-сэнсавае напаўненне і сапраўды народны характар: Каляды – Раство Хрыстова (7 студзеня ў праваслаўных), Грамніцы – Стрэчанне Гасподняе (15 лютага), Вербніца – Уваход Гасподні ў Іерусалім (апошняя нядзеля перад Вялікаднем), Вялікдзень (Вяліканне) – Уваскрэсенне Хрыстова (Пасха) (адзначаецца ў першую нядзелю пасля веснавога раўнадзенства і поўні), Сёмуха (Зялёныя святкі) – Тройца (святкуецца на 7 тыдзень пасля Вялікадня), Купалле (Іван Купала) – Нараджэнне Іаана Прадцечы (адзначаецца ў ноч на 7 ліпеня), Спас (Яблычны Спас) – Прэабражэнне Гасподняе (19 жніўня), Багач – Раство Багародзіцы (21 верасня) і інш.

Важнае значэнне ў зімовым цыкле святаў мелі калядныя святкаванні – ад Раства Хрыстовага да Хрышчэння (Водахрышча) (19 студзеня ў праваслаўных). Наладжвалася абрадавая вячэра (куцця) – у пачатку Каляды, перад старым Новым годам, на Водахрышча. Гурты калядоўшчыкаў абыходзілі дамы з песнямі (калядкамі) і віншаваннямі. Унікальнымі каляднымі абрадамі, гульнямі з’яўляюцца “Жаніцьба Цярэшкі”, “Яшчур”, “Калядныя цары”, “Конікі” і інш. Паводле хрысціянскіх традыцый, адбывалася праслаўленне Хрыста-Збавіцеля, урачыстая ўсяночная служба ў храме, хросныя ходы, хаджэнне з зоркай і інш. Шумнымі карнавальнымі гуляннямі, тэатралізаванымі відовішчамі адзначалася Масленіца. На Грамніцы асвячаліся ў царкве свечкі, якія набывалі засцерагальную сілу.

Старажытным веснавым святам было Благавешчанне (Дабравешчанне) (7 красавіка ў праваслаўных). На Благавешчанне звычайна пачыналі гуканне вясны. На Вербніцу паўсюдна асвячалі ў царкве галінкі вярбы, якімі ў гэты дзень сцябалі адзін аднаго і прыгаворвалі: “Не я б’ю – вярба б’е, за тыдзень – Вялікдзень”. Асаблівае шанаванне атрымаў у народным календары Вялікдзень. Да свята фарбаваліся яйкі, якія асвячаліся, наладжваліся гульні ў біткі, хаджэнне гуртоў па хатах і выкананне валачобных песень.

У беларускім народным календары асаблівае месца займаў старажытны памінальны абрад – Дзяды, які звычайна спраўляўся не менш 3–4 разоў у год вясной і восенню – Радаўніца, Змітраўскія Дзяды (асяніны), перад Масленіцай, Сёмухай. Пасля царкоўнай службы людзі ішлі на могілкі, дзе напярэдадні прыводзілі ў парадак магілы родных, нярэдка пачыналі там памінальную трапезу, успаміналі продкаў. На Дзяды гатавалі святочныя і абрадавыя стравы (куццю, бліны, клёцкі і інш.).

Да Юр’я (6 мая) прымяркоўвалі першы выган статка на пашу. На Сёмуху (Тройцу) упрыгожвалі хату, двор зелянінай (“маем”) – ссечанымі маладымі дрэўцамі бярозы, ліпы, рабіны, падлогу засцілалі аерам, травой. Мікола, старадаўняе аграрна-каляндарнае свята ў гонар Свяціцеля Мікалая Мірлікійскага, адзначалася 2 разы ў год – 22 мая (Мікола веснавы) і 19 снежня (Мікола зімовы).

Цэнтральнае месца сярод абрадаў і гульняў Купалля займала купальскае вогнішча. Наладжваліся карагоды, скокі праз вогнішча, выкананне купальскіх песень, гатаванне абрадавай вячэры, купанне ў рацэ, качанне па расе, варажба, пошукі папараць-кветкі. Ілля (2 жніўня) – свята лічылася канцом лета і пачаткам восені, пра што сведчаць прыказкі “Ілля нарабіў гнілля”, “Ілля жніво пачынае, а лета канчае” і інш. Вялікі Спас (Яблычны Спас) асабліва шанаваўся ў народзе – асвячаліся ў храмах яблыкі і іншая садавіна. У народным календары адзначаліся таксама і “мядовы” Спас ці Макавей (14 жніўня), “арэхавы” Спас (29 жніўня). Хлеб і зеляніну асвячалі ў царкве на Прачыстую (Успенне, Успенне Маці Боскай) (28 жніўня).

Старажытным святам ўраджаю была Малая Прачыстая (Раство Багародзіцы). Узвіжанне, хрысціянскае свята ў гонар Крыжа, праваслаўныя святкуюць 27 верасня. Пакроў (14 кастрычніка) лічыўся надзейным паказчыкам перспектыўных прагнозаў надвор’я (“Калі да Пакрова дня снег не пакрые зямлю, то і на Каляды не будзе снегу” і інш.).

Песні зімовага цыклу (піліпаўскія песні, калядныя, масленкі і інш.), веснавыя песні (гуканне вясны, вяснянкі, сёмушныя і інш.), песні летняга перыяду (купальскія песні, касецкія, жніўныя з абрадамі зажынак і дажынак), восеньскія песні (спасаўскія, кірмашовыя, ільяныя і інш.)

уяўляюць сабой каштоўную частку беларускай каляндарна-абрадавай паэзіі. Маючы высокую мастацкую вартасць, яны з’яўляюцца невычэрпнай крыніцай для развіцця літаратуры, музыкі, выяўленчага мастацтва.

Адметнай з’явай традыцыйнай культуры стала сямейна-абрадавая паэзія, якая ўзнікла ў эпоху першабытнасці, пазней набыла шматлікія спецыфічныя нацыянальныя рысы. Якраз з першабытнасці выйшла сямейная абраднасць, якая развівалася вакол галоўных момантаў у жыцці чалавека: нараджэння (радзіны ці хрэсьбіны), уступлення ў шлюб (вяселле), смерці (памінкі).

У цэлым, першабытная культура, якая ўяўляла сабой сукупнасць дасягненняў у матэрыяльнай вытворчасці, мастацтва, вераванняў і абрадаў, з’яўляецца важным, даволі працяглым этапам у гісторыі культуры Беларусі. Многія са здабыткаў матэрыяльнай ці духоўнай культурнай спадчыны першабытнасці ў наступныя эпохі трансфармаваліся, асобныя з іх дайшлі да сучаснасці (рэлігійныя вераванні, культ продкаў, сямейны лад жыцця, калектыўная праца, святы, традыцыі, абрады і інш.).

**Паняцці**

**Анімізм** – сістэма ўяўленняў і вераванняў аб духах і душы як вызначальных пачатках свету і чалавечага жыцця; адна з форм першабытных вераванняў; вера ў існаванне душы і розных духаў. У беларускім фальклоры (легендах, паданнях, песнях) сустракаюцца вобразы злых і добрых духаў (лесавік, палявік, вадзянік і інш.), а таксама хатніх духаў (дамавік, лазнік і г.д.). Анімістычныя ўяўленні адлюстраваны таксама ў народных традыцыях, святах (памінанне продкаў – Дзяды, “завіванне барады” у дажынках і інш.).

**Выяўленчае мастацтва** — група відаў пластычных мастацтваў (жывапіс, скульптура, графіка), якія адлюстроўваюць рэчаіснасць у вобразах, якія ўспрымаюцца зрокам чалавека.

**Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва** – творчасць па стварэнні мастацкіх вырабаў, прызначаных для дэкаратыўнага і прыкладнога выкарыстання (посуд, мэбля, дробная пластыка, прылады працы, сродкі перамяшчэння, зброя, мастацкія тканіны, адзенне, абутак, упрыгожванні і інш.).

**Культура** – сукупнасць матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, якія ствараюцца людзьмі ў працэсе фізічнай і разумовай працы для задавальнення іх разнастайных патрэбнасцей і перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Традыцыйна культура падзяляецца на матэрыяльную культуру, духоўную культуру, сацыяльную культуру (культуру чалавечых адносін). Суб’ектам культуры выступае чалавек як творца, захавальнік і распаўсюджвальнік створаных ім культурных артэфактаў. Культура

развіваецца ў розных формах: элітарная культура, народная культура, масавая культура і інш. Асноўнымі функцыямі культуры з’яўляюцца наступныя: сацыялізацыі (сацыяльнага навучання і выхавання), аксіялагічная ці каштоўнасная (дазваляе фарміраваць, успрымаць і ацэньваць розныя каштоўнасці), рэгулятыўная (наладжвае і рэгулюе міжчалавечыя адносіны праз нормы, правілы маралі), эстэтычная (задавальняе чалавечую патрэбнасць у прыгажосці), крэатыўная (спрыяе стварэнню новых артэфактаў, стыляў, напрамкаў культуры), камунікатыўная (дазваляе наладжваць узаемаадносіны паміж людзьмі), пазнавальна-інфармацыйная (захоўвае і перадае з пакалення ў пакаленне найбольш значную інфармацыю), рэлаксацыйна-кампенсаторная (дазваляе чалавеку адпачыць) і інш. У сучаснай гістарычнай і культуралагічнай навуцы існуе мноства азначэнняў паняцця культуры. Паводле ЮНЕСКА, да сферы культуры адносяцца літаратура, друк, музыка, драматычнае і пластычнае мастацтва, кіно, фатаграфія, радыё і тэлебачанне, спорт, гульні і інш. Як адзначана на Сусветнай канферэнцыі па культурнай палітыцы (Мехіка, 1982), у шырокім сэнсе культура ўключае розныя віды мастацкай дзейнасці, спецыфічныя мадэлі паводзін, спосабы жыцця, фундаментальныя правы чалавека, сістэмы каштоўнасцей, традыцыі і звычаі.

**Мастацкая культура** – сукупнасць мастацкіх каштоўнасцей, гістарычная пэўная сістэма іх узнаўлення і функцыянавання ў грамадстве. Можа выкарыстоўвацца ў якасці сіноніма паняцця мастацтва.

**Мастацтва** – вобразнае асэнсаванне рэчаіснасці, працэс ці вынік выражэння ўнутранага ці знешняга свету творцы ў мастацкім вобразе; мастацкая творчая дзейнасць, звязаная з вобразным адлюстраваннем рэчаіснасці, якая ўключае літаратуру, архітэктуру, скульптуру, жывапіс, графіку, дэкаратыўнае мастацтва, музыку, танцы, тэатр, кіно і інш. Выконвае эстэтычную, пазнавальную, выхаваўчую, рэлаксацыйную і іншыя функцыі. У вузкім сэнсе азначае выяўленчае мастацтва.

**Татэмізм** – вераванні, абрады і рытуалы ў першабытным грамадстве, звязаныя з уяўленнем аб роднасці паміж групай людзей (родам, племенем) і татэмам (пэўным відам жывёл, птушак, раслін, радзей з’яў прыроды і неадушаўлёных прадметаў. У беларускай народнай культуры захаваліся шматлікія легенды, паданні, прыкметы, звязаныя з рэшткамі татэмізму. У некаторых творах беларускага фальклору адзначаецца, што ў мядзведзяў, буслоў, ваўкоў часам ператвараліся (пераважна па волі Бога) звычайныя людзі. На Беларусі доўгі час захоўвалася язычніцкае свята татэмнага паходжання “Камаедзіца”, што наладжвалася вясной у гонар прабуджэння мядзведзя ад зімовай спячкі. Праявы татэмізму прысутнічаюць у звычаі

пераапранання ў скуры жывёл (казы, мядзведзя і інш.) у розных народных святах і абрадах (у час Каляды і інш.).

**Фетышызм** – вера ў звышнатуральныя ўласцівасці прыродных або выробленых чалавекам неадушаўлёных прадметаў (фетышаў) і пакланенне ім. Узнік у эпоху першабытнасці. На беларускіх землях людзі пакланяліся камяням, прыносілі да іх невялікія ахвярапрынашэнні. Фетышысцкія ўяўленні знайшлі адлюстраванне ў беларускай народнай творчасці (песнях, казках, легендах, паданнях). Вера ў амулеты, талісманы з'яўляецца сведчаннем рэшткаў фетышызму.

**Язычніцтва (паганства)** – старажытныя вераванні і культы, якія існавалі да пашырэння сусветных рэлігій (будызму, хрысціянства, ісламу). Уяўляла сабой сукупнасць шматслойных і разгалінаваных рэлігійных уяўленняў (анімізм, фетышызм, татэмізм і інш.) пэўных гістарычных эпох. На працягу многіх тысячагоддзяў язычніцтва зведала шматлікія змены, трансфармацыі, наслаенні. Яно пачыналася ад культу Маці-Багіні эпохі матрыярхату, культу продкаў, культу жывёлы і завяршылася складаным і разгорнутым пантэонам багоў. Прыхільнікі язычніцтва прыносілі разнастайныя ахвярапрынашэнні шматлікім божаствам, пакланяліся духам рэк, азёр, лясоў, жывёл, дрэвам, камяням, крыніцам і іншым аб'ектам навакольнага асяроддзя. Ва ўсходнеславянскіх плямён найбольш паважаныя язычніцкія багі – Пярун (бог грому і маланкі), Вялес (бог жывёлагадоўлі), Сварог (бог неба), Дажбог (бог сонца) і інш. Язычніцкія культавыя збудаванні называліся капішчамі, у цэнтры якіх размяшчаліся драўляныя ці каменныя ідалы, каля якіх выконваліся рытуальныя дзеянні, праводзіліся святкаванні. У большай ці меншай ступені язычніцтва захоўвалася ў духоўнай культуры многіх народаў нават пасля прыняцця адной з сусветнай рэлігій. На беларускіх землях з канца X – XI ст. язычніцтва паступова выцяснялася хрысціянствам. Працяглы час разам з хрысціянскімі каштоўнасцямі яшчэ захоўваліся язычніцкія перажыткі ("двухвер'е"). Старажытнае язычніцкае паходжанне маюць многія беларускія народныя святы, абрады – Купалле, Каляды, Дзяды, Радаўніца, гуканне вясны і інш.

## Тэма 2. Культура беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст.

***Прынящце і распаўсюджванне хрысціянства.*** У гісторыі ўсходнеславянскіх народаў з канца I тысячагоддзя важнае значэнне стала іграць хрысціянства. У 988 г. князь Уладзімір Святаслаівіч быў ахрышчаны і абвясціў хрысціянства дзяржаўнай рэлігіяй Кіеўскай Русі. З канца X – пачатку XI ст. хрысціянства візантыйскага абраду пачало распаўсюджвацца на тэрыторыі сучаснай Беларусі. У 992 г. была створана

Полацкая епархія. Магчыма, у 1005 г. епіскапская кафедра была заснавана ў Тураве. У выніку прыняцця хрысціянства значна ўзрос аўтарытэт Полацкага і Тураўскага княстваў. Паступова фарміравалася саслоўе духавенства, якое складалі самыя адукаваныя і ўплывовыя людзі. На беларускіх землях хрысціянства пашыралася пераважна мірным, эвалюцыйным шляхам. Спачатку хрысціянства прынялі вярхі грамадства (баяры, дружына), пазней – гараджане і сяляне. Аднак значная частка насельніцтва (пераважна сялянства) яшчэ доўгі час прытрымлівалася язычніцкіх вераванняў, павярхоўна ўспрымала хрысціянскую веру. Па меры распаўсюджвання хрысціянства ў Полацкім і Тураўскім княствах узводзіліся цэрквы, адкрываліся манастыры. У XII ст. у Полацку існавала не менш 10 культавых манументальных збудаванняў, 3 манастыры (Бельчыцкі Барысаглебскі, Спаса-Ефрасіннеўскі, Багародзіцкі). Полацкая княжацкая сям’я была цесна звязана з Кіева-Пячэрскім манастыром. У XII ст. з’явіліся 2 манастыры ў Тураве – Варварынскі і Барысаглебскі, пры якім знаходзілася епіскапская рэзідэнцыя. У Гродне былі пабудаваны 3 храмы. Царкоўнае мураванае дойлідства развівалася таксама ў іншых старажытных гарадах Беларусі.

Візантыйская культура характарызавалася магутным росквітам у XI–XII стст. Наноў перапрацаваўшы традыцыі старажытнага Рыма і Грэцыі, Візантыя стала мастком паміж антычнасцю і культурай сярэднявечча, Новага часу Еўропы, моцным сусветным цэнтрам культуры. Усходнеславянскія землі не маглі пазбегнуць уплыву візантыйскай культуры. Прыняцце і распаўсюджванне хрысціянства аказала велізарны ўплыў на культуру ўсходнеславянскага насельніцтва. Па-першае, з’явілася пісьменнасць (набыла пашырэнне кірыліца), што садзейнічала пашырэнню твораў пісьменства, пачатку летапісання і інш. Па-другое, атрымала развіццё асвета (школы пры манастырах і інш.). Па-трэцяе, з Візантыі прыйшло мураванае культавае дойлідства, крыжова-купальны тып храмаў. Па-чацвёртае, з хрысціянствам з’явіўся іканапіс, фрэскі, новыя мастацкія тэхналогіі і інш. Па-пятае, усталёўваліся хрысціянскія маральна-этычныя каштоўнасці. Творчае засваенне візантыйскай спадчыны паспрыяла самастойнаму, выніковаму культурнаму развіццю ўсходніх славян. “Славянскія народы не былі правінцыяльнымі самавучкамі, абмежаванымі мясцовымі інтарэсамі і мясцовымі традыцыямі, – адзначаў акадэмік Д.С. Ліхачоў. – Праз Візантыю і іншыя краіны яны дыхалі паветрам сусветнай культуры”.

***Пісьменнасць і помнікі пісьменства.*** З прыняццем хрысціянства на ўсходнеславянскія землі прыйшла пісьменнасць. Славянскія асветнікі святыя Кірыла і Мяфодзій сталі фактычна стваральнікамі літаратурнай старaславянскай мовы, зразумелай тады для ўсіх славянскіх народаў.

Кірыліца, старажытная славянская азбука (назва паходзіць ад імя асветніка Кірылы), створаная ў IX ст. на аснове грэка-візантыйскага ўстаўнога пісьма, у адрозненне ад другой славянскай азбукі – глаголіцы – мела іншы тып і больш простую форму літар (43 літары, з іх 24 візантыйскага паходжання, 19 створаны ўпершыню). Літарны склад кірыліцы адпавядаў гукавой сістэме стараславянскай мовы.

На тэрыторыі Беларусі пісьменнасць пачынаецца з X ст. Да XII ст. кніжная культура развівалася ў агульным кантэксце старажытнарускай спадчыны. Доказамі наяўнасці і развіцця пісьменнасці на беларускіх землях у X–XIII стст. з’яўляюцца наступныя: свінцовая пячатка полацкага князя Ізяслава Уладзіміравіча (канец X ст.), якая з’яўляецца самым старажытным помнікам пісьменства ва Усходняй Еўропе; берасцяныя граматы; шматлікія прадметы з археалагічных раскопак, звязаныя з пісьмом (самшытавы грэбень XIII ст. з алфавітам, знойдзены ў Бярэсці; пісалы, з дапамогай якіх наносіліся літары; засцёжкі для кніг і інш.); помнікі эпіграфікі – Барысавы камяні, Рагвалодаў камень, графіці полацкіх храмаў і інш.; старажытныя рукапісныя кнігі і летапісы – Тураўскае, Полацкае, Аршанскае Евангеллі і інш.; асветніцкая дзейнасць Е. Полацкай, К. Тураўскага і іншых дзеячаў.

Адным з важных сведчанняў, што на Русі пісьменнасць была пашырана не толькі сярод духавенства, феадалаў, але і простых гараджан, былі берасцяныя граматы. Першая берасцяная грамата была знойдзена ў Вялікім Ноўгарадзе ў 1951 г. (да сённяшняга часу там выяўлена ўжо больш 1 тыс.). На тэрыторыі Беларусі знойдзены 3 берасцяныя граматы: канца XIII ст. – у 1959 г. у Віцебску; пачатку XIII ст. і першай паловы XII ст., выяўлены адпаведна ў 1980 і 2014 гг. у Мсціславе.

Манументальнымі помнікамі эпіграфікі XII ст. былі Барысавы камяні – 7 вялікіх валуноў з высечанымі на іх 6-канцовымі крыжамі і надпісамі “Господи помози”, якія размяшчаліся ў рэчышчы Заходняй Дзвіны. Да прыняцця хрысціянства камяні былі язычніцкімі фетышамі. Крыжы на іх былі высечаны паводле загаду полацкага князя Барыса Усяславіча ў першай трэці XII ст. Цяпер захаваліся толькі 3 з іх: у музеі-запаведніку “Каломенскае” у Маскве, у Полацку каля Сафійскага сабора і ў Друі (Браслаўскі раён). Адзіным дакладна датаваным быў Рагвалодаў камень, што знаходзіўся каля в. Дзятлава (Аршанскі раён). У 1171 г. на валуне вышынёй у 3 м высечаны 6-канцовы крыж і надпіс на царкоўнаславянскай мове: “В лето 6679 месяца мая в 7 день доснен крест сей. Господи помози рабу своему Василию в крещении именем Рогволоду сыну Борисову”. Даследчыкі мяркуюць, што гэта была просьба ў барацьбе з голадам. Рагвалодаў камень узарваны ў 1930-я гг.

Адным з самых старажытных помнікаў усходнеславянскага пісьменства з’яўляецца Супрасльскі рукапіс XI ст. (зборнік жыцій і пропаведзяў), які да XIX ст. знаходзіўся ў манастыры ў Супраслі (цяпер Польшча). Самай старажытнай кнігай, створанай на тэрыторыі сучаснай Беларусі, з’яўляецца Тураўскае Евангелле XI ст. Уцалелі ўсяго 10 аркушаў рукапісу, напісаныя ўставам на пергаменце на царкоўнаславянскай мове старажытнарускай рэдакцыі (з прыпіскамі князёў Астрожскіх пачатку XVI ст.), якія былі вывезены ў 1865 г. і да сённяшняга часу захоўваюцца ў бібліятэцы АН Літвы ў Вільнюсе. Саліднае факсімільнае выданне Тураўскага Евангелля з’явілася ў Мінску ў 2014 г.

Полацкае Евангелле (канец XII – пачатак XIII ст.) належала Троіцкаму манастыру ў Полацку. Напісана на царкоўнаславянскай мове ўставам на пергаменце, почыркам двух пісцоў, у два слупкі на 172 аркушах. Аздоблена кінаварнымі ініцыяламі і загалоўкамі, утрымлівае фундушавыя запісы XIV–XVII стст. Захоўваецца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу. Шыкоўнае факсімільнае выданне Полацкага Евангелля з’явілася ў Мінску ў 2013 г. Канцом XII – пачаткам XIII ст. датуецца і Аршанскае Евангелле, якое было знойдзена ў Оршы ў 1812 г. Збераглiся 142 аркушы рукапісу (без пачатку і канца), напісаныя ўставам на пергаменце. У Аршанскім Евангеллі змешчаны 2 мініяцюры з выявамі евангелістаў Лукі і Матфея, 2 застаўкі і 310 ініцыялаў. Цяпер захоўваецца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы АН Украіны.

Выдатным помнікам усходнеславянскай літаратуры з’яўляецца “Слова аб палку Ігаравым” (канец XII ст.). Невядомы аўтар апісаў няўдалы паход на палаўцаў у 1185 г. ноўгарад-северскага князя Ігара Святаславіча. У творы перапляліся лепшыя традыцыі кніжнасці і фальклору. Асноўная ідэя твора – заклік да яднання старажытнарускіх князёў перад знешняй пагрозай, супраць міжусобіцы. “Слова аб палку Ігаравым” з’яўляецца каштоўнай крыніцай па старажытнай гісторыі ўсходнеславянскіх народаў. Мастацкае апісанне атрымала гісторыя Полацкага княства ў часы княжання Усяслава Брачыславіча і яго нашчадкаў.

Адметную ролю ў тагачаснай культуры выконвала летапісанне. На Русі летапісы пачалі складваць у XI ст. Вытокі старажытнарускага летапісання былі ў гістарычных паданнях і дзелавой пісьменнасці, у вусна-паэтычных і літаратурных традыцыях адлюстравання гісторыі. У пачатку XII ст. створаны выдатны агульнадзяржаўны і агульнарускі летапісны помнік – “Аповесць мінулых гадоў”, аўтарства якога прыпісваюць манаху Кіева-Пячэрскага манастыра Нестару. У XII–XIV стст. летапісы мелі пераважна мясцовы характар. Магчыма, у Полацку таксама было наладжана летапісанне, якое мела пераважна княжацкі характар. Па

нешматлікіх прамых і ўскосных звестках у розных пісьмовых крыніцах вядомы Полацкі летапіс, які не збярогся, але яго асобныя ўрыўкі ёсць у Іпацьеўскім летапісным зводзе.

На ўсходнеславянскіх землях папулярнымі сталі творы агіяграфічнай літаратуры (жыціі), арыгінальныя і перакладныя. Сярод арыгінальных твораў агіяграфіі канца XII – XIII ст. вядомы "Жыціе і хаджэнне Ефрасінні Полацкай", "Жыціе прападобнага Аўрамія Смаленскага" і інш.

Полацк з'яўляўся значным цэнтрам пісьменства на старажытнабеларускіх землях. Пісьменнасць у Полацку пачаў распаўсюджваць князь Ізяслаў Уладзіміравіч, якога ў летапісе назвалі кніжнікам. Е. Полацкая спрыяла папаўненню кнігамі бібліятэкі Сафійскага сабора. У скрыпторыі яна перапісвала і, магчыма, перакладала кнігі. Заснаваныя ёй у Полацку Спасаўскі і Багародзіцкі манастыры сталі цэнтрамі культуры Полацкага княства.

Значным цэнтрам пісьменства быў Тураў. К. Тураўскі праславіўся як прапаведнік, выдатны майстар красамоўства, якога параўноўвалі з візантыйскім царкоўным дзеячам І. Златавустам, які на Русі лічыўся ідэалам прапаведніка. К. Тураўскі з'яўляецца аўтарам да 70 вядомых цяпер твораў розных жанраў ("слоў"-казанняў, прытчаў, канонаў, спавядальных малітваў і інш.). Ён пісаў на стараславянскай мове, для яго стылю характэрна ўскладненасць і ўрачыстасць, высокамастацкае майстэрства выкладання матэрыялу. Творчасць К. Тураўскага набыла вялікую папулярнасцю на ўсходнеславянскіх землях і аказала істотны ўплыў на развіццё аратарскай прозы.

Важную ролю ў культурным развіцці ўсходнеславянскіх зямель з другой паловы XII ст. выконваў Смаленск. З творчай спадчыны кніжніка і мысліцеля К. Смаляціча захавалася толькі "Пасланне прэсвітэру Фаме", у якім аўтар прадэманстраваў тонкае веданне багаслоўя, валоданне ўсімі сродкамі рыторыкі, добрае знаёмства з творамі візантыйскіх філосафаў, умела спалучыў дагматычныя пытанні з праблемамі царкоўнага кіравання. Выдатным прамоўцам быў А. Смаленскі, жыціе якога было складзена каля 1240 г. яго вучнем манахам Яфрэмам.

***Дойлідства.*** Прыняцце і распаўсюджванне хрысціянства паклала пачатак на беларускіх землях мураванаму манументальнаму дойлідству. Пад уплывам візантыйскай і кіеўскай архітэктуры найбольшае распаўсюджанне ў культавым будаўніцтве атрымалі крыжова-купальныя храмы. Па адметных мастацкіх рысах і тэхналогіі будаўніцтва вылучаюцца полацкая і гродзенская архітэктурныя школы.

Творчае пераасэнсаванне візантыйскай будаўнічай традыцыі паспрыяла стварэнню ў XI ст. полацкай архітэктурнай школы, росквіт якой назіраўся ў XII ст. Яе характэрнымі рысамі былі наступныя: тэхніка

муроўкі са “схаваным радам”; у асобных храмах падкупальны квадрат размяшчаўся не над усходнімі, а над заходнімі парамі слупоў, што надавала кампазіцыі будынкаў цэнтрычнасць; лесвіца на хоры ўнутры сцяны; у многіх храмах меліся абыходныя галерэі і інш.

Першым прыкладам мураванага культавага дойлідства на Беларусі быў узведзены паміж 1044 і 1066 гг. (паводле іншых звестак – у 1050–1060 гг.) пры князі Усяславе Брачыславічу Сафійскі сабор у Полацку – трэці ва ўсходнеславянскіх землях (пасля Кіева і Ноўгарада). Агульныя памеры сабора складалі 26,4 м шырыні і 31,5 м даўжыні (з улікам апсід). Храм быў 5-нефавым крыжова-купальным (7 ці 5 купалоў). Унутры памяшканне храма было падзелена 16 слупамі на нефы, 3 сярэднія нефы заканчваліся апсідамі. Яго сцены былі складзены з каменю і плінфы ў тэхніцы муроўкі са “схаваным радам”. У старажытнай частцы сабора (усходняя апсіда) захаваліся фрагменты фрэсак XI ст. Сафійскі сабор з’яўляўся не толькі культавай пабудовай – там размяшчалася дзяржаўная казна, бібліятэка, архіў. У канцы XV – пачатку XVI ст. Сафійскі сабор быў перабудаваны ў 5-вежавы абарончы храм, які ў 1710 г. быў пашкоджаны выбухам, а ў сярэдзіне XVIII ст. адноўлены ў стылі позняга барока.

Паміж 1128 і пачаткам 1140-х гг. (паводле іншых звестак – паміж 1152 і 1161 гг.) па заказу Е. Полацкай была пабудавана за 30 тыдняў дойлідам Іаанам Спаса-Прэабражэнская царква ў Полацку. Царква ўяўляе сабой невялікі (8х12 м) мураваны прамавугольны 3-нефавы аб’ём. Цэнтральны неф завершаны масіўнай паўкруглай апсідай, вузенькія бакавыя нефы – паўкруглымі нішамі ў тоўшчы сцяны. Будынак храма нагадваў шмат’ярусную вежу, бо грані кубічнага пастамента, на якім трымаліся барабан і купал храма, былі аздоблены какошнікамі. Спаса-Прэабражэнская царква – адзіны храм на тэрыторыі Беларусі, дзе амаль поўнасцю дайшлі да сучаснасці фрэскавыя роспісы (іх рэстаўрацыя цяпер завяршаецца). Там жа захоўваюцца адноўленыя мастаком М. Кузьмічом крыж Е. Полацкай і сярэбраная рака з яе мошчамі.

Сярод помнікаў полацкай школы дойлідства XII ст. трэба адзначыць цэрквы Бельчыцкага манастыра ў Полацку – Вялікі (Успенскі) сабор, храм-трыконх, Пятніцкую і Барысаглебскую цэрквы (дзве апошнія будаваў дойлід Іаан), якія не дайшлі да сучаснасці, Дабравешчанскую царкву ў Віцебску (узарвана ў 1961 г., адноўлена ў 1990-я гг.) і іншыя пабудовы. Полацкія дойліды ўдзельнічалі ў будаўніцтве Навагрудскай Барысаглебскай царквы, узводзілі цэрквы ў Ноўгарадзе, Смаленску.

У XII ст. самабытная школа дойлідства склалася ў Гродне. Яе характэрнымі рысамі з’яўляліся наступныя: роўнаслойная муроўка з плінфы; уключэнне ў муроўку шліфаваных валуноў і маёлікавай плінфы; выкладанне падлог у будынках разнастайнымі па форме каляровымі

паліванымі керамічнымі пліткамі са складанымі геаметрычнымі арнаментамі; адносна невялікая таўшчыня апорных канструкцый, круглая і гранёная форма ўнутраных слупоў; выкарыстанне вялікай колькасці галаснікоў для аблягчэння канструкцый, паляпшэння акустыкі і інш.

Адным з вядомых уцалелых, хоць і не ў поўным выглядзе, помнікаў гродзенскай школы з'яўляецца Барысаглебская (Каложская – па назве пасада) царква (другая палова XII ст.) у Гродне. Уяўляе сабой мураваны 6-стаўповы 3-апсідны крыжова-купальны храм памерам 13,5х21,5 м, таўшчыня сцен каля 1,2 м. У муроўцы сцен былі змешчаны галаснікі. У знешнім аздабленні сцен вялікія каляровыя камяні і фігурныя керамічныя пліткі ўтваралі непадобныя адна на адну геаметрычныя фігуры і крыжы. Вядомы адзін з будаўнікоў – Пётр Міланег. У выніку апоўзня царква разбуралася ў XIX ст. Захаваліся паўночная і частка заходняй сцяны, 3 апсіды і 2 заходнія падкупальныя слупы. Барысаглебская царква рэстаўравалася ў XX ст., цяпер робяцца захады для яе захавання. Сярод узораў гродзенскай школы былі таксама Ніжняя і Прачысценская цэрквы, княжацкі палац у Гродне, царква ў Ваўкавыску, якія не захаваліся.

Археалагічныя раскопкі сведчаць аб развіцці манументальнага дойлідства ў Турава-Пінскім княстве. У XII–XIII стст. у Тураве было мноства хрысціянскіх храмаў і манастыроў, сярод іх Варварынскі, Барысаглебскі манастыры. Дойлідства Турава было цесна звязана з кіеўскай архітэктурнай школай. Цяпер падмурак храма XII ст., выяўлены археолагамі ў 1963 г., уваходзіць у гісторыка-археалагічны комплекс "Старажытны Тураў".

Аб знешнім вобліку тагачасных гарадоў сведчаць матэрыялы археалагічных даследаванняў. У 1960–1980-я гг. пад кіраўніцтвам П. Лысенкі праводзіліся раскопкі гарадзішча старажытнага Бярэсця, у выніку якіх былі выяўлены больш за 220 драўляных жылых і гаспадарчых пабудоў XI–XIII стст. (захаваліся зрубы нават на 12 вянкоў), рэшткі маставых, агароджаў, шматлікія прадметы матэрыяльнай культуры. Раскрытыя рэшткі гарадзішча старажытнага Бярэсця сталі асновай для адкрыцця ў 1982 г. унікальнага археалагічнага музея "Бярэсце", адзінага ў Еўропе музея сярэдневяковага ўсходнеславянскага горада.

***Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.*** На мастацкае жыццё беларускіх зямель у X–XII стст. моцны ўплыў аказвала візантыйскае мастацтва, а таксама культура Кіева, іншых усходнеславянскіх зямель. Захаваліся адзінкавыя арнаментальныя фрагменты фрэскавых роспісаў у апсіднай частцы Полацкага Сафійскага сабора. Найбольшая колькасць фрэсак XII ст. зберaглася ў Спаса-Праабражэнскай царкве ў Полацку. Гэтыя фрэскі дайшлі да сучаснасці ў амаль непашкоджанным, першапачатковым варыянце. Па сваіх мастацкіх

асаблівасцях яны маюць безумоўную блізкасць да візантыйска-кіеўскіх традыцый. Пры гэтым можна сцвярджаць аб фарміраванні ў Полацку рэгіянальнай мастацкай школы.

Найбольш раннія творы іканапісу з'явіліся на беларускіх землях у канцы X ст. у Полацку і Тураве. Верагодна, што спачатку іх прывозілі з Візантыйскай імперыі. Вядома, што менавіта адтуль была дастаўлена для Е. Полацкай ікона Маці Боскай Адзігітрыі Эфескай. Твораў іканапісу X–XIII стст. на Беларусі не захавалася.

У XI ст. пачалі закладвацца асновы кніжнай мініяцюры (афармленне рукапісаў мініяцюрамі, застаўкамі, канцоўкамі, ініцыяламі). У XII–XIII стст. склалася полацка-смаленская школа кніжнай мініяцюры (сярод яе твораў – аздабленне Друцкага, Полацкага і іншых рукапісных кніг).

Творы дробнай пластыкі рэлігійнага і свецкага прызначэння знойдзены пры раскопках Мінска, Гродна, Полацка, Ваўкавыска і іншых старажытных гарадоў. З прыняццем хрысціянства замест язычніцкіх амулетаў больш выкарыстоўваліся нацельныя крыжы-энкалпіёны, маленькія абразкі з косці, каменю, дрэва, металу (сярод іх "Хрыстос Эмануіл" з Пінска, "Канстанцін і Алена" з Полацка XII ст. і інш.).

У X–XIII стст. дэкаратыўна-прыкладное мастацтва вылучылася ў самастойную галіну мастацкай дзейнасці. Назіралася развіццё разьбы па косці і дрэве, металаапрацоўчых рамёстваў, шкларобства, ткацтва, ганчарства і інш. Рамеснікі выраблялі прадметы побыту, посуд, літургічнае начынне, зброю, упрыгожванні і інш.

Шэдэўрам ювелірнага і эмальернага мастацтва быў крыж, зроблены ў 1161 г. Л. Богшам па заказу Е. Полацкай. Крыж быў 6-канцовым (вышыня – 51,8 см, даўжыня верхняй перакладзіны – 14 см, ніжняй – 21 см, таўшчыня – 2,5 см), аснова яго драўляная. Пярэдняя і адваротная плоскасці крыжа былі пакрыты 21 залатой пласцінай, якія былі аздоблены 20 перагародчатымі каляровымі эмалямі з выявамі святых, арнаментамі, каштоўнымі камянямі. На верхніх выявах канца размешчаны выявы І. Хрыста, Маці Божай, Іаана Прадцечы, у цэнтры ніжняга перакрыжавання – 4 евангелісты (Іаан, Марк, Лука, Матфей), на канцах ніжняй перакладзіны – архангелы Гаўрыіл і Міхаіл, унізе крыжа выявы святых Ефрасінні, Георгія і Сафіі (патронаў заказчыцы і яе бацькоў). Крыж быў абкладзены 20 сярэбранымі пазалочанымі пласцінамі, на якіх быў зроблены вялікі надпіс, дзе паведамлялася гісторыя яго стварэння, дата, імя ювеліра і заказчыцы, завяшчанне. Уяўляў сабой каўчэг для захоўвання свяшчэнныя рэліквій: у сярэдзіне крыжа ў 5 квадратных гнёздах знаходзіліся кавалачкі крыжа Гасподняга з кроплямі яго крыві, кавалачак каменю ад дамавіны Маці Божай, часткі мошчаў Св. Стэфана і Панцеляймона, кроў Св. Дзмітрыя. Туды ж былі змешчаны часцінкі

Святога Дрэва (крыжа), на якім быў распяты І. Хрыстос. Крыж Е. Полацкай захоўваўся (з перапынкамі) у Полацку, у першай палове ХХ ст. знік. Мастак М. Кузьміч узнавіў крыж, які быў асвечаны і перададзены ў 1997 г. у Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр у Полацку.

У цэлым, культура беларускіх зямель IX – першай паловы XIII ст. характарызавалася шматграннасцю – развіццём мураванага дойлідства, пісьменства і асветы, жывапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Яна з’яўляецца дастойнай часткай старажытнай усходнеславянскай спадчыны.

**Паняцці**

**Апсіда** – у будынку так называецца выступ паўкруглай ці шматвугольнай формы, пакрыты паўкупалам ці паўскляпеннем. У хрысціянскім храме апсіда знаходзіцца з усходняга боку, у ёй размяшчаецца алтар.

**Барабан** – у будынку так называецца верхняя нясучая падкупальная частка цыліндрычнай ці гранёнай формы (глухая ці са светлавымі праёмамі), якая абапіраецца на сцены, слупы, ветразі. Пераважна пашырана ў хрысціянскім культавым дойлідстве.

**Галаснікі** – гліняныя пасудзіны ў выглядзе збаноў з доўгім вузкім горлам, якія ўмуроўваліся ў тоўшчу сцяны адтулінамі ўнутр памяшкання для паляпшэння яго акустыкі, аблягчэння мураванай сцяны. У архітэктуры Беларусі галаснікі вядомы з XII ст. у цэрквах у Гродне.

**Данжон** – галоўная, асобна размешчаная вежа замка прамавугольнай ці круглай у плане формы. З’яўлялася назіральным пунктам, у час аблогі замка ператваралася ў ізаляваную цытадэль. Самы старажытны ўцалелы данжон на тэрыторыі Беларусі – “стоўп” ці вежа ў Камянцы XIII ст.

**Дзядзінец** – умацаваны цэнтр старажытнаславянскага горада, які абкружаўся сценамі, вежамі, земляныміваламі, равамі.

**Замак** – будынак ці комплекс будынкаў, які быў жыллём і выконваў абарончую функцыю, з’яўляўся адміністрацыйна-палітычным і культурна-гаспадарчым цэнтрам. Звычайна ўзводзіліся ў выгадных для абароны месцах, абкружаліся сценамі, вежамі, землянымі валамі і равамі. З XIII–XIV стст. на беларускіх землях будаваліся замкі-кастэлі. Паступова замкі страцілі абарончую функцыю, замяняліся ці ператвараліся ў палацы, палацава-замкавыя комплексы.

**Ікона (абраз)** – у хрысціянскай царкве так называюць выяву І. Хрыста, Маці Боскай, апосталаў, святых, асобных сцэн з Бібліі. Іконы пішуцца па вызначаных канонах тэмпернымі ці алейнымі фарбамі звычайна на дошках ці палатне. Абраз Маці Боскай Адзігітрыі Эфескай падараваў Е. Полацкай візантыйскі імператар Мануіл І Камнін для

Багародзіцкага манастыра ў Полацку. Самыя старажытныя ўцалелыя іконы ў Беларусі датуюцца канцом XIV – пачаткам XV ст.

**Крыжова-купальны храм** – тып культавай пабудовы, які прыйшоў з візантыйскай архітэктуры. Уяўляе сабой 4 вертыкальныя апоры, на якія праз ветразі абапіраецца барабан і купал. У дойлідстве Беларусі крыжова-купальныя храмы вядомы з XI ст.

**Купал** – прасторавае пакрыццё будынка ці пабудовы, якое мае звычайна сферычную, паўсферычную форму, прызначана для перакрыцця разнастайных па форме і велічыні аб'ёмаў без дадатковых апор. Купал шырока выкарыстоўваўся ў культавым, грамадзянскім і свецкім дойлідстве, у розных мастацкіх стылях. У дойлідстве ўсходніх славян купал размяшчаўся на барабанах цэркваў. На беларускіх землях вядомы з XI ст.

**Ляўкас** – крэйдавы грунт для іканапісу, які складаецца з крэйды, размешаны на жывёльным ці рыбіным клеі з дадаткам ільнянога алею.

**Маёліка** – від керамікі, вырабы з абпаленай гліны, пакрытыя каляровай палівай.

**Мазаіка** – арнаментаваная або сюжэтная выява з аднародных ці розных па матэрыялу частак (каменю, смальты, шкла, керамікі, дрэва і інш.).

**Мецэнацтва** – добраахвотная і бескарыслівая апека, матэрыяльная, фінансавая і іншая дапамога для асветы, культуры, мастацтва, навукі, гуманітарнай сферы. Да мецэнатаў адносяць прыватных асоб, палітычных, грамадскіх, царкоўных дзеячаў, заказчыкаў, калекцыянераў і інш.

**Мініяцюра** – мастацкі твор малых памераў. Прадстаўлена кніжнай мініяцюрай (з малюнкамі, ілюстрацыямі, ініцыяламі, застаўкамі, канцоўкамі кніг), партрэтнай мініяцюрай.

**Неф** – прадаўгаватая прамавугольная ў плане прастора будынка, якая абмежавана сценамі ці радамі слупоў, калон, аркадамі. Адрозніваюць галоўны, бакавыя, папярочныя (трансепт) нефы. У завяршэннях галоўнага і бакавых нефаў размяшчаліся алтары. На перакрыжаванні галоўнага і папярочнага нефаў звычайна ўзводзіўся купал на барабане.

**Пасад** – гандлёва-рамесніцкая частка старажытнаславянскага горада, размешчаная па-за гарадскімі ўмацаваннямі каля дзядзінца, дзе пражывалі купцы і рамеснікі, адбываўся гандаль.

**Плінфа** – шырокая і плоская абпаленая цэгла, якую выкарыстоўвалі для будаўніцтва ў візантыйскім і старажытнарускім дойлідстве.

**Раманскі стыль** – стыль у еўрапейскім мастацтве X–XIII стст. Склаўся пад уплывам традыцый старажытнарымскага і візантыйскага мастацтва. Раманская архітэктура (кляштары, храмы, замкі) вызначалася манументальнасцю, суровасцю і крапасным характарам, выкарыстаннем

масіўных, цяжкіх і дакладных форм, аздабленнем абстрактна-геаметрычным арнаментам і скульптурай з умоўнай трактоўкай фігур у спалучэнні з павышанай экспрэсіяй. Для выяўленчага мастацтва раманскага стылю былі характэрны схематызм, сімвалічная абагульненасць, напружаная духоўная выразнасць, імкненне да выяўлення розных фантастычных істот і інш. У творах жывапісу і скульптуры ў асноўным адлюстроўваліся біблейскія сюжэты (пераважна сцэны Страшнага Суда), паказваліся І. Хрыстос, святыя, падзеі старажытнай гісторыі. На беларускіх землях рысы раманскай архітэктуры прасочваюцца ў дойлідстве XIII–XIV стст. (вежа ў Камянцы, замкі ў Навагрудку, Лідзе, Крэве).

**Скань (філігрань)** – ювелірная тэхналогія, пры якой ствараецца ўзор з тонкага залатога, сярэбранага, меднага гладкага ці звітага дроту. Вырабы са скані часта дапаўняюцца зерню (малымі сярэбранымі ці залатымі шарыкамі), эмалямі, чаканкай. На Беларусі вядома з XI ст.

**Скляпенне** – тып перакрыцця ці пакрыццё прасторы (памяшкання), абмежаванай сценамі, бэлькамі ці слупамі; канструкцыя, якая ўтвараецца нахільнымі прамалінейнымі ці крывалінейнымі паверхнямі.

**Скрыпторый** – майстэрня па перапісванні кніг.

**Смальта** – каляровае штучнае шкло ў выглядзе невялікіх кубікаў ці пласцінак, з якіх выкладваюцца мазаікі. На беларускіх землях вядома з XI ст. у архітэктуры Полацка.

**Фрэска** – тэхніка манументальнага жывапісу па сырой тынкоўцы. Пры высыханні вапны, якая ўтрымліваецца ў тынкоўцы, утвараецца тонкая празрыстая кальцыевая плёнка, якая робіць фрэску даўгавечнай. На Беларусі фрэска вядома з XI ст.

**Фундатар** – асоба, якая засноўвае што-небудзь або ахвяруе грошы, сродкі на заснаванне, упрыгожанне чаго-небудзь. У праваслаўнай царкве такія ахвярадаўцы называліся **кцітарамі**. Асоб каталіцкага і пратэстанцкага веравызнання, якія былі заказчыкамі твораў выяўленчага мастацтва, архітэктуры ці іх дарыльшчыкамі, называлі **данатарамі**. Выявы кцітараў, данатараў былі пашыраны ў сярэдневяковым мастацтве.

**Тэмпера** – фарба, якая прыгатавана на аснове сухіх парашковых натуральных пігментаў (могуць выкарыстоўвацца іх сінтэтычныя аналагі). Звычайна складалася з пігмента, замешанага на яечным жаўтку, бялку ці казеіне, і разбаўленага вадой. На Беларусі выкарыстоўвалі ў іканапісе, аздабленні драўлянай скульптуры.

**Фасад** – знешняя вертыкальная паверхня збудавання, утвораная разнастайнымі архітэктурнымі дэталямі і прыёмамі.

**Эмаль** – ювелірная тэхналогія тонкага шклопадобнага пакрыцця, якая атрымліваецца пры высокатэмпературнай апрацоўцы, ці ўпрыгожаны

ім выраб. На тэрыторыі Беларусі асобныя віды эмалі вядомы з II–V стст., перагародачная эмаль – з XII ст.

**Дзеячы культуры, мастацтва**

**Аўрамій Смаленскі (Працалюбівы)** (каля 1150 – да 1224) – праваслаўны дзеяч, мысліцель. Святы Рускай Праваслаўнай Царквы. Пасля смерці бацькоў раздаў усю іх маёмасць манастырам, цэрквам і беднякам, а сам пайшоў у манастыр каля Смаленска, дзе вывучаў творы І. Златавуста, Я. Сірына, жыціі святых, займаўся зборам і перапісваннем кніг. Дапамагаў камплектаваць кнігазбор вучылішча ў Смаленску. У 1198 г. прыняў сан прэсвітэра, актыўна займаўся прапаведніцкай працай. Аздабляў храм Крыжаўзвіжанскага манастыра ў Смаленску, намаляваў для яго 2 іконы. Заклікаў людзей няўхільна прытрымлівацца маральных прынцыпаў хрысціянства, клапаціцца пра духоўнае ўдасканаленне. За актыўнае прапаведніцтва і ўзорнае жыццё быў кананізаваны Рускай Праваслаўнай Царквой у XVI ст. Яго вучань манах Яфрэм напісаў “Жыціе прападобнага Аўрамія Смаленскага”, якое вядома па спісах XVI–XVII стст.

**Богша Лазар** (XII ст.) – майстар-ювелір, рамеснік. У 1161 г. для Спаса-Праабражэнскай царквы ў Полацку стварыў шэдэўр старажытнаславянскага мастацтва – напрастольны крыж Е. Полацкай. Яго імя і мянушка вядомы з надпісу, пакінутага ім на адваротным баку крыжа.

**Іаан** (XII ст.) – дойлід. Магчыма, быў манахам аднаго з полацкіх манастыроў, кіраўніком будаўнічых арцеляў. Пабудаваў паміж 1128 і пачаткам 1140-х гг. (паводле іншых звестак – паміж 1152 і 1161 гг.) па замове Е. Полацкай Спаса-Праабражэнскую царкву Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. Ім таксама ўзведзены Барысаглебская і Пятніцкая цэрквы Бельчыцкага манастыра ў Полацку.

**Еўфрасіння (Ефрасіння) Полацкая** (свецкае імя – **Прадслава)** (каля 1101 – 1167 ці 1173) – асветніца, ігумення Спаса-Прэабражэнскага манастыра ў Полацку, мецэнатка. Святая Беларускай Праваслаўнай Царквы. З дынастыі полацкіх князёў – была дачкой Святаслава-Георгія, унучкай Усяслава Брачыславіча (Чарадзея). Яе клопатамі папаўнялася бібліятэка Сафійскага сабора і вялося полацкае летапісанне. У храмавым скрыпторыі перапісвала і, магчыма, перакладала кнігі. Заснавала жаночы Спаса-Прэабражэнскі манастыр і мужчынскі манастыр Св. Багародзіцы, якія сталі цэнтрамі хрысціянства і асветы ў Полацкім княстве – пры іх працавалі школы для дзяцей розных саслоўяў, бібліятэкі, скрыпторыі, магчыма, іканапісная і ювелірная майстэрні. З’яўляецца пачынальніцай традыцыі мецэнацтва на Беларусі. Па заказу Е. Полацкай і на яе сродкі дойлід Іаан пабудаваў Спаса-Прэабражэнскую царкву і царкву Св. Багародзіцы. Таксама па яе заказу майстрам-ювелірам Л. Богшай быў

створаны ў 1161 г. напрастольны крыж – унікальны шэдэўр старажытнабеларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (страчаны, яго падабенства было зроблена ў 1997 г. мастаком М. Кузьмічом). Па заказу Е. Полацкай была прывезена з Візантыі ікона Маці Боскай Адзігітрыі Эфескай. Сама Еўфрасіння складала і, магчыма, запісвала малітвы і дыдактычныя пропаведзі. Памерла ў час паломніцтва ў Іерусалім, дзе была пахавана ў манастыры Св. Феадосія. У 1178 г. была перапахавана ў Кіева-Пячэрскай лаўры. У 1910 г. яе мошчы былі ўрачыста перавезены ў Полацк. Яны былі ўскрыты ў 1919 г., выстаўляліся на атэістычнай выставе ў Маскве, экспанаваліся ў Віцебскім краязнаўчым музеі, у 1943 г. вернуты ў Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр у Полацку, дзе і знаходзяцца цяпер. Страчаная ў 1920-я гг. сярэбраная рака для мошчаў Е. Полацкай была адноўлена мастаком М. Кузьмічом у 2007 г.

Асноўнай крыніцай пра жыццё і дзейнасць Е. Полацкай з'яўляецца "Жыціе Ефрасінні Полацкай" (канец XII – XIII ст.) невядомага аўтара. У ім адзначана, што яна была "яко луна солнечная, просветившая землю Полотскую". У гэтым творы сцвярджаецца неабходнасць ведаў, любові да кнігі, ідэя духоўнага ўдасканалення, праслаўляецца падзвіжніцтва асветніцы, яе самаадданае служэнне вышэйшым маральным ідэалам.

Царкоўнае шанаванне Еўфрасінні ў Полацкім княстве пачалося ўжо ў канцы XII ст. Яна стала першай жанчынай на Русі, кананізаванай Праваслаўнай Царквой. Захаваліся царкоўныя спевы аб Е. Полацкай у спісах XVI–XVIII стст. Е. Полацкая ў 1984 г. была залічана да беларускіх святых. Дзень яе памяці адзначаецца 5 чэрвеня. У свядомасці як праваслаўных, так і каталікаў Св. Е. Полацкая стала апякункай і нябеснай заступніцай беларускіх зямель. Храмы, асвечаныя ў гонар Св. Е. Полацкай, знаходзяцца ў Беларусі, Расіі, ЗША, Канадзе, Вялікабрытаніі, Літве. У 1998 г. Сінод Беларускай Праваслаўнай Царквы зацвердзіў ордэн Крыжа Прападобнай Еўфрасінні Полацкай. Вобраз асветніцы з'яўляецца папулярным у беларускай літаратуры, мастацтве.

**Кірыла Тураўскі** (каля 1110 – каля 1182) – царкоўны дзеяч, пісьменнік, асветнік. Святы Беларускай Праваслаўнай Царквы. Быў манахам, тураўскім епіскапам. Праславіўся як прапаведнік, выдатны майстар урачыстага царкоўнага красамоўства, якога сучаснікі называлі "вторым Златоустом … воссиявшим паче всех на Руси". К. Тураўскі ў сваёй літаратурнай дзейнасці абапіраўся на лепшыя традыцыі антычнай і візантыйскай аратарскай прозы. Асноўныя творы тураўскага асветніка пералічаны ў яго кароткім жыціі. Творчая спадчына К. Тураўскага даволі значная: яму належаць да 70 вядомых зараз царкоўна-асветніцкіх і літаратурных твораў. Захаваліся яго 8 "слоў"-казанняў, 2 прытчы пра душу і цела, альбо пра сляпога і кульгавага (кароткая і поўная рэдакцыі),

2 казанні пра манаскі чын і анёльскі вобраз, 2 пасланні да ігумена Пячэрскага Васіля, 2 каноны і каля 30 спавядальных малітваў, дзе з найбольшай глыбінёй выявілася асоба пісьменніка, яго духоўныя перажыванні. У сваіх казаннях і іншых творах горача выступаў за маральна-духоўнае самаўдасканаленне людзей.

Творы К. Тураўскага складаюць залаты фонд старажытнаславянскай літаратуры. На працягу стагоддзяў яны карысталіся вялікай папулярнасцю на ўсходнеславянскіх землях, распаўсюджваліся ў спісах XII–XVII стст. Творчасць К. Тураўскага аказала ўплыў на развіццё духоўнасці і мастацкай культуры на Беларусі. Ф. Скарына змясціў 3 малітвы К. Тураўскага (без назвы аўтара) у “Малой падарожнай кніжцы” (1522 г.), а І. Фёдараў і П. Мсціславец – яго “Слова на Узнясенне” у “Евангеллі вучыцельным” (1569 г.). З XIX ст. пачалася паўнацэнная публікацыя яго твораў, іх вывучэнне філолагамі, багасловамі. Мясцовае царкоўнае ганараванне К. Тураўскага пачалося, магчыма, адразу пасля яго смерці, у пачатку XIII ст. яго шанавалі святым.

**Клімент (Клім) Смаляціч** (? – пасля 1164) – праваслаўны дзеяч, мысліцель, пісьменнік. Быў манахам, кіеўскім мітрапалітам (1148–1155 гг.). Актыўна агітаваў за царкоўную аўтакефалію. Добра ведаў антычную і візантыйскую літаратуру, багаслоўе, філасофію, меў здольнасці прамоўцы, настаўніка і пісьменніка. Выступаў за развіццё ўсходнеславянскай культуры. У Іпацьеўскім летапісе названы кніжнікам і філосафам, “якіх на Русі не было яшчэ”. Праводзіў шырокую перапіску з праціўнікамі і аднадумцамі. Захаваўся адзіны літаратурны твор К. Смаляціча – “Пасланне прэсвітэру Фаме” (перароблены ў XIV ст. манахам Афанасіем). У гэтым творы, разглядаючы тэарэтычныя пытанні, К. Смаляціч абвяргаў высунутыя супраць яго абвінавачванні, прыводзіў аргументы ў абарону свайго права кіраваць царквой. Ён разважаў пра межы інтэрпрэтацыі Свяшчэннага Пісання, развіваў антрапацэнтрычныя ідэі, падкрэсліваў духоўна-маральную прыроду чалавека. У яго светапоглядзе пераважалі ідэі пакорлівасці, аскетычнасці, зварот да духоўнага і непрыняцце матэрыяльнага. Гэты твор стаў узорам палемічнага паслання і павучальнай пропаведзі. Творчасць К. Смаляціча паўплывала на старабеларускую палемічную публіцыстыку XVI–XVII стст.

## Тэма 3. Культура беларускіх земель у другой палове XIII–XV ст.

***Агульная характарыстыка.*** Узнікненне і станаўленне ВКЛ у складаных геапалітычных абставінах, знешняя пагроза (асабліва з боку крыжакоў) прадвызначылі пераважнае развіццё ў другой палове XIII – XV ст. абарончага дойлідства. Адначасова разгортваўся працэс фарміравання

беларускай народнасці, у межах якога складваліся спецыфічныя рысы яе матэрыяльнай і духоўнай культуры, адбывалася станаўленне старабеларускай ("рускай") мовы, якая шырока выкарыстоўвалася ў дзяржаўным справаводстве (у граматах, прывілеях, пастановах соймаў, паноў-рады і інш.), грамадскім жыцці, літаратуры (у рукапісных кнігах, летапісах і інш.), міжэтнічных кантактах. Больш высокі ўзровень грамадска-культурнага развіцця беларускіх зямель забяспечыў вядучую ролю іх культуры ў поліэтнічным грамадстве ВКЛ.

У культурным жыцці, якое было цесна звязана з царквой, важнай састаўной часткай з'яўляліся старажытныя ўсходнеславянскія традыцыі, каштоўнасці візантыйскай і старажытнарускай культур. Буйныя праваслаўныя манастыры і храмы з'яўляліся цэнтрамі кніжнай пісьменнасці, там існавалі бібліятэкі. Такімі ж цэнтрамі пісьменства былі двары магнатаў. Пры гэтым пачаў распаўсюджвацца ўплыў заходнееўрапейскай культуры. Пасля Крэўскай уніі 1385 г. было разгорнута будаўніцтва касцёлаў, пашырылася каталіцкая асвета. Усё больш шырока пранікала заходнееўрапейская культура ў побыт насельніцтва, асабліва ў гарадах. У дойлідстве і выяўленчым мастацтве пашыраліся раманскі і гатычны стылі. Актыўна ішло засваенне навацый у фартыфікацыі, узбраеннях.

Культура Беларусі ў другой палове XIII – XV ст. характарызуецца арганічным злучэннем і творчай пераапрацоўкай візантыйскіх, старажытнарускіх вытокаў, заходнееўрапейскіх уплываў у цеснай узаемасувязі з народнай (этнаграфічна-фальклорнай) спадчынай, культурай літоўскага, украінскага і іншых народаў у межах ВКЛ.

Пасля Грунвальдскай бітвы 1410 г. склаліся больш спрыяльныя ўмовы для стваральнай і творчай працы. Назіралася актыўнае развіццё гарадоў як гандлёва-рамесніцкіх і культурных цэнтраў. Асабліва вылучаліся Навагрудак, Полацк, Віцебск, Магілёў, Слуцк, Брэст, Гродна, Мінск і іншыя беларускія гарады.

***Рукапісная кніга і летапісанне.*** Працэс аб'яднання беларускіх зямель у складзе ВКЛ, фарміраванне беларускай народнасці, багатыя традыцыі старажытнарускай кніжнай культуры садзейнічалі развіццю пісьменства. Сярод шэдэўраў старажытнабеларускіх рукапісных кніг другой паловы XIII – XV ст. трэба назваць Друцкае, Лаўрышаўскае, Мсціжскае, Жыровіцкае Евангеллі, Смаленскі (Анежскі) Псалтыр. Друцкае Евангелле (канец XIV – пачатак XV ст.), якое знаходзілася ў Багародзіцкай царкве ў Друцку (Талачынскі раён), а пазней у Вільні, напісана на царкоўнаславянскай мове ўставам на 188 аркушах пергаменту, аздоблена застаўкамі і ініцыяламі. Цяпер захоўваецца ў Дзяржаўнай публічнай навукова-тэхнічнай бібліятэцы Сібірскага аддзялення РАН у Новасібірску (Расія). У Беларусі ў 2001 г. з'явілася факсімільнае выданне Друцкага Евангелля. Лаўрышаўскае

Евангелле (пачатак XIV ст.) было напісана на царкоўнаславянскай мове (прысутнічаюць надпісы на старабеларускай мове) уставам на 183 аркушах пергаменту для Успенскай царквы Лаўрышаўскага манастыра каля Навагрудка. У 1887 г. кніга адрэстаўравана, зараз захоўваецца ў бібліятэцы князёў Чартарыйскіх у Кракаве (Польшча). Мсціжскае Евангелле (XIV ст.) напісана на царкоўнаславянскай мове паўуставам на 187 аркушах пергаменту, утрымлівае адну застаўку і каля 350 ініцыялаў у тэраталагічным стылі. Як сведчаць фундушавыя запісы, мінскі бурмістр В. Лях ахвяраваў яго Юр’еўскай царкве ў Мсціжы (Барысаўскі раён). Цяпер Мсціжскае Евангелле зберагаецца ў бібліятэцы АН Літвы ў Вільнюсе. Там жа захоўваецца і Жыровіцкае Евангелле (Евангелле Сапегі) XV ст. (да сярэдзіны XIX ст. было ў Жыровіцкім Успенскім манастыры), напісанае ўставам на 404 аркушах, утрымлівае фундушавыя запісы Л. Сапегі. Смаленскі (Анежскі) Псалтыр (канец XIV ст.) паходзіць з Мсціслаўскага Пустынскага Успенскага манастыра. Напісаны на пергаменце Л. Смаляніным па заказе манаха Аляксея. Твор змяшчае 3 мініяцюры, 22 застаўкі, 150 ініцыялаў з мудрагелістым плеценым арнаментам, выявамі людзей, жывёл і пачвар. У 1657 г. рукапіс па загаду патрыярха Нікана быў вывезены ў манастыр на востраве Кій Анежскай губы Белага мора. Цяпер помнік захоўваецца ў Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве. Акрамя рэлігійнай літаратуры, пашыралася свецкае дзелавое пісьменства, чаму спрыяла выкарыстанне старабеларускай мовы ў якасці дзяржаўнай у ВКЛ.

Значны ўклад у пісьменнасць у другой палове XIV – XV ст. унеслі выхадцы з паўднёваславянскіх зямель – мітрапаліты Кіпрыян і Грыгорый I Цамблак. Кіпрыян з’яўляецца аўтарам многіх грамат, лістоў і пасланняў, шэрагу літаратурных твораў (канонаў, малітваў), перакладаў з грэчаскай мовы, богаслужэбных кніг і інш. Найбольш значныя творы аратарскай прозы належаць Грыгорыю I Цамблаку. Яго ўрачыстыя словы-пропаведзі напісаны ў стылі “пляценне славес”. Аўтар “Надмагільнага слова мітрапаліту Кіпрыяну” (1409 г.), “Пахвальнага слова Яўфімію Тырнаўскаму” (1416–1417 гг.) і цэлага шэрагу іншых прац. Творы напісаны вобразнай мовай, багатыя метафарамі, параўнаннямі, рознымі складанымі фігурамі. Літаратурная спадчына Г. Цамблака была добра вядома на ўсходнеславянскіх землях.

У “Хаджэнні ў Царград і Іерусалім” (канец XIV – пачатак XV ст.), напісаным смаленскім дзякам Ігнаціем, перапляліся традыцыі паломніцкай літаратуры і летапіснага стылю.

Адбывалася паступовая дэмакратызацыя і беларусізацыя царкоўнаславянскай мовы, значнае звужэнне сферы яе пісьмовага выкарыстання. Працягвалася традыцыя летапісання. Калі ў XII–XIV стст. летапісы мелі пераважна мясцовы характар, то з пачатку XV ст. ствараліся агульнадзяржаўныя летапісы і летапісныя зводы – “Летапісец вялікіх князёў

літоўскіх” (першая трэць XV ст.), Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г. і інш. “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх” напісаны на старабеларускай мове невядомым аўтарам у канцы 1420-х гг. у Смаленску. Асноўным яго зместам з’яўляецца палітычная гісторыя ВКЛ ад смерці Гедзіміна ў 1341 г. да канца XIV ст., а галоўная ідэя – усхваленне цэнтралізатарскай палітыкі вялікіх князёў, абгрунтаванне гістарычнай неабходнасці і заканамернасці палітычнага аб’яднання ў ВКЛ літоўскіх, беларускіх і ўкраінскіх зямель. Гэты помнік летапісання захаваўся ў розных спісах, летапісных зводах і гістарычных кампіляцыях. Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г. з’яўляецца першым агульнадзяржаўным летапісным зводам ВКЛ. Храналагічна ахоплівае перыяд ад сярэдзіны IX да сярэдзіны XV ст. Палітычная гісторыя Літвы, Беларусі, часткова Украіны XIV – першай паловы XV ст. выкладаецца ў цеснай узаемасувязі з гісторыяй Расіі і Кіеўскай Русі. Большасць звестак беларуска-літоўскай часткі летапісу не паўтараецца ў іншых гістарычных крыніцах. У летапісным зводзе праводзіцца ідэя гістарычнага адзінства ўсходніх славян, абгрунтоўваецца заканамернасць іх палітычнага аб’яднання ў межах ВКЛ. Першапачатковая рэдакцыя летапісу не захавалася. Зберaглася 2-я рэдакцыя 1490-х гг. (у складзе Нікіфараўскага, Супрасльскага, Акадэмічнага летапісаў), 3-я, скарочаная (у Слуцкім летапісе).

У XIV–XV стст. назіраўся заняпад агіяграфічнай (жыційнай) літаратуры. Адначасова пашыралася перакладная літаратура рэлігійнага характару. У другой палове XV ст. была перакладзена з лацінскай мовы на старабеларускую “Аповесць пра трох каралёў” (XIV ст.). Пераклад зроблены на высокім узроўні, тэкст не ўтрымлівае царкоўнаславянізмаў. На Беларусі ў XV ст. быў перакладзены паўднёваславянскі варыянт “Александрыі”, помніка сусветнай літаратуры, прыгодніцкага рамана пра жыццё, паходы і подзвігі А. Македонскага. У “Жыціі Аляксея, чалавека Божага”, перакладзеным у канцы XV ст. з лацінскай мовы (з выкарыстаннем чэшскіх крыніц), шырока адлюстраваны асаблівасці тагачаснай беларускай народнай гаворкі. Высокай дакладнасцю і мастацкай дасканаласцю вылучаўся пераклад канца XV ст. з лацінскай мовы (з выкарыстаннем польскіх і чэшскіх крыніц) легендарна-апакрыфічнай аповесці пра І. Хрыста – “Страсці Хрыстовы”.

***Дойлідства.*** Асаблівасцямі дойлідства на беларускіх землях у разглядаемы перыяд з’яўляюцца наступныя: мела пераважна абарончы характар; пашырэнне замкавага будаўніцтва; спалучэнне ў культавых пабудовах рыс культавага і абарончага дойлідства; выпрацоўка ўласнага стылявога напрамку ў архітэктуры XV – першай трэці XVI ст. – беларускай готыкі, якая гарманічна спалучала рысы готыкі і рэнесансу, традыцыі візантыйскага і старажытнарускага дойлідства, што надало мясцовым архітэктурным помнікам непаўторны каларыт і мастацкую каштоўнасць

(Троіцкі касцёл у Ішкалдзі, цэрквы-крэпасці ў Сынкавічах, Мураванцы, Мірскі замак і інш.).

У абарончым дойлідстве Беларусі з XIII ст. пашыраліся данжоны – асобна размешчаныя шмат’ярусныя ўмацаваныя вежы (прамавугольныя ці круглыя ў плане). Данжоны валынскага тыпу (“стаўпы”) існавалі ў Бярэсці (Брэсце), Камянцы, Тураве, Навагрудку, Гародні (Гродне). Да сучаснасці ўцалела толькі Камянецкая вежа-данжон, пабудаваная паміж 1276 і 1288 гг. дойлідам Алексам па загаду валынскага князя Уладзіміра Васількавіча. Вежа размяшчалася ўнутры кальцавога вала і даміравала над драўлянымі ўмацаваннямі. Вышыня 5-яруснай вежы, узведзенай з цэглы, складала каля 30 м, таўшчыня сцен – 2,5 м, знешні дыяметр – 13,6 м. Зверху вежы знаходзілася баявая пляцоўка, акружаная 14 зубцамі, што мелі скразную адтуліну.

У другой палове XIII – XV стст. асноўным тыпам манументальных абарончых збудаванняў сталі вялікакняжацкія замкі. Можна выдзеліць 2 асноўныя тыпы замкаў: 1) замкі нерэгулярнага тыпу (мелі развітую сістэму абарончых збудаванняў, складаную аб’ёмна-прасторавую кампазіцыю, звычайна размяшчаліся на натуральных узвышшах, прыстасоўваліся да рэльефу) – Верхні і Ніжні замкі ў Вільні, Навагрудскі замак, Стары замак у Гродне і інш.; 2) кастэлі – мураваныя замкі рэгулярнага тыпу, звычайна прамавугольныя ў плане з 1–2 вежамі, якія ўзводзіліся ў цяжкадаступным месцы, на штучных насыпах, вакол іх былі равы і земляныя валы – замкі ў Коўне (цяпер – Каўнас), Медніках (зараз – Мядзінінкай) на тэрыторыі сучаснай Літвы, у Лідзе, Крэве (Смаргонскі раён) і інш. Сярод замкаў-кастэляў вылучаліся канвентгаўзы з комплексам жылых, культавых, гаспадарчых пабудоў, якія былі згрупаваны вакол невялікага ўнутранага двара і мелі абарончыя ўмацаванні на знешнім перыметры. Першым з іх быў замак у Троках на востраве возера Гальве (канец XIV – першая палова XV ст.). Спачатку замкі былі драўляныя, у XIV ст. пачалі ўзводзіць поўнасцю мураваныя замкі. Для замкавага дойлідства характэрны архітэктурныя формы, канструкцыі і будаўнічая тэхніка гатычнага стылю. Замкі (асабліва кастэлі) выконвалі абарончыя, адміністрацыйна-гаспадарчыя, рэпрэзентатыўныя функцыі.

У Гродне на высокім правым беразе Нёмана, які злучаўся з ракой Гараднічанкай, замест сцяны і вежаў, узведзеных у XII ст., але пазней разбураных і замененых драўлянымі, у канцы XIV – пачатку XV ст. быў узведзены замак няправільнай 3-вугольнай формы. Таўшчыня сцен, пабудаваных з валуноў і буйнапамернай брусковай цэглы, складала 2,5–3 м. У замку было 5 вежаў, з іх 4 квадратныя і адна круглая ў плане (вежа-“стоўп” XIII ст). Паміж 2-мя вежамі знаходзіўся 2-павярховы палац вялікага князя

Вітаўта. У 70–80-я гг. XVI ст. Стары замак у Гродне быў перабудаваны ў рэнесансавым стылі.

Навагрудскі замак прайшоў складаны шлях развіцця ад простых умацаванняў (востракол і інш.) да шматвежавага мураванага замка. Замак у Навагрудку ўзводзіўся на месцы дзядзінца, дзе ўмацаванні існавалі яшчэ з XI ст. У канцы XIV – пачатку XV ст. для абароны ад нападаў крыжаносцаў на Замкавай гары будаваліся мураваныя вежы і сцены. У канцы XV – пачатку XVI ст. перад пагрозай набегаў крымскіх татараў замак быў сур’ёзна адрамантаваны і дадаткова ўмацаваны. У XVI ст. замак стаў самым магутным абарончым збудаваннем на Беларусі – меў 7 вежаў (Шчытоўку, Касцельную, Малую браму, Калодзежную, Пасадскую, Дазорцу і Мескую), якія былі злучаны паміж сабой мураванымі сценамі таўшчынёй 2 м і вышынёй да 8 м. Аднак у XVII–XVIII стст. Навагрудскі замак атрымаў моцныя пашкоджанні ў час шматлікіх войн. Да сучаснасці дайшлі руіны 2-х вежаў – Шчытоўкі і Касцельнай. У 2014 г. праведзена кансервацыя Касцельнай вежы.

Адным з першых мураваных замкаў-кастэляў ВКЛ быў замак у Крэве (XIV ст.). Крэўскі замак узведзены ў забалочанай нізіне каля месца ўпадзення ракі Шляхцянкі ў Крэвянку. Замак у плане меў няправільную трапецыю (85х108,5х71,5х97,2 м), абнесеную мураванымі сценамі таўшчынёй 2,5 м і вышынёй 12–13 м. Сцены завяршаліся баявой галерэяй. Каля паўночна-заходняга вугла замка звонку была пабудавана Княжацкая вежа-данжон вышынёй 25 м, у паўднёва-ўсходнім унутраным куце замка – Малая вежа. З замкам звязаны значныя палітычныя падзеі – там знаходзіўся ў зняволенні і быў забіты князь Кейстут, заключана ў 1385 г. унія паміж ВКЛ і Польшчай. Замак быў разбураны ў наступныя стагоддзі, асабліва моцныя знішчэнні напаткалі яго ў час Першай сусветнай вайны. Цяпер праводзіцца кансервацыя руін замка.

Будаўніцтва Лідскага замка было пачата ў 30-я гг. XIV ст. Замак будаваўся з бутавага каменю і цэглы на насыпным пясчаным узгорку, акружаным берагамі рэк Лідзея і Каменка і ровам, які злучаў гэтыя рэкі з поўдня і аддзяляў замак ад горада. Замак у плане ўяўляе няправільны 4-вугольнік (93,5х83,5х80х84 м) з 2 вуглавымі вежамі. Асноўнае абарончае значэнне мелі сцены вышынёй 12 м, таўшчынёй 2 м унізе і 1,5 м уверсе. У кампазіцыі Лідскага замка адчуваецца ўплыў раманскай архітэктуры і готыкі. За сваю гісторыю Лідскі замак вытрымаў мноства аблог. У XVIII ст. ён страціў сваё стратэгічнае значэнне і пачаў паступова разбурацца. Маштабная рэстаўрацыя Лідскага замка праведзена ў 2010 г.

З XV ст. готыка пашырылася у культавым дойлідстве Беларусі. У трэцяй чвэрці XV ст. на сродкі М. Неміровіча быў пабудаваны Троіцкі касцёл у мястэчку Ішкалдзь (Баранавіцкі раён). Звонку кампактны аб’ём храма накрыты высокім 2-схільным дахам, а ўнутры перакрыты зорчатымі

нервюрнымі скляпеннямі. Своеасаблівасць яго архітэктурнаму абліччу надаюць ступенчатыя контрфорсы, якія ўмацоўваюць тоўстыя сцены. У першай палове XV ст. на сродкі Я. Няміры быў узведзены ў гатычным стылі Крыжаўзвіжанскі касцёл у в. Уселюб (Навагрудскі раён). У 1520-я гг. на сродкі Шамятовічаў быў пабудаваны гатычны Міхайлаўскі касцёл у Гнезна (Ваўкавыскі раён).

У канцы XV – пачатку XVI ст. на беларускіх землях узнік арыгінальны тып абарончага храма з 4 вуглавымі вежамі. Першым узорам такіх праваслаўных цэркваў-крэпасцей у ВКЛ стаў Сафійскі сабор у Полацку, які быў перабудаваны ў 1494–1501 гг. (у такім выглядзе заставаўся да 1710 г., калі быў знішчаны выбухам, а ў сярэдзіне XVIII ст. пры аднаўленні набыў рысы віленскага барока). У пачатку XVI ст. на сродкі А. Хадкевіча пры ўдзеле смаленскага епіскапа І. Солтана была пабудавана Дабравешчанская царква як галоўны храм манастыра ў Супраслі (цяпер на тэрыторыі Польшчы). Царква знішчана ў час Другой сусветнай вайны, але адноўлена ў канцы XX ст.

З уцалелых цэркваў-крэпасцей сапраўднымі шэдэўрамі гатычна-рэнесанснай архітэктуры з’яўляюцца Міхайлаўская царква ў Сынкавічах (Зэльвенскі раён), царква Раства Багародзіцы ў Мураванцы (Шчучынскі раён). Сынкавіцкая царква (пачатак XVI ст.) пабудавана з цэглы ў тэхніцы гатычнай муроўкі. У плане ўяўляе сабой крыху перакошаны 4-вугольнік памерам 17,5х13 м з 3 нефамі, па вуглах храм фланкіраваны 4 баявымі вежамі (з захаду – 8-гранныя, з усходу – круглыя). Дах 2-схільны, з вострымі тарцовымі шчытамі. Машыкулі-байніцы ствараюць своеасаблівы фрыз на трох фасадах, уключаючы вежы.

Мураванкаўская царква (пачатак XVI ст.) таксама ўзведзена з цэглы ў тэхніцы гатычнай муроўкі. Уяўляе сабой 4-стаўповае збудаванне зальнага тыпу (у плане – амаль квадрат), завершанае 2-схільным дахам са шчытамі на тарцах, з паўцыркульнай апсідай і 4 круглымі вуглавымі вежамі. Фасады, вежы, франтоны ўпрыгожаны яруснай кампазіцыяй у выглядзе плоскіх атынкаваных арачных нішаў.

У канцы XV – XVI ст. пачалі ўзводзіцца прыватнаўласніцкія замкі. На мяжы XV–XVI стст. быў узведзены канцлерам ВКЛ і віленскім ваяводай А. Гаштольдам замак у Геранёнах (Іўеўскі раён). Аднак ён быў разбураны ў час войн XVII–XVIII стст., прыйшоў у заняпад і не дайшоў да сучаснасці. Найвышэйшым дасягненнем абарончага дойлідства стаў Мірскі замак. Замак у Міры (Карэліцкі раён) пачаў узводзіцца князем Ю. Іллінічам у 1520-я гг. Спачатку замак быў мураванай крэпасцю (у плане ўяўляла сабой блізкі да квадрата 4-вугольнік, утвораны бакамі даўжынёй каля 75 м), абнесенай абарончымі сценамі з 5-яруснымі вежамі па вуглах. 5-я вежа – уязная 6-ярусная вежа-брама – мела пад’ёмны мост, краты (герсу). Па перыметры 4-

вугольніка былі ўзведзены сцены таўшчынёй 2,5 м і вышынёй да 13 м. Замак быў абкружаны землянымі валамі вышынёй каля 10 м і ровам з вадой. Іллінічы не змаглі завяршыць будаўніцтва. З 1568 да 1831 г. уладальнікамі замка былі Радзівілы. У канцы XVI – пачатку XVII ст. пачаўся другі этап будаўніцтва. Па ініцыятыве М.К. Радзівіла Сіроткі замак быў перароблены ў загарадную рэзідэнцыю італьянскага тыпу. Быў узведзены 3-павярховы палац у рэнесансавым стылі, закладзены рэгулярны італьянскі парк. Замак пацярпеў ад войн у XVII–XVIII стст. У XIX ст. яго ўладальнікамі былі Вітгенштэйны, Святаполк-Мірскія (да верасня 1939 г.). У 2000 г. Мірскі замак уключаны ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА як выдатны ўзор цэнтральнаеўрапейскага замка, які адлюстроўвае паступовую змену культурных стыляў (готыкі, рэнесансу, барока), і за нагляднае адлюстраванне ў форме і знешнім выглядзе ансамбля доўгай гісторыі палітычных і культурных супрацьстаянняў і узаемадзеянняў. У 2010 г. у Мірскім замку былі завершаны рэстаўрацыйна-аднаўленчыя працы.

Пасля Грунвальдскай бітвы 1410 г., калі знікла пагроза з боку крыжакоў, гарадская культура ВКЛ канчаткова стала фарміравацца як неад’емная частка заходнееўрапейскай цывілізацыі. З пашырэннем магдэбургскае права на самакіраванне гарадоў іх адміністрацыйныя цэнтры паступова перамяшчаліся на рыначную плошчу, дзе ўзводзіліся ратушы (Віцебск, Мінск, Слонім і інш.), нярэдка разам з гандлёвымі радамі (Нясвіж). Часта захоўвалася суіснаванне ў гарадах рэзідэнцый магнатаў (у замках) і ратуш, рыначных плошчаў.

***Выяўленчае мастацтва.*** У XIV–XV стст. характэрнымі рысамі выяўленчага мастацтва беларускіх зямель з’яўляліся наступныя: развіццё манументальнага жывапісу; працягванне іканапісных традыцый; прыкладны характар мастацтва; распаўсюджванне кніжнай графікі (мініяцюры, застаўкі, ініцыялы ў рукапісных кнігах і летапісах); увядзенне партрэтных выяў у сюжэтныя кампазіцыі манументальных роспісаў і інш. Фарміраванне асобных жанраў беларускага выяўленчага мастацтва праходзіла ў XV–XVI стст.

Буйнымі мастацкімі цэнтрамі на Беларусі з’яўляліся Полацк, Слуцк, Пінск і іншыя гарады. У XIV–XV стст. развіццё іканапісу адбывалася на аснове візантыйскага і старажытнарускага мастацтва. Адзін з першых вядомых цяпер твораў іканапісу XV ст. з’яўляецца ікона “Маці Боская Замілаванне” з Мікалаеўскай царквы ў Маларыце (выканана афінскім жывапісцам Н. Ламбудзісам). Да візантыйскай традыцыі іканапісу належыць ікона XV ст. “Успенне Маці Боскай” (“Блакітнае Успенне”, “Голубое Успение”), якая захоўваецца цяпер у Траццякоўскай галерэі ў Маскве. У расійскім мастацтвазнаўстве яе адносяць да цвярской іканапіснай школы. Паводле беларускага даследчыка А. Ярашэвіча, з XV ст. да 1914–1917 гг.

гэтая ікона знаходзілася на Беларусі (спачатку ў Тураве, з XVI ст. – у Лешчынскім манастыры ў Пінску, з канца XVIII – пачатку XIX ст. – у Мінску, адкуль была вывезена ў Маскву). Ікона аднесена да італа-крыцкай школы А. Рыцаса.

Найбольш раннім узорам раманскага стылю з элементамі ранняй готыкі XIV ст. у манументальным жывапісе з’яўляецца фрэска “Распяцце” ў касцёле Св. Станіслава і Уладзіслава ў Вільні. У адрозненне ад раманска-гатычных помнікаў у праваслаўных храмах (пераважна на тэрыторыі сучаснай усходняй Польшчы) распісваліся скляпенні, сцены паводле візантыйскага канона.

Аб развіцці мясцовых традыцый разьбы сведчаць творы дробнай пластыкі, у якіх працягвалася стылістыка папярэдняга часу: каменныя рэльефныя абразкі з Турава (XIV ст.), цудатворны Жыровіцкі абраз Маці Божай (XV ст.) і інш. У XV – пачатку XVI ст. адным з цэнтраў мастацкай культуры стаў Пінск. Вядомы імёны пінскіх майстроў – мастак Навоша і разьбяр “поп Ананія”, якія выконвалі заказы пінскага князя Фёдара Яраславіча. Ананія стварыў некалькі разных драўляных абразкоў-мініяцюр, сярод якіх “Прамудрасць стварыла сабе храм”.

Выдатнымі прыкладамі тагачаснай кніжнай мініяцюры з’яўляюцца Друцкае, Лаўрышаўскае, Мсціжскае, Жыровіцкае Евангеллі і іншыя рукапісныя кнігі. Лаўрышаўскае Евангелле ўпрыгожана 18 мініяцюрамі з выявамі святых Іаана, Матфея, Лукі, Міхаіла-архангела, Іова, евангельскіх сцэн, застаўкай і ініцыяламі. Жыровіцкае Евангелле багата аздоблена застаўкамі, мініяцюрамі з выявамі евангелістаў, мноствам ініцыялаў. Мініяцюры абведзены шырокімі залачонымі рамкамі, арнаментаванымі геаметрычнымі і раслiннымі ўзорамі.

Шэдэўрамі выяўленчага мастацтва з’яўляюцца мініяцюры Радзівілаўскага (Кёнігсбергскага) летапісу XIII ст. Вядомы яго адзіны ілюстраваны спіс канца XV ст. з 617 каляровымі мініяцюрамі, дзе аллюстраваны ваенныя паходы, бітвы (сярод іх – бітва на Нямізе 1067 г.), паўстанні, палітычная дзейнасць князёў (у тым ліку полацкіх князёў Рагвалода, Усяслава Брачыславіча і інш.), выявы помнікаў архітэктуры, святы і абрады, прадметы побыту, зброя, адзенне і інш. У некаторых мініяцюрах адчуваецца ўплыў заходнееўрапейскіх традыцый. Цяпер рукапіс захоўваецца ў бібліятэцы РАН у Санкт-Пецярбургу. Ён быў надрукаваны ў 38-м томе Поўнага збору рускіх летапісаў (Ленінград, 1989).

У цэлым, у параўнанні з папярэднім часам (IX – першая палова XIII ст.) перыяд другой паловы XIII – XV ст. у культуры беларускіх зямель быў адносна “глухім”, не такім прадстаўнічым на яркія асобы і творы, але менавіта тады праходзіла збіранне сіл для далейшага творчага ўздыму: адбывалася фарміраванне беларускай народнасці з адметнай культурай,

станаўленне старабеларускай мовы, складванне самабытнай гатычнай спадчыны ў архітэктуры і інш.

**Паняцці**

**Аркбутан** – знешняя каменная паўарка, якая з’яўляецца адным з канструктыўных элементаў каменнага каркаса гатычнага сабора. Праз яе ціск скляпенняў галоўнага нефа перадаецца контрфорсам.

**Вітраж** – арнаментаваная ці сюжэтная дэкаратыўная кампазіцыя з кавалачкаў шкла ці іншага матэрыялу, што прапускае святло. Найбольшае распаўсюджанне вітражы атрымалі ў Францыі і Германіі ў X–XII стст. На беларускіх землях яны пачалі шырока выкарыстоўвацца ў готыцы, рэнесансавым стылі, неаготыцы.

**Готыка** – стыль у еўрапейскім мастацтве XII–XV стст. Узнік на аснове народных традыцый германцаў, дасягненняў раманскага дойлідства і хрысціянскага светаўспрымання. Праявіўся ў культавым будаўніцтве, скульптуры, графіцы, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, вітражах. Гатычныя будынкі ўзводзіліся з выкарыстаннем каркаснай сістэмы, у якой скляпенні былі з арачных рэбраў (нервюраў), ціск ад перакрыццяў галоўнага нефа перадаваўся на знешнія апорныя слупы (контрфорсы) праз аркбутаны. Для выяўленчага мастацтва готыкі характэрна падпарадкаванасць вертыкальнаму рытму архітэктурных форм, выцягнутыя прапорцыі, дынамізм, паказ у алегарычнай форме ідэі грахоўнасці чалавека. У мастацтве Беларусі рысы готыкі найбольш адчуваліся ў XV–XVI стст. Стыль готыкі ў беларускай культурнай спадчыне развіваўся ва ўзаемасувязі з візантыйскімі традыцыямі, мастацтвам старажытнабеларускіх княстваў, рэнесансавай культурай.

**Кастэль** – тып абарончай пабудовы (замка), звычайна прамавугольны ў плане з 1–2 вежамі, узводзіўся ў цяжкадаступным месцы. На тэрыторыі Беларусі замкі-кастэлі з’явіліся ў XIII–XIV стст. у нізінных, балоцістых мясцовасцях, сутоках рэк, на штучных насыпах, былі абкружаны равамі і землянымі валамі.

**Контрфорс** – знешні падпорны слуп (каменная цагляная папярэчная сценка ці вертыкальны выступ) знадворку гатычнага будынка для ўзмацнення яго асноўнай нясучай канструкцыі і прыняцця цяжару ад скляпенняў праз аркбутаны.

**Нервюра** – арка з клінападобных чэсаных камянёў, цаглін для падтрымання скляпенняў у будынках гатычнага стылю, перадачы нагрузкі на слупы, патоўшчаныя сцены, аркбутаны, контрфорсы.

**Дзеячы культуры**

**Вітаўт** (1350–1430) – вялікі князь літоўскі (1392–1430 гг.). Утварыў праваслаўную мітраполію ў ВКЛ з цэнтрам у Навагрудку, дзе мітрапалітам стаў Грыгорый І Цамблак. Старабеларуская мова стала афіцыйнай у ВКЛ разам з лацінскай, якая выкарыстоўвалася дыпламатыяй і рымска-каталіцкай царквой.

**Гедзімін (Гедымін)** (каля1275 – 1341) – вялікі князь літоўскі (1316–1341 гг.). Разгарнуў будаўніцтва вялікакняжаскіх замкаў у ВКЛ. Не пазней за 1320 г. заснаваў мураваны замак у Вільні, які стаў галоўнай рэзідэнцыяй вялікага князя. Пры Гедзіміне былі таксама пабудаваны мураваныя замкі ў Медніках, Лідзе, Крэве, Віцебску. Пачалося запазычанне першых элементаў заходнееўрапейскай культуры. У пачатку яго княжання была створана у ВКЛ самастойная Літоўская праваслаўная мітраполія з цэнтрам у Навагрудку (1317–1330 гг.), падпарадкаваная канстанцінопальскаму патрыярху. У 1320-я гг. Гедзімін пабудаваў у Вільні касцёл францысканцаў і аднавіў іх касцёл у Навагрудку, які быў спалены крыжакамі.

**Грыгорый І Цамблак** (свецкае імя – **Гаўрыіл**) (каля 1364 – 1419/1420) – праваслаўны дзеяч, пісьменнік. У 1415 г. быў выбраны кіеўскім мітрапалітам. Рэзідэнцыя Г. Цамблака знаходзілася ў Навагрудку, а мітрапаліцкая кафедра перанесена з Кіева ў Вільню. Праявіў сябе як вучоны кніжнік і прапаведнік. Аўтар больш чым 50 твораў, з якіх захаваліся і вядомы 26, у тым ліку 10 твораў былі напісаны ў час пражывання ў ВКЛ. Гэта пераважна жыціі, пахвальныя словы, святочныя казанні, якія ставяць аўтара ў шэраг славутых дзеячаў царкоўнаславянскай і старабалгарскай культуры. Сярод яго твораў – “Надмагільнае слова мітрапаліту Кіпрыяну”, “Пахвальнае слова Яўфімію Тырнаўскаму” і інш.

**Елісей Лаўрышаўскі** (? – каля 1250) – праваслаўны дзеяч. Святы Беларускай Праваслаўнай Царквы. Заснавальнік і першы ігумен Лаўрышаўскага манастыра каля Навагрудка (паводле Іпацьеўскага летапісу, манастыр заснаваў вялікі князь ВКЛ Войшалк), які быў цэнтрам летапісання на Беларусі – там было створана ў пачатку XIV ст. рукапіснае Лаўрышаўскае Евангелле на царкоўнаславянскай мове (з надпісамі на старабеларускай).

## Тэма 4. Культура эпохі Адраджэння і Рэфармацыі на Беларусі (XVI ст.)

***Агульная характарыстыка.*** Адраджэнне (Рэнесанс) ці гуманістычнае Адраджэнне з’яўляецца пераходнай эпохай ад сярэдневякоўя да Новага часу з XIV да сярэдзіны XVII ст., якая адзначана станаўленнем нацыянальнай мовы і самасвядомасці, гуманістычнага светапогляду, росквітам свецкай навукі, літаратуры, мастацтва. Асноўнымі рысамі агульнаеўрапейскага Адраджэння былі гуманізм і антрапацэнтрызм, мадыфікацыя сярэдневяковай

хрысціянскай традыцыі, адраджэнне антычных помнікаў мастацтва і філасофіі, новыя адносіны да навакольнага свету, свабода асобы. Па тыпалогіі айчыннае Адраджэнне ўваходзіць у Паўночнае Адраджэнне, якое ў адрозненне ад класічнага італьянскага Адраджэння звязана з Рэфармацыяй, нацыянальна-культурным адраджэннем, было ў пэўнай залежнасці ад сярэдневяковых і рэлігійных традыцый. Адметнасцямі айчыннага Адраджэння былі наступныя: пачалося пазней за агульнаеўрапейскае – у XVI ст.; было цесна звязана з хрысціянскім светапоглядам; разгортвалася ва ўмовах узаемаўплыву культур; фарміравалася ў абставінах дыхатаміі “Усход-Захад” – сутыкнення праваслаўна-візантыйскай (старажытнарускай) і лацінска-каталіцкай цывілізацыйных плыняў; культурнае жыццё беларускай народнасці ва ўмовах рэлігійнай, ідэалагічнай і інтэлектуальнай талерантнасці; развівалася на фоне адсутнасці яскравых праяўленняў капіталістычных адносін.

Пашырэнню ідэй Рэнесансу паспрыяла ўзнікненне і інтэнсіўнае развіццё кнігадрукавання. У эпоху Адраджэння актыўна развівалася асвета, пашыраўся інтарэс да антычнай спадчыны. Цэнтрамі культуры Рэнесансу станавіліся гарады. Адбываўся працэс станаўлення старабеларускай мовы, якая атрымала статус дзяржаўнай мовы ў ВКЛ. Тыповыя рысы рэнесанснай культуры выразна праявіліся ў культурна-асветніцкай, творчай дзейнасці Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, С. Буднага, В. Цяпінскага і іншых дзеячаў айчыннага Адраджэння. Адбывалася развіццё літаратуры на старабеларускай, лацінскай і іншых мовах, філасофскай і грамадска-палітычнай думкі. Паспяхова развівалася архітэктура, выяўленчае мастацтва (асабліва іканапіс). Шэдэўрамі прававой культуры былі Статуты ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг.

У Еўропе ў XVI ст. разгарнулася Рэфармацыя – шырокі рэлігійна-ідэалагічны і сацыяльна-палітычны антыфеадальны рух, нацэлены на перабудову і выпраўленне рымска-каталіцкай царквы, які прывёў да ўтварэння пратэстантызму. У сярэдзіне XVI ст. пачалі ўзнікаць пратэстанцкія абшчыны ў розных гарадах Беларусі – у Брэсце, Нясвіжы, Клецку, Навагрудку і інш. Да Рэфармацыі далучыліся магнаты (Радзівілы, Сапегі, Хадкевічы, Кішкі і інш.), шляхта, частка мяшчан. Асаблівасцямі Рэфармацыі на беларускіх землях сталі наступныя: не набыла народнага характару, ахапіла толькі вышэйшыя саслоўі; не мела адзінай рэлігійнай тэорыі, рэфармацыйны рух распаўся на шматлікія секты; асноўнай ідэалагічнай формай быў кальвінізм; распаўсюджанне антытрынітарызму (адмаўленне догмату Троіцы) і інш. Віднымі дзеячамі Рэфармацыі былі М. Радзівіл Чорны, Л. Сапега, С. Будны, В. Цяпінскі і інш.

***Кнігадрукаванне***. Першадрукаром усходнеславянскіх народаў з’яўляецца Ф. Скарына, які надрукаваў 6 жніўня 1517 г. у Празе першую кнігу – “Псалтыр”. З 1517 па 1519 г. ім надрукаваны там яшчэ 22 кнігі Бібліі.

Пазней Ф. Скарына заснаваў у Вільні першую ва Усходняй Еўропе друкарню, дзе выдаў “Малую падарожную кніжку” (1522 г.), “Апостал” (1525 г.). Цяпер уцалелыя кнігі айчыннага першадрукара раскіданы па ўсяму свету. Адзіная ў Рэспубліцы Беларусь калекцыя выданняў Ф. Скарыны (10 фрагментаў кніг Біблii) захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Кнігавыдавецкая дзейнасць Ф. Скарыны мела гуманістычны, культурна-асветніцкі і патрыятычны характар. Кнігі Ф. Скарыны складалі 2/3 усіх выданняў кірыліцай у свеце за XV – першую чвэрць XVI ст. Высокі ўзровень паліграфічнага афармлення яго выданняў аказаў значны ўплыў на далейшае развіццё кірылічнага кнігадрукавання ў ВКЛ і за яго межамі. У Беларусі ў 1969 г. былі надрукаваны “Прадмовы і пасляслоўі” Ф. Скарыны, у 1990–1991 гг. – факсімільнае выданне яго “Біблii” ў 3-х тамах, а ў 2014 г. пачаўся выпуск факсімільнага выдання поўнага збору кніг Ф. Скарыны.

З сярэдзіны XVI ст. на беларускіх землях ствараліся прыватныя друкарні, уладальнікамі якіх былі буйныя магнаты (М. Радзівіл Чорны, А. Валовіч, Р. Хадкевіч, К. Астрожскі), прадстаўнікі шляхты і мяшчан (К. і Л. Мамонічы, М. Кавячынскі, Я. Кішка, В. Гарабурда і інш.). У 1553 г. для прапаганды рэфармацыйных ідэй М. Радзівіл Чорны заснаваў у Брэсце першую на тэрыторыі сучаснай Беларусі друкарню, дзе працавалі друкары Б. Ваяводка (1553–1554 гг.), С. Мурмеліус (1558–1560-я гг.), Ц. Базылік (1560–1570-я гг.). Найбольшага росквіту друкарня ў Брэсце дасягнула пад кіраўніцтвам Ц. Базыліка – больш за 40 выданняў рознага зместу на польскай і лацінскай мовах. У 1558 г. там выйшаў першы ў ВКЛ друкаваны нотны зборнік “Песні хвал боскіх” Я. Зарэмбы. У 1563 г. у Брэсце на сродкі М. Радзівіла Чорнага была надрукавана польскамоўная Берасцейская (Брэсцкая) Біблія (Радзівілаўская Біблія). Яе поўная назва – “Біблія святая, гэта значыць Кніга Старога і Новага запаветаў з яўрэйскай, грэчаскай і лацінскай нанава на польскую мову са стараннасцю і дакладна перакладзеная”. У выданні змешчаны поўны тэкст Старога і Новага запаветаў Біблii. У той час Брэсцкая Біблія была адным з лепшых выданняў у ВКЛ і Польшчы. Цяпер у свеце засталося ўсяго 40 экзэмпляраў знакамітага фаліянта. У Рэспубліцы Беларусь няпоўны экзэмпляр Брэсцкай Біблii захоўваецца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі ў Мінску, фрагмент кнігі – у Брэсцкай абласной бібліятэцы імя М. Горкага. У 2003 г. у Кракаве з’явілася сучаснае выданне Брэсцкай Біблii. У 1575 г. М.К. Радзівіл Сіротка перавёз абсталяванне былой пратэстанцкай друкарні з Брэста ў Вільню, дзе яна перададзена езуіцкаму калегіуму.

Пры падтрымцы М. Радзівіла Чорнага дзейнічала ў 1560-я гг. у Нясвіжы першая на тэрыторыі сучаснай Беларусі друкарня, якая карысталася кірылаўскімі шрыфтамі. Яе заснавалі М. Кавячынскі і Л. Крышкоўскі, ідэйным кіраўніком у першыя гады яе існавання быў С. Будны. У 1562 г. там

выдадзены творы С. Буднага – “Катэхізіс” (першая на Беларусі друкаваная кніга на старабеларускай мове; у свеце захаваліся адзінкі экзэмпляраў, аднак арыгінала няма ў Рэспубліцы Беларусь, у 2005 г. перавыдадзена ў Мінску), “Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам” (не захавалася). Друкарня спыніла сваю дзейнасць паводле загаду М.К. Радзівіла Сіроткі. Маёмасць друкарні ў 1572 г. купіў Я. Кішка, які заснаваў друкарню ў сваім замку ў Лоску (Валожынскі раён). У другой палове XVI ст. Лоская друкарня была цэнтрам арыянскага кнігадрукавання ў ВКЛ. Там працавалі друкары Д. Ланчыцкі, Я. Карцан, Ф. Балямоўскі, ідэйным кіраўніком у 1570-я – пачатку 1580-х гг. з’яўляўся С. Будны.

У маёнтку Р. Хадкевіча ў Заблудаве (цяпер на тэрыторыі Польшчы) рускімі першадрукарамі І. Фёдаравым і П. Мсціслаўцам, якія перасяліліся з Масквы ў ВКЛ, была заснавана друкарня (1568–1570 гг.). Там былі выдадзены “Евангелле вучыцельнае” (1569 г.), “Псалтыр з Часаслоўцам” (1570 г.). Яшчэ адзін дзеяч Адраджэння – В. Цяпінскі – у 1570-я гг. пераклаў і выдаў Евангелле на царкоўнаславянскай і старабеларускай мовах.

У канцы XVI – пачатку XVII ст. дзейнічала ў Вільні друкарня купцоў К. і Л. Мамонічаў. Там П. Мсціславец выдаў “Часоўнік” (1574–1576 гг.), “Евангелле напрастольнае” (1575 г.), “Псалтыр” (1576 г.). Дзякуючы прывілеям Л. Сапегі, Мамонічы манапалізавалі выданне кніг на старабеларускай і царкоўнаславянскай мовах. Значная частка кніжнай прадукцыі друкарні прызначалася на патрэбы праваслаўных брацкіх школ, царквы, мяшчан. Друкарня Мамонічаў была адзінай друкарняй, якая выпускала юрыдычную літаратуру. Сярод яе выданняў прававога характару быў Статут ВКЛ 1588 г. на старабеларускай мове, а ў 1614 г. – па-польску.

Каля 1578 г. на сродкі К. Астрожскага І. Фёдаравым была заснавана друкарня ў Астрогу (Ровенская вобласць Украіны). У 1581 г. там з’явілася Астрожская Біблія – гэта першы поўны і лепшы для свайго часу пераклад Бібліі на царкоўнаславянскую мову. Астрожская Біблія сыграла важную ролю ў праваслаўнай асвеце і адукацыі. На яе арыентаваўся пры складванні “Граматыкі” (1619 г.) М. Сматрыцкі.

Усяго за час існавання ВКЛ у ім дзейнічала 36 друкарняў, прадукцыя якіх задавальняла дзяржаўныя і грамадскія інтарэсы, патрэбнасці розных этнічных і канфесійных груп насельніцтва.

***Літаратура.*** У эпоху Адраджэння можна адзначыць высокі ўзровень дасканаласці старабеларускай мовы. У літаратуры з’явіліся новыя віды і жанры: гісторыка-мемуарны, драматургія, кніжная паэзія, рэфармацыйная публіцыстыка і інш. Літаратура характарызавалася шматмоўнасцю – творы пісаліся і друкаваліся на старабеларускай, царкоўнаславянскай, польскай, лацінскай, старажытнарускай мовах. На старабеларускай (народна-дыялектнай) мове, але арабскім пісьмом, былі напісаны кітабы – рукапісныя

зборнікі мясцовых татараў. У 50–70-я гг. XVI ст. на развіццё літаратуры моцны ўплыў аказвалі ідэі Рэфармацыі (кальвінізму, лютэранства, антытрынітарызму і іншых плыняў пратэстантызму). Пачалося актыўнае выданне палемічнай і вучэбнай літаратуры.

Ф. Скарына лічыцца пачынальнікам нацыянальна-культурнага і гуманістычнага Адраджэння на беларускіх землях. Новымі жанрамі ў беларускай літаратуры з'яўляюцца напісаныя ім прадмовы і пасляслоўі да кніг Бібліі, у якіх выказваў уласныя філасофскія, маральна-этычныя і эстэтычныя погляды. Ф. Скарына стаў пачынальнікам патрыятычнай традыцыі ў беларускай літаратуры.

Розныя аспекты літаратурнай і асветніцкай спадчыны Ф. Скарыны развівалі М. Гусоўскі, С. Будны, В. Цяпінскі і іншыя мысліцелі і асветнікі. М. Гусоўскі ў лацінамоўнай паэме “Песня пра зубра” (поўная назва – “Песня пра постаць, дзікасць зубра і паляванне на яго”), што была выдадзена ў 1523 г. у Кракаве, выступіў як прадстаўнік рэнесансавага рэалізму, папулярызатар гісторыка-культурнай спадчыны на міжнародным узроўні. Зубр у гэтай паэме з'яўляецца алегарычным вобразам Айчыны. М. Гусоўскі выступаў за творчае засваенне антычнай літаратуры, міфалогіі, лацінскай мовы. Асаблівае значэнне надаваў народнай мудрасці, у выхаванні важную ролю адводзіў мастацтву і навуцы. Заклікаў еўрапейскія народы да аб'яднання перад пагрозай турэцкага і татарскага нашэсця.

С. Будны ўвайшоў у гісторыю айчыннай культуры як бліскучы асветнік, палеміст, ідэолаг антытрынітарыяў у ВКЛ, аўтар “Катэхізіса” і цэлага шэрагу іншых рэлігійна-філасофскіх прац. С. Будны абгрунтаваў думку пра асаблівае значэнне асветы на роднай мове. Як выдавец і перакладчык ён развіваў традыцыі Ф. Скарыны, спрыяў развіццю старабеларускай мовы. Ім праведзена велізарная тэксталагічная праца пры перакладзе Новага запавету Бібліі.

З творчай спадчыны В. Цяпінскага захавалася няшмат: няпоўны пераклад Новага запавету Бібліі з рукапіснай прадмовай і каментарыямі, адзіная старонка “Катэхізіса, або Сумы навукі для дзетак”. Адстойваў значнасць чытання Евангелля на роднай мове. Заклікаў да міжканфесійнага ўзаемаразумення, умацавання згоды паміж народамі. Лічыў прыгажосць праявай разумнай гармоніі жыцця.

У эпоху Адраджэння ўзрасла цікавасць да гісторыі, што паспрыяла развіццю гістарыяграфіі. У першай палове XVI ст. быў напісаны на старабеларускай мове гісторыка-літаратурны твор – “Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”, у якім выкладзена гісторыя ВКЛ ад легендарнага князя Палемона да Гедзіміна. Першая рэдакцыя была напісана ў 1520-я гг., магчыма, у асяроддзі мясцовых феадалаў Вільні. Найвышэйшым дасягненнем гістарычнай прозы з'яўляецца “Хроніка Быхаўца” (“Летапіс

Быхаўца”), прысвечаная гісторыі ВКЛ ад легендарных часоў да пачатку XVI ст. Мова гэтага твора з’яўляецца ўзорам старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы XVI ст. Мяркуюць, што асноўная частка “Хронікі Быхаўца” была напісана праваслаўным аўтарам з акружэння князёў Алелькавічаў.

Еўрапейскую славу набыла гістарычная паэма на лацінскай мове “Пруская вайна” (Кракаў, 1516) Я. Вісліцкага, аднаго з пачынальнікаў гуманістычнай літаратуры ва Усходняй Еўропе. Другую частку твора ён прысвяціў Грунвальдскай бітве 1410 г., якую асвятляў з пазіцыі дзяржаўнага патрыятызму ў традыцыях еўрапейскай героіка-эпічнай паэзіі. У 1578 г. у Кракаве А. Гваньіні выдаў на лацінскай мове “Хроніку Еўрапейскай Сарматыі”, якая была заснавана на розных матэрыялах, у тым ліку на “Хроніцы польскай, літоўскай, жамойцкай і усёй Русі” М. Стрыйкоўскага, беларуска-літоўскіх хроніках. На Беларусі “Хроніка Еўрапейскай Сарматыі” была вядома ў польскамоўным выданні (Кракаў, 1611). У кнізе шмат звестак па гісторыі і геаграфіі Польшчы і ВКЛ, апісаны гарады і крэпасці Беларусі, матэрыяльная і духоўная культура.

Заснавальнікам жанру панегірычнай паэзіі ў старажытнай беларускай літаратуры быў А. Рымша, які пісаў на старабеларускай, польскай і лацінскай мовах. У 1585 г. у Вільні была выдадзена яго польскамоўная паэма “Дзесяцігадовая аповесць ваенных спраў князя Крыштафа Радзівіла”.

Сярод першых твораў свецкай публіцыстыкі быў сацыяльна-палітычны трактат на лацінскай мове “Аб норавах татараў, літоўцаў і масквіцян” М. Літвіна. Трактат напісаны да 1550 г., яго ўцалелыя 10 вялікіх фрагментаў былі выдадзены ў 1615 г. у Базелі (Швейцарыя). Аўтар выкрываў заганы ВКЛ, магнатаў і шляхты, каталіцкай царквы, што паслужылі прычынамі знешнепалітычных няўдач ВКЛ.

Каштоўнымі помнікамі руска-беларускай палемічнай літаратуры з’яўляюцца творы, аўтарамі якіх былі прадстаўнікі рэлігійнага вальнадумства Арцемій, Ф. Касой, што знайшлі прытулак у ВКЛ. Свецкім публіцыстычным характарам вызначаюцца лісты і іншыя творы А. Курбскага.

Адным з заснавальнікаў свецкага напрамку ў сацыяльна-палітычнай думцы быў А. Волан (Волян), які апублікаваў на лацінскай і польскай мовах больш за 30 публіцыстычных твораў, дзе крытыкаваў догматы і арганізацыйную структуру каталіцкай царквы, адстойваў прынцыпы рэлігійнай талерантнасці.

Выдатнымі творамі прававой думкі еўрапейскага ўзроўню былі Статуты ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг. Трэці Статут ВКЛ падрыхтаваны на высокім тэарэтычным узроўні правазнаўцамі пад кіраўніцтвам А. Валовіча і Л. Сапегі. У ім абагулены тагачасныя дзяржаўна-прававыя ідэі, некаторыя з іх апярэдзілі свой час.

***Мастацкая культура.*** У эпоху Адраджэння ажыццяўляліся спробы комплекснай рэканструкцыі гарадоў на аснове рэгулярнага плана (Нясвіж, Быхаў, Слуцк). Цэнтрам кампазіцыі горада была плошча з ратушай і храмамі. Спачатку рэнесанс у дойлідстве спалучаўся з элементамі готыкі. Свецкая і культавая архітэктура паступова страчвала абарончыя рысы. У сярэдзіне – другой палове XVI ст. узводзіліся рэфармацкія зборы (храмы): у Асташыне (Навагрудскі раён), Заслаўі, Койданаве (Дзяржынскі раён), Смаргоні. У большасці яны былі перабудаваны ў наступныя стагоддзі ў касцёлы ці праваслаўныя цэрквы.

Адбывалася паступовая трансфармацыя замкавага дойлідства ў палацава-замкавае дойлідства. Палацы станавіліся больш свецкімі і рэпрэзентатыўнымі збудаваннямі, набылі рысы італьянскага і нідэрландскага рэнесансу. Па ініцыятыве караля Рэчы Паспалітай С. Баторыя ў 1570–1580-я гг. быў перабудаваны ў рэнесансавым стылі Стары замак у Гродне (магчыма, гэтым займаліся італьянскія архітэктары С. Гучы ці Скота).

У жывапісе асаблівага развіцця атрымалі фрэскавыя роспісы, іканапіс, партрэт. Беларускія мастакі ўдзельнічалі ў роспісах храмаў як на тэрыторыі Беларусі (Троіцкага касцёла ў Ішкалдзі, цэркваў-крэпасцей у Сынкавічах, Мураванцы), так і Польшчы (Дабравешчанская царква Супрасльскага манастыра, капліцы ў Люблінскім замку, капэл у Вавельскім замку ў Кракаве).

З’яўленне і пашырэнне кнігадрукавання паспрыяла станаўленню кніжнай графікі. Пачаткам беларускай друкаванай графікі з’явіліся выданні Ф. Скарыны (найперш пражскія), багата аздобленыя сюжэтнымі ілюстрацыямі (52, з іх 47 у кнігах, выдадзеных у Празе), застаўкамі і ініцыяламі. Далейшае развіццё кніжнай графікі звязана з прадаўжальнікамі кнігадрукарскай традыцыі (С. Будным, В. Цяпінскім, І. Фёдаравым, П. Мсціслаўцам і інш.), многімі мастакамі-графікамі беларускіх друкарняў.

У XVI ст. пад уплывам ідэй Адраджэння на аснове традыцый візантыйскага і старажытнарускага мастацтва склалася самабытная беларуская іканапісная школа. Для яе ранніх твораў XVI ст. было характэрна спалучэнне адметных рыс сярэдневяковага мастацтва з элементамі Рэнесансу. Акрамя таго, адбываўся пераход ад плоскасных да аб’ёмных выяў, уключаліся мясцовыя бытавыя этнаграфічныя элементы. Іконы вылучаліся ўзорыстасцю, багатай і разнастайнай арнаментоўкай, разным раслінным арнаментам фону. Разам з захаваннем агульнанацыянальных рыс вылучаліся па характару тыпажоў, каларыту, асаблівасцях манеры выканання і мясцовыя іканапісныя школы Брэстчыны, Віцебшчыны, Магілёўшчыны. Добра вядомы цяпер іконы шарашоўскіх, маларыцкіх і іншых майстроў. Сярод выдатных узораў іканапісу XVI ст. трэба адзначыць іконы “Маці Боская Адзігітрыя Іерусалімская” з Варварынскай царквы ў Пінску, “Маці Боская Смаленская”

(в. Дубянец Столінскага раёна), “Знаменне” (в. Імянін Драгічынскага раёна), “Маці Боская Адзігітрыя Іерусалімская” (в. Здзітава Жабінкаўскага раёна), “Хрыстос Уседзяржыцель” (в. Быцень Івацэвіцкага раёна) і інш.

У цэлым, у эпоху Адраджэння і Рэфармацыі культура беларускіх зямель усё больш уключалася ў культурна-цывілізацыйныя працэсы ў Еўропе. Нараджэнне кнігадрукавання, развіццё беларуска-літоўскага летапісання, шматмоўнай літаратуры, філасофскай, прававой і грамадска-палітычнай думкі, адукацыі, дойлідства і выяўленчага мастацтва сведчаць аб высокім узроўні тагачаснай айчыннай культуры.

**Паняцці**

**Адраджэнне (Рэнесанс)** – пераходная эпоха ад сярэдневякоўя да Новага часу ў Еўропе з XIV да сярэдзіны XVII ст., якая характарызавалася станаўленнем нацыянальнай мовы і самасвядомасці, гуманістычнага светапогляду, росквітам свецкай навукі, літаратуры, мастацтва (гуманістычнае Адраджэнне). Асноўнай ідэалогіяй Адраджэння быў гуманізм (прызнанне чалавека асобай, зацвярджэнне яго права на творчасць, свабоду і шчасце). Узнікла новая свецкая культура, на аснове якой сфарміраваўся рэнесансава-гуманістычны светапогляд. Асноўнымі рысамі агульнаеўрапейскага Адраджэння былі антрапацэнтрызм і гуманізм, мадыфікацыя сярэдневяковай хрысціянскай традыцыі, асаблівыя адносіны да антычнай культурнай спадчыны, новыя адносіны да навакольнага свету, свабода асобы.

У сучаснай гістарычнай і культуралагічнай навуцы пераважае думка пра варыянтнасць і шматграннасць рэнесансавай культуры пры яе аднатыпнасці. Беларускія землі ў складзе ВКЛ у XVI ст. добра ўпісваліся ў тагачасную еўрапейскую культуру, хоць і не знаходзіліся ў эпіцэнтры яе развіцця. Іх тагачасную культуру далучаюць да Паўночнага Адраджэння. Беларускія гарады мелі юрыдычную аўтаномію. У XIV–XV стст. сфарміравалася старабеларуская мова, якая да канца XVII ст. была дзяржаўнай мовай ВКЛ. У галіне архітэктуры ў XVI ст. разам з готыкай складваўся рэнесансавы стыль (комплексная рэканструкцыя гарадоў, абарончыя збудаванні, замкі-палацы ў Міры, Любчы, Нясвіжы, цэрквы ў Сынкавічах, Супраслі, Маламажэйкаве і інш.). З XVI – першай паловы XVII ст. дайшлі творы жывапісу (сармацкі партрэт, іканапіс з прыкметнымі рэалістычнымі і этнаграфічна-бытавымі рысамі). Вялікім дасягненнем эпохі Адраджэння было ўзнікненне беларускага кнігадрукавання і станаўленне мясцовай школы кніжнай графікі. Таксама развівалася беларуская царкоўная і свецкая музыка, узнікла нотадрукаванне, канты як самабытны жанр песеннай культуры. Сярод іншых дасягненняў эпохі Адраджэння на Беларусі былі дакументы дзяржаўнага справаводства на старабеларускай мове

(Метрыка ВКЛ), гістарычная навука і летапісы, прававая культура (Статуты ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг.), развіццё новалацінскай і старабеларускай літаратуры, філасофскай і грамадска-палітычнай думкі. Пачынальнікам беларускага рэнесансавага асветніцтва быў Ф. Скарына.

**Рэфармацыя** – шырокі рэлігійна-ідэалагічны і сацыяльна-палітычны антыфеадальны рух у Еўропе ў XVI ст., які быў накіраваны на перабудову і выпраўленне рымска-каталіцкай царквы і прывёў да ўзнікнення пратэстантызму.

На беларускіх землях рэфармацыйны рух разгарнуўся ў першай палове XVI ст. Асноўным напрамкам Рэфармацыі на Беларусі быў кальвінізм, галоўнай сацыяльнай апорай якога сталі феадальная знаць, частка дробнай і сярэдняй шляхты. Адмоўныя адносіны Радзівілаў, Сапег, Хадкевічаў і іншых магнатаў ВКЛ да дзяржаўнай уніі з Польшчай, імкненне захаваць свае сацыяльна-эканамічныя і палітычныя правы ў ходзе дэцэнтралізацыі дзяржаўнай улады і структуры каталіцкай і праваслаўнай царкваў абумовіла іх прыхільнасць да Рэфармацыі. Іх падтрымала частка слаёў мяшчанства, незадаволеная прывілеяваным становішчам традыцыйных цэркваў. У 1560-я гг. кальвінісцкая плынь Рэфармацыі падзялілася на ўмераны (памяркоўныя) і радыкальны (антытрынітарыі) напрамкі. У другой палове XVI ст. рэфармацыйны рух распаўся на мноства дробных сектаў. Рэфармацыя спрыяла актывізацыі духоўнага жыцця, распаўсюджванню гуманістычных тэндэнцый, развіццю рэнесансавай культуры, пашырэнню асветы.

**Дзеячы культуры, мастацтва**

**Будны Сымон** (каля 1530 –1593) – асветнік, філосаф, выдавец. Развіваў кнігадрукарскую традыцыю і ідэі гуманістычнага Адраджэння Ф. Скарыны. Актыўны ўдзельнік рэфармацыйнага руху. Разам з Л. Крышкоўскім, М. Кавячынскім і яго братамі заснаваў Нясвіжскую друкарню, дзе ў 1562 г. выдаў на старабеларускай мове кнігі “Катэхізіс” і “Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам”. У сярэдзіне 1560-х гг. адзін з ідэолагаў антытрынітарызму – радыкальнай плыні Рэфармацыі ў ВКЛ. Аўтар шэрагу палемічных літаратурна-філасофскіх, багаслоўскіх твораў. Заклікаў клапаціцца аб развіцці беларускай культуры і мовы, засвойваць усю сукупнасць еўрапейскай культуры. У рэлігійна-філасофскім творы “Пра галоўныя палажэнні хрысціянскай веры” (Лоск, 1576) абагульніў свае радыкальныя ідэі. Каштоўнай працай па гісторыі айчыннай Рэфармацыі з’яўляецца яго зборнік “Пра свецкую ўладу” (Лоск, 1583). Займаўся працай па перакладзе на польскую, старабеларускую мовы і крытычным даследаванні Бібліі. Асабліва шырокі рэзананс у свеце атрымаў яго пераклад Новага запавету 1574 г.

**Гусоўскі Мікола** (1470-я – пасля 1533) – паэт, мысліцель, асветнік. Прадстаўнік новалацінскай паэзіі. Заснавальнік мастацкай рэнесансавай рэалістычнай традыцыі ў паэзіі Беларусі, Украіны, Літвы і Польшчы. Напісаў у Рыме на лацінскай мове паэму “Песня пра постаць, дзікасць зубра і паляванне на яго” (часта выкарыстоўваецца скарочаная назва – “Песня пра зубра”) і шэраг вершаў (выдадзены ў Кракаве ў 1523 г.). З’яўляецца таксама аўтарам эпічных паэм “Новая і славутая перамога над туркамі ў ліпені месяцы” (1524 г.), “Жыццё і подзвігі св. Гіяцынта” (1525 г.). У паэме “Песня пра зубра” выступіў як папулярызатар айчыннай гісторыі і культуры на сусветнай арэне. Невычэрпнай крыніцай паэзіі лічыў народную мудрасць. Выступаў за творчае засваенне жыхарамі ВКЛ антычнай спадчыны. У выхаванні народа важную ролю адводзіў мастацтву і навуцы, прапагандаваў сістэму лацінскай класічнай адукацыі.

**Мсціславец Пётр Цімафеевіч** (? – пасля 1576) – друкар. Выхадзец з Мсціслава. Удзельнічаў у заснаванні (разам з І. Фёдаравым) друкарні ў Маскве, дзе яны выдалі першую ў Расіі друкаваную кнігу “Апостал” (1564 г.), 2 выданні “Часоўніка” (1565 г.). Па замове гетмана Р. Хадкевіча заснаваў друкарню ў Заблудаве, дзе разам з І. Фёдаравым выдаў “Евангелле вучыцельнае” (1569 г.). У 1569 г. пераехаў у Вільню і з дапамогай братоў Мамонічаў заснаваў там друкарню, у якой амаль праз паўстагоддзе пасля спынення выдавецкай дзейнасці Ф. Скарыны аднавіў кірылічнае кнігавыданне – “Часоўнік” (1574–1576 гг.), “Евангелле напрастольнае” (1575 г.), “Псалтыр” (1576 г.) і іншыя кнігі.

**Радзівіл Мікалай** (мянушка **“Чорны”**) (1515–1565) – грамадскі дзеяч, мецэнат. Узначальваў рэфармацыйны рух у ВКЛ. У пачатку 1550-х гг. далучыўся да лютэранскай царквы, праз 2 гады перайшоў у кальвінізм і стаў актыўным яго прапагандыстам. Пры яго падтрымцы ў 1543 г. у Гродне створана “Літоўская капэла” – адзін з першых у Еўропе аркестравых калектываў, у якім удзельнічалі замежныя і мясцовыя артысты (дзейнічала да пачатку XVII ст.). Пры М. Радзівіле Чорным Брэст і Нясвіж сталі цэнтрамі пратэстанцтва ў Беларусі і Літве. На яго сродкі ў 1553 г. у Брэсце была заснавана першая на беларускіх землях друкарня, у якой працавалі запрошаныя ім з Польшчы друкары Б. Ваяводка, С. Мурмеліус, паэт і перакладчык Ц. Базылік. У 1558 г. там выйшаў “Брэсцкі канцыянал” (“Песні хвал боскіх”) Я. Зарэмбы – першы друкаваны нотны зборнік на Беларусі. Сярод шэрагу кніг была надрукаваная за кошт М. Радзівіла Чорнага ў 1563 г. Берасцейская (Брэсцкая) Біблія (Радзівілаўская Біблія) – польскамоўны пераклад поўнага зводу Бібліі, найбуйнейшае па аб’ёме і адно з лепшых па мастацкіх і паліграфічных якасцях рэнесансавае выданне. Пад апекай М. Радзівіла Чорнага дзейнічала пратэстанцкая друкарня і ў Нясвіжы, у арганізацыі якой прымалі ўдзел С. Будны, М. Кавячынскі, Л. Крышкоўскі –

першая на тэрыторыі Беларусі друкарня, якая карысталася кірылаўскімі шрыфтамі. Там у 1562 г. быў выдадзены "Катэхізіс" – першая на Беларусі друкаваная кніга на старабеларускай мове. Пры кальвінісцкіх зборах часта адкрываліся школы, у якіх адукацыя была значна лепшай, чым у каталіцкіх школах. Пасля смерці М. Радзівіла Чорнага папскі нунцый Я. Камедоні паведаміў у Ватыкан, што "памёр чалавек, наймацнейшы не толькі ў Літве, але і ва ўсіх краях гэтай дзяржавы".

**Сапега Леў Іванавіч** (1557–1633) – грамадскі дзеяч, мецэнат. Канцлер ВКЛ (1589–1623 гг.). Узначальваў соймавую камісію па падрыхтоўцы трэцяй рэдакцыі Статута ВКЛ, адрэдагаваў яе тэкст і фінансаваў яго выданне ў 1588 г. у віленскай друкарні Мамонічаў. Па яго загадзе ў 1594–1607 гг. былі нанава перапісаны кнігі Метрыкі ВКЛ, каб пры карыстанні яны не прыходзілі ў непрыгоднасць (новыя кнігі зберагліся да сучаснасці). За яго сродкі ўзводзіліся касцёлы, уніяцкія і праваслаўныя цэрквы, адкрываліся школы, шпіталі, прытулкі. Аказваў матэрыяльную падтрымку мастакам, пісьменнікам. У Ружанах сабраў вялікі кнігазбор, пачаў збіраць архіў.

**Скарына Францыск** (каля 1490 – каля 1551) – першадрукар, перакладчык, мысліцель, асветнік-гуманіст. Бакалаўр вольных мастацтваў (філасофіі) (Кракаў, 1506), доктар медыцыны (Падуя, 1512). Пачынальнік нацыянальна-культурнага і гуманістычнага Адраджэння на беларускіх землях. Заснавальнік беларускага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання. На працягу 1517–1519 гг. у Празе (Чэхія) ім былі надрукаваны 23 асобныя кнігі Старога запавету Бібліі (поўная назва – "Библия руска, выложена доктором Франциском Скориною из славного града Полоцька, Богу ко чти и людем посполитым к доброму научению"). Першая кніга – "Псалтыр" – выйшла там у свет 6 жніўня 1517 г. Кнігі Бібліі былі перакладзены Ф. Скарынам з лацінскіх, чэшскіх, старажытнаяўрэйскіх і царкоўнаславянскіх крыніц на мову, набліжаную па сваёй лексіцы, марфалогіі і фанетыцы да старабеларускай. Да кожнай з кніг ён напісаў прадмовы і пасляслоўі. У друкаванай кнізе Ф. Скарына бачыў невычарпальныя магчымасці духоўнай асветы народа, выхавання высокіх хрысціянскіх, маральных і грамадзянскіх якасцей, усё большага далучэння да культурна-гістарычнай еўрапейскай спадчыны, узаемадзеяння з ёй. У 1522 г. Ф. Скарына заснаваў першую ва Усходняй Еўропе друкарню ў Вільні і выдаў "Малую падарожную кніжку", а ў 1525 г. – "Апостал". Віленскія выданні былі больш звязаны з беларускай і ўсходнеславянскай кніжнасцю і выдаваліся на царкоўнаславянскай мове. Матэрыяльную падтрымку ў кнігавыдавецкай працы яму аказвалі брат Іван Скарына, Я. Бабіч, Б. Онкаў, Р. Адвернік. У канцы 1530-х гг. (магчыма, што і ў 1540-я гг.) працаваў каралеўскім садоўнікам на Градчанах у Празе.

Кнігі Ф. Скарыны вылучаюцца высокімі выдавецкімі і друкарскімі якасцямі. Рэнесансавыя выданні беларускага першадрукара, адметныя

мастацкім, гравюрным, арнаментальным упрыгожаннем, шрыфтам і іншымі элементамі выдавецкай эстэтыкі і майстэрства, былі прызначаны для ўсіх слаёў грамадства. У творах Скарыны арганічна перапляліся антычныя і сярэдневяковыя традыцыі з ідэалогіяй еўрапейскага Адраджэння, хрысціянскі гуманізм з рэнесансна-гуманістычнымі ўяўленнямі. Ён праяўляў канфесійную цярпімасць, паважліва ставіўся да свецкіх навук, літаратуры, мастацтва, пісьменства, духоўных здабыткаў мінулага і эпохі Адраджэння. Ф. Скарына з'яўляецца пачынальнікам патрыятычнай традыцыі ў айчыннай літаратуры і грамадска-палітычнай думцы. Яго кнігі аказалі вялікі ўплыў на развіццё духоўнай культуры Беларусі і Украіны, стымулявалі ўзнікненне кнігадрукавання ў Расіі.

**Фёдараў Іван (Масквіцін Іван Фёдаравіч)** (каля 1510–1583) – друкар. Заснавальнік кнігадрукавання ў Расіі і на Украіне. Паводле даследаванняў расійскага вучонага-кнігазнаўцы Я. Неміроўскага, меў беларускае паходжанне. Удзельнічаў у заснаванні (разам з П. Мсціслаўцам) друкарні ў Маскве, дзе яны выдалі першую ў Расіі друкаваную кнігу "Апостал" (1564 г.), 2 выданні "Часоўніка" (1565 г.). У друкарні ў Заблудаве былі выдадзены "Евангелле вучыцельнае" (1569 г.) (разам з П. Мсціслаўцам), "Псалтыр з Часаслоўцам" (1570 г.). У канцы 1572 – пачатку 1573 г. пераехаў у Львоў і заснаваў першую на Украіне друкарню, дзе выдаў першую ўкраінскую дакладна датаваную кнігу "Апостал" і першы друкаваны ўсходнеславянскі падручнік "Азбука". Каля 1578 г. заснаваў Астрожскую друкарню, дзе надрукаваў дапоўненае выданне "Азбукі", "Храналогію" А. Рымшы і іншыя кнігі. У 1581 г. ім надрукавана Астрожская Біблія на царкоўнаславянскай мове – першае поўнае выданне славянскай Бібліі кірылічным пісьмом.

**Цяпінскі (Амельяновіч) Васіль** (1530-я – каля 1600) – друкар, пісьменнік. Актыўны ўдзельнік рэфармацыйнага руху, прыхільнік антытрынітарыяў. У 1570-я гг. арганізаваў за свой кошт друкарню ў маёнтку Цяпіна каля Лепеля, пераклаў і выдаў Евангелле на царкоўнаславянскай і старабеларускай мовах з уласнымі заўвагамі, прадмовай. Пераклад вызначаўся дакладнасцю і апрацаванасцю. Духоўнае адраджэнне грамадства звязваў з рэлігійнай асветай – "навукай слова Божага".

## Тэма 5. Культура Контррэфармацыі і барока. Асветніцтва на Беларусі

***Агульная характарыстыка.*** Контррэфармацыя ў Еўропе ў другой палове XVI – XVII ст. ахапіла палітыку, ідэалогію, культуру. Галоўнай яе мэтай было аднаўленне страчаных каталіцкай царквой пазіцый у грамадска-культурным жыцці. Асноўнымі яе рухаючымі сіламі былі каталіцкія манаскія ордэны (найперш езуіты). На беларускіх землях Контррэфармацыя разгарнулася пасля Люблінскай уніі 1569 г. і працягвалася да сярэдзіны XVIII ст., пакуль не змянілася эпохай

Асветніцтва. Эпоха Контррэфармацыі была даволі складанай і супярэчлівай для культуры Беларусі. Па-першае, былі разгорнуты ганенні як супраць пратэстантызму, так і супраць праваслаўя (абмяжоўвалі дзейнасць, закрывалі брацкія школы, друкарні, праваслаўныя цэрквы і манастыры, праследавалі дзеячаў культуры і асветы). Нацыянальна-рэлігійны ўціск узмацніўся пасля Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. Адбывалася амаль поўная клерыкалізацыя культуры. Па-другое, разгортвалася акаталічванне і паланізацыя беларускага насельніцтва. Асабліва паланізацыя закранула вышэйшыя саслоўі (магнатаў, шляхту). Соймавай пастановай "Ураўнаванне правоў" 1697 г. старабеларуская мова была заменена ў афіцыйным ужытку польскай мовай, што прывяло да заняпаду старабеларускай літаратурнай мовы. Беларуская мова стала пераважна элементам народнай культуры сацыяльных нізоў (сялян, мяшчан, часткі шляхты і духавенства). Па-трэцяе, негатыўна ўплывалі на становішча беларускай культуры разбуральныя вынікі шматлікіх войн. Па-чацвёртае, асвета, літаратура і мастацтва характарызавалася шматмоўнасцю (лацінская, польская, старабеларуская, царкоўнаславянская і іншыя мовы). Адбываўся няпросты дыялог, палеміка ў грамадскай і рэлігійнай думцы, літаратуры. Па-пятае, адбывалася інтэграцыя ў культурную прастору Рэчы Паспалітай (асабліва гэта датычылася элітарнай культуры, літаратуры і мастацтва). Па-шостае, барока (вядучы мастацкі стыль Контррэфармацыі) вызначалася спалучэннем заходнееўрапейскіх уплываў з візантыйскімі і мясцовымі традыцыямі. Па-сёмае, назіраліся дасягненні ў архітэктуры, выяўленчым мастацтве, тэатры і музыцы. Некаторыя творы мастацтва дастойна ўвайшлі ў еўрапейскую і сусветную спадчыну. Асноўнымі цэнтрамі культуры з'яўляліся гарады і буйныя мястэчкі, манастыры і храмы, навучальныя ўстановы, рэзідэнцыі магнатаў і маёнткі шляхты.

Эпоха Асветніцтва, антыфеадальнай буржуазнай ідэалогіі перыяду станаўлення капіталізму, што сцвярджала першынства асветы, навукі і розуму ў жыцці асобы, грамадства і дзяржавы, на беларускіх землях датуецца другой паловай XVIII – пачаткам XIX ст. Беларускае Асветніцтва ўзаемадзейнічала з французскім, рускім, польскім, украінскім і літоўскім Асветніцтвам. Яго ідэі знайшлі адлюстраванне ў філасофіі, сацыялогіі, гістарычнай навуцы, літаратуры і мастацтве. Дзеячы Асветніцтва адстойвалі гуманістычныя ідэалы, свецкія каштоўнасці, прагрэсіўнае развіццё. Беларускае Асветніцтва характарызавалася элітарным (шляхецка-мяшчанскім) характарам, навукова-асветніцкім напрамкам. У эпоху Асветніцтва ў літаратуры, мастацтве суіснавалі розныя стылі і напрамкі. З канца XVIII ст. пачаў пашырацца класіцызм.

***Архітэктура***. Першым помнікам архітэктуры барока не толькі ў Рэчы Паспалітай, але і ва ўсёй Усходняй Еўропе стаў касцёл Божага Цела ў Нясвіжы, пабудаваны Дж. Бернардоні ў 1587–1593 гг. па заказу М.К. Радзівіла Сіроткі. Яго прататыпам з’явіўся галоўны храм езуітаў Іль Джэзу ў Рыме. У архітэктуры барока на Беларусі можна выдзеліць 3 перыяды: ранняе барока (канец XVI – першая палова XVII ст.), сталае барока (другая палова XVII ст. – 1720-я гг.), позняе барока (1730-я – 1780-я гг.). Адбываўся пераход ад храмаў з аднанефавай аднавежавай структурай да найбольш пашыранай 3-нефавай базілікі (спачатку з бязвежавым галоўным фасадам, потым характэрнымі сталі 2-вежавыя фасады): касцёлы бернардзінцаў у Нясвіжы і Гродне, францысканцаў у Гродне, Петрапаўлаўская (Кацярынінская) царква ў Мінску і інш. У перыяд ранняга барока многія храмы спалучалі рэнесансавыя рысы з гатычнымі. Для беларускага барока была характэрна манументальнасць, якая праяўлялася ў павелічэнні маштабу будынка адносна асяроддзя і паміж асобнымі часткамі помніка архітэктуры: касцёлы бернардзінцаў у Мінску, цыстэрцыянцаў у Вістычах (Брэсцкі раён), бернардзінак у Слоніме і інш. Сярод адметных культавых пабудоў барока трэба адзначыць касцёл Праабражэння Гасподняга у Навагрудку, касцёл Ушэсця Найсвяцейшай Дзевы Марыі кляштара францысканцаў ў Пінску, Успенскі сабор базыльянскага манастыра ў Жыровічах, Троіцкі касцёл у Ружанах (Пружанскі раён) і інш.

Укладам у еўрапейскую архітэктурную спадчыну лічацца помнікі позняга ці віленскага барока. У яго фарміраванні самы актыўны ўдзел прыняў віленскі архітэктар І. Глаўбіц. Для віленскага барока, якое арганічна спалучыла заходнія і ўсходнія ўплывы з традыцыямі мясцовага дойлідства і было абумоўлена спецыфікай сацыяльна-палітычнага і рэлігійнага жыцця ВКЛ, была характэрна вытанчанасць прапорцый, скульптурная пластычнасць фасадаў і інтэр’ераў, маляўнічасць сілуэта. Да найлепшых узораў віленскага барока адносяцца Полацкі Сафійскі сабор (перабудаваны І. Глаўбіцам і Б. Касінскім у 1738–1750 гг.), Глыбоцкі касцёл і кляштар кармелітаў, касцёлы ў Гродне, Оршы, Слоніме, касцёл кляштара бернардзінак (Свята-Духаўскі кафедральны сабор) у Мінску, цэрквы і манастыры базыльян у Беразвеччы (Глыбоцкі раён), Барунах (Ашмянскі раён), Вольне (Баранавіцкі раён), Талачыне, Богаяўленская і Крыжаўздзвіжанская цэрквы манастыра ў Жыровічах, Васкрасенская царква ў Віцебску і інш. Адным з апошніх выдатным помнікаў віленскага барока лічыцца касцёл Узнясення Маці Боскай (1767–1783 гг., архітэктар Дж. Фантана) у Будславе. У XVIII ст. былі ўзведзены ў стылі барока (ці перабудоўваліся ў гэтым стылі) Троіцкі касцёл у Воўчыне (Камянецкі раён), касцёл кляштара бернардзінцаў (Варварынская царква) у Пінску,

царква манастыра базыльян (Петрапаўлаўская царква) у Ружанах (Пружанскі раён), касцёл К. Барамея ордэна камуністаў у Пінску і інш.

Храмы ўзводзіліся звычайна ў ансамблі з манастырамі. Ансамблевае вырашэнне было характэрна для буйнога комплексу кляштара картузаў у Бярозе, шэрагу езуіцкіх калегіумаў XVIII ст. у Брэсце, Мінску, Полацку, Гродне і іншых гарадах.

У канцы XVI – першай палове XVII ст. рэзідэнцыі магнатаў фарміраваліся як палацава-замкавыя комплексы рэнесансавага тыпу (Нясвіжскі замак Радзівілаў, Гальшанскі і Быхаўскі замкі Сапегаў, Смалянскі замак Сангушкаў і інш.). У канцы XVI ст. Я. Хадкевіч узвёў замак бастыённага тыпу на беразе ракі Ведзьма ў Ляхавічах (разбураны ў XVIII ст., да сучаснасці не ўцалеў). Замкі ў Міры і Любчы, якія былі ўзведзены ў традыцыях мясцовага абарончага дойлідства, у пачатку XVII ст. набылі рысы рэнесансавых палацаў. Архітэктар Дж. Бернардоні ўдзельнічаў ва ўзвядзенні Нясвіжскага замка (уключаны ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, у 2010 г. завяршана яго рэстаўрацыя). У яго архітэктуры змяшаліся розныя стылі, што з'яўляецца сведчаннем шматэтапнасці будаўніцтва і выкарыстання мастацкіх дасягненняў розных гістарычных эпох. Рэзідэнцыя Радзівілаў у Нясвіжы, "неафіцыйнай" сталіцы ВКЛ, уяўляла сабой буйны палацава-замкавы комплекс з вялікімі вадаёмамі і паркамі (плошчай больш 90 га). Усе 12 залаў комплексу (Каралеўскі, Гетманскі, Мармуровы і інш.) былі ўпрыгожаны разьбой па дрэве, лепкай, роспісам, шыкоўнымі камінамі.

На працягу XVII–XVIII стст. адбылася сур'ёзная эвалюцыя палацава-замкавай архітэктуры: ранейшыя ізаляваныя комплексы з сістэмай умацаванняў замяняліся палацавымі забудовамі з адкрытай кампазіцыяй (карпусы, флігелі, бакавыя прыбудовы), пераўтвараліся ў палацава-паркавыя ансамблі. Некаторыя з іх ствараліся на аснове старых замкаў. У канцы XVI – пачатку XVII ст. была ўзведзена рэзідэнцыя Сапегаў – замак у Гальшанах (Ашмянскі раён). Замак уяўляў сабой мураваны прамавугольны ў плане 3-павярховы будынак (94,9x78,4 м). Яго карпусы з 4 шасціграннымі вежамі, накрытымі шатровымі дахамі, утваралі замкнёны амаль квадратны двор. Па сваёй кампазіцыі аддалена нагадваў Мірскі замак. У ім адчуваўся ўплыў галандска-фламандскай архітэктуры. Замак неаднаразова разбураўся і перабудоўваўся. Да сучаснасці дайшлі руіны Гальшанскага замка, якія падвяргаюцца кансервацыі.

Для палацавай архітэктуры позняга барока былі характэрны паўзамкнёнасць, аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя, анфіладнасць унутранай планіроўкі: каралеўскі палац (Новы замак) у Гродне, буйныя палацавыя комплексы ў Ружанах і Свяцку (Гродзенскі раён). У палацавым будаўніцтве актыўна працавалі замежныя архітэктары. Так, каралеўскі

палац (Новы замак) у Гродне ў 1734–1751 гг. узводзілі М. Пёпельман, І. Яўх, І. Кнобель, рэканструкцыю праводзіў у 1789 г. Дж. Сака.

Класіцызм у архітэктуры Беларусі пачаўся ў 1770-я гг. Спачатку развіваўся паралельна з познім барока, а ў канцы XVIII ст. стаў асноўным стылем. Для яго характэрна спалучэнне заходнееўрапейскай і рускай культур з мясцовымі мастацкімі традыцыямі. Сярод помнікаў пераходнага стылю былі палацы ў Ружанах і Свяцку. У палацава-сядзібным будаўніцтве класіцызм абумовіў пераважна сіметрычна-восевую планіроўку тэрыторыі сядзібы.

У другой палове XVIII стст. узводзіліся мануфактуры, што спрыяла развіццю жыллёвай архітэктуры ў Нясвіжы, Гродне, Паставах. У культурна-прамысловы цэнтр Гарадніца ў Гродне, створаны па ініцыятыве А. Тызенгаўза ў 1765–1780-я гг. архітэктарамі І. Мёзерам, Дж. Сака, уваходзіла 85 будынкаў рознага прызначэння (мануфактуры, палацы, навучальныя ўстановы, тэатр і інш.).

***Выяўленчае мастацтва.*** На працягу XVII–XVIII стст. цэнтрамі іканапісу былі Брэст, Гродна, Пінск, Магілёў, Віцебск, Полацк, Мінск і іншыя гарады. Адметнасцямі беларускага іканапісу XVII ст. з'яўляліся манументальнасць, прапарцыянальная яснасць кампазіцыі, адсутнасць празмернай дэталізацыі. З'явіліся алтарныя іконы з рысамі готыкі, рэнесансу і барока. Іконы пачалі аздабляць накладнымі металічнымі рызамі. З найбольш значных роспісаў праваслаўных храмаў былі фрэскавыя роспісы Богаяўленскай царквы Куцеінскага манастыра ў Оршы, Мікалаеўскай, Пакроўскай і Богаяўленскай цэркваў у Магілёве, цэркваў Тупічэўскага манастыра ў Мсціславе. Буйным самабытным іканапісным цэнтрам стараабраднікаў стала Ветка на Гомельшчыне. Веткаўскія іконы з'яўляюцца выдатным прыкладам сінтэзу старажытнарускага мастацтва і мясцовых традыцый іканапісу.

Партрэт і алтарная карціна сталі галоўнымі жанрамі ў станковым жывапісе Беларусі XVII–XVIII стст. Узніклі таксама гістарычны, батальны і іншыя жанры. У рэзідэнцыях магнатаў і сядзібах шляхты пачалі з'яўляцца партрэтныя галерэі. У Нясвіжы быў створаны партрэтны збор Радзівілаў. Іх замкавая калекцыя партрэтаў налічвала каля тысячы палотнаў. Найбольш разгорнуты на Беларусі фрэскавы біблейскі цыкл у XVIII–XIX стст. быў створаны у касцёле Св. Станіслава ў Магілёве.

Своеасаблівай з'явай партрэтнага жанру стаў сармацкі партрэт, які быў вынікам пашырэння шляхецкай ідэалогіі сарматызму. На гэтых партрэтах чалавек паказваўся ў парадным адзенні, у акружэнні некаторых прадметаў, з надпісамі інфармацыйнага зместу, выявамі гербаў. Сярод прыкладаў сармацкага партрэту – партрэты Ю. Радзівіла, Г. Сапегі, К. Весялоўскага, напісаныя невядомымі мастакамі, партрэты Х. і

Я. Радзівіл (мастак І. Шрэтар), Я. Радзівіла (Д. Шульц), караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага (Ю. Гескі) і інш.

У кніжнай і станковай гравюры Беларусі XVII–XVIII стст. набывала папулярнасць тэхніка медзярыту. Вылучалася магілёўская гравёрная школа ў Богаяўленскім брацкім манастыры (С. Собаль, М. Вашчанка і іншыя майстры). Сярод гравёраў нясвіжскай школы выдзяляўся Т. Макоўскі, прыдворны мастак Радзівілаў, які выгравіраваў першую дакладную геаграфічную карту ВКЛ (каля 1603 г.). На працягу 1745–1768 гг. у Нясвіжы быў створаны выдатны помнік беларускай графікі барока – альбом “Выявы роду князёў Радзівілаў” (першае выданне – 1758 г.), які ўключаў 165 партрэтаў. У яго падрыхтоўцы прымалі ўдзел прыдворныя мастакі Радзівілаў Г. Ляйбовіч, К.Д. Гескі і інш. У 1750-я гг. К.Д. Гескі выконваў размалёўку Нясвіжскага касцёла Божага Цела, дзе найбольш значнай працай была алтарная карціна “Тайная вячэра”. Цыкл з 14 гравюр у кнізе Ф.У. Радзівіл “Камедыі і трагедыі” (1754 г.) з’яўляецца першай іканаграфічнай серыяй тэатральнай сцэнаграфіі ва Усходняй Еўропе. Усяго ў першай палове XVIII ст. у Нясвіжы працавалі больш за 40 прыдворных архітэктараў, скульптараў, разьбяроў і іншых майстроў.

Буйнымі творамі барочнай скульптуры XVIII ст. сталі разьбяныя драўляныя алтары ў Гродзенскім касцёле езуітаў, Пінскім францысканскім касцёле. У 1736–1737 гг. група разьбяроў на чале з Я. Шмітам з Польшчы выканала галоўны алтар касцёла Св. Францыска Ксаверыя у Гродне (3 ярусы вышынёй 21 м). Барочная пышнасць дэкаратыўнага аздаблення выявілася ў іканастасах праваслаўных і ўніяцкіх храмаў: Успенскай царквы Жыровіцкага манастыра, Мікалаеўскай царквы ў Магілёве і інш. Асаблівая ўвага надавалася разьбе царскіх варот: у царкве ў Варанілавічах (Пружанскі раён) і іншых храмах. У другой палове XVII – XVIII стст. пашырыліся шмат’ярусныя іканастасы (Георгіеўская царква ў Давыд-Гарадку Столінскага раёна і інш.).

“Беларуская рэзь”, манументальна-дэкаратыўная аб’ёмна-ажурная разьба па дрэве, якая сфарміравалася пад уплывам рэнесансу і барока, з XVII ст. атрымала пашырэнне ў Расіі. Беларускія майстры аздаблялі там разьбой храмы і палацы (іканастасы Смаленскага сабора Новадзявочага манастыра ў Маскве, палацы ў Каломенскім і Маскве, палаты Крамля і інш.), прынеслі тэхналогію рэльефнай шматколернай кафлі.

У XVIII ст. узніклі вотчынныя мануфактуры па вытворчасці шаўковых паясоў (Нясвіж, Слуцк), фаянсу (Свержань, Целяханы), шпалераў, габеленаў (Гродна, Карэлічы, Ружаны, Слонім), мастацкага шкла (Налібокі, Урэчча) і інш. Спачатку прадукцыю нярэдка выраблялі паводле ўсходніх ці заходнееўрапейскіх узораў, але пад уплывам народнага мастацтва яна набывала мясцовы каларыт.

Сусветную вядомасць атрымалі паясы Слуцкай персіярні Радзівілаў – слуцкія паясы. Для арганізацыі іх вытворчасці ў Нясвіжы, з 1750-х гг. у Слуцку запрасілі майстра Я. Маджарскага (яго справу прадоўжыў сын Л. Маджарскі). Спачатку капіравалі ўсходнія (персідскія) узоры, потым у арнамент уключалі нацыянальныя матывы, кветкі мясцовай флоры – валошкі, незабудкі і інш. Ткаліся вольнанаёмнымі мужчынамі ўручную з тонкіх шаўковых, залатых і сярэбных нітак. Памеры пояса складалі 2–4,5 м даўжыні, 30–50 см шырыні. Яны выраблялiся аднабаковымі, 2-х і 4-х баковымі, канцы нярэдка абшываліся махрамі, у кутках былі вытканы на старaславянскай ці лацінскай мовах меткі "Слуцк", "У горадзе Слуцку", "Зроблена ў Слуцку" і інш. У год выпускалі каля 200 паясоў. Слуцкія паясы капіравалі ў Гродне, Ружанах, Слоніме, Кракаве, Гданьску, Ліёне і іншых гарадах. Вытворчасць слуцкіх паясоў, нацыянальнай рэліквіі беларусаў, адноўлена ў 2012–2013 гг. у Слуцку на РУП "Слуцкія паясы".

***Асвета. Навука. Літаратура.*** У канцы XVI – першай палове XVIII ст. адукацыя працягвала захоўваць канфесійны характар. Пад уплывам ідэй Контррэфармацыі значна ўзмацніліся пазіцыі каталіцкіх навучальных устаноў, асабліва езуітаў. Езуіты стварылі дасканалую 2-узроўневую адукацыю (акадэмія-калегіум). У 1570 г. у Вільні быў адкрыты езуіцкі калегіум, які ў 1578 г. быў пераўтвораны ў вышэйшую навучальную ўстанову ВКЛ – Віленскую езуіцкую акадэмію, дзе дзейнічалі філасофскі, тэалагічны факультэты, да якіх у 1640-я гг. дадаўся юрыдычны факультэт. Першым рэктарам быў П. Скарга. Паводле прыблізных падлікаў, з 1583 па 1781 г. Віленская акадэмія прысвоіла сваім выпускнікам 4076 навуковых ступеняў па філасофіі, праву, тэалогіі. Сярод найбольш вядомых выпускнікоў былі А. Баболя, А. Нарушэвіч, М.К. Сарбеўскі, С. Полацкі, М. Сматрыцкі і інш. Калегіумы давалі класічную гуманітарную адукацыю. У іх прымалі дзяцей з розных саслоўяў і веравызнанняў (не толькі католікаў), вучылі бясплатна. Выкладанне праводзілася на лацінскай мове, традыцыйнымі прадметамі былі граматыка, рыторыка, дыялектыка, арыфметыка, геаметрыя, астраномія, музыка. Асноўная мэта гэтых навучальных устаноў – выхаваць католікаў, фанатычна адданых ордэну езуітаў. Езуіцкія калегіумы існавалі ў Вільні, Брэсце, Віцебску, Гродне, Мінску, Навагрудку, Нясвіжы, Оршы, Пінску, Полацку, Слуцку і іншых гарадах і мястэчках. Па ўзору езуіцкіх калегіумаў з канца XVII ст. пашыраліся таксама калегіумы ордэна піяраў. Езуіцкія калегіумы з'яўляліся ўзорнымі і для базыльянскіх школ, дзе выкладалі на роднай мове вучняў.

Праваслаўныя брацтвы сыгралі важную ролю ў супрацьдзеянні паланізацыі, абароне рэлігійных і культурных інтарэсаў беларускага насельніцтва. Пры іх у канцы XVI – XVIII ст. ствараліся праваслаўныя

брацкія школы. Першымі з іх былі брацкія школы ў Вільні (каля 1584 г.), Магілёве (1590 г.), Брэсце (1591 г.), Мінску (1612 г.). Пасля пачатковага навучання вучні пераходзілі да вывучэння "трывіума" (граматыка, рыторыка, дыялектыка) і "квадрывіума" (арыфметыка, геаметрыя, астраномія і музыка). Вывучаліся царкоўнаславянская, старабеларуская, польская, лацінская, грэчаская мовы. Сярод вядомых вучэбных выданняў былі "Граматыка славенская..." (1596 г.) Л. Зізанія, "Граматыкі славенскія правільна сінтагма..." (1618–1619 гг.) М. Сматрыцкага, "Буквар" (1631 г.) С. Собаля і інш. У брацкіх школах выкарыстоўвалася групавая (класна-ўрочная) сістэма навучання.

У канцы XVI – пачатку XVII ст. у Вільні, Віцебску, Глыбокім, Заслаўі, Магілёве, Мінску, Оршы, Смаргоні і іншых гарадах дзейнічалі кальвініцкія школы, у якіх выкарыстоўваліся элементы класна-ўрочнай сістэмы, гуманістычныя падыходы ў арганізацыі навучання, фарміравалася крытычнае мысленне. Аднак з сярэдзіны XVII ст. колькасць пратэстанцкіх школ скарацілася. Найбольш вядомай стала кальвініцкая школа ў Слуцку, заснаваная Я. Радзівілам у 1617 г., якую сучаснікі называлі "Слуцкімі Афінамі".

З сярэдзіны XVIII ст. асвета на беларускіх землях пачала набываць больш свецкі характар. Вялікую ролю ў гэтым сыграла Адукацыйная камісія (1773–1794 гг.), хаця неспрыяльная грамадска-палітычная сітуацыя перашкаджала рэалізаваць прагрэсіўныя пераўтварэнні. Аднак езуіты былі адхілены ад навучання. У 1781 г. Віленская акадэмія пераўтворана ў Галоўную школу ВКЛ. Яе куратарам стаў І. Храптовіч, а рэктарам – М. Пачобут-Адляніцкі, які надаў адукацыі амаль свецкі характар. У 1775 г. па ініцыятыве Адукацыйнай камісіі і А. Тызенгаўза была заснавана французскім вучоным-натуралістам Ж.Э. Жыліберам медыцынская акадэмія ў Гродне. У 1781 г. яна была пераведзена ў Вільню і стала базай для стварэння медыцынскага факультэта Галоўнай школы ВКЛ. У Гродне ў 1776–1783 гг. друкавалася першая на тэрыторыі Беларусі газета – польскамоўная "Газэта Гродзеньска".

У эпоху Контррэфармацыі назіраўся рэгрэс у навуцы, панаванне ў ёй схаластыкі. Навуковая дзейнасць і яе вынікі лічыліся грахоўнымі. Аднак і ў нетрах самой езуіцкай схаластыкі нярэдка нараджаліся новыя ідэі. К. Лышчынскі стварыў рукапісны трактат "Аб неіснаванні Бога", на падставе якога быў зняволены, прызнаны атэістам і пакараны смерцю.

У эпоху Асветніцтва пачаўся адыход ад сярэдневяковай тэалогіі і схаластыкі. Пра гэта сведчаць працы ў галіне філасофіі, сацыялогіі, гісторыі, дакладных і прыродазнаўчых навук Б. Дабшэвіча, А. Доўгірда, К. Нарбута, М. Пачобут-Адляніцкага, А. Снядэцкага і іншых вучоных.

У XVII–XVIII стст. літаратура на беларускіх землях была шматмоўнай. У лацінамоўнай "Перэгрынацыі" М.К. Радзівіла Сіроткі (1601 г.) прасочваецца пераход ад персаніфікаванага паломніцкага апавядання да літаратурнага апісання вандроўкі ў Святую Зямлю. Гэтая праца была перакладзена на многія еўрапейскія мовы і вытрымала каля 20 выданняў. У барочнай літаратуры выдзялялася рознымі відамі і жанрамі новалацінская паэзія. Адным з заснавальнікаў эпічна-гераічнай паэзіі ў ВКЛ быў Я. Радван, які ў 1588 г. выдаў паэму "Радзівіліяда". Літаратурную спадчыну "славянскага Гарацыя" М.К. Сарбеўскага (яго трактаты па рыторыцы, паэтыцы, антычнай міфалогіі, вершаваныя творы) вывучалі ў XVII–XIX стст. у еўрапейскіх універсітэтах.

Першым мемуарным творам на старабеларускай мове стаў "Дыярыуш" Ф. Еўлашоўскага (пачатак XVII ст.), у якім малюнкі жыцця шляхты былі выкладзены ва ўзаемасувязі з біяграфіяй аўтара. Рысы помніка гісторыка-мемуарнага жанру меў Баркалабаўскі летапіс (пачатак XVII ст.), напісаны жывой і каларытнай старабеларускай мовай (у 2013 г. надрукаваны апрацаваны і ўзноўлены яго тэкст, факсімільнае выданне). Узнікала парадыйна-сатырычная проза: "Прамова Мялешкі" (першая палова XVII ст.), "Ліст да Абуховіча" (1655 г.). Вывядзенне старабеларускай мовы з афіцыйнага ўжытку прывяло да заняпаду беларускамоўнага друку. Літаратура на беларускай мове стала пераважна рукапіснай і ананімнай.

Падрыхтоўка і заключэнне Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. прадвызначылі развіццё ў канцы XVI – XVII ст. палемічнай публіцыстыкі – у форме дыскусіі ці вострай спрэчкі, нярэдка ананімнай. З каталіцка-уніяцкага боку з'явіліся працы П. Скаргі, І. Пацея, З. Капысценскага, І. Руцкага і іншых дзеячаў. Найбольш значнымі прадстаўнікамі праваслаўнай палемічнай літаратуры былі М. Сматрыцкі (у 1608 г. – "Антыграфі", 1610 г. – "Трэнас" і інш.), С. і Л. Зізаніі, Л. Карповіч, А. Філіповіч (яго публіцыстыка змешчана ў 1646 г. у "Дыярыушы") і інш. Пакінуў пасля сябе шмат твораў Г. Каніскі, які самаадданa адстойваў правы праваслаўнага насельніцтва ў сярэдзіне – другой палове XVIII ст.

Адметнай з'явай у літаратуры ўсходнеславянскіх народаў была асветніцкая і паэтычная дзейнасць С. Полацкага. У яго творчасці спалучыліся элементы рэнесансу, барока і класіцызму. Ён узбагаціў беларускую літаратуру новымі тэмамі і ідэямі, формамі і жанрамі, узняў сілабічнае вершаскладанне на высокі ўзровень. Пасмяротныя зборнікі С. Полацкага "Вертаград мнагацветны" і "Рыфмалагіён, ці Вершаслоў" (1681 г.) сталі настольнымі кнігамі адукаваных людзей і творцаў.

У эпоху Асветніцтва творы новай літаратуры пісаліся на польскай, рускай, лацінскай мовах (А. Нарушэвіч, Ф. Князьнін, Г. Каніскі,

Ф. Багамолец, К. Марашэўскі, Ю. Нямцэвіч і інш.). Пісьменнікі пачалі выкарыстоўваць беларускі фальклор, пласты беларускай лексікі. “Камедыя” (1787 г.) К. Марашэўскага напісана пераважна гутарковай беларускай мовай.

***Тэатр і музыка.*** Традыцыі народнага тэатральнага мастацтва падтрымлівалі вандроўныя скамарохі. Атрымаў распаўсюджанне на народных святах (асабліва ў калядны перыяд) лялечны тэатр – батлейка. Для гэтага выраблялі з дрэва спецыяльныя скрынкі, якія звычайна мелі выгляд хаткі ці царквы, з гарызантальнымі перагародкамі-ярусамі. Паказы суправаджаліся словамі і музыкай, а батлеечнік агучваў персанажы-лялькі рознымі галасамі. Звычайна прадстаўленне складалася з 2-х частак: рэлігійнай і свецкай (народна-бытавой). У батлейцы ігралі сцэны з жыцця простых людзей, ставіліся народныя драмы “Цар Ірад”, “Яўрэй і казак” і інш.

У познім Рэнесансе і асабліва ў эпоху Контррэфармацыі разгортвалася дзейнасць школьных тэатраў пры навучальных установах езуітаў: у Віленскай езуіцкай акадэміі, калегіумах у цэлым шэрагу гарадоў і буйных мястэчак Беларусі – у Полацку, Пінску, Гродне, Віцебску, Мінску, Нясвіжы, Брэсце, Слуцку, Магілёве і інш. Іх спектаклі на лацінскай і польскай мовах уяўлялі сабой пышныя відовішчы з музыкай, спевамі, танцамі.

Пышнасцю вылучалася музыка барока. Каля 70 музычных твораў у стылі барока былі ўключаны у зборнік “Полацкі сшытак” (“Астрамечаўскі рукапіс”), які быў выяўлены ў 1960-я гг. А. Мальдзісам. Цяпер творы з гэтага нотнага рукапісу актыўна выконваюцца мастацкімі калектывамі ў Беларусі і за мяжой.

У XVIII ст. на беларускіх землях былі створаны шматлікія прыдворныя тэатры, якія нярэдка з аматарскіх пераўтвараліся ў прафесійныя калектывы, набывалі еўрапейскую славу. Пры буйнейшых з іх адкрываліся школы, дзе рыхтавалі акцёраў, музыкантаў. Нясвіжскі тэатр Радзівілаў, які быў заснаваны ў 1746 г. Ф.У. Радзівіл, дзейнічаў з пэўнымі перапынкамі да 1791 г. У пастаноўках прымалі ўдзел прыгонныя акцёры, а таксама члены сям’і Радзівілаў, прадстаўнікі шляхты і кадэты. Балетмайстрамі ў тэатры працавалі Л. Дзюпрэ, Г. Петынецi, А. Пуціні і іншыя запрошаныя майстры. Значную ролю ў фарміраванні насычанага і арыгінальнага рэпертуара тэатра сыграла Ф.У. Радзівіл, якая стварыла 16 драматычных і оперных лібрэта – “Дасціпнае каханне”, “Каханне – зацікаўлены суддзя”, “Забава фартуны” і інш. У 1780-я гг. на пасаду дырыжора нясвіжскай капэлы быў запрошаны нямецкі кампазітар Я. Голанд. Тады ў тэатры Нясвіжа ставіліся многія класічныя творы замежных і мясцовых аўтараў. Важнай падзеяй стала пастаноўка ў 1784 г.

яго оперы “Агатка, або Прыезд пана” (лібрэта М. Радзівіла). Сваімі пастаноўкамі Нясвіжскі тэатр зацмяваў каралеўскія тэатры Рэчы Паспалітай.

У 1769–1780 гг. дзейнічаў тэатр А. Тызенгаўза ў Гродне, які набыў вядомасць сваім высокім выканальніцкім майстэрствам. У яго рэпертуары былі творы замежных аўтараў. Балетмайстрамі з’яўляліся Г. Петынеці, К. Марэлі. Трупа папаўнялася замежнымі артыстамі і выпускнікамі мясцовай музычна-драматычнай школы. У 1771–1791 гг. у Слоніме працавала прыдворная тэатральная трупа М.К. Агінскага – спачатку як плаваючы тэатр па рацэ Шчара, потым у пабудаваным спецыяльным памяшканні. Рэпертуар тэатра ўключаў лепшыя творы тагачаснага еўрапейскага сцэнічнага мастацтва, у тым ліку пастаноўкі “Зменены філосаф” і “Елісейскія палі” М.К. Агінскага. Яго балетная трупа паспяхова канкурыравала з каралеўскім балетам у Варшаве. Высокага прафесійнага ўзроўню дасягнуў тэатр Сапегаў у Ружанах (1765–1791 гг.), дзе балетмайстар М. Пранчынскі паставіў балет “Літасцівасць Ціта” і інш.

У канцы XVIII ст. буйныя тэатры на усходзе Беларусі заснавалі рускія вяльможы – З. Чарнышоў у Магілёве і Чачэрску, С. Зорыч у Шклове. Па шыкоўнасці пастановак з Нясвіжскім тэатрам Радзівілаў мог паспрачацца тэатр С. Зорыча ў Шклове (1778–1800 гг.), у якім выступалі замежныя акцёры, кадэты, прыгонныя артысты. Там працавалі балетмайстры П. Барцанці, Д. Хорват, М. Пранчынскі, высокім выканальніцкім майстэрствам вылучаўся акцёр П. Мяшчэрскі. Маштабная і пампезная тэатральная пастаноўка была паказана 30 мая 1780 г. з нагоды сустрэчы ў Шклове расійскай імператрыцы Кацярыны II і аўстрыйскага імператара Іосіфа II.

Паводле ацэнак мастацтвазнаўцаў, у XVIII ст. на беларускіх землях дзейнічалі 22 школьныя тэатры, 26 музычна-драматычных (оперна-балетных) тэатраў, каля 30 сімфанічных аркестраў. Акцёры тэатраў Гродна і Слоніма склалі аснову тэатра ў Варшаве, а артысты Шклоўскага тэатра з поспехам прадоўжылі выступленні на імператарскіх сцэнах у Пецярбургу і Маскве.

У цэлым, культура беларускіх зямель у эпоху Контррэфармацыі знаходзілася ў складаных умовах, выкліканых унутранымі і знешнімі фактарамі. Значна абвастрылася пытанне аб захаванні грамадска-культурнай і рэлігійнай самабытнасці беларусаў. Мастацкая культура барока характарызавалася ўзаемадзеяннем заходнееўрапейскага ўплыву з візантыйскімі і мясцовымі традыцыямі, што надало яму непаўторную самабытнасць. Найбольш поўна барока праявілася ў архітэктуры, у залежнасці ад якой было выяўленчае мастацтва. Беларуская культура барока выступіла ў якасці пасрэдніцы паміж заходнеславянскім і

ўсходнеславянскімі светамі. Ідэалогія Асветніцтва аказала значны ўплыў на фарміраванне прагрэсіўнай грамадскай думкі Беларусі.

**Паняцці**

**Асветніцтва** – антыфеадальная буржуазная ідэалогія перыяду станаўлення капіталізму, якая прапаведавала прыярытэт асветы, навукі і розуму ў жыцці асобы, грамадства і дзяржавы. Усталяванню Асветніцтва спрыялі навуковыя адкрыцці ў прыродазнаўстве і дасягненні гуманітарных ведаў. Як плынь культуры, грамадска-палітычнай думкі Асветніцтва адлюстроўвала нарастанне супярэчнасцей феадалізму ў эпоху буржуазных рэвалюцый. Узнікла з XVI ст. у заходнееўрапейскіх краінах (Галандыі, Англіі, Францыі), дзе перамаглі буржуазныя рэвалюцыі. На Беларусі ідэі Асветніцтва распаўсюдзіліся ў другой палове XVIII – пачатку XIX ст. і былі цесна звязаны з французскім, рускім, польскім, украінскім і літоўскім Асветніцтвам. Яны знайшлі адлюстраванне ў філасофіі, сацыялогіі, гістарычнай навуцы, літаратуры і мастацтве, вызначаліся паказам бытавых і этнічных умоў жыцця класаў і сацыяльных груп, праблем аўтаномнасці і адносін да Рэчы Паспалітай і Расіі, успрыняцця старажытнай духоўнай спадчыны, суіснавання розных пластоў у нацыянальнай культуры. Ідэйныя вытокі Асветніцтва на Беларусі ідуць ад творчасці і дзейнасці прагрэсіўных мысліцеляў XVII – пачатку XVIII стст. К. Лышчынскага, С. Полацкага, І. Капіевіча. Значны ўклад у культуру Асветніцтва зрабілі выхаванцы Кіева-Магілянскай духоўнай семінарыі сярэдзіны XVIII ст. (Г. Каніскі, Ф. Пракаповіч і інш.), Б. Дабшэвіч, К. Нарбут, М. Пачобут-Адляніцкі і інш.

**Барока** – вядучы мастацкі стыль у Еўропе ў XVI–XVIII стст. На яго станаўленне паўплывала ідэалогія Контррэфармацыі. Цэнтрам яго распаўсюджання быў Рым, але ў кожнай краіне барока набывала адметныя рысы. Стыль вызначаўся кантрастнасцю, напружанасцю, дынамічнасцю ў вырашэнні вобразаў, імкненнем да пышнасці і велічнасці, перапляценнем рэальнага і ілюзорнага ў пластыцы, ансамблевасцю. У мастацкай культуры Беларусі пачынаецца ў канцы XVI – пачатку XVII ст., найбольшага пашырэння атрымаў у XVII–XVIII стст. Беларускае барока вызначалася спалучэннем заходнееўрапейскіх уплываў з візантыйскімі і мясцовымі традыцыямі. У галіне архітэктуры барока на Беларусі прадстаўлена пераважна касцёламі, кляштарамі, палацавымі комплексамі. Першым архітэктурным помнікам барока быў Касцёл Божага Цела ў Нясвіжы (1587–1593 гг., архітэктар Дж.М. Бернардоні). У архітэктуры барока вылучаюцца 3 перыяды: ранняе барока (канец XVI – першая палова XVII ст.), сталае барока (другая палова XVII ст. – 1720-я гг.), позняе

барока (1730-я – 1780-я гг.). Позняе барока ў манументальнай культавай архітэктуры атрымала назву “віленскае барока”.

**Класіцызм** – мастацкі стыль XVII–XIX стст., адной з галоўных рыс якога быў зварот да антычнай спадчыны. Вызначаецца імкненнем да яснасці і чысціні прапорцый, ураўнаважанасці і гармоніі форм. У мастацкай культуры Беларусі рысы класіцызму з’явіліся ў канцы XVIII ст. (суіснавалі з барока). Найбольшае пашырэнне атрымаў у архітэктуры, выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве ў першай палове XIX ст. Для архітэктуры класіцызму характэрна прастата, строгасць, лагічная яснасць, манументальнасць, дакладнасць аб’ёмнай формы, сіметрычна-восевыя кампазіцыі, стрыманасць дэкаратыўнага аздаблення, рэгулярнасць планіроўкі гарадоў.

**Контррэфармацыя** – рэлігійна-палітычны рух у Еўропе ў другой палове XVI–XVII стст. на чале з папствам, накіраваны супраць Рэфармацыі. Яго галоўнай мэтай было аднаўленне страчаных каталіцкай царквой пазіцый у грамадска-культурным жыцці. Яе асноўнымі праваднікамі былі манаскія ордэны (найперш езуіты), рымская курыя, інквізіцыя. На Беларусі Контррэфармацыя ўзмацнілася пасля Люблінскай уніі 1569 г. Брэсцкая ўнія 1596 г. умацавала пазіцыі Контррэфармацыі, адкрыла шлях для больш жорсцкага ўціску. Ідэі Контррэфармацыі вызначалі духоўнае жыццё Беларусі амаль да сярэдзіны XVIII ст. У другой палове XVII – першай трэці XVIII ст. адбывалася амаль поўная клерыкалізацыя культуры і яе падпарадкаванне рэлігіі. Навуковыя веды абвяшчаліся грахоўнымі. Былі страчаны многія бліскучыя навуковыя і культурныя дасягненні папярэдніх стагоддзяў. У выяўленчым мастацтве ўздзеянне Контррэфармацыі не было такім адмоўным, як у літаратуры, грамадскай думцы. Пануючым стылем у эпоху Контррэфармацыі стала барока.

**Ракако** – стыль у еўрапейскім мастацтве XVIII ст. Яго характэрнымі рысамі з’яўляюцца пышнасць, вытанчанасць, багацце крывалінейных паверхняў, складанае кампазіцыйнае і каларыстычнае вырашэнне, камернасць, вялікая ўвага да міфалогіі. Ракако атрымала пашырэнне ў палацава-сядзібнай і культавай архітэктуры, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Беларусі з сярэдзіны XVIII ст.

### Дзеячы культуры, мастацтва

**Агінскі Міхал Казімір** (1730–1800) – грамадскі дзеяч, кампазітар, мецэнат. Яго сядзіба ў Слоніме пераўтварылася ў буйны еўрапейскі цэнтр мастацкай культуры, якую называлі “сядзібай музаў” – у 1770-я гг. М.К. Агінскі заснаваў там оперны тэатр, музычную капэлу, адкрыў балетную школу для дзяцей прыгонных. Аўтар опер “Зменены філосаф”,

"Елісейскія палі", паланезаў і іншых музычных твораў. Яму прыпісваюць аўтарства выдадзеных у Варшаве пад псеўданімам "Слонімскі грамадзянін" перадавых для свайго часу зборнікаў "Гістарычныя і маральныя аповесці" (1782 г.), "Байкі і не-байкі" (1788 г.).

**Бернардоні Джавані (Ян) Марыя** (1541–1605) – архітэктар, езуіт. Прыехаў з Рыма. Узводзіў Касцёл Божага Цела ў Нясвіжы у 1587–1593 гг. па фундацыі Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі. Удзельнічаў у будаўніцтве замка ў Нясвіжы.

**Глаўбіц Іаган (Ян) Крыштоф** (1700–1767) – архітэктар. Стваральнік віленскага барока (уласнага варыянта барока ў ВКЛ). Працаваў у Вільні. На Беларусі перабудаваў Сафійскі сабор у Полацку (1738–1750 гг.), пабудаваў касцёл Яна Хрысціцеля ў Сталавічах (сучасны Баранавіцкі раён), Спаскую царкву ў Магілёве, манастыр базыльян у Беразвеччы, кляштар кармелітаў у Глыбокім, архірэйскі палац у Магілёве і інш.

**Голанд Ян Давід** (1746–1827) – кампазітар. У 1780-я гг. быў прыдворным кампазітарам і капельмайстрам Нясвіжскай капэлы Радзівілаў. Напісаў у Нясвіжы шэраг паланезаў, кантат і опер. Найбольшае значэнне для музычнай культуры ВКЛ і асабліва Беларусі мела яго опера "Агатка, або прыезд пана" на лібрэта М. Радзівіла. Прэм'ера адбылася 17 верасня 1784 г. у Нясвіжы і была прымеркавана да прыезду ў горад караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

**Еўлашоўскі (Еўлашэўскі) Фёдар Міхайлавіч** (1546–1619) – пісьменнік і грамадскі дзеяч. Аўтар "Дыярыуша" ("Дзённіка") – самага ранняга помніка мемуарнага жанру ў беларускай літаратуры канца XVI – пачатку XVII ст. (упершыню апублікаваны У. Антановічам у 1886 г.).

**Жылібер Жан-Эмануэль** (1741–1814) – натураліст, хірург. Прыехаў з Францыі па запрашэнні А. Тызенгаўза. Стваральнік і кіраўнік Гродзенскай медыцынскай акадэміі (1775–1781 гг.). Заснаваў у Гродне таксама акушэрскую і ветэрынарную школы, клінічны шпіталь, батанічны сад. Разам са сваімі вучнямі вывучаў прыроду Беларусі і Літвы. Аўтар навуковага выдання "Флора Літвы" (1781–1782 гг.) і іншых прац па батаніцы, эпідэміялогіі.

**Зізаній (Тустаноўскі) Лаўрэнцій Іванавіч** (1550–1560-я – 1634) – педагог, царкоўны дзеяч, пісьменнік-палеміст. Выкладаў у праваслаўных брацкіх школах у Львове, Брэсце, Вільні. Славу і аўтарытэт вучонага-лінгвіста прынеслі яму выдадзеныя ў 1596 г. у Вільні вучэбныя кнігі "Азбука" (з тлумачальным слоўнікам "Лексісам"), "Грамматіка словенска съвершеннаго искусства осми частій слова". У 1627 г. быў выдадзены ў Маскве ў перапрацаваным выглядзе яго "Катехізис".

**Каніскі Георгій** (свецкае імя – **Рыгор**) (1717–1795) – праваслаўны царкоўны і грамадскі дзеяч, пісьменнік. Святы Беларускай Праваслаўнай

Царквы. У 1755 г. уведзены ў сан епіскапа магілёўскага (беларускага). Змагаўся за захаванне і адраджэнне праваслаўя на Беларусі. У 1757 г. адкрыў у Магілёве пры архірэйскім доме друкарню і выдаў на "рускім дыялекце" скарочаны тэкст "Катэхізіса" Ф. Пракаповіча, заснаваў духоўную семінарыю. Сабраў шмат дакументаў па гісторыі праваслаўнай царквы (каралеўскіх грамат і інш.). Аўтар "Мемарыяла аб крыўдах праваслаўным", "Правоў і вольнасці жыхароў грэчаскага веравызнання", "Збору павучальных слоў", "Трактату вечнай дружбы", драмы "Уваскрэсенне мёртвых" і іншых твораў. Кананізаваны Беларускай Праваслаўнай Царквой у 1993 г.

**Лышчынскі Казімір** (1634–1689) – мысліцель-атэіст. Аўтар трактата "Аб неіснаванні Бога", у якім выступіў супраць рэлігійнага светаразумення і хрысціянскай рэлігіі.

**Макоўскі Тамаш** (1562 або 1575–1630) – прыдворны мастак Радзівілаў. Выгравіраваў першую дакладную геаграфічную карту ВКЛ (каля 1603 г., захавалася 2-е выданне 1613 г.), да якой склаў тлумачальны тэкст, даў агульную характарыстыку дзяржавы. Аўтар гравюр Вільні, Масквы, Нясвіжа, Клецка, Тракая і іншых гарадоў, ілюстрацый да кніг "Перэгрынацыя, або Паломніцтва ў Святую зямлю" М.К. Радзівіла (1601 г.), "Гіпіка" (кніга аб конях) К.М. Дарагастайскага і інш.

**Пачобут-Адляніцкі Марцін** (1728–1810) – астраном і асветнік. У 1780–1799 гг. з'яўляўся рэктарам Галоўнай школы ВКЛ. Надаў працэсу навучання амаль свецкі характар. Узначальваў Віленскую астранамічную абсерваторыю ў 1764–1807 гг.

**Радзівіл Мікалай Крыштоф** (мянушка **"Сіротка"**) (1549–1616) – грамадскі дзеяч, мецэнат, пісьменнік. Займаўся ўмацаваннем ідэй Контррэфармацыі. Аўтар лацінамоўнай кнігі "Перэгрынацыя, або Паломніцтва ў Святую зямлю" (1601 г.). Запрашаў з-за мяжы таленавітых архітэктараў (Дж.М. Бернардоні), ліцейшчыкаў, рамеснікаў. Фундаваў касцёлы і шпіталі ў Нясвіжы, Міры, Свержані, Чарнаўчыцах, Дуброве, Бялай. Пабудаваў замкі ў Бялай і Нясвіжы (сабраў там галерэю партрэтаў, бібліятэку, збраёўню), езуіцкі калегіум, кляштар бенедыкцінак, кляштар бернардзінцаў у Нясвіжы. Па ініцыятыве М.К. Радзівіла і за яго сродкі была выгравіравана Т. Макоўскім першая дакладная геаграфічная карта ВКЛ.

**Радзівіл Францішка Уршуля** (1705–1753) – пісьменніца. Лічыцца першай у ВКЛ жанчынай-драматургам. Яе драматычныя творы і оперныя лібрэта выконваліся на тэатральных сцэнах у Нясвіжы і Альбе (каля Нясвіжа). Аўтар камедый "Дасціпнае каханне", "У вачах нараджаецца каханне", "Каханне – зацікаўлены суддзя", "Суддзя, пазбаўлены розуму",

"Забавы фартуны" і інш. Драматычныя творы Ф.У. Радзівіл былі надрукаваны ў Жоўкве ў 1754 г.

**Сака Джузэпэ (Юзаф)** (1735–1798) – архітэктар. Прадстаўнік архітэктуры барока і класіцызму. Прыдворны архітэктар А. Тызенгаўза, галоўны архітэктар Гродзенскіх каралеўскіх мануфактур. У 1770-я гг. кіраваў будаўнічай школай у Гродне. Пабудаваў Аўгустоўскі, Станіслаўскі палацы, палац Я. Валовіча ў Свяцку, палац у Шчорсах (разам з К. Спампані), праводзіў рэканструкцыю гродзенскага Новага замка, палацаў Тызенгаўзаў у Гродне (разам з І.Г. Мёзерам), Паставах, Вільні і іншых пабудоў.

**Семяновіч Казімір** (каля 1600 – пасля 1651) – інжынер, мысліцель-гуманіст. Ураджэнец ВКЛ. У 1650 г. у Амстэрдаме выдаў на лацінскай мове трактат "Вялікае майстэрства артылерыі", які пазней перакладаўся на французскую, нямецкую, англійскую, галандскую, польскую і іншыя мовы, больш 200 гадоў быў у Еўропе падручнікам па артылерыі. У кнізе ўпершыню была прапанавана ідэя шматступенчатай ракеты.

**Сімяон Полацкі** (свецкае імя – **Самуіл Гаўрылавіч Пятроўскі-Сітняновіч**) (1629–1680) – рэлігійны і грамадскі дзеяч, паэт, драматург, перакладчык, педагог. Стаяў у вытокаў першага ў Расіі тэатра (адкрыты пры царскім двары ў 1672 г.), арганізаваў друкарню ў Крамлі. Адзін з родапачынальнікаў рускай сілабічнай паэзіі. Аўтар зборнікаў пропаведзяў "Абед душэўны" (1681 г.), "Вячэрня душэўная" (1683 г.). Складаў оды, элегіі, гімны, панегірыкі, эпітафіі і іншыя творы. Па яго творах М. Ламаносаў упершыню пазнаёміўся з вершаскладаннем. Аснову літаратурнай спадчыны С. Полацкага складаюць 2 вялікія зборнікі, падрыхтаваныя ў канцы 1670-х гг., але выдадзеныя пасмяротна: "Вертаград мнагацветны" і "Рыфмалагіён, ці Вершаслоў" (1681 г.). Яшчэ пры жыцці яго першы зборнік быў ацэнены як энцыклапедыя, з якой чэрпалі веды па хрысціянскай сімволіцы, гісторыі, антычнай міфалогіі, тэалогіі. У другім зборніку панегірычнай накіраванасці змешчаны драматычныя творы "Камедыя прытчы пра блуднага сына…" і "Пра Навуходаносара цара…", якія ставіліся ў прыдворных тэатрах Крамля.

**Сматрыцкі Мялецій** (свецкае імя – **Максім**) (1577–1633) – царкоўны і грамадскі дзеяч, пісьменнік-палеміст. Выступаў супраць Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. Аўтар шэрагу антыўніяцкіх палемічных прац. У 1610 г. пад псеўданімам Тэафіла Арталога выдаў "Трэнас", дзе ад імя "маці-царквы", што сімвалізавала прыгнечаную Бацькаўшчыну, заклікаў народы Беларусі і Украіны да аб'яднання супраць каталіцызму. У 1618–1619 гг. выдаў кнігу "Граматыкі славенскія правільна сінтагма...", якая больш за 200 гадоў была адным з найбольш аўтарытэтных падручнікаў славянскага мовазнаўства.

**Собаль Спірыдон Міронавіч** (у манастве – **Сільвестр**) (каля 1580–1590 – 1645) – друкар і асветнік. Заснаваная ім у 1630 г. пад Оршай друкарня Куцеінскага манастыра стала цэнтрам беларускага кірылічнага кнігадрукавання. Галоўнай надрукаванай працай С. Собаля стаў напісаны ім “Буквар” (1631 г., другое выданне ім зроблена ў Магілёве ў 1636 г.). Таксама ў Куцейне надрукаваў у 1631–1632 гг. “Часаслоў”, “Малітваслоў”, у адкрытай ім друкарні ў Буйнічах каля Магілёва – “Псалтыр” (1635 г.), у Магілёўскай брацкай друкарні выдаў, акрамя “Буквара”, “Псалтыр” (1637 г.), “Тастамент” (1638 г.).

**Тызенгаўз Антоній** (1733–1785) – грамадскі дзеяч, мецэнат. Актыўны прыхільнік ідэй Асветніцтва, рэфарматар. Забудаваў прадмесце Гродна – Гарадніцу, дзе размяшчаліся батанічны сад, медыцынская акадэмія, кадэцкі корпус, заснаваныя ім мануфактуры і інш. Арганізаваў у Гродне прыдворныя тэатр, балетную трупу, аркестр (капэлу), музычна-тэатральную школу, заснаваў друкарню. Тэатр і капэла А. Тызенгаўза вызначаліся высокім прафесійным узроўнем і славіліся за мяжой.

**Філіповіч Афанасій (Афанасій Брэсцкі)** (каля 1596 – 1648) – пісьменнік-публіцыст, грамадскі і царкоўны дзеяч. Святы Беларускай Праваслаўнай Царквы. Актыўна выступаў супраць Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г., заганаў знешняй і ўнутранай палітыкі Рэчы Паспалітай, у абарону інтарэсаў сацыяльных нізоў беларускага і ўкраінскага народаў. Аўтар “Дыярыуша” (1646 г.), у якім змешчана ўся яго публіцыстыка і напеў. Кананізаваны Рускай Праваслаўнай Царквой як вялікапакутнік.

**Храптовіч (Літавор-Храптовіч) Іахім Ігнацы Юзаф** (1729–1812) – грамадскі і культурны дзеяч, мецэнат. Актыўны прыхільнік ідэй Асветніцтва, рэфарматар. Адзін з кіраўнікоў Адукацыйнай камісіі. У родавым маёнтку Шчорсы Навагрудскага павета ў 1770–1776 гг. быў створаны палацава-паркавы ансамбль, у палацы была сабрана багатая прыватная бібліятэка, якой карысталіся І. Лелявель, А. Міцкевіч, У. Сыракомля і многія іншыя вядомыя дзеячы навукі, літаратуры, а бібліятэкарам працаваў Я. Чачот.

## Тэма 6. Культура беларускіх зямель у канцы XVIII – XIX ст.

***Агульная характарыстыка.*** Пасля ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст. грамадска-культурнае жыццё на беларускіх землях разгортвалася пад уплывам розных фактараў. У яго развіцці можна выдзеліць 2 перыяды: канец XVIII ст. – 1850-я гг.; 1860–1890-я гг. Пры аналізе культурнага жыцця перыяду канца XVIII ст. – 1850-х гг. трэба вылучыць наступныя яго асноўныя тэндэнцыі:

– дэмакратызацыя;

– узаемадзеянне культур (асабліва польскай і рускай);

– стылявая разнастайнасць (класіцызм, рамантызм, рэалізм і інш.);

– пачатак фарміраванння “краёвай інтэлігенцыі”;

– разгортванне даследаванняў беларускай гісторыі і культуры.

Сярод асаблівасцей развіцця культуры Беларусі ў канцы XVIII ст. – 1850-я гг. варта назваць наступныя: яе выразныя свецкія рысы; захоўвалася традыцыйная (народная) культура і мастацтва; пачалося фарміраванне асобных відаў прафесійнага беларускага мастацтва; шматмоўе і полікультурнасць (літаратурная, мастацкая спадчына належыць адначасова некальскім народам); станаўленне новай беларускай літаратуры; уплыў нацыянальна-вызваленчага руху; асновай фарміравання інтэлігенцыі стала паланізаваная беларуская шляхта; паступовая інтэграцыя ў культурную і адукацыйную прастору Расійскай імперыі; развіццё ва ўмовах усталявання капіталістычных адносін і інш.

У культурным жыцці 1860–1890-х гг. можна выдзеліць наступныя асноўныя тэндэнцыі:

– уздзеянне вынікаў паўстання 1863–1864 гг. на стан літаратуры, мастацтва;

– развіццё культуры ва ўмовах фарміравання беларускай нацыі;

– працяг узаемадзеяння культур;

– стылявая эвалюцыя ў мастацкай культуры (эклектызм, гістарызм стыляў, рэалізм, мадэрн і іншыя стылі);

– шырокае развіццё беларусазнаўства;

– уплыў працэсаў капіталістычнай мадэрнізацыі і інш.

***Асвета і навука.*** Праведзеная ў Расійскай імперыі ў пачатку XIX ст. школьная рэформа закранула і беларускія землі. У 1805 г. у Свіслачы была адкрыта першая на Беларусі гімназія. Пазней гімназіі былі адкрыты ў Мінску, Віцебску, Магілёве, Гродне, Жыровічах. Пачалі з’яўляцца школы ўзаемнага навучання ці ланкастарскія школы (першая з іх заснавана ў 1819 г. у Гомелі). У 1803 г. на аснове Галоўнай школы ВКЛ быў адкрыты ў Вільні ўніверсітэт, які стаў цэнтрам Віленскай навучальнай акругі, куды ўвайшлі і беларускія землі. Віленскі ўніверсітэт паспрыяў узмацненню паланізацыі, фарміраванню “краёвай” інтэлігенцыі, пераўтварыўся ў цэнтр вальнадумства і пашырэння антыцарскіх настрояў (дзейнічалі таварыствы філаматаў, філарэтаў і інш.). У 1812–1820 гг. існавала езуіцкая акадэмія ў Полацку. Пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. Віленскі ўніверсітэт быў закрыты царызмам у 1832 г. Замест яго ў Вільні былі створаны медыка-хірургічная і духоўная рымска-каталіцкая акадэміі, якія ў пачатку 1840-х гг. былі пераведзены адпаведна ў Кіеў і Пецярбург.

У канцы 1820-х гг. у адукацыі Расійскай імперыі назіраўся паварот да рэакцыі. Уводзіўся саслоўны прынцып навучання, адбывалася выхаванне вучняў і студэнтаў у духу адданасці самадзяржаўю і праваслаўю, узмацнілася

барацьба з польскім уплывам. У навучальных установах на тэрыторыі Беларусі выкладанне пераводзілася на рускую мову.

У 1840 г. у Горы-Горках Магілёўскай губерні была адкрыта земляробчая школа (з 1848 г. – земляробчы інстытут) – першая ў Расійскай імперыі вышэйшая сельскагаспадарчая навучальная ўстанова, якая адыграла вялікую ролю ў развіцці навукі і падрыхтоўцы спецыялістаў для сельскай гаспадаркі. Аднак пасля паўстання 1863–1864 гг. інстытут быў закрыты і пераведзены ў Пецярбург.

Праведзеная школьная рэформа 1860-х гг. абвяшчала ўсесаслоўнасць адукацыі, аднак была нацэлена на выхаванне вучняў у духу адданасці царызму, “тэорыі афіцыйнай народнасці”. Замест закрытых прагімназій у Навагрудку, Свіслачы і Маладзечне былі адкрыты настаўніцкія семінарыі – у Маладзечне (1864 г.), Полацку (1872 г.), Нясвіжы (1875 г.), Свіслачы (1876 г.). У 60–90-я гг. XIX ст. на беларускіх землях пераважалі пачатковыя школы – народныя вучылішчы, царкоўна-прыходскія школы і школы граматы, у гарадах – прыходскія павятовыя і гарадскія вучылішчы. Выкладанне прадметаў у школах праходзіла выключна на рускай мове. Непісьменнасць заставалася вострай сацыяльнай праблемай.

З канца XVIII – пачатку XIX ст. пачалося комплекснае вывучэнне гісторыі, мовы, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, што было абумоўленае палітычнымі і эканамічнымі інтарэсамі царскіх улад. У першай трэці XIX ст. буйнейшым навуковым цэнтрам з’яўляўся Віленскі ўніверсітэт. Разгарнулася збіранне і сістэматызацыя гістарычнага, этнаграфічнага, фальклорнага матэрыялу. У першай палове XIX ст. праблематыкай гісторыі ВКЛ займаліся І. Лелявель, М. Баброўскі, І. Грыгаровіч, І. Даніловіч, З. Даленга-Хадакоўскі, А. Кіркор, Т. Нарбут, браты Я. і К. Тышкевічы і інш. І. Грыгаровіч сабраў і выдаў у 4-х тт. “Беларускі архіў старажытных грамат”, а пазней таксама “Акты Заходняй Расіі” у 5 тт. і інш. Аўтар “Гісторыі літоўскага народа” у 9 тт. Т. Нарбут таксама апублікаваў шэраг гістарычных крыніц, у тым ліку “Хроніку Быхаўца”. М. Баброўскі займаўся пошукамі беларускіх пісьмовых крыніц і старадрукаў, адкрыў Супрасльскі рукапіс, а І. Даніловіч упершыню выявіў і надрукаваў Судзебнік Казіміра IV, Статут ВКЛ 1529 г. і інш. П. Шпілеўскі вывучаў этнаграфію беларусаў, з’яўляецца аўтарам нарысаў “Падарожжа па Палессі і беларускім краі”, “Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках” і іншых белетрызаваных прац, якія атрымалі папулярнасць у расійскім грамадстве. Адметнай была дзейнасць братоў Я. і К. Тышкевічаў. Яны стаялі ў вытокаў беларускай археалагічнай навукі, іх намаганнямі ў 1842 г. у Лагойску быў створаны першы на Беларусі музей старажытнасцей, а ў 1855 г. – Віленскі музей старажытнасцей.

У другой палове XIX ст. вывучэннем гісторыка-культурнай спадчыны беларусаў займалася Акадэмія навук Расіі і Паўночна-Заходняе аддзяленне

Рускага геаграфічнага таварыства, Віленскае археаграфічнае і археалагічнае таварыствы. Беларусазнаўчыя даследаванні праводзіў цэлы шэраг вучоных. Высокім навукова-метадалагічным узроўнем вылучаліся працы І. Насовіча, Е. Раманава, М. Нікіфароўскага, Я. Карскага, М. Доўнар-Запольскага, М. Янчука, А. Багдановіча і інш. З пазіцый "заходнерусізму" асвятляў гісторыю Беларусі М. Каяловіч. Найбольш значнымі і каштоўнымі працамі былі 9 тамоў "Беларускага зборніка" (1886–1912 гг.) Е. Раманава, "Слоўнік беларускай гаворкі" (1870 г.) І. Насовіча, 3 тамы "Матэрыялаў для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю" (1887–1902 гг.) П. Шэйна, 3-і том выдання "Маляўнічая Расія" (1882 г.) А. Кіркора, 8 тамоў працы "Люд беларускі" (1897–1981 гг.) М. Федароўскага і інш.

***Літаратура.*** Адметнай асаблівасцю літаратуры Беларусі ў канцы XVIII – XIX ст. з'яўлялася яе шматмоўнасць. Таленавітыя ўраджэнцы беларускіх зямель сталі своеасаблівымі донарамі суседніх літаратур, хаця служылі і роднай зямлі, выказваючы думкі і пачуцці беларускага народа на польскай і рускай мовах (А. Міцкевіч, Я. Чачот, У. Сыракомля, П. Шпілеўскі і інш.). Мастацкая апрацоўка вуснай народнай творчасці спрыяла нараджэнню новай беларускай літаратурнай мовы, нацыянальнай літаратуры. Станаўленню беларускай літаратуры садзейнічала творчасць А. Міцкевіча, Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, А. Рыпінскага, У. Сыракомлі, К. Вераніцына (аўтара паэмы "Тарас на Парнасе"), В. Равінскага (аўтара паэмы "Энеіда навыварат") і іншых пісьменнікаў і паэтаў. Польскамоўныя паэмы "Пан Тадэвуш", "Дзяды", "Мешка, князь Наваградка", "Гражына", "Конрад Валенрод", балады "Свіцязь" і іншыя творы А. Міцкевіча, якія заснаваны на багатым фальклоры і культурна-гістарычнай спадчыне беларускіх зямель, з'яўляюцца значным дасягненнем славянскай літаратуры. Я. Чачот выдаў у 1837–1846 гг. сабраныя ім "Сялянскія песні", на беларускім фальклоры заснаваны былі яго балады "Наваградскі замак", "Калдычэўскі шчупак", "Мышанка" і іншыя творы. Я. Баршчэўскі праславіўся сваім зборнікам "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" (1844–1846 гг.), які параўноўвалі з усходнім казачным цыклам "Тысяча і адна ноч". У. Сыракомля пакінуў пасля сябе шмат гістарычных і краязнаўчых даследаванняў.

Асаблівым нацыянальна-культурным каларытам вызначалася творчасць класіка новай беларускай літаратуры, заснавальніка нацыянальнай драматургіі В. Дуніна-Марцінкевіча. Яго "Пінская шляхта", "Залёты", "Ідылія", "Гапон", "Рэкруцкі яўрэйскі набор" і іншыя творы да сённяшняга часу не зыходзяць з тэатральнай сцэны. У яго творах назіралася паэтызацыя духоўнай прыгажосці і годнасці беларускіх сялян, гісторыі Беларусі разам з праўдзівым паказам рэчаіснасці, раскрыццём унутранага свету, псіхалогіі чалавека ў кантэксце няпростых сацыяльных адносін.

Публіцыстыка К. Каліноўскага на старонках газеты “Мужыцкая праўда” (1862–1863 гг.) і яго “Лісты з-пад шыбеніцы” разам з прадчуваннем аптымістычнай перспектывы прынеслі ў беларускую літаратуру жанравае і стылёвае ўзбагачэнне. Аднак у гісторыі беларускай літаратуры 1860–1880-я гг. былі даволі неспрыяльнымі, што з’яўлялася наступствам падаўлення царызмам паўстання 1863–1864 гг. Арыгінальныя беларускія мастацкія творы публікаваліся па-за межамі Беларусі. Некаторае ажыўленне падцэнзурнага беларускамоўнага друку пачалося толькі з канца 1880-х гг.

Буйнейшай постаццю беларускай літаратуры і грамадскай думкі XIX ст. з’яўляецца Ф. Багушэвіч. З яго імем звязаны цэлы этап у гісторыі рэвалюцыйнага дэмакратызму, канчатковае ўмацаванне крытычнага рэалізму ў беларускай літаратуры. У 1891 г. у Кракаве выйшаў зборнік Ф. Багушэвіча “Дудка беларуская”, а ў 1894 г. у Познані выдадзены яго другі зборнік – “Смык беларускі”. У мясцовым перыядычным друку ў 1890-я гг. (найперш у газеце “Минский листок”) змяшчаў беларускамоўныя вершы Я. Лучына, які ў сваёй творчасці быў блізкім па духу Ф. Багушэвічу.

***Тэатр і музыка.*** У канцы XVIII – першай трэці XIX ст. на беларускіх землях дзейнічалі прыватнаўласніцкія оперныя і драматычныя трупы, капэлы (аркестры). Еўрапейскую славу атрымалі тэатры Радзівілаў у Нясвіжы, Зорыча ў Шклове, Агінскага ў Слоніме, Тышкевічаў у Свіслачы і Плешчаніцах, Чарнышова ў Магілёве і Чачэрску. Пры тэатрах існавалі балетныя і іншыя школы. Пашырэнню хатняга музіцыравання і выхавання спрыяла дзейнасць музычных салонаў А. Тызенгаўза ў Жалудку, М. К. Агінскага ў Залессі, генерала К. Завішы ў Кухцічах і інш. Сядзіба Залессе М.К. Агінскага пад Смаргонню, якую сучаснікі называлі Паўночнымі Афінамі, ператварылася ў буйны мастацкі цэнтр. Папулярызацыі музычнай культуры ў першай палове – сярэдзіне XIX ст. садзейнічаў гарадскі аркестр у Мінску, дырыжорамі якога былі браты Д. і В. Стэфановічы. Д. Стэфановіч з’яўляўся настаўнікам кампазітара С. Манюшкі, піяніста і кампазітара Ф. Міладоўскага, піяністкі і педагога К. Марцінкевіч. Пашырэннем музычнай культуры займаліся таксама гарадскія аркестры ў Магілёве, Гомелі, Віцебску і іншых гарадах Беларусі.

Аднак з 1830-х гг. прыватнаўласніцкія тэатры спынілі сваю дзейнасць. З сярэдзіны XIX ст. на Беларусі гастралявалі рускія, польскія і ўкраінскія тэатральныя трупы.

У такіх абставінах адбывалася нараджэнне ў 1840–1850-я гг. беларускага нацыянальнага тэатра. Яго пачынальнікам быў В. Дунін-Марцінкевіч і яго аднадумцы з асяроддзя беларускай і польскай інтэлігенцыі. У 1846 г. ён надрукаваў музычна-драматычны твор “Сялянка” (“Ідылія”). З беларускімі землямі звязаны пачатковы перыяд жыцця і станаўленне творчасці кампазітара С. Манюшкі, які з’яўляецца аўтарам цэлага шэрагу музычных вадэвіляў, камічных опер і камедый. Найбольш вядомы яго “Рэкруцкі набор” (паводле В.

Дуніна-Марцінкевіча), “Галька”, “Страшны двор” і інш. Першая класічная беларуская опера “Сялянка” (“Ідылія”) С. Манюшкі і К. Кжыжаноўскага на лібрэта В. Дуніна-Марцінкевіча была ўпершыню пастаўлена ў 1852 г. у гарадскім тэатры Мінска. Хоць пасля гэтага дзейнасць тэатра была забаронена, аднак нелегальныя паказы “Сялянкі” адбываліся да 1856 г. у Мінску, Бабруйску, Слуцку і іншых гарадах. В. Дунін-Марцінкевіч арганізаваў у фальварку Люцынка Мінскага павета тэатральную трупу – першы беларускі тэатр, які паказваў спектаклі ў розных мясцовасцях Беларусі. У камедыях “Халімон на каранацыі” (1857 г.), “Пінская шляхта” (1866 г.), “Залёты” (1870 г.) В. Дунін-Марцінкевіч паэтызаваў сялянскую працу, высмейваў адмоўныя рысы характару прадстаўнікоў розных саслоўяў, востра крытыкаваў недахопы грамадскага жыцця. На беларускім фальклоры былі заснаваны творы кампазітара А. Абрамовіча: “Беларускае вяселле”, “Беларускія мелодыі”, “Зачараваная дуда” і інш.

У другой палове XIX ст. умовы для тэатральнага і музычнага мастацтва былі даволі складаныя. Ліквідацыя вандроўных тэатраў адбылася ў ходзе праведзенай яшчэ ў 1840-я гг. тэатральнай рэформы. Уведзены пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. рэжым выключных законаў надоўга перапыніў працэс станаўлення беларускага прафесійнага тэатра. Нацыянальнае тэатральнае мастацтва развівалася ў аматарскіх, народна-фальклорных формах. Па-ранейшаму вялікай папулярнасцю карыстаўся лялечны тэатр – батлейка. Разам са зборам, вывучэннем і публікацыямі беларускіх песень кампазітарамі ажыццяўляліся спробы іх апрацоўкі і канцэртнага выканання. У канцы XIX ст. у Мінску, Віцебску, Магілёве і іншых гарадах узніклі таварыствы аматараў выяўленчых мастацтваў і музыкі.

***Выяўленчае мастацтва.*** У развіцці беларускага выяўленчага мастацтва ў першай трэці XIX ст. значную ролю адыграла Віленская школа жывапісу, якая была прадстаўлена мастацкімі кафедрамі Віленскага ўніверсітэта. Шмат для яе станаўлення зрабіў мастак і педагог Ф. Смуглевіч. Выхаванцамі гэтай школы былі мастакі Я. Дамель, В. Ваньковіч, І. Аляшкевіч, К. Русецкі, М. Кулеша, Н. Орда, І. Хруцкі і інш. У 1866 г. рускі мастак І. Трутнеў стаў арганізатарам і заснавальнікам Віленскай рысавальнай школы, якая давала першапачатковую мастацкую адукацыю і рыхтавала выкладчыкаў для мясцовых гімназій. Пасля закрыцця Віленскага ўніверсітэта атрымаць мастацкую адукацыю ехалі ў Пецярбургскую акадэмію мастацтваў, у другой палове XIX ст. – таксама ў Маскоўскае вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства, Варшаву, Кіеў, Адэсу. Некаторыя накіроўваліся на вучобу за мяжу.

На мастацкае жыццё Беларусі ў другой палове XIX ст. значна ўплывалі рускія мастакі І. Рэпін (набыў каля Віцебска памесце Здраўнёва, дзе былі створаны многія шэдэўры жывапісу), І. Шышкін (ствараў свае лепшыя палотны па эцюдах, зробленых у Белавежскай пушчы), К. Савіцкі і інш. З

канца XIX ст. наладжваліся выстаўкі Таварыства перасоўнікаў, пачалі дзейнічаць прыватныя мастацкія школы.

У першай палове XIX ст. у выяўленчым мастацтве назіралася змена, перапляценне стыляў – класіцызму, сентыменталізму, рамантызму, рэалізму. Дамінуючае становішча займаў партрэт і гістарычны жанр, складваліся новыя жанры – пейзаж, бытавы жанр, нацюрморт.

У гістарычным жанры жывапісу Беларусі першай паловы XIX ст. адлюстроўвалася беларуская і польская гісторыя, антычная міфалогія і гісторыя, евангельскія сюжэты. В. Ваньковіч напісаў карціны "Подзвіг маладога кіяўляніна пры аблозе Кіева печанегамі ў 968 годзе", "Напалеон каля вогнішча", шэраг партрэтаў. Да ліку лепшых твораў мастака адносіцца кампазіцыйны партрэт "Міцкевіч на скале Аю-Даг" (1828 г.). Майстрам гістарычнага жанру быў Я. Дамель: "Хрышчэнне княгіні Вольгі", "Смерць магістра крыжаносцаў Ульрыха фон Юнгінгена ў бітве пад Грунвальдам", "Смерць Глінскага ў няволі", "Павел І вызваляе Касцюшку з цямніцы" і інш. У Я. Сухадольскага шэраг карцін заказаў фельдмаршал І. Паскевіч для свайго палаца ў Гомелі. Мастаку належаць наступныя палотны гістарычнага і батальнага жанраў: "Узяцце рускімі войскамі крэпасці Карс", "Штурм крэпасці Ахалцых", "Пераход арміі Напалеона цераз Бярэзіну", "Фельдмаршал Паскевіч прымае дэлегацыю жыхароў Эрзурума" і інш.

Партрэтны жанр у першай палове эвалюцыяніраваў – ад класічных партрэтаў І. Аляшкевіча, А. Ромера, Ю. Пешкі да поўнасцю рэалістычных, глыбока праўдзівых партрэтаў І. Хруцкага, В. Ваньковіча. Беларускія жывапісцы творча ўспрымалі ўсё перадавое, што і надало партрэтнаму жанру вядучую ролю ў жывапісе.

Прызнаным майстрам нацюрморта ў беларускім і рускім выяўленчым мастацтве стаў І. Хруцкі (яго палотны"Кветкі і садавіна", "Грыбы і агуркі" і інш.). Мастакі бытавога жанру ўсё часцей звярталіся да жыцця сацыяльных нізоў. Даволі цікавыя бытавыя карціны стварылі Ю. Карчэўскі, Ц. Бычкоўскі, К. Русецкі.

Выдатным пейзажыстам быў В. Дмахоўскі, якога празвалі "Клодам Лоранам віленскіх ваколіц". Ім напісаны рамантычныя пейзажы "Возера Свіцязь", "Дом Міцкевіча ў Навагрудку", "На пачлезе" і інш. Майстар замалёвак помнікаў дойлідства і гістарычных мясцін Н. Орда стаў заснавальнікам гісторыка-архітэктурнага пейзажу.

У другой палове XIX ст. працягваўся працэс дэмакратызацыі выяўленчага мастацтва, узрасла роля рэалістычных прынцыпаў паказу рэчаіснасці. У станковым жывапісе вядучае месца займаў гістарычны жанр, аднак рысы рамантызму ў ім перапляліся з рэалізмам, акцэнт рабіўся на сацыяльную праблематыку (К. Альхімовіч, М. Андрыёлі). Пейзажны жанр стаў набываць самастойнае значэнне, адлюстроўваць грамадскія,

дэмакратычныя ідэалы (А. Гараўскі і інш.). У партрэтным жывапісе ўзрос інтарэс мастакоў да перадачы псіхалагічнага стану асобы, яе сацыяльнай прыналежнасці (А. Гараўскі, Б. Русецкі, Н. Сілівановіч).

К. Альхімовічам напісаны шматфігурныя бытавыя і гістарычныя кампазіцыі “Смерць Міхаіла Глінскага ў турме”, “Смерць у выгнанні”, “Пахаванне на Урале”, “Пахаванне Гедыміна”, “Ліздзейка з дачкой на руінах царквы Перуна” і інш. М. Андрыёлі стварыў цыкл гістарычных ілюстрацый і эскізаў: “Смерць Кейстута”, “Гусляр”, “Хрышчэнне язычнікаў” і інш. У высокамастацкіх творах А. Гараўскага апяваецца прырода Беларусі, народны побыт: “Вечар у Мінскай губерні”, “Цвіце канюшына”, “Свіслач”, “На радзіме”, “Пінскія балоты” і інш. Н. Слівановіч вядомы сваімі партрэтамі і іконамі, выканаў сумесна з І. Лавярэцкім у тэхніцы мазаікі кампазіцыю “Тайная вячэра” для галоўнага іканастаса Ісакіеўскага сабора ў Пецярбургу.

***Архітэктура.*** У сувязі з разгорнутай перабудовай гарадоў Расійскай імперыі змянялася аблічча беларускіх гарадоў. Адбывалася іх перапланіроўка на прынцыпах класіцызму. Гарады набывалі пераважна прамавугольную сетку кварталаў, прамыя вуліцы, плошчы набылі выразныя геаметрычныя абрысы. Пры ўзвядзенні крэпасцей у Бабруйску і Брэсце была страчана гістарычная архітэктурная спадчына гэтых старажытных беларускіх гарадоў. Бабруйская крэпасць будавалася ў 1807–1812 гг. і пасля Айчыннай вайны 1812 г. да 1825 г. паводле плана К. Опермана. Першыя праекты будаўніцтва крэпасці ў Брэсце не прадугледжвалі знішчэння гістарычнай забудовы горада (налічвалася 18 культавых збудаванняў розных канфесій). У 1836–1842 гг. па праекту К. Опермана, І. Малецкага, А. Фельдмана Брэсцкая крэпасць была ўзведзена (у 1864–1888 гг. яе мадэрнізавалі па праекту Э. Татлебена). Толькі некалькі ранейшых пабудоў былі прыстасаваны для ваенных патрэб.

У канцы XVIII – першай палове XIX стст. у архітэктуры Беларусі пануючым становіцца стыль класіцызм (разам з ампірам, рысамі рамантызму), з сярэдзіны XIX ст. пашыраецца эклектызм, гістарызм (пераймание гістарычных стыляў мінулага – неаготыка, неакласіцызм, неабарока і інш.), мадэрн.

Сярод значных пабудоў класіцызму канца XVIII – першай паловы XIX ст. трэба адзначыць Іосіфаўскі сабор (не захаваўся) і будынак семінарыі ў Магілёве (архітэктар М. Львоў), палац у Крычаве (архітэктар І. Староў) і інш. У сядзібна-палацавым дойлідстве развівалася шырокая тыпалогія будынкаў ад раскошных палацавых комплексаў да невялікіх дамоў з порцікам на фасадзе. Іх стваральнікамі былі архітэктары А. Ідзкоўскі, К. Падчашынскі, Ф. Яшчалд і інш. Буйнейшы палацавы ансамбль у стылі класіцызму – палац Румянцавых-Паскевічаў у Гомелі – узводзіўся з 1785 г. у некалькі этапаў. У пачатку XIX ст. архітэктар Дж. Кларк перабудаваў палац у Гомелі, спраектаваў фактычна ўсю архітэктуру гэтага горада. Менавіта паводле яго праекта ў стылі класіцызму ў

Гомелі быў пабудаваны ў 1809–1819 гг. Петрапаўлаўскі сабор. Прынцыпы класіцызму знайшлі адлюстраванне ў касцёле піяраў у Лідзе, касцёлах у Рось (Ваўкавыскі раён), Вішнева (Смаргонскі раён), цэрквах у Слаўгарадзе, Чачэрску і інш. З найбольш значных помнікаў палацава-сядзібнай архітэктуры класіцызму трэба адзначыць палац Бутрымовіча ў Пінску, Сапегаў у Ружанах (Пружанскі раён), Радзівілаў у Радзівілімонтах (Клецкі раён), Булгакаў у Жылічах (Кіраўскі раён), І. Тышкевіча ў Валожыне, М.К. Агінскага ў Залессі (Смаргонскі раён), Рдултоўскіх у Снове (Нясвіжскі раён) і інш. У 1840-я гг. архітэктарамі Ф. Яшчалдам і У. Марконі ў формах несапраўднай готыкі быў пабудаваны палац Пуслоўскіх у Косаве (Івацэвіцкі раён).

Маёнткі дробнай і сярэднепаместнай шляхты ў XIX ст. ўяўлялі сабой архітэктурныя комплексы, у цэнтры якіх звычайна размяшчаўся сядзібны дом, абкружаны маляўнічым пейзажным паркам з службовымі і гаспадарчымі пабудовамі. Яскравымі прыкладамі такіх архітэктурных комплексаў былі сядзіба Касцюшкаў у Мерачоўшчыне (пад Косавам), дом-музей А. Міцкевіча ў Навагрудку, сядзібы Міцкевічаў ў Завоссі (Баранавіцкі раён), Нямцэвічаў у Скоках (Брэсцкі раён), Рэйтанаў у Грушаўцы (Ляхавіцкі раён) і інш.

У культавым дойлідстве ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. яшчэ захоўваліся рысы барока і ракако. Адным з самых яскравых прыкладаў палескай школы драўлянага дойлідства ў стылі барока з’яўляецца Рубельская Свята-Міхайлаўская царква (1796 г.) на Століншчыне. З сярэдзіны XIX ст. у праваслаўным царкоўным будаўніцтве пачалі выкарыстоўваць традыцыі рускага дойлідства XVII ст. (руска-візантыйскі стыль). Былыя ўніяцкія і каталіцкія храмы перабудоўваліся ў праваслаўныя цэрквы. Неаготыка найбольш часта выкарыстоўвалася ў будаўніцтве касцёлаў (Гервяты, Браслаў, Паставы і інш.).

З другой паловы XIX ст. пад уплывам працэсаў капіталістычнай мадэрнізацыі гарады ператвараліся ў значныя гандлёва-прамысловыя цэнтры. Разгарнулася чыгуначнае будаўніцтва, добраўпарадкаваліся гасцінцы. У горадабудаўніцтве павялічылася шчыльнасць забудовы, узмацніўся кантраст паміж цэнтрам і ўскраінамі гарадоў, узніклі новыя тыпы збудаванняў (асабнякі, шматпавярховыя даходныя дамы, гандлёвыя і крэдытна-фінансавыя ўстановы, вакзалы і інш.), прымянялася цэгла і новыя будаўнічыя матэрыялы (чыгун, пракат, жалезабетон). Хаця яшчэ захоўвалася структура ранейшых паселішчаў, аднак беларускія гарады пачыналі губляць былую лагічнасць і стройнасць планіроўкі.

У цэлым, на працягу канца XVIII – XIX ст. у развіцці беларускай культуры назіраліся разнастайныя працэсы. Непісьменнасць насельніцтва, сацыяльная няроўнасць і іншыя праблемы ускладнялі беларусам доступ да адукацыі і культуры. Слабасць прафесійнага мастацтва прадвызначыла пераважнае пашырэнне народных форм мастацкай творчасці. Фарміраванню

нацыянальнай самасвядомасці спрыяла шырокае развіццё беларусазнаўчых даследаванняў. Пачалося станаўленне новай беларускай літаратуры, асобных відаў прафесійнага мастацтва. Беларуская культура ўступала ў дыялог з культурамі іншых народаў Расійскай імперыі.

**Паняцці**

**Рамантызм** – ідэйны і мастацка-стылявы напрамак у еўрапейскай культуры ў канцы XVIII–XIX стст. Асветніцкаму рацыяналізму і культу ведаў рамантызм супрацьпаставіў вышэйшую каштоўнасць духоўнага жыцця свабоднай асобы з яе моцнымі пачуццямі, страсцямі, фантазіяй і інтуіцыяй. Прыхільнікі рамантызму былі незадаволены рэальным светам, імкнуліся адмежавацца ад яго, актыўна цікавіліся старажытнай гісторыяй, міфалогіяй, загадкавай культурай Усходу. Творы рамантызму звычайна мелі арыгінальную, наватарскую форму, нярэдка былі прасякнуты настальгіяй па лепшым мінулым.

**Рэалізм** – мастацкі стыль у еўрапейскай культуры з 30-х гг. XIX ст. Для яго характэрны рэалістычнае і праўдзівае адлюстраванне рэчаіснасці, абвостраная ўвага да сацыяльных праблем, крытыка існуючых грамадска-палітычных парадкаў, норм і каштоўнасцей буржуазнага ладу жыцця. У культуры і мастацтве Беларусі рэалістычныя прыкметы заўважаліся са старажытнасці. У беларускай літаратуры рысы рэалізму назіраліся з XVI ст., у XIX ст. праявіліся ў паэмах “Энеіда навыварат”, “Тарас на Парнасе”, творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча і найбольш паслядоўна праводзіліся Ф. Багушэвічам. У жывапісе, графіцы рэалістычныя тэндэнцыі пашыраліся з пачатку XIX ст., у другой палове XIX ст. рэалізм стаў вядучым творчым метадам.

**Эклектызм** – спалучэнне разнастайных мастацкіх элементаў у дойлідстве XIX–XX стст. У архітэктуры Беларусі эклектызм панаваў з сярэдзіны XIX ст. Вырашэнні фасадаў і інтэр’ераў будынкаў характарызаваліся дэкаратыўнасцю, спалучэннем формаў і элементаў готыкі, барока, мадэрну, неабарока і іншых стыляў.

**Дзеячы культуры, мастацтва**

**Агінскі Міхал Клеафас** (1765–1833) – грамадскі дзеяч, кампазітар. Аўтар оперы “Зеліс і Валькур, або Банапарт у Каіры”, папулярных паланезаў для фартэпіяна, рамансаў і іншых музычных твораў. Найбольш вядомы яго паланез ля-мінор “Развітанне з Радзімай”.

**Альхімовіч Казімір Дамінікавіч** (1840–1916) – мастак. Намаляваў карціны на гістарычныя і міфалагічныя тэмы (“Пахаванне Гедыміна”, “Пасля бітвы”, “Ліздзейка з дачкой на руінах царквы Пяруна”, “Смерць Глінскага ў турме”), паказаў лёс ссыльных паўстанцаў (“Смерць у выгнанні”, “Пахаванне

на Урале”, “На этапе”), адлюстраваў цяжкае жыццё сялян (“Жніво”, “Парабкава хата”), ілюстраваў творы Ю. Славацкага, А. Міцкевіча і інш.

**Аляшкевіч Іосіф Іванавіч** (1777–1830) – мастак. Майстар партрэту. Напісаў “Групавы партрэт”, “Партрэт дзяўчынкі”, партрэты Л. Сапегі, А. Міцкевіча, А. Чартарыйскага і інш., шэраг кампазіцый на рэлігійную тэму і інш.

**Баброўскі Міхаіл Кірылавіч** (1784–1848) – славіст. Даследчык старажытных славянскіх рукапісаў і кніжных старадрукаў. У 1822 г. адкрыў Супрасльскі рукапіс. Разам з І. Даніловічам лічыцца адным з пачынальнікаў беларускага нацыянальнага адраджэння.

**Багушэвіч Францішак Бенядзікт Казіміравіч** (1840–1900) – паэт і публіцыст. Класік беларускай літаратуры Адзін з пачынальнікаў крытычнага рэалізму ў беларускай літаратуры. Аўтар зборнікаў вершаў “Дудка беларуская” (Кракаў, 1891), “Смык беларускі” (Познань, 1894), кніжкі-апавядання “Тралялёначка” (Кракаў, 1892) і іншых твораў. Аказаў вялікі ўплыў на беларускі нацыянальны рух у пачатку XX ст.

**Баршчэўскі Ян** (1794–1851) – пісьменнік. Адзін з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры. Аўтар польскамоўнага зборніка фантастычных твораў “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” у 4-х тт. (1844–1846 гг.).

**Ваньковіч Валенцій Мельхіёравіч** (1800–1842) – мастак. Майстар гістарычнага жанру, партрэту. Вядомасць яму прынесла карціна “Міцкевіч на скале Аю-Даг”. Напісаў таксама палотны “Подзвіг маладога кіяўляніна пры аблозе Кіева печанегамі ў 968 годзе”, “Напалеон каля вогнішча”, “Жанчына гуляе ў пасьянс”, “Аўтапартрэт”, партрэты А. Пушкіна, А. Міцкевіча, Т. Зана, піяністкі М. Шыманоўскай і інш.

**Гараўскі Апалінарый Гілярыевіч** (1833–1900) – мастак. Майстар пейзажнага і партрэтнага жанраў. Аўтар пейзажаў “Вечар у Мінскай губерні”, “Цвіце канюшына”, “Свіслач”, “На радзіме”, “Пінскія балоты”, “Пейзаж з ракой і дарогай” і інш. Сярод партрэтаў вылучаюцца “Старая моліцца”, “Жанчына з палітрай”, “Жаночы партрэт”, мастака Ф. Бруні і інш.

**Грыгаровіч Іван Іванавіч** (1792–1852) – гісторык, археограф, святар. Збіраў і рыхтаваў да друку першы беларускі археаграфічны зборнік “Беларускі архіў старажытных грамат” (1824 г.). Аўтар даследавання “Беларуская іерархія” і іншых гістарычных прац.

**Дамель Ян Крыштаф** (1780–1840) – мастак. Майстар гістарычнага жанру. Аўтар палотнаў “Смерць магістра крыжаносцаў Ульрыха фон Юнгінгена ў бітве пад Грунвальдам”, “Хрышчэнне княгіні Вольгі”, “Смерць Глінскага ў няволі”, “Смерць князя Юзафа Панятоўскага”, “Павел І вызваляе Касцюшку з цямніцы”, “Адступленне французаў праз Вільню”, “Разбітыя войскі Напалеона на плошчы ратушы ў Вільні”, твораў на біблейскую тэму,

партрэтаў Д. Радзівіла, Я. Храптовіча, К. Тышкевіча і інш., пейзажаў Мінска і яго наваколляў, малюнкаў побыту народаў Сібіры.

**Даніловіч Ігнат Мікалаевіч** (1787–1843) – гісторык і археограф. Адзін з першых даследчыкаў летапісных і заканадаўчых помнікаў ВКЛ. Упершыню апісаў усе рукапісныя і друкаваныя экзэмпляры Статута ВКЛ, падрыхтаваў яго навуковае выданне (1841 г.).

**Дмахоўскі Вікенцій Ігнатавіч** (1807–1862) – мастак. Майстар пейзажнага жанру. Аўтар рамантычных пейзажаў “На начлезе”, “Каля пераправы”, “Навагрудак”, “Возера Свіцязь”, “Дом Міцкевіча ў Навагрудку”, “Замак у Крэве”, “Радзіма” (“Двор у Нагародавічах”), ваколіц Вільні, Навагрудка і інш.

**Дунін-Марцінкевіч Вінцэнт-Якуб (Вікенцій Іванавіч)** (1808–1884) – драматург, паэт. Заснавальнік нацыянальнай драматургіі і тэатра. Класік беларускай літаратуры. Арганізаваў у 1840–1850-я гг. у фальварку Люцынка Мінскага павета тэатральную трупу – першы беларускі тэатр. Найбольш вядомыя яго творы – “Пінская шляхта”, “Залёты”, “Ідылія”, “Гапон”, “Рэкруцкі яўрэйскі набор” і іншыя – складаюць залаты фонд беларускай драматургіі, тэатральнага і музычнага мастацтва. Перакладаў на беларускую мову паэму “Пан Тадэвуш” А. Міцкевіча (выйшлі яе 2 песні).

**Каліноўскі Кастусь (Вінцэнт Канстанцін)** (1838–1864) – грамадскі дзеяч, публіцыст, паэт. Адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. Выдаваў у 1862–1863 гг. газету “Мужыцкая праўда” (з Ф. Ражанскім, С. Сангіным, В. Урублеўскім). Яго вобраз з’яўляецца папулярным у беларускай літаратуры і мастацтве (раман “Каласы пад сярпом тваім” і п’еса “Кастусь Каліноўскі” У. Караткевіча, п’еса “Кастусь Каліноўскі” Е. Міровіча, паэма “Хамуціус” А. Куляшова, опера “Кастусь Каліноўскі” Д. Лукаса і інш.).

**Кіркор Адам Ганоры** (1818–1886) – гісторык, этнограф, археолаг, выдавец. Аўтар 3-га тома выдання “Маляўнічая Расія” (1882 г.) і цэлага шэрагу іншых прац па гісторыі, этнаграфіі і археалогіі Беларусі і Літвы. Адным з першых пазнаёміў навуковы свет Расіі і Польшчы з багаццем духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў.

**Манюшка Станіслаў** (1819–1872) – кампазітар, педагог. Стваральнік нацыянальнай класічнай оперы, класік польскай і беларускай вакальнай лірыкі. Аўтар музычных вадэвіляў, камічных опер і камедый. Вядомы яго “Рэкруцкі набор” (на лібрэта В. Дуніна-Марцінкевіча), “Галька”, “Страшны двор” і інш. Напісаў першую класічную беларускую оперу “Сялянка” (“Ідылія”) (разам з К. Кжыжаноўскім) на лібрэта В. Дуніна-Марцінкевіча (упершыню пастаўлена ў Мінску ў 1852 г.).

**Міцкевіч Адам Бярнард** (1798–1855) – паэт, асветнік, грамадскі дзеяч. Класік польскамоўнай паэзіі рамантызму. Арганізатар тайных студэнцкіх таварыстваў філаматаў і філарэтаў у Віленскім універсітэце. Яго літаратурная

творчасць была цесна звязана з беларускімі землямі, асабліва Навагрудчынай. Многія творы былі заснаваны на беларускім фальклорным і гістарычным матэрыяле. Аўтар паэм "Пан Тадэвуш", "Дзяды", "Мешка, князь Наваградка", "Гражына", "Конрад Валенрод", балады "Свіцязь" і іншых твораў. З сярэдзіны XIX ст. да сучаснасці творы А. Міцкевіча актыўна перакладаліся на беларускую мову. Яго творчасць аказала вялікі ўплыў на ўсё далейшае развіццё беларускай літаратуры і мастацтва.

**"Мужыцкая праўда"** – першая на беларускай мове газета (друкавалася лацінкай). Яе выдавалі К. Каліноўскі, Ф. Ражанскі, С. Сангін, В. Урублеўскі ў 1862–1863 гг. на Гродзеншчыне (мяркуецца, што апошні нумар надрукаваны ў Вільні). Усяго выйшла 7 нумароў газеты.

**Нарбут Тэадор (Фёдар Яўхімавіч)** (1784–1864) – гісторык і археолаг. Аўтар польскамоўнай "Гісторыі літоўскага народа" ў 9 тт. (1835–1841 гг.), дзе шмат месца адведзена гісторыі, мове, пісьменнасці, абрадам беларускага народа. Увёў у навуковы зварот "Хроніку Быхаўца" (1846 г.) і шэраг іншых гістарычных крыніц. Праводзіў археалагічныя раскопкі ў Падняпроўі, Лідскім павеце. Аўтар праекта Бабруйскай крэпасці і ўдзельнік яе будаўніцтва.

**Насовіч Іван Іванавіч** (1788–1877) – мовазнавец, фалькларыст і этнограф. Аўтар тлумачальна-перакладнога "Слоўніка беларускай гаворкі" (1870 г.), у які ўключана больш за 30 тыс. слоў, запісаных аўтарам у Магілёўскай, Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай губернях, з вуснай народнай творчасці, старабеларускіх пісьмовых помнікаў, а таксама шэрагу іншых навуковых прац.

**Орда Напалеон** (1807–1883) – мастак, кампазітар, педагог. Майстар архітэктурна-гістарычнага пейзажу. Стварыў сітэматызаваныя серыі замалёвак гістарычных мясцін і архітэктурных помнікаў Беларусі, Літвы, Польшчы, Украіны і іншых краін Еўропы (захавалася больш 1 тыс.). Выдаў "Альбом гістарычных мясцін" з 260 малюнкамі-літаграфіямі. Аўтар цэлага шэрагу музычных твораў. Яго "Граматыку музыкі" (1873 г.) высока ацаніў С. Манюшка, які лічыў Н. Орду сваім настаўнікам.

**Раманаў Еўдакім Раманавіч** (1855–1922) – этнограф, фалькларыст і археолаг. Выдаў пры жыцці ў 1886–1912 гг. 9 тамоў асноўнай фальклорна-этнаграфічнай працы – "Беларускага зборніка", які быў своеасаблівай энцыклапедыяй побыту, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа XIX – пачатку XX ст. (10-ы том выдадзены ў 1928 г., астатнія 5 тамоў загінулі і страчаны).

**Ромер Альфрэд Ізідор** (1832–1897) – мастак, этнограф. Маляваў партрэты, пейзажы, тэматычныя кампазіцыі з жыцця народа і на рэлігійныя сюжэты, распісваў храмы ў Камаях, Пінску і інш.

**Сілівановіч Нікадзім Юр'евіч** (1834–1919) – мастак. Працаваў у бытавым і партрэтным жанрах, іканапісе. Аўтар карцін "Дзеці ў двары", "У

школу", "Салдат і хлопчык", "Стары пастух" і інш. Стварыў мазаічную кампазіцыю "Тайная вячэра" для галоўнага іканастаса Ісакіеўскага сабора ў Пецярбургу (разам з І. Лаврэцкім).

**Смуглевіч Францішак** (1745–1807) – мастак, педагог. Аўтар станковых карцін і манументальных размалёвак у храмах Беларусі, Польшчы і Літвы, працаваў у гістарычным, батальным, партрэтным жанрах, пісаў краявіды архітэктурных помнікаў Вільні і інш.

**Сухадольскі Януар Іванавіч** (1797–1875) – мастак. Майстар гістарычнага і батальнага жанраў. Аўтар карцін "Узяцце рускімі войскамі крэпасці Карс", "Штурм крэпасці Ахалцых", "Пераход арміі Напалеона цераз Бярэзіну", "Фельдмаршал Паскевіч прымае дэлегацыю жыхароў Эрзурума" і інш.

**Сыракомля Уладзіслаў (Кандратовіч Людвік Уладзіслаў Францішак)** (1823–1862) – паэт, драматург, перакладчык. Вывучэнню Беларусі прысвяціў гісторыка-краязнаўчыя працы "Вандроўкі па маіх былых ваколіцах", "Мінск" і інш., у якіх шырока выкарыстаў старажытнарускія і беларуска-літоўскія летапісы. Яго творчасць прыкметна паўплывала на фарміраванне беларускай літаратуры новага часу.

**Тышкевіч Яўстафій Піевіч** (1814–1873) – археолаг, гісторык, этнограф, музеязнаўца. Адзін з заснавальнікаў беларускай навуковай археалогіі. Разам з братам К. Тышкевічам адкрыў у 1842 г. у Лагойску першы на Беларусі музей старажытнасцей, а ў 1855 г. – Віленскі музей старажытнасцей.

**Федароўскі Міхал (Міхаіл) Адольфавіч** (1853–1923) – фалькларыст, этнограф, археолаг. Сабраў больш за 5 тыс. беларускіх народных песень, каля 10 тыс. прыказак, сотні казак, загадак і іншых твораў духоўнай спадчыны. Фальклорныя матэрыялы былі выдадзены ў 8-томнай працы "Люд беларускі" ў 1897–1981 гг.

**Хруцкі Іван Фаміч** (1810–1885) – мастак. Майстар нацюрморта, партрэту, пейзажу. Аўтар карцін "Кветкі і садавіна", "Грыбы і агуркі", "Партрэт невядомай", "Пажылая жанчына, якая вяжа шкарпэткі", "Партрэт жонкі", "Сямейны партрэт", "Від у маёнтку", "Партрэт хлопчыка ў саламяным капелюшы", партрэт мітрапаліта І. Сямашкі і інш.

**Чачот Ян Антоні** (1796–1847) – паэт, фалькларыст. На беларускім фальклоры былі заснаваны яго балады "Наваградскі замак", "Калдычэўскі шчупак", "Мышанка", "Свіцязь" і інш., вершы і песні. Сабраў каля 1 тыс. беларускіх народных песень і выдаў іх у 1837–1846 гг. у 6 зборніках у перакладзе на польскую мову і часткова ў беларускім арыгінале пад назвай "Сялянскія песні".

**Шпілеўскі Павел Міхайлавіч** (1823–1861) – этнограф, фалькларыст, пісьменнік. Аўтар нарысаў і артыкулаў "Беларускія народныя павер'і", "Народныя прыказкі з тлумачэннем паходжання і значэння іх", цыклаў

белетрызаваных нарысаў “Падарожжа па Палессі і беларускім краі”, “Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках” і іншых прац.

**Шэйн Павел Васільевіч** (1826–1900) – этнограф, фалькларыст. Збіральнік беларускай народнай вусна-паэтычнай творчасці. Апублікаваў “Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю” у 3-х тт. у 1887–1902 гг. і іншыя працы.

## Тэма 7. Культура Беларусі ў пачатку XX ст.

***Агульная характарыстыка.*** Галоўнымі тэндэнцыямі развіцця беларускай культуры ў пачатку XX ст. з’ўляліся наступныя: у беларускай нацыянальнай культуры вызначыліся 2 напрамкі – буржуазна-ліберальны і рэвалюцыйна-дэмакратычны; фарміраванне новай беларускай літаратуры, літаратурнай мовы; развіццё вуснапаэтычнай творчасці і беларускага народнага музычнага мастацтва; культурнае жыццё беларускага народа ва ўмовах узаемаўплыву нацыянальных культур; уздзеянне рэвалюцыйнага, нацыянальна-вызваленчага руху на развіццё культуры.

Варта таксама адзначыць і фактары, якія ўскладнялі развіццё беларускай культуры ў пачатку XX ст.: абгрунтаванне дзяржаўнай асімілятарскай палітыкі царызму праз ідэалогію “заходнерусізму”, царскі ўлад не прызнаваў існавання беларускай нацыі; адсутнасць ВНУ; замаруджаны і супярэчлівы працэс фарміравання беларускай нацыі; нізкі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа; канфесійная раз’яднанасць беларусаў на праваслаўных і католікаў, што перашкаджала паўнацэннаму этнакультурнаму развіццю; царскія ўлады, агульнарасійскія, польскія партыі, каталіцкі касцёл і праваслаўная царква атаясамлівалі канфесійную прыналежнасць з этнічнай, што таксама не садзейнічала этнічнай кансалідацыі; русіфікатарская палітыка царскіх улад; паланізатарская дзейнасць польскіх памешчыкаў, рымска-каталіцкай царквы; рэжым выключных законаў; рэпрэсіі царскіх улад ў дачыненні да перадавых грамадскіх і культурных дзеячаў.

***Друк. Газета “Наша ніва”.*** Буйнейшым цэнтрам беларускага грамадска-культурнага жыцця ў пачатку XX ст. з’яўляўся Пецярбург. Менавіта там па ініцыятыве прафесара Пецярбургскага ўніверсітэта Б. Эпімах-Шыпілы ў маі 1906 г. была заснавана суполка “Загляне сонца і ў наша ваконца”, якая займалася сістэматычным, планамерным выданнем беларускіх кніг. Першай кнігай стаў “Беларускі лемантар або першая навука чытання” А. Пашкевіч (Цёткі). Беларускія кнігі выдаваліся кірыліцай і лацінкай. Публікацыя “Дудкі беларускай”, “Смычка беларускага Ф. Бугушэвіча выклікала адмоўную рэакцыю царскіх улад. У Варшаве, Вільні, Мінску, Віцебску, Гродне, Гомелі былі адкрыты контрагенцтвы выдавецтва “Загляне сонца і ў наша ваконца”, праз якія распаўсюджвалася літаратура.

Вялікую долю свайго заробку Б. Эпімах-Шыпіла аддаваў на ўтрыманне суполкі. Грошы на выданні давалі ахвярадаўцы (сярод іх – М. Радзівіл). Тады пашыранымі формамі папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны былі мастацкія імпрэзы, вечарыны з дэкламацыяй вершаў, тэатральнымі пастаноўкамі, харавымі спевамі. Усяго выдавецтвам "Загляне сонца і ў нашаваконца" было надрукавана больш 100 тыс. экзэмпляраў кніг. У пачатку Першай сусветнай вайны суполка спыніла сваю дзейнасць. Акрамя гэтага выдавецтва, у пачатку ХХ ст. дзейнічала некалькі іншых прыватных выдавецтваў – "Наша ніва", "Наша хата", "А. Грыневіч", "Беларус", "Менчук", "Палачанін".

Адбываўся беларускі грамадска-культурны рух у Вільні. Менавіта там з'явілася адна з першых беларускамоўных газет – "Наша доля", якая друкавалася кірыліцай і лацінкай. Рэдактарам-выдаўцом першых 4-х нумароў быў І. Тукеркес, з № 5 – А. Гедвіла. Усяго выйшла 6 нумароў газеты "Наша доля" (апошні – 14 снежня 1906 г.). Галоўную ролю ў рэдагаванні газеты сыгралі браты І. і А. Луцкевічы, А. Пашкевіч (Цётка), К. Каганец. Закрыццё "Нашай долі" (афіцыйна забаронена 11 студзеня 1907 г.) было абумоўлена як рэпрэсіямі з боку царскіх улад, фінансавымі цяжкасцямі, так і расколам унутры рэдакцыі.

10 (23) лістапада 1906 г. частка супрацоўнікаў "Нашай долі" – браты І. і А. Луцкевічы, А. Пашкевіч (Цётка) – выдала ў Вільні першы нумар газеты "Наша ніва". Рэдактарам-выдаўцом спачатку быў З. Вольскі, а з 8 снежня 1906 г. – А. Уласаў. У маі-чэрвені 1907 г. літаратурны аддзел "Нашай нівы" ўзначальваў Я. Колас. У 1908 г. у рэдакцыю прыйшлі Ядвігін Ш., Я. Купала, у 1909 г. – С. Палуян, З. Жылуновіч (Цішка Гартны). Пазней да іх далучыліся З. Бядуля, М. Гарэцкі. Сакратаром рэдакцыі з'яўляўся В. Ластоўскі. З 1907 г. з газетай супрацоўнічаў М. Багдановіч, які ў 1911 г. па запрашэнню рэдакцыі прыязджаў у Беларусь. У 1914–1915 гг. рэдактарам-выдаўцом быў Я. Купала. Улічваючы канфесійны падзел беларусаў на праваслаўных і католікаў, "Наша ніва" друкавалася па-беларуску на кірыліцы і лацінцы, а з лістапада 1912 г. – толькі на кірыліцы.

Сярод шэрагу цяжкасцей пры выданні газеты былі і сацыяльна-псіхалагічныя перашкоды. З канца XVII ст. беларуская мова не была мовай адукацыі, навукі, грамадскага жыцця, дзяржаўных устаноў, цэркваў і касцёлаў. Усё гэта ўскладняла працэс фарміравання новай беларускай літаратурнай мовы.

На старонках газеты "Наша ніва" сцвярджалася, што гістарычнае прызванне кожнага народа заключаецца ў развіцці сваёй нацыянальнай культуры. Абвяргаўся тэзіс аб тым, што гістарычны працэс непасрэдна вядзе да зліцця меншых народаў з большымі. На старонках "Нашай нівы" актыўна папулярызавалася гісторыя і культура Беларусі. З 1910 г. там друкавалася

“Кароткая гісторыя Беларусі” В. Ластоўскага. У дзейнасці газеты “Наша ніва” арганічна спалучалася нацыянальнае і інтэрнацыянальнае. Уступаючы ў палеміку з рускімі шавіністычнымі выданнямі (сярод іх – былі газеты “Виленский вестник”, “Минское слово”, “Окраины России”, часопіс “Крестьянин” і інш.), польскім нацыяналістычным друкам, яна ніколі не атаясамлівала іх з рускімі і польскімі народамі, культурамі, мовамі. Газета рашуча выступала супраць яўрэйскіх пагромаў. Адстойваючы ўласныя этнакультурныя інтарэсы, “Наша ніва” выступала супраць нацыянальнай нянавісці, выказвалася за паважлівае стаўленне да кожнага народа.

Газета закранала разнастайныя тэмы – унутраную і знешнюю палітыку царызму, культурнае жыццё, давала сельскагаспадарчыя парады і г. д. Па свайму характару “Наша ніва” была выданнем для сялян. У апошнія гады сваёй дзейнасці “Наша ніва” была ў росквіце сіл, у апагеі сваёй папулярнасці, пра што сведчаць шматлікія лісты ў газету. Надрукаваныя допісы былі ў асноўным з вясковай мясцовасці, у іх апавядалася пра сялянскае жыццё. Рэдакцыя мела больш 3 тыс. пастаянных і часовых карэспандэнтаў у павятовых і губернскіх гарадах, вёсках, мястэчках Беларусі, у Пецярбурзе, Маскве, Сібіры і за межамі Расійскай імперыі. Царская адміністрацыя забараняла падпіску і чытанне “Нашай нівы” ўсім настаўнікам Віленскай навучальнай акругі, святарам, служачым пошты, войска, паліцыі, валасных органаў, вучням сельскагаспадарчых школ.

“Нашаніўскі” перыяд у гісторыі беларускай літаратуры быў даволі выніковым. Найбольш значнымі творамі былі верш Я. Купалы “Мужык”, паэтычныя зборнікі А. Пашкевіч (Цёткі) “Скрыпка беларуская”, “Хрэст на свабоду” (1906 г.). Варта адзначыць таксама зборнікі Я. Купалы “Жалейка” (1908 г.), “Гусляр” (1910 г.), “Шляхам жыцця” (1913 г.), яго драматычныя і рамантычныя паэмы, п’есы “Паўлінка”, “Раскіданае гняздо”, зборнікі Я. Коласа “Песні жальбы” (1910 г.), “Апавяданні” (1912 г.), “Родныя з’явы” (1914 г.), зборнік паэзіі М. Багдановіча “Вянок” (1913 г.). На першы план у творчасці беларускіх літаратараў выступілі праблемы “зямлі і волі”, новага чалавека і гераічнай асобы, узаемаадносін чалавека і грамадства, ролі культуры ў жыцці народа. Галоўным героем становіцца селянін, яго духоўны рост, абуджэнне нацыянальнай годнасці. У цэлым, газета “Наша ніва” і беларускі літаратурна-грамадскі рух прыцягнулі да сябе выдатных інтэлектуалаў, перспектыўных маладых пісьменнікаў.

На старонкаў газеты “Наша ніва” ішло плённае засваенне здабыткаў іншых народаў. Публікаваліся па-беларуску творы рускіх (А. Пушкіна, І. Крылова, М. Някрасава, М. Горкага, А. Чэхава і інш.), польскіх ці польскамоўных (А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, М. Канапніцкай і інш.), украінскіх (Т. Шаўчэнкі, М. Крапіўніцкага і інш.) пісьменнікаў, паэтаў.

У беларускай гістарычнай навуцы доўгі час дзейнасць “Нашай нівы” вызначалася з пазіцыі афіцыйнай камуністычнай прапаганды. Пасля дыскусіі аб “Нашай ніве” на пасяджэнні Таварыства гісторыкаў-марксістаў у студзені 1931 г. за газетай замацаваўся ярлык “контррэвалюцыйнага”, ліберальна-буржуазнага”, “нацыяналістычнага” выдання. Толькі ў 1960–80-я гг. у даследаваннях С. Александровіча, У. Конана, Р. Семашкевіча, М. Біча, А. Лойкі была адлюстравана сапраўдная роля і значэнне газеты ў гісторыі культуры Беларусі. Архіў “Нашай нівы” захоўваецца зараз у архівах, музеях, бібліятэках Беларусі, Літвы. Пакуль ён вывучаны недастаткова, асабліва эпісталярная спадчына. “Наша ніва” спыніла свой выхад 7 (20) жніўня 1915 г. на аб’ектыўных абставінах – прыбліжаўся фронт.

У цэлым, значэнне газеты “Наша ніва” заключалася ў наступным: абуджэнне нацыянальнай свядомасці беларускага насельніцтва; складванне беларускай інтэлігенцыі; фарміраванне беларускай літаратурнай мовы; актывізацыя беларускага нацыянальна-вызваленчага руху; барацьба з польскім нацыяналізмам, рускімі манархістамі, царскімі ўладамі; выданне беларускіх кніг і часопісаў; прапаганда розных жанраў беларускага мастацтва; уклад у стварэнне беларускага нацыянальнага музея.

***Мастацкая культура: дойлідства, тэатр, выяўленчае мастацтва.***

***Дойлідства.*** Разгляд дадзенага пытання пачынаецца з вызначэння асноўных тэндэнцый у развіцці архітэктуры Беларусі пачатку ХХ ст.: хуткае развіццё губернскіх і буйных павятовых гарадоў; рост гарадоў, размешчаных на чыгунцы (Баранавічы, Жлобін, Маладзечна, Орша, Полацк і інш.); тэндэнцыя дэмакратычнага развіцця ў горадабудаўніцтве (нівеліроўка адрозненняў паміж цэнтральнай забудовай і рабочымі ўскраінамі, узвядзенне будынкаў масавага прызначэння – бальніц, багадзельняў, школ, рамесных вучылішчаў); у буйных гарадах з’явіўся гарадскі транспарт (конка, трамвай); у губернскіх і буйных павятовых гарадах дамінавалі галоўныя вуліцы: у Мінску – Захар’еўская вуліца (цяпер – праспект Незалежнасці), у Брэсце – Паліцэйская (Савецкая), Шасейная (Машэрава) і г. д.; узводзіліся помнікі манументальнага мастацтва (у 1912 г. у гонар першай перамогі рускіх войск у Айчыннай вайне 1812 г. быў закладзены помнік у Кобрыне (архітэктар – С. Ома; у час Першай сусветнай вайны былі згублены фігуры арлоў, бакавыя дошкі, адноўлены ў 1951 г.); з’явіўся мемарыяльны помнік у Віцебску; узведзены мемарыяльныя помнікі каля вёсак Лясная, Салтанаўка); назіраўся стылявы плюралізм (пашыраліся гістарычныя формы, адбывалася пераасэнсаванне псеўдастыляў, гістарычная рэтраспекцыя): неакласіцызм, мадэрн, несапраўдная готыка (псеўдаготыка), неараманскі стыль, неарускі стыль; большасць буйных грамадзянскіх збудаванняў (вакзалы, гімназіі, вучылішчы, бальніцы і інш.) узводзілася па індывідуальных праектах; кансерватыўны характар вясковага драўлянага дойлідства; культавае

будаўніцтва значна ўступала свае ранейшыя пазіцыі, аднак цэрквы і касцёлы выконвалі горадаўтваральныя функцыі. Звяртаецца ўвага на касцёл Сымона і Алены (Чырвоны касцёл) у Мінску, культавыя пабудовы ў Браславе, Паставах, Свіры, Ракаве і іншых месцах. Паказваюцца таксама выявы касцёла Ушэсця ў Дзярэчыне, касцёла ў в. Дварэц Дзятлаўскага раёна, Антоніеўскага касцёла (в. Каменка Шчучынскага раёна), касцёла ў в. Пеляса Астравецкага раёна, Андрэеўскага касцёла (в. Нарач Мядзельскага раёна), капліца Святаполк-Мірскіх у Міры, царква А. Неўскага ў Мінску і інш.

Царква А. Неўскага ў Мінску, якая знаходзіцца на Вайсковых могілках, пабудавана ў 1896–1898 гг. з цэглы па праекту архітэктара В. Струева ў гонар перамогі рускіх войск у руска-турэцкай вайне 1877–1878 гг. Да 1910 г. належала ваеннаму ведамству. Помнік рэтраспектыўна-рускага стылю. Пры ўваходзе ў прытворы размешчаны мемарыяльныя дошкі з імёнамі 118 воінаў-беларусаў 30-й артылерыйскай брыгады і 119-га Каломенскага палка, якія гераічна загінулі пад Плеўнай (Балгарыя). У царкве захоўваюцца ваенныя рэліквіі (сцяг палка), за алтарнай сцяной былі пахаванні вышэйшых афіцэрскіх чыноў, 2 брацкія магілы воінаў.

Свята-Мікалаеўская брацкая царква ў Брэсце была ўзведзена ў 1904–1906 гг. у руска-візантыйскім стылі з элементамі маскоўскага царкоўнага дойлідства XVII ст. Аўтарам праекта быў гродзенскі губернскі архітэктар І. Плотнікаў. Будаўніцтва вялося на ахвяраванні маракоў і афіцэраў, удзельнікаў руска-японскай вайны, якія лічылі свяціцеля Мікалая сваім апекуном, і на сродкі брацтва ў гонар свяціцеля Мікалая і Афанасія Брэсцкага.

Касцёл Святых Сымона і Алены (Чырвоны касцёл) у Мінску ўзводзіўся ў 1906–1910 гг. на сродкі старшыні Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, слуцкага памешчыка Э. Вайніловіча, які ахвяраваў амаль усё сваё багацце на будаўніцтва касцёла ў гонар памерлых ад эпідэміі іспанкі (грыпу) дзяцей Алены і Сымона. Праект храма стварыў польскі архітэктар Т. Пайздэрскі (пры ўдзеле У. Марконі). Будаўніцтва ажыццяўляў архітэктар Г. Гай. Касцёл быў упрыгожаны на сродкі (1500 руб.) графа Э. Чапскага, сям'і Скірмунтаў (старажытны абраз Маці Божай) і іншых прыватных асобаў. Паводле жадання фундатара касцёла 20 верасня 1910 г. архібіскуп Ключынскі асвяціў новы храм у імя святых Сымона і Алены, пры ўваходзе была ўстаноўлена мемарыяльная пліта з іх імёнамі. У 1909 г. на вежу былі ўзняты званы вагой 2373 фунты. У адзіны комплекс з касцёлам уваходзіла плябанія (мураваны 2-павярховы будынак) і частка мураванай агароджы з брамай.

З 1946 г. у будынку касцёла размяшчалася кінастудыя "Беларусьфільм", у 1975 г. ён быў прыстасаваны пад Дом кіно. У 1990 г. Чырвоны касцёл аднавіў сваю дзейнасць як культавая ўстанова.

Касцёл Святых Сымона і Алены ўяўляе сабой помнік архітэктуры неараманскага стылю (так званы “надрэйнскі рамантызм”, які мае аналогіі з германскім раманскім саборам Бамбергу, апостальскай царквой у Кёльне). У архітэктуры выявіўся складаны інтэлектуальна-творчы пошук новай, яшчэ не раскрытай прыгажосці дойлідства сярэдневековага раманскага перыяду. 3-нефавая базіліка набыла смелую, арыгінальную асіметрычную, складаную дынамічную аб’ёмна-прасторавую кампазіцыю са змешчанай па восі фасада 50-мятровай вежай-званіцай і 2 меншымі сіметрычнымі вежамі па баках магутнай паўкруглай апсіды. Над галоўным парталам касцёла змешчаны герб Вайніловічаў. У інтэр’еры аконныя каляровыя вітражы, выкананыя па малюнках мастака з Піншчыны Ф. Бруздовіча. У 1970-я гг. зроблены новыя вітражы, якія ўвасаблялі алегорыі 5 мастацтваў, медныя люстры (мастак Г. Вашчанка). Мураваны алтар быў выкананы паводле праекта скульптара Ота. Каля касцёла ў 1996 г. пастаўлена скульптурная кампазіцыя “Архангел Міхаіл перамагае дракона” (скульптар І. Голубеў). 11 чэрвеня 2006 г. у нішы Чырвонага касцёла быў перазахаваны з польскага горада Быдгашч Э. Вайніловіч.

***Тэатр, музыка.*** У 1899 г. у Мінску было створана таварыства аматараў мастацтваў. Яно аб’ядноўвала прадстаўнікоў мясцовай ліберальнай інтэлігенцыі. У складзе таварыства існавала 4 секцыі: літаратурная, драматычная, музычная, мастацкая. Так як дзейнасць аб’яднання набыла апазіцыйны да царскіх уладаў характар, то ў лютым 1906 г. яно было забаронена.

У пачатку ХХ ст. развіваліся асобныя музычныя школы, педагогі і навучэнцы выступалі на рабочых вечарынках, выконвалі рускую і замежную класіку, выдаваліся зборнікі беларускіх песень, вядомым стаў хор У. Тэраўскага. Кампазітары і музычныя дзеячы Л. Рагоўскі, А. Грыневіч, згаданы У. Тэраўскі займаліся апрацоўкай беларускіх песень.

У 1905–1907 гг. у некаторых гарадах, мястэчках існавалі аматарскія гурткі, якія сталі праводзіць “беларускія вечарынкі” з выступленнем хораў, танцораў, дэкламацыяў твораў беларускіх пісьменнікаў. Першая такая вечарынка адбылася вясной 1906 г. у в. Пятроўшчына пад Мінскам. Арганізатарамі выступалі А. Бурбіс, А. Уласаў і іншыя прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі. У развіцці беларускага тэатральнага і музычнага мастацтва важную ролю сыграў у 1910–1916 гг. Беларускі музычна-драматычны гурток у Вільні. Менавіта ім і была там арганізавана 12 лютага 1910 г. першая беларуская вечарына. У маі 1911 г. быў зацверджаны статут гуртка (старшыня – Б. Даніловіч, намеснік – В. Ластоўскі).

Вечарынкі набылі вялікую папулярнасць. Мастацкія імпрэзы былі разлічаны не толькі на сялянства. Паводле аднаго з ідэолагаў польскіх “краёўцаў” М. Ромера, які прысутнічаў разам з жонкай на адным з такіх

мерапрыемстваў у лютым 1911 г. у Вільні, на канцэрце ён сустрэў прадстаўнікоў беларускай, польскай, літоўскай і рускай інтэлігенцыі, найбольшае ўражанне на яго зрабілі акцёрскае майстэрства А. Бурбіса і хор Л. Рагоўскага. У 1910–1915 гг. праз вечарынкі прапагандавалася беларускае мастацтва ў многіх гарадах Беларусі, а таксама ў Пецярбурзе, Маскве.

Пачынальнікам беларускага прафесійнага тэатра лічыцца Ігнат Цярэнцьевіч Буйніцкі, які ў 1907 г. арганізаваў у фальварку Палевачы Дзісенскага павета аматарскі тэатр. З 1910 г. гэты тэатр стаў прафесійным. І. Буйніцкі быў не толькі кіраўніком мастацкага калектыву, але і таленавітым акцёрам. У дзейнасці тэатра арганічна перапляталіся драматургія, вакальнае выкананне, танцы. Рэпертуар тэатра І. Буйніцкага складалі “Па рэвізіі”, “Пашыліся ў дурні” М. Крапіўніцкага, “У зімовы вечар” Э. Ажэшкі, “Сватанне” А. Чэхава, “Модны шляхцюк” К. Каганца і іншыя пастаноўкі. Ставіліся таксама творы Я. Лучыны, Я. Купалы, Я. Коласа, А. Пашкевіч (Цёткі), М. Багдановіча і інш. 12, 22 лютага, 27 сакавіка 1910 г. адбыліся паспяховыя выступленні тэатра ў Вільні. У тым жа 1910 г. артысты выступалі ў Дзісне, Свянцянах, у 1911 г. – у Пецярбурзе. Адбыліся гастролі па беларускіх гарадах і мястэчках (Капыль, Нясвіж, Клецк, Ляхавічы, Слуцк, Мінск, Вілейка, Смаргонь, Ашмяны). У 1912 г. зноў былі выступленні ў Пецярбурзе, а 15 лютага 1913 г. – у Варшаве. Фінансавыя цяжкасці фактычна спынілі дзейнасць тэатра І. Буйніцкага напярэдадні Першай сусветнай вайны.

***Выяўленчае мастацтва.*** Характэрнай адметнасцю выяўленчага мастацтва Беларусі пачатку ХХ ст. з’яўлялася адсутнасць мясцовых прафесійных мастацкіх школ. Адкрыліся першыя прыватная школы малявання – у Мінску, Віцебску, Магілёве. Дзейнічалі асобныя таварыствы, наладжваліся выстаўкі. Выразным было імкненне да стварэння нацыянальнай мастацкай школы. Большасць жывапісцаў атрымоўвала мастацкую адукацыю ў галоўных мастацкіх цэнтрах Расійскай імперыі – у Пецярбурзе, Маскве, а таксама за мяжой.

Выяўленчага мастацтва характарызавалася шматграннасцю. У пейзажным жанры працавалі Ф. Рушчыц, В. Бялыніцкі-Біруля, С. Жукоўскі. Прызнаным майстрам лірычнага пейзажу стаў В. Бялыніцкі-Біруля, які вучыўся жывапісу ў Маскоўскім вучылішчы ў рускіх мастакоў К. Каровіна, В. Паленава, І. Пранішнікава., захапляўся жывапісам І. Левітана. У 1908 г. ён атрымаў званне акадэміка жывапісу. Толькі вясне В. Бялыніцкі-Біруля прысвяціў каля 200 палотнаў. У бытавым жанры працавалі яўрэйскія мастакі Ю. Пэн (з яго прыватнай школы выйшлі М. Шагал, С. Юдовін і інш.), Я. Кругер, Л. Альпяровіч. Графіка папаўнялася працамі Я. Драздовіча, К. Каганца.

На мяжы ХІХ–ХХ ст. з Беларуссю была звязана творчасць рускага мастака І. Рэпіна. У маі 1892 г. ён прыехаў сюды, каб набыць куток для

летняга адпачынку і творчай працы ўдалечыні ад гарадской мітусні. Выбар майстра выпаў на невялікі маёнтак Сафіеўка каля Віцебска, размешчаны на беразе Заходняй Дзвіны. У адным з лістоў да В. Сярова выказваў свае першыя ўражанні: "Край тёплый, народ разнообразный. Есть белорусы (господствующее племя), поляки, литва и евреи!...Теперь так и тянет туда". Мастак вярнуў маёнтку старую назву Здраўнёва, правёў там добраўпарадкаванне, асабіста прымаў удзел у гаспадарчых справах. Гаспадарчыя заняткі былі адлюстраваны ім у шэрагу малюнкаў ("Касцы ў полі", "Рыга-асець" і інш.). Мастака зачароўвалі краявіды Заходняй Дзвіны. Сярод партрэтаў беларускіх сялян І. Рэпіна найбольшую вядомасць атрымаў партрэт С. Шаўрова "Беларус" (1892 г.) (знаходзіцца ў Рускім музеі ў С.-Пецярбургу), які лічыцца лепшым сялянскім партрэтам у рускім мастацтве. У Здраўнёва І. Рэпін стварыў цэлы шэраг палотнаў, якія ўвайшлі ў скарбніцу рускага і сусветнага мастацтва: "Асенні букет" (1892 г.) "На Заходняй Дзвіне. Усход сонца" (1892 г.), "Дуэль" (1896 г.), "На сонцы" (1900 г.) і інш. Усе яны вызначаліся багаццем і разнастайнасцю колеру. Апошні раз І. Рэпін быў у Здраўнёва ў 1904 г. Потым там гаспадарылі родныя, сваякі. Зараз у адноўленай сядзібе размяшчаецца музейная экспазіцыя.

Адной з каларытных фігур сусветнага выяўленчага мастацтва XX ст. быў М. Шагал, чыё юнацтва і маладосць былі звязаны з Віцебскам. Менавіта ў Віцебску М. Шагал атрымаў першыя ўрокі малявання ў мастака Ю. Пэна. У час вучобы ў Пецярбурзе і Парыжы яго прыцягваў родны Віцебск. М. Шагал шчыра прызнаваўся: "Парыж – ты мой другі Віцебск!". Мастак стварыў "Віцебскую серыю" (каля 60 прац), прысвечаную любімаму гораду. Яго творчасць фарміравалася пад уплывам фавізму і кубізму. У Віцебску ў 1918 г. М. Шагал адкрыў школу "новага рэвалюцыйнага ўзору", дзе па яго запрашэнні выкладалі мастакі-авангардысты К. Малевіч, Л. Лісіцкі, В. Ермалаева, М. Дабужынскі, Р. Фальк, С. Юдовін. У 1922 г. М. Шагал назаўсёды пакінуў радзіму. Аднак праз усё жыццё мастак пранёс любоў да Віцебска. "Як самотны вандроўнік – я … нёс усе гады твой подых на маіх карцінах", – пісаў мастак у 1944 г. у звароце "Да майго горада Віцебска". – І так з табой размаўляў і, як у сне, бачыў цябе… Я не жыў з табой, але не было маёй карціны, якая не дыхала б тваім духам і адлюстраваннем. … Лепшае што магу я пажадаць сабе – каб ты мовіў, што я быў і застаўся верным табе назаўсёды…". Вяртанне імя М. Шагала ў грамадскую свядомасць Беларусі пачалося з канца 1980-х гг. У Віцебску ўжо традыцыйнымі сталі Шагалаўскія мастацкія пленэры, дзейнічае музей М. Шагала.

У цэлым, трэба адзначыць асаблівасці мастацкай культуры Беларусі пачатку XX ст.:

1. Беларуская мастацкая культура развівалася пад уплывам рускай культуры. У перыяд станаўлення беларускай культуры засвойваліся

традыцыі і каштоўнасці рускай культурнай спадчыны; адчувальнай станавілася прысутнасць рускіх сярод насельніцтва (інтэлігенцыя, чыноўнікі, праваслаўныя святары, рабочыя).

2. Беларускае мастацкая культура ўзаемадзейнічала з культурамі польскага, украінскага, яўрэйскага народаў.

3. Мастацкая спадчына беларусаў развівалася ў 2-х напрамках – ліберальным і рэвалюцыйна-дэмакратычным. Дзеячы ліберальнага напрамку (В. Ластоўскі, І. Луцкевіч, А. Уласаў і інш.) надавалі большую ўвагу нацыянай самабытнасці беларусаў; прадстаўнікі рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні (Я. Купала, Я. Колас, А. Пашкевіч (Цётка) і інш.) выступалі за сувязь з рускай дэмакратычнай культурай.

**Паняцці**

**Інтэлігенцыя** (ад лац. intelligens – разумны, дасведчаны) – грамадскі слой людзей, якія прафесійна займаюцца разумовай, творчай працай, развіццём і распаўсюджваннем культуры. Тэрмін уведзены ў XIX ст. рускім даследчыкам Т. Бабарыкіным і пазней з рускай перайшоў у іншыя мовы.

**Мадэрн** (ад франц. moderne – навейшы, сучасны) – стылявы напрамак у мастацтве канца XIX – пачатку XX ст., заснаваны на выкарыстанні новых прынцыпаў формаўтварэння, багатай арнаментацыі, шырокім выкарыстанні хваліста-ломанай лініі ў дэкоры, уключэнні элементаў готыкі, класіцызму.

**Нацыя** – устойлівая этнасацыяльная супольнасць людзей, якія пражываюць на адной тэрыторыі, звязаны агульным эканамічным і сацыяльна-палітычным жыццём, маюць адзіную культуру, мову і самасвядомасць. Галоўныя прыкметы нацыі: агульнасць культуры; агульнасць мовы; агульнасць тэрыторыі пражывання; агульнасць эканамічнага жыцця; этнічная (нацыянальная) самасвядомасць.

**Нацыянальная самасвядомасць** – сукупнасць уяўленняў, пачуццяў і ведаў чалавека аб сваёй прынадлежнасці да пэўнай нацыі, месцы і ролі ў жыцці роднага народа.

**“Наша Ніва”**, штотыднёвая беларуская газета, выдавалася ў Вільні ў 1906–1915 гг. на беларускай мове кірыліцай (да лістапада 1912 г. і лацінкай). Рэдактары-выдаўцы – З. Вольскі, А. Уласаў, Я. Купала. Адыграла важную ролю ў развіцці беларускага нацыянальнага руху, беларускай літаратуры.

**Неакласіцызм** – стылістычны прыём, заснаваны на выкарыстанні ў літаратуры, музыцы, архітэктуры, тэатральным і выяўленчым мастацтве міфалагічных вобразаў і матываў, антычных тэм і сюжэтаў у новых умовах развіцця мастацкай культуры.

**Неараманскі стыль** – напрамак у архітэктуры канца XIX – пачатку XX ст., заснаваны на выкарыстанні форм і кампазіцыі раманскага стылю.

**Неарускі стыль** – напрамак у архітэктуры канца XIX – пачатку XX ст., заснаваны на выкарыстанні форм і кампазіцыі рускага стылю, які не атрымаў шырокага распаўсюджвання на Беларусі.

**Несапраўдная готыка (псеўдаготыка)** – напрамак у архітэктуры канца XIX – пачатку XX ст., заснаваны на выкарыстанні форм, а таксама канструкцыі готыкі сярэдніх вякоў.

**Дзеячы культуры, мастацтва**

**Альпяровіч Леў Абрамавіч** (1874–1913) – мастак. Аўтар партрэтаў, пейзажаў, бытавых кампазіцый. Яго рэалістычныя творы “Муляры”, “Прачка”, “Партрэт старой”, “Дзяўчына ў чырвонай шалі” блізкія да твораў рускіх перасоўнікаў.

**Аляхновіч Францішак Каралевіч** (1883–1944) – драматург, тэатральны дзеяч, публіцыст. Яшчэ пры жыцці яго называлі “бацькам навейшай беларускай драматургіі”. Аўтар п’ес “Пан міністр”, “На Антокалі”, “Бутрым Няміра”, “У лясным гушчары”, “Папараць-кветка”, “Заручыны Паўлінкі”, “Птушка шчасця”, “Няскончаная драма” і інш. Яго творы актыўна ставіліся тэатральнымі калектывамі ў Заходняй Беларусі, БССР, у асяроддзі беларусаў Латвіі, Чэхаславакіі. Напісаў аповесць “У капцюрох ГПУ”.

**Багдановіч Максім Адамавіч** (1891–1917) – паэт. Класік беларускай літаратуры. Яго творчая спадчына залічваецца ў залаты фонд беларускай культуры. Выступаў з патрыятычых пазіцый за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне беларускага народа, сцвярджэнне ідэй роўнасці, братэрства, гуманізму. Аўтар адзінага прыжыццёвага зборніка вершаў “Вянок”, выдадзенага пры падтрымцы М. Радзівіл (Вільня, 1913).

**Буйніцкі Ігнат Цярэнцьевіч** (1861–1917) – тэатральны дзеяч. Стваральнік нацыянальнага прафесійнага тэатра – яго называлі “бацькам беларускага тэатра”. Арганізаваў у 1907 г. у фальварку Палевачы Дзісенскага павета аматарскую трупу, якая з 1910 г. стала прафесійным тэатрам. З’яўляўся ініцыятарам адкрыцця Першага беларускага таварыства драмы і камедыі ў Мінску.

**Бялыніцкі-Біруля Вітольд Каэтанавіч** (1872–1957) – мастак. Майстар пейзажнага жанру, развіваў традыцыі лірычнага пейзажу канца XIX ст. У яго творах (“Зімовы сон” і інш.) назіраецца тонкае адчуванне колеру, мяккасць і непаўторны лірызм, глыбіня ўспрымання і перадачы прыроды.

**Грыневіч Антон Антонавіч** (1877–1937) – збіральнік беларускага музычнага фальклору, выдавец і педагог. Выдаваў зборнік “Беларускія песні з нотамі”, “Народны спеўнік”, “Школьны спеўнік”, “Навука спеву”, “Беларускі дзіцячы спеўнік” і іншыя зборнікі народных песень, гульняў.

**Жукоўскі Станіслаў Юльянавіч** (1875–1944) – мастак. Майстар пейзажнага жанру канца XIX – першай трэці XX ст. На яго творах

адлюстравана жывая прырода Палесся, Белавежскай пушчы, старажытных сядзіб. Першыя творы (“Памешчыцкі дом”, “Май”, “Бяссонная ноч. Золак”, “Першыя прадвеснікі вясны”, “Промні вясны”, “Свята вясны” і інш.) прысвечаны маёнтку ў Староволі на Пружаншчыне, дзе прайшло дзяцінства мастака.

**Змітрок Бядуля (Плаўнік Самуіл Яфімавіч)** (1886–1941) – паэт і празаік. Класік беларускай літаратуры. Працаваў у рэдакцыі газеты “Наша ніва”. Аўтар шэрагу зборнікаў паэзіі і апавяданняў, рамана “Язэп Крушынскі”, аповесці “Салавей”, кніг для дзяцей, даследавання “Вера, паншчына і воля ў беларускіх народных казках і песнях”, кішэннага яўрэйска-беларускага слоўніка (разам з Н. Рубінштэйнам) і іншых прац.

**Карскі Яўхім Фёдаравіч** (1860–1931) – вучоны-філолаг, этнограф. Заснавальнік беларускага навуковага мовазнаўства і літаратуразнаўства. З’яўляўся рэктарам Варшаўскага ўніверсітэта, акадэмікам Пецярбургскай акадэміі навук, правадзейным членам Інбелкульта. Аўтар больш як 700 прац у галіне славяназнаўства. Энцыклапедыяй беларусазнаўства лічыцца яго фундаментальная праца “Беларусы” (выдадзена ў 1903–1922 гг. у 3-х тамах), у якой навукова абгрунтавана нацыянальная самабытнасць беларусаў як самастойнага славянскага народа з багатай, самабытнай і старажытнай культурнай спадчынай.

**Карусь Каганец (Кастравіцкі Казімір-Рафал Каралевіч)** (1868–1918) – драматург, скульптар, грамадскі дзеяч. Супрацоўнічаў з газетай “Наша ніва”. Яго вадэвіль “Модны шляхцюк” набыў папулярнасць ў пачатку ХХ ст., актыўна ставіўся ў БССР, Заходняй Беларусі ў 1920–30-я гг.

**Кругер Янкель Мордухавіч (Якаў Маркавіч)** (1869–1940) – мастак. Майстар бытавога і партрэтнага жанраў. Заснаваў ў Мінску курсы малявання і жывапісу (мастацкую школу). Аўтар карцін “На суд прафесара”, “Паштальён”, “Дзіцячая калонія”, “Кавальскі цэх” і інш. Адлюстроўваў яўрэйскі побыт на палотнах “Хедар”, “Яўрэйскі духоўны суд”, “Перапісчык Торы”, “За малітвай”, “Талмудыст” і інш. Пісаў жанравыя карціны на працоўную тэматыку, партрэты дзеячаў беларускай культуры, літаратуры.

**Ластоўскі Вацлаў Юстынавіч** (1883–1938) – грамадскі дзеяч, пісьменнік, гісторык, этнограф. Узначальваў урад БНР. З’яўляўся рэдакцыйным сакратаром газеты “Наша ніва”, неадменным сакратаром Інбелкульта, акадэмікам Беларускай акадэміі навук, дырэктарам Беларускага дзяржаўнага музея. У 1910 г. выдаў “Кароткую гісторыю Беларусі”. Рэдагаваў часопісы “Саха”, “Беларускі сцяг”, “Крывіч”, газету “Гоман”. Аўтар фундаментальнага кнігазнаўчага даследавання “Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі”.

**Луцкевіч Антон Іванавіч** (1884–1942) – грамадскі дзеяч, публіцыст, гісторык, выдавец. Адзін з заснавальнікаў Беларускай рэвалюцыйнай

грамады (Беларускай сацыялістычнай грамады), уваходзіў у склад рэдакцый газет "Наша доля" і "Наша ніва". Узначальваў урад БНР. Арганізатар і дырэктар у 1921–1939 гг. Беларускага музея імя І. Луцкевіча ў Вільні. Аўтар прац "Польская акупацыя на Беларусі", "За дваццаць пяць гадоў (1903–1928)". Апублікаваў шэраг даследаванняў па гісторыі беларускай культуры, літаратуры.

**Луцкевіч Іван Іванавіч** (1881–1919) – грамадскі дзеяч, публіцыст, археолаг. Адзін з заснавальнікаў Беларускай рэвалюцыйнай грамады (Беларускай сацыялістычнай грамады), стаяў у вытокаў беларускамоўнага кнігадрукавання, займаўся выданнем газет "Наша доля" і "Наша ніва". Праводзіў археалагічныя і этнаграфічныя даследаванні, збіраў помнікі даўніны, быў ініцыятарам адкрыцця першай беларускай гімназіі ў Вільні.

**Пэн Юдаль Мойшавіч (Юрый Маісеевіч)** (1854–1937) – мастак і педагог. Майстар бытавога жанру і партрэту. Заснаваў у Віцебску ў 1892 г. прыватную школу малявання і жывапісу. Яго вучнямі былі М. Шагал, Л. Лісіцкі, А. Ахола-Вала, В. Цадкін, С. Юдовін, З. Азгур і іншыя мастакі. Адлюстроўваў побыт і традыцыі яўрэйскай беднаты ў карцінах "Гадзіншчык", "Стары кравец", "Яўрэйскі рабін", "Апошняя субота" і інш. У паслярэвалюцыйны час стварыў палотны "Шавец-камсамолец", "Сват", "Пекар" і інш.

**Рушчыц Фердынанд Эдуардавіч** (1870–1936) – мастак і педагог. Майстар пейзажнага жанру, тэатральных дэкарацый. Яго пейзажы ("Пустка", "Стары млын", "Ля касцёла", "Пейзаж. Вілія", "Пуня і азярод" і інш.) характарызуюцца лаканізмам і прастатой кампазіцыі, драматызмам і манументальнасцю формаў, прасякнуты псіхаэмацыянальнымі перажываннямі.

**Тэраўскі Уладзімір Васільевіч** (1871–1938) – дырыжор, кампазітар. Стваральнік беларускага хору ў Мінску. Супрацоўнічаў з Беларускім таварыствам драмы і камедыі, трупай "Беларускі народны тэатр" Ф. Аляхновіча. Ствараў музыку да п'ес У. Галубка, Я. Міровіча, песні і рамансы на словы Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, М. Чарота і інш.

**Цётка (Пашкевіч Алаіза Сцяпанаўна)** (1876–1916) – грамадскі дзеяч, паэтэса, публіцыст. Аўтар паэтычных зборнікаў "Скрыпка беларуская", "Хрэст на свабоду", вучэбных дапаможнікаў для дзяцей "Лемантар", "Першае чытанне для дзетак беларусаў", даследаванняў па гісторыі беларускага тэатра. Яе лірыка характарызавалася тонкім лірызмам і рэвалюцыйнай палымянасцю, была насычана пяшчотнымі вобразамі. Галоўнымі матывамі паэзіі былі патрыятызм і самаахвярнае служэнне Бацькаўшчыне, прыгажосць прыроды.

**Шагал Марк Захаравіч (Маісей Хацкелевіч)** (1887–1985) – мастак. Адзін з самых вядомых у свеце прадстаўнікоў мастацкага авангарду XX ст.

Вучань Ю. Пэна. Засвойваў жывапіс у Пецярбургу, Парыжы. Заснаваў у 1919 г. у Віцебску мастацкую школу. З 1922 г. знаходзіўся ў эміграцыі, пасля Другой сусветнай вайны пераехаў у Францыю. З 1960-х гг. займаўся пераважна манументальным мастацтвам (мазаікамі, вітражамі, шпалерамі), скульптурай, керамікай. Аздабляў будынак ізраільскага парламента (кнесета) у Іерусаліме, плафон “Гранд опера” ў Парыжы, фешэнебельныя апартаменты, храмы ў розных краінах свету. Да канца жыцця ў яго творчасці прасочваліся матывы роднага Віцебска.

**Эпімах-Шыпіла Баніслаў Ігнатавіч** (1859–1934) – грамадскі дзеяч, выдавец, фалькларыст, філолаг. Арганізатар беларускага грамадска-культурнага руху ў Пецярбургу ў пачатку XX ст. Заснавальнік беларускага выдавецтва “Загляне сонца і ў наша ваконца”. Збіраў матэрыялы па гісторыі, этнаграфіі, фальклоры і літаратуры Беларусі.

**Якуб Колас (Міцкевіч Канстанцін Міхайлавіч)** (1882–1956) – паэт, празаік, драматург, публіцыст. Народны паэт Беларусі, акадэмік Беларускай акадэміі навук. Класік беларускай літаратуры, яго творы складаюць залаты фонд беларускай культуры. Працаваў загадчыкам літаратурнага аддзела газеты “Наша ніва”. Надрукаваў першы верш “Наш родны край” у 1906 г. у газеце “Наша доля”. Яго першы зборнік вершаў “Песні жальбы” выйшаў у Вільні ў 1910 г. Аўтар буйных літаратурных твораў – лірыка-эпічных паэм “Новая зямля” (яе называюць “энцыклапедыяй жыцця беларускага сялянства канца XIX – пачатку XX ст.”), “Сымон-музыка”, эпічнай трылогіі “На ростанях” (складаецца з 3-х частак: “У палескай глушы”, “У глыбі Палесся”, “На ростанях”), у якой прадстаўлена шырокая панарама паўсядзённага жыцця вясковай інтэлігенцыі і працоўнага сялянства ў пачатку XX ст.

**Янка Купала (Луцэвіч Іван Дамінікавіч)** (1882–1942) – паэт, драматург, публіцыст. Народны паэт Беларусі, акадэмік Беларускай акадэміі навук. Класік беларускай літаратуры, яго творчасць уваходзіць у залаты фонд культуры беларускага народа. З’яўляўся рэдактарам газеты “Наша ніва” у 1914–1915 гг. Першы верш на беларускай мове “Мужык” надрукаваў у 1905 г. у газеце “Северо-Западный край”. Аўтар зборнікаў вершаў “Жалейка”, “Гусляр”, “Шляхам жыцця”. У савецкі перыяд былі надрукаваны яго кнігі паэзіі “Безназоўнае”, “Апавяданні вершам”, паэмы “Магіла льва”, “Над ракою Арэсай”, “Курган”, зборнікі “Адцвітанне”, “Песня будаўніцтву”, “Беларусі ардэнаноснай”, “Ад сэрца”, “Беларускім партызанам”. Многія вершы пакладзены на музыку. П’есы Я. Купалы “Паўлінка”, “Тутэйшыя”, “Прымакі”, “Раскіданае гняздо” і іншыя складаюць класіку беларускай драматургіі.

## Тэма 8. Культурнае жыццё ў БССР у 20–30-я гг. ХХ ст.

***Агульная характарыстыка.*** У культурным жыцці БССР міжваеннага часу можна вылучыць 2 перыяды: 1917–1920-я гг. і 1930-я гг.

Перыяд 1917–1920-х гг. у развіцці беларускай культуры меў разнастайны характар і змястоўную насычанасць. Менавіта ў гэты час разгарнулася нацыянальна-культурнае будаўніцтва, якое аформілася ў рэспубліцы ў 1920-я гг. у асобную нацыянальна-культурную палітыку – беларусізацыю, нацэленую на адраджэнне мовы, культуры, традыцый не толькі беларусаў, але і іншых нацыянальных супольнасцей. Тады пачалося станаўленне нацыянальнай адукацыі, навукі, мастацтва. Ажыўленне назіралася ў літаратурным жыцці і мастацкай культуры – узнікалі разнастайныя творчыя аб'яднанні, існаваў стылявы і тэматычны плюралізм, адбываўся пошук наватарскіх ідэй, пашыраўся канструктывізм у архітэктуры. Актыўна ішоў працэс станаўлення беларускіх тэатраў, нараджаўся нацыянальны кінематограф. У пачатку 1920-х гг. Віцебск ператварыўся ў буйны мастацкі цэнтр – там дзейнічала група УНОВИС ("Утвердители нового искусства" ці "Сцвярджальнікі новага мастацтва"). Адначасова адбывалася стварэнне асобнага віду пралетарскага мастацтва і літаратуры, у якім у творчасці пераважаў класавы падыход, прапагандаваліся выключна рэвалюцыйныя ідэі, адмаўлялася дарэвалюцыйная культурная спадчына.

Перыяд 1930-х гг. разгортваўся ва ўмовах карэнных сацыяльна-эканамічных, грамадска-палітычных і культурных ператварэнняў у Савецкай краіне. Для развіцця культуры і мастацтва БССР у гэты час было характэрна ўзмацненне пазіцыі марксісцкай ідэалогіі, фактычнае згортванне беларусізацыі, рэалізацыя мерапрыемстваў "культурнай рэвалюцыі" і пашырэнне масавай культуры, разгортванне ваяўнічага атэізму. Быў ўстаноўлены адзіны творчы метад у літаратуры і мастацтве – метад сацыялістычнага рэалізму, наладжаны партыйна-дзяржаўны кантроль за творчым працэсам, уводзіліся ідэалагічныя абмежаванні і забароны. Да пытанняў культурнага жыцця прымянялася ідэя І. Сталіна аб развіцці культуры – нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па змесце. Драматычнай старонкай сталі рэпрэсіі супраць прадстаўнікоў інтэлігенцыі, якія нанеслі адчувальны ўрон нацыянальнай культуры, навуцы, мастацтву. Нягледзячы на гэта, у 1930-я гг. былі дасягнуты некаторыя поспехі ў барацьбе з непісьменнасцю і малапісьменнасцю насельніцтва, у галіне архітэктуры – узведзены буйныя грамадскія пабудовы агульнарэспубліканскага значэння (найперш у Мінску), у выяўленчым мастацтве – назіралася развіццё скульптурнага і жывапіснага партрэту, пейзажу, жанравых і гістарычных кампазіцый, у музычным і тэатральным мастацтве – адкрыты новыя ўстановы, створаны шэраг значных мастацкіх твораў, у кінамастацтве – працягвалася арганізацыйнае станаўленне

кінастудыі “Савецкая Беларусь”, адбыўся яе пераезд у 1939 г. з Ленінграда ў Мінск.

***Палітыка беларусізацыі. Асвета і навука.*** Першыя крокі ў напрамку беларусізацыі на тэрыторыі Беларусі праводзіліся ў час існавання БНР у 1918 г. У першыя гады існавання БССР пачалася праца па ліквідацыі непісьменнасці, рэалізоўваліся на практыцы асобныя палажэнні беларусізацыі. Аднак афіцыйнае абвяшчэнне беларусізацыі – палітыкі нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР, нацэленай на развіццё беларускай мовы, культуры, навукі і адукацыі – адбылося толькі ў 1924 г. 15 ліпеня 1924 г. ІІ сесія ЦВК БССР прыняла пастанову “Аб практычных мерапрыемствах па правядзенню нацыянальнай палітыкі”. Сярод асноўных напрамкаў беларусізацыі варта адзначыць наступныя: развіццё беларускай культуры; пашырэнне сферы выкарыстання беларускай мовы; увядзенне беларускай мовы ў навучальны працэс устаноў адукацыі, перавод дзяржаўнага апарату і справаводства на беларускую мову; стварэнне нацыянальнай сістэмы вышэйшай адукацыі; арганізацыя навукова-даследчай працы ў рэспубліцы (у тым ліку ўсебаковае вывучэнне гісторыі Беларусі); адкрыццё культурна-асветніцкіх устаноў; развіццё беларускай літаратуры; наладжванне нацыянальнага кнігадрукавання і інш.

Сярод найбольш значных дасягненняў беларусізацыі можна адзначыць наступныя. Па-першае, была створана нацыянальная сістэма адукацыі. Тады вострай сацыяльнай праблемай з’яўлялася непісьменнасць. Была ўтворана Надзвычайная камісія па ліквідацыі непісьменнасці, арганізавана таварыства “Далоў непісьменнасць”, разгорнута на месцах праца па навучанні непісьменных. У 1926 г. у рэспубліцы было ўведзена ўсеагульнае пачатковае навучанне, у 1932 г. – няпоўнае сярэдняе. Актыўна праводзілася беларусізацыя навучальнага працэсу ў школах. Да 1928 г. каля 80 % пачатковых школ з’яўляліся беларускімі. Акрамя іх, дзейнічалі рускія, польскія, яўрэйскія, украінскія, літоўскія, латышскія, нямецкія, эстонская школы. Для падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў для нацыянальных школ былі адкрыты яўрэйскія педтэхнікумы (у Мінску, Віцебску і Гомелі), польскі педтэхнікум у Мінску, польская секцыя на педфаку БДУ і інш.

30 кастрычніка 1921 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё БДУ. Першым рэктарам быў прызначаны прафесар У.І. Пічэта. Акрамя БДУ, у 1925–1926 гг. у рэспубліцы дзейнічалі 3 ВНУ – Горацкі сельскагаспадарчы інстытут, ветэрынарны інстытут у Віцебску, Камуністычны ўніверсітэт у Мінску.

Па-другое, адбылося значнае пашырэнне сферы выкарыстання беларускай мовы – у дзяржаўным справаводстве, у галіне адукацыі, навукі, культуры, у дзейнасці гаспадарчых, прафсаюзных і іншых арганізацый, вайсковых фарміраванняў. Беларуская, руская, яўрэйская (ідыш) і польская мовы прызнаваліся дзяржаўнымі, аднак беларуская мова выконвала

функцыю мовы зносін паміж дзяржаўнымі, прафесійнымі і грамадскімі ўстановамі і арганізацыямі. Была праведзена ў Мінску ў лістападзе 1926 г. Акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу і азбукі, у якой удзельнічалі айчынныя і замежныя вучоныя, лідары беларускай эміграцыі (В. Ластоўскі, К. Езавітаў, У. Жылка, У. Пігулеўскі). Аднак у пачатку 1930-х гг. вынікі працы гэтай канферэнцыі былі неабгрунтавана падвергнуты вострай крытыцы, не былі ўлічаны пры распрацоўцы пастановы СНК БССР "Аб зменах і спрашчэннях беларускага правапісу" ад 26 жніўня 1933 г.

Значна павялічылася колькасць кніг, перыёдыкі на беларускай мове. У 1927 г. у БССР выдаваліся 20 газет, з іх 10 на беларускай мове, 3 – на ідыш, 3 – на рускай, 2 – на польскай, 1 – на літоўскай, 1 – на змешанай.

Па-трэцяе, у 1920-я гг. адбылося станаўленне беларускай навукі. Важнай падзеяй стала адкрыццё ў 1922 г. Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта) на аснове навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамасветы БССР. У яго арганізацыі і працы прынялі ўдзел Я. Карскі, Я. Купала, Я. Колас, Я. Лёсік, З. Бядуля, З. Жылуновіч, У. Пічэта, і інш. У 1920-я гг. у рэспубліку прыехалі вядомыя вучоныя І. Замоцін, М. Нікольскі, У. Перцаў, М. Шчакаціхін і інш. На 1 кастрычніка 1926 г. Інбелкульт налічваў 224 чалавекі, з іх 83 правадзейных членаў, 74 – членаў-супрацоўнікаў і 67 членаў-карэспандэнтаў. Першым старшынёй быў С. Некрашэвіч, пасля яго стаў У. Ігнатоўскі. Інбелкульт з'яўляўся значным цэнтрам культурнага жыцця, унёс уклад у нацыянальна-культурнае адраджэнне, фарміраванне кадраў для навукі і культуры. Паводле пастановы ЦВК і СНК БССР ад 13 кастрычніка 1928 г. Інбелкульт быў рэарганізаваны з 1 студзеня 1929 г. у Беларускую акадэмію навук. Яе першым прэзідэнтам стаў У. Ігнатоўскі, неадменным (вучоным) сакратаром – В. Ластоўскі. Сярод першых правадзейных членаў былі 22 вядомыя вучоныя, пісьменнікі, грамадскія дзеячы: Я. Купала, Я. Колас, У. Пічэта, З. Жылуновіч, С. Некрашэвіч, І. Замоцін, С. Матулайціс і інш. У культурнае жыццё ўключыліся пасля вяртання з эміграцыі В. Ластоўскі, А. Цвікевіч, А. Смоліч, М. Гарэцкі, Л. Родзевіч і інш.

Адбывалася станаўленне беларускай гістарычнай навукі. Неаднаразова перавыдаваўся "Кароткі нарыс гісторыі Беларусі" У. Ігнатоўскага. Пытанні нацыянальнай палітыкі царызму на Беларусі, развіццё грамадскай думкі, праблематыка беларускага нацыянальнага руху раскрываліся А. Цвікевічам у манаграфіі "Западно-руссизм: Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в.". Аднак праца М. Доўнар-Запольскага "Гісторыя Беларусі" так і не была тады выдадзена (толькі ў 1994 г.).

Масавы характар набываў краязнаўчы рух – было створана Цэнтральнае бюро краязнаўства, якое выдавала часопіс "Наш край". У 1926 г. у рэспубліцы дзейнічалі 240 краязнаўчых арганізацый, якія ахоплівалі каля 10 тыс. чалавек.

У 1930-я гг. у складаных абставінах дзейнічалі сістэма адукацыі і навуковая сфера рэспублікі. Была праведзена значная праца па ліквідацыі непісьменнасці, арганізацыі дзейнасці агульнаадукацыйнай школы, што паспрыяла павышэнню ўзроўню адукаванасці насельніцтва. Аднак на адукацыю адмоўна ўплывала складанае сацыяльна-эканамічнае становішча, уніфікацыя школьнай справы, розныя эксперыменты ў навучанні і выхаванні, барацьба з "нацыянал-дэмакратызмам", рэпрэсіі супраць настаўнікаў, выкладчыкаў. Адначасова адкрываліся новыя навучальныя ўстановы. У 1939/1940 навучальным годзе ў БССР дзейнічалі 22 вышэйшыя (15,4 тыс. студэнтаў) і 102 сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы (133,6 тыс. навучэнцаў), яшчэ каля 20 тыс. чалавек вучылася на завочных аддзяленнях і курсах.

У галіне навукі таксама адкрываліся новыя ўстановы, умацоўвалася іх матэрыяльная база. У канцы 1930-х гг. у рэспубліцы налічвалася 40 навукова-даследчыцкіх устаноў (больш за 1,5 тыс. супрацоўнікаў). Вучоныя займаліся вывучэннем вытворчых сіл, распрацоўкай навуковых праблем прыкладнога характару. Аднак рэпрэсіі істотна аслабілі кадравы патэнцыял беларускай навукі, поўнасцю агалілі асобныя навуковыя напрамкі. Сярод рэпрэсіраваных у 1937–1938 гг. у Акадэміі навук БССР былі яе кіраўнікі І. Сурта, В. Шчарбакоў, П. Панкевіч, П. Горын (Каляда), акадэмікі Я. Афанасьеў, Ц. Бурстын, І. Замоцін, З. Жылуновіч, С. Матулайціс, В. Сербента і інш.

***Літаратура.*** У пачатку 1920-х гг. для літаратурнага жыцця былі характэрны свабода творчага пошуку, саперніцтва думак, з'яўленне розных груп і напрамкаў, аб'яднанняў пісьменнікаў. У 1923 г. узнікла першае літаратурнае аб'яднанне – "Маладняк", заснавальнікамі якога былі М. Чарот, А. Вольны, А. Дудар, А. Александровіч, А. Бабарэка, Я. Пушча і інш. Яны былі прыхільнікамі сацыялістычнага шляху развіцця грамадства, адмаўлялі папярэднюю літаратурна-мастацкую традыцыю. Ідэалагічныя і творчыя разыходжанні прывялі да адыходу ад "Маладняка" часткі пісьменнікаў, якія ў канцы 1926 г. стварылі новае літаратурнае аб'яднанне – "Узвышша" (У. Дубоўка, К. Крапіва, А. Бабарэка, Я. Пушча, К. Чорны, З. Бядуля, П. Глебка, М. Лужанін, В. Шашалевіч, Т. Кляшторны і інш.). Яны выступілі за стварэнне высокамастацкай беларускай літаратуры, своеасаблівага літаратурнага ўзвышша, актуалізавалі літаратурныя традыцыі і нацыянальную ідэю, вельмі шанавалі класікаў беларускай літаратуры Я. Купалу, Я. Коласа, М. Багдановіча. У лістападзе 1928 г. Усебеларускі з'езд "Маладняка" абвясціў сябе першым з'ездам Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў, куды ўвайшлі А. Астрэйка, П. Броўка, П. Галавач, А. Куляшоў, М. Лынькоў, Б. Мікуліч і інш. Старэйшае пакаленне пісьменнікаў (Я. Купала, Я. Колас, У. Галубок, Ц. Гартны, А. Дудар, М.

Зарэцкі, Я. Нёманскі, М. Чарот і інш.) заснавала літаратурнае аб'яднанне "Полымя".

У 1920-я гг. адбылося станаўленне "чалавеказнаўчай" беларускай прозы, у якой вядучымі жанрамі сталі раман і аповесць. Сярод значных дасягненняў беларускай прозы былі першыя кнігі трылогіі Я. Коласа "На ростанях" – "У палескай глушы" (1923 г.), "У глыбі Палесся" (1927 г.), яго аповесць "На прасторах жыцця" (1926 г.), раман Ц. Гартнага "Сокі цаліны" (1922–1923 гг.), аповесць М. Чарота "Свінапас" (1924 г.), дакументальна-мастацкія запіскі М. Гарэцкага "На імперыялістычнай вайне" (1926 г.), раман А. Мрыя "Запіскі Самсона Самасуя" (1929 г.) і інш. Асабліва трэба адзначыць займальную літаратуру для дзяцей Я. Маўра – аповесці "У краіне райскай птушкі" (1927 г.), "Палескія рабінзоны" (1930 г.) і яго іншыя творы.

Высокім мастацкім узроўнем вызначалася беларуская паэзія. Я. Купала ў паэме "Безназоўнае" імкнуўся асэнсаваць перамены ў жыцці беларускага грамадства. У пачатку 1920-х гг. Я. Колас завяршыў працу над паэмай-эпапеяй "Новая зямля". Адметнай старонкай з'яўляецца гумарыстычная і сатырычная паэзія К. Крапівы Арыгінальныя творы Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, Ц. Гартнага, А. Александровіча, У. Дубоўкі, У. Жылкі, Т. Кляшторнага, Я. Пушчы, М. Чарота і іншых беларускіх паэтаў займаюць дастойнае месца ў кантэксце еўрапейскіх мадэрнісцкіх плыняў.

Важнейшай асаблівасцю беларускай драматургіі 1920-х гг. з'яўляецца ўніверсальнасць яе творчых пошукаў. Свой уклад у яе станаўленне ўнеслі Я. Купала, У. Галубок, Л. Родзевіч, Е. Міровіч і інш. Глыбокім нацыянальна-культурным кантэкстам прасякнута сатырычная трагікамедыя Я. Купалы "Тутэйшыя" (1922 г.). Гістарычная тэматыка ўзнята ў драмах "Кастусь Каліноўскі" Е. Міровіча (1923 г.) і "Скарынін сын з Полацка" М. Грамыкі (1926 г.).

У 1930-я гг. папярэдні літаратурны дыялог, плюралізм думак быў згорнуты. Асноўныя змены ў літаратурным жыцці былі прадугледжаны пастановай ЦК КП(б)Б "Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый у БССР" ад 27 мая 1932 г. Літаратары былі аб'яднаны ў Саюз пісьменнікаў БССР. Галоўным прынцыпам метаду сацыялістычнага рэалізму, які стаў асноўным ў літаратуры і мастацтве, было абвешчана праўдзівае, канкрэтна-гістарычнае адлюстраванне рэчаіснасці ў яе рэвалюцыйным развіцці. Пры гэтым адбывалася ідэалізацыя падзей рэвалюцыі і існуючага грамадскага ладу, акцэнт рабіўся на адлюстраванне поспехаў сацыялістычнага будаўніцтва, паказ савецкага чалавека ў якасці творцы і гаспадара новага жыцця. Тэма сучаснасці, сацыялістычных пераўтварэнняў стала вядучай. Асэнсаванне мінулага становіцца вельмі важным у прозе Я. Коласа, З. Бядулі, Ц. Гартнага. Сярод найбольш значных твораў беларускай літаратуры 1930-х гг. трэба адзначыць аповесць Я. Коласа "Дрыгва" (1932–1933 гг.), раманы К.

Чорнага “Бацькаўшчына” (1931 г.) і “Трэцяе пакаленне” (1935 г.), раманы М. Гарэцкага “Віленскія камунары” (1931–1932 гг.) і “Камароўская хроніка” (1932–1937 гг.), паэму Я. Купалы “Над ракой Арэсай” (1933 г.), яго зборнік вершаў “Ад сэрца” (1940 г., адзначаны Сталінскай прэміяй 1941 г.) і інш. Каштоўнымі з’яўляюцца кнігі для дзяцей М. Лынькова – “Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў”, “Міколка-паравоз” (1937 г.). Народнай сталі называць драму К. Крапівы “Партызаны” (1937 г.). Асаблівым дасягненнем нацыянальнай драматургіі стала яго сатырычная камедыя “Хто смяецца апошнім” (1939 г., атрымаў за яе Сталінскую прэмію).

Аднак 1930-я гг. сталі даволі трагічнымі для беларускай літаратуры. Многія пісьменнікі былі рэпрэсіраваны. 29 кастрычніка 1937 г. органамі НКУС БССР былі расстраляны 22 беларускія літаратары, сярод якіх былі А. Вольны, П. Галавач, А. Дудар, М. Зарэцкі, В. Маракоў, І. Харык, М. Чарот, М. Кульбак і інш. Ахвярамі сталінскіх рэпрэсій сталі таксама А. Астрэйка, С. Баранавых, Ц. Гартны, Л. Калюга, Т. Кляшторны, А. Мрый, Я. Нёманскі і інш. Сярод рэпрэсіраваных здолелі выжыць С. Грахоўскі, У. Дубоўка, С. Шушкевіч, Я. Пушча і некаторыя іншыя літаратары. Стан творчай дэпрэсіі, маральнай падаўленасці ў асяроддзі беларускіх пісьменнікаў ва ўмовах разгорнутых рэпрэсій адзначаў на адрас І. Сталіна першы сакратар ЦК КП(б)Б К. Панамарэнка ў дакладной запісцы “Аб беларускай мове, літаратуры і пісьменніках” ад 21 лістапада 1938 г.

***Тэатральнае і музычнае мастацтва. Кіно.*** У 1920-я гг. адбывалася станаўленне нацыянальнага тэатра, музыкі. 14 верасня 1920 г. у Мінску прайшло ўрачыстае адкрыццё Беларускага дзяржаўнага тэатра (з 1926 г. – БДТ-1). Першай пастаноўкай быў “Рысь” Э. Ажэшкі. Арганізатарам і кіраўніком тэатра быў Ф. Ждановіч, у 1921–1931 гг. мастацкім кіраўніком з’яўляўся рэжысёр Е. Міровіч. У рэпертуары тэатра з самага пачатку былі арыгінальныя нацыянальныя мастацкія творы, насычаныя фальклорам, гістарычным матэрыялам – “Паўлінка” і “Раскіданае гняздо” Я. Купалы, “Машэка”, “Кастусь Каліноўскі” Е. Міровіча і інш.

У жніўні 1920 г. у Мінску спектаклем “Суд” У. Галубка пачала працу тэатральная трупа пад яго загадам (з 1926 г. перайменавалі ў Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр). Гэты самабытны тэатральны калектыў прадоўжыў традыцыі беларускага фальклорнага сцэнічнага мастацтва І. Буйніцкага. Ва ўсіх спектаклях шырока выкарыстоўвалася музыка, песні, танцы. Акрамя твораў У. Галубка, у рэпертуары прысутнічала “Пінская шляхта” В. Дуніна-Марцінкевіча, “Мікітаў лапаць” М. Чарота, “Збянтэжаны Саўка” Л. Родзевіча і інш. Тэатр набыў папулярнасць ва ўсіх кутках Беларусі. У. Галубку ў 1928 г. першаму ў рэспубліцы было прысвоена званне народнага артыста БССР.

Асновай новага беларускага тэатра (БДТ-2), адкрытага ў лістападзе 1926 г. у Віцебску, сталі навучэнцы Беларускай драматычнай студыі ў Маскве, якая была арганізавана яшчэ ў 1920 г. для падрыхтоўкі нацыянальных акцёрскіх кадраў.

Адбывалася развіццё тэатральнага мастацтва нацыянальных супольнасцей. Былі створаны Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР (1926 г.), Польскі дзяржаўны вандроўны тэатр БССР (1929 г.) і інш.

У 1920-я гг. былі закладзены асновы беларускай кампазітарскай школы. Ля яе вытокаў стаялі М. Аладаў, А. Багатыроў, В. Залатароў, Р. Пукст, Я. Цікоцкі, М. Чуркін. Першай савецкай беларускай операй стала “Вызваленне працы” (1922 г.) М. Чуркіна.

У 1930-я гг. адбылася пераарыентацыя рэпертуару тэатраў у бок засваення савецкай драматургіі. У сваіх спектаклях тэатральныя калектывы неслі народу духоўныя вартасці, мастацкае асэнсаванне рэчаіснасці. Вядучым тэатральным калектывам з’яўляўся БДТ-1. Тады ў тэатры былі пастаўлены такія творы нацыянальнай драматургіі, як “Бацькаўшчына” К. Чорнага (1932 г.), “Канец дружбы” (1934 г.), “Партызаны” (1938 г.), “Хто смяецца апошнім” (1939 г.) К. Крапівы, “Салавей” (1937 г.) З. Бядулі. У гэтым тэатры вырасла цэлае пакаленне таленавітых акцёраў – Г. Глебаў (адзначаны Сталінскай прэміяй у 1941 г.), У. Крыловіч, Б. Платонаў, Л. Ржэцкая, У. Уладамірскі і інш.

Важнае месца ў тэатральным жыцці рэспублікі займаў БДТ-2. Сярод значных яго пастановак трэба адзначыць п’есы “Паўлінка” і “Прымакі” (1936 г.) Я. Купалы, “Вайна вайне” і “У пушчах Палесся” (1937 г.) Я. Коласа, “Несцерка” В. Вольскага (1941 г.), “Беспасажніца” А. Астроўскага (1936 г.) і інш. З тэатрам звязана цэлая плеяда таленавітых майстроў сцэны – акцёры А. Ільінскі, Ц. Сяргейчык, З. Канапелька і інш.

У 1930-я гг. былі адкрытыя новыя тэатры – Тэатр юнага гледача БССР (1931 г.), Рускі дзяржаўны тэатр БССР (1932 г.), у другой палове 1930-х гг. ствараліся калгасна-саўгасныя тэатры ў шэрагу гарадоў рэспублікі, у 1938–1940 гг. – абласныя тэатры, асабліва ў заходніх абласцях БССР. У 1937 г. была створана Беларуская дзяржаўная філармонія.

Аднак у 1930-я гг. многія тэатральныя дзеячы былі падвергнуты рэпрэсіям. Вялікай стратай для нацыянальнага мастацтва было закрыццё БДТ-3. У. Галубок быў арыштаваны і расстраляны. Таксама загінуў у час рэпрэсій мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР М. Рафальскі.

У складаных абставінах 1930-х гг. адбывалася далейшае развіццё музычнага мастацтва. У 1933 г. быў створаны Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР, на сцэне якога ставіліся творы сусветнага і нацыянальнага館 опернага мастацтва. У першыя гады былі пастаўлены оперы “Яўген Анегін” і

“Пікавая дама” П. Чайкоўскага, “Князь Ігар” А. Барадзіна, “Русалка” А. Даргамыжскага і інш. Першым беларускім балетам стала пастаноўка “Салавей” М. Крошнера (1939 г.). Адной з яркіх зорак тэатра стала спявачка Л. Александроўская. Усенароднае прызнанне ёй прынесла адухоўленае выкананне беларускіх народных песень (атрымала ў 1941 г. Сталінскую прэмію).

Беларускія кампазітары стварылі цэлы шэраг значных музычных твораў. Найбольш вядомымі былі вакальна-сімфанічная паэма “Над ракой Арэсай” М. Аладава, оперы “Міхась Падгорны” (1938 г.) Я. Цікоцкага, “У пушчах Палесся” (1939 г.) А. Багатырова (атрымаў за яе Сталінскую прэмію), “Кветка шчасця” (1940 г.) А. Туранкова і інш.

Гісторыя беларускага кінематографа пачалася ў 1920-я гг. У 1924 г. было створана Белдзяржкіно. З 1928 г. у Ленінградзе дзейнічала кінастудыя “Савецкая Беларусь”, якая ў 1939 г. пераехала ў Мінск. Уласная кінавытворчасць пачалася ў 1925 г. з кінахронікі пра першамайскія святочныя ўрачыстасці. У 1926 г. рэжысёр Ю. Тарыч зняў першы мастацкі (яшчэ нямы) фільм “Лясная быль” паводле аповесці М. Чарота “Свінапас”. Тэма барацьбы беларускага народа за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне была вядучай у кінематаграфіі 1920-х – 1930-х гг.: фільмы “Кастусь Каліноўскі” (1927 г., рэжысёр У. Гардзін), “У агні народжаная” (1929 г., рэжысёр У. Корш-Саблін), “Адзінаццатага ліпеня” (1938 г., рэжысёр Ю. Тарыч) і інш. З канца 1920-х гг. з’явіліся фільмы пра сучаснасць: “Двойчы народжаны” (1934 г., рэжысёр Э. Аршанскі), “Шукальнікі шчасця” (1936 г., рэжысёр У. Корш-Саблін). У 1930-я гг. значнае месца займала экранізацыя літаратурных твораў. Сярод лепшых фільмаў для дзяцей была экранізацыя аповесці Я. Маўра “Палескія рабінзоны” (1934 г., рэжысёры І. Бахар і Л. Малчанаў).

***Выяўленчае мастацтва. Архітэктура.*** У гісторыі выяўленчага мастацтва Беларусі пачатку 1920-х гг. Віцебск становіцца буйнейшым мастацкім цэнтрам. Менавіта там у снежні 1918 г. пачала дзейнічаць народная мастацкая школа, заснавальнікам і дырэктарам якой стаў М. Шагал. З Віцебскам звязана творчасць заснавальніка супрэматызму К. Малевіча, які стварыў аб’яднанне мастакоў – УНОВИС (“Сцвярджальнікі новага мастацтва”). Творчая практыка мастакоў-авангардыстаў прадвызначыла шэраг дасягненняў сусветнага архітэктурнага дызайну, прамысловай графікі, хаця яе неадназначна ўспрынялі ў асяроддзі мастацкай інтэлігенцыі. На пазіцыях традыцыйнай акадэмічнай школы стаяла шмат мастакоў.

У выяўленчым мастацтве 1920-х – пачатку 1930-х гг. у працах У. Кудрэвіча, М. Станюты, А. Тычыны, М. Філіповіча, А. Грубэ, А. Бразера і іншых мастакоў, скульптараў знайшлі адлюстраванне ідэі нацыянальна-культурнага адраджэння, багатыя гістарычныя і культурныя традыцыі

беларускага народа, яго побыт, славутыя асобы гісторыі Беларусі, помнікі дойлідства. У пейзажах пераважала прыхільнасць да рэалізму, адчуваліся ўплывы імпрэсіянізму (У. Кудрэвіч, В. Волкаў). Сярод найбольш значных твораў мастакоў 1920-х гг. трэба адзначыць наступныя: “Шавец-камсамолец”, “Швачка”, “Партрэт стогадовага селяніна” Ю. Пэна, партрэты вядомых палітычных дзеячаў, пісьменнікаў, вучоных Я. Кругера, “Партызаны”, “Плытагоны” В. Волкава, “Стары Мінск”, “Раніца вясны”, “Млын” У. Кудрэвіча, “Бетоншчыкі”, “Аўтапартрэт”, “Партрэт дачкі” М. Станюты, “На Купалле”, “Бітва на Нямізе”, “Паўстанне К. Каліноўскага” М. Філіповіча, “І з’езд РСДРП у Мінску” і “Падпісанне маніфеста аб утварэнні БССР” І. Ахрэмчыка.

У 1930-я гг. у жывапісе папулярнай была сюжэтна-тэматычная карціна. Асаблівая ўвага была звернута на сацыяльнае змаганне беларускага народа. Вытворчая тэма заняла важнае месца ў творчасці І. Ахрэмчыка, В. Волкава, П. Гаўрыленкі, Я. Кругера, А. Шаўчэнкі, М. Філіповіча. У пейзажы па-ранейшаму вядучае месца займаў В. Бялыніцкі-Біруля, а ў жанры партрэта – В. Волкаў, М. Філіповіч, І. Ахрэмчык. З найбольш значных карцін гістарычнага жанру трэба адзначыць “Уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск” (1934–1935 гг.) І. Ахрэмчыка, “Сустрэча савецкіх танкістаў у Заходняй Беларусі. 1939 год” (1940 г.) М. Манасзона і інш. У 1939 г. была адкрыта Дзяржаўная карцінная галерэя БССР.

Рэпрэсіі не мінулі і мастакоў. Сярод загінуўшых быў таленавіты малады мастак Р. Семашкевіч, які да свайго арышту ў 1937 г. паспеў напісаць у Беларусі і Расіі каля 700 палотнаў.

У дойлідстве БССР у пачатку 1920-х гг. рабіліся спробы фарміравання ўласнага архітэктурнага стылю з акцэнтам на нацыянальныя традыцыі. У міжваенны час у дойлідстве пашыраўся канструктывізм – гэта добра відаць на прыкладзе архітэктуры Віцебска і Мінска: комплекс БДУ (1928–1931 гг.), будынак Дзяржаўнай бібліятэкі БССР (1932 г.) і інш. З канца 1920-х гг. у архітэктуры рэспублікі стаў панаваць функцыяналізм.

У адрозненне ад выяўленчага мастацтва беларуская архітэктура ў 1930-я гг. мела больш значныя дасягненні. Яна развівалася ў кантэксце агульнасаюзнай. З 1932 г. праводзілася актыўная распрацоўка генеральных планаў беларускіх гарадоў. У рэспубліку нярэдка накіроўваліся архітэктары з Масквы і Ленінграда (Г. Лаўроў, І. Лангбард і інш.), якія ўзвялі буйныя комплексы агульнарэспубліканскага значэння. У архітэктуры назіралася крытычнае асваенне класічнай спадчыны.

Адным з выдатных дойлідаў з’яўляўся І. Лангбард, які ўнёс значны ўклад у фарміраванне архітэктурнага аблічча Мінска. Створаныя ім будынкі сталі сапраўднай візітнай карткай беларускай сталіцы. Яго праект Дома ўрада БССР быў прызнаны самым лепшым на ўсесаюзным конкурсе 1929 г.

Узвядзенне Дома ўрада праводзілася ў 1930–1934 гг. Яго даўжыня па фасаду пераўзыходзіла 200 м – гэта першы такі вялікі будынак не толькі ў БССР, але і ў Савецкім Саюзе. Па праектах І. Лангбарда былі таксама пабудаваны ў Мінску Дом Чырвонай Арміі (1934–1939 гг.), будынак тэатра оперы і балета (1934–1937 гг., першапачаткова планавалася ўзводзіць паводле праекта Г. Лаўрова), галоўны корпус АН БССР (1935–1939 гг.). У сувязі з пераносам сталіцы рэспублікі з Мінска ў Магілёў (неабходнасць у рэалізацыі такога праекта адпала пасля верасня 1939 г.) І. Лангбардам у 1938–1939 гг. узводзіўся ў Магілёве будынак для ўрада (Дом Саветаў) і некалькі іншых грамадскіх і жылых пабудоў.

У цэлым, нягледзячы на сацыяльна-эканамічныя цяжкасці, складаныя грамадска-палітычныя працэсы, трагічныя вынікі сталінскіх рэпрэсій, у 1920–1930-я гг. былі атрыманы істотныя поспехі ў культурным жыцці рэспублікі. Разам са стратамі былі і значныя дасягненні ў прафесійнай творчасці пісьменнікаў, мастакоў, архітэктараў, рэжысёраў і іншых прадстаўнікоў шматнацыянальнай інтэлігенцыі БССР. Была праведзена ліквідацыя непісьменнасці, павышаўся агульнаадукацыйны і культурны ўзровень шырокіх слаёў працоўных. Беларуская культура пачала займаць сваё дастойнае месца сярод культур іншых народаў СССР.

**Паняцці**

**Беларусізацыя** – палітыка нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР у 1920-я гг., накіраваная на развіццё беларускай мовы, культуры, навукі і адукацыі.

**Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі** (да 1992 г. – **Беларуская дзяржаўная кансерваторыя імя А.В. Луначарскага**) – вядучая ВНУ Рэспублікі Беларусь у галіне музычнага мастацтва. Адкрыта 15 лістапада 1932 г. З’яўляецца буйным цэнтрам беларускага музычнага выканальніцкага мастацтва, музыказнаўства. Яе гісторыя непарыўна звязана з гісторыяй усёй музычнай культуры Беларусі ХХ – пачатку ХХІ стст. Тут сфарміравалася нацыянальная кампазітарская школа, ля вытокаў якой былі В. Залатароў, М. Аладаў і іншыя творцы. Цяпер рэктарам ВНУ з’яўляецца прафесар К. Дулава.

**Беларуская дзяржаўная філармонія** – установа культуры Беларусі. Афіцыйна адкрылася 25 красавіка 1937 г. у складзе сімфанічнага аркестра, аркестра беларускіх народных інструментаў, Беларускага ансамбля народнай песні і танца і Беларускай харавой капэлы. Цяпер уключае Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь “Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Р. Шырмы” (створаны ў 1939 г.), Дзяржаўны акадэмічны народны аркестр Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча (створаны ў 1930 г.), Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр і іншыя творчыя калектывы.

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (БДУ)** – вядучы ўніверсітэт Рэспублікі Беларусь. Быў адкрыты ў Мінску 30 кастрычніка 1921 г. Першым рэктарам з'яўляўся гісторык У. Пічэта (1921–1929 гг.). З 2008 г. рэктарам з'яўляецца акадэмік НАН Беларусі С. Абламейка.

**Беларускі трэці дзяржаўны тэатр** (з 1920 г. – **трупа Галубка**, з 1924 г. – **Другая беларуская дзяржаўная трупа**, з 1926 г. – **Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр** у Мінску, з 1932 г. – **Беларускі трэці дзяржаўны тэатр (БДТ-3)** у Гомелі) – тэатр Беларусі ў 1920–1937 гг. Арганізатарам і мастацкім кіраўніком да канца 1931 г. з'яўляўся У. Галубок. Ставіліся "Суд", "Апошняе спатканне", "Культурная цешча" і іншыя п'есы У. Галубка, "Пінская шляхта" В. Дуніна-Марцінкевіча, "Паўлінка" Я. Купалы, "Модны шляхцюк" К. Каганца, "Збянтэжаны Саўка" Л. Родзевіча, "Птушка шчасця" Ф. Аляхновіча і інш.

**Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт)** – вышэйшая навуковая ўстанова Беларусі ў 1922–1928 гг. Заснавана ў 1922 г. у Мінску на базе навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамасветы БССР. Старшынямі (прэзідэнтамі) з'яўляліся С. Некрашэвіч, У. Ігнатоўскі. Займалася шматгаліновымі навуковымі даследаваннямі. Рэарганізавана ў кастрычніку 1928 г. у Беларускую акадэмію навук.

**Канструктывізм** – напрамак у мастацкай культуры першай паловы ХХ ст., які імкнуўся да "канструявання" навакольнага асяроддзя, якое актыўна накіроўвае жыццёвыя працэсы, да стварэння "мастацтва для ўсяго народа". Прадстаўнікі канструктывізму проціпастаўлялі паказной раскошы прастату і падкрэслены ўтылітарызм новых прадметных форм, рэчаў і інш. Найбольшае распаўсюджанне атрымаў у архітэктуры. У Беларусі рысы канструктывізму праявіліся ў 1920–1930-я г. у дойлідстве Мінска, Віцебска і іншых гарадоў.

**Нацыянальная акадэмія навук Беларусі (Беларуская акадэмія навук** у 1928–1936 гг., **Акадэмія навук БССР** у 1936–1991 гг., **Акадэмія навук Беларусі** ў 1991–1997 гг.) – вышэйшая дзяржаўная навуковая ўстанова Рэспублікі Беларусь. Створана на базе Інстытута беларускай культуры ў кастрычніку 1928 г., урачыста адкрыта 1 студзеня 1929 г. Першым прэзідэнтам Беларускай акадэміі навук быў У. Ігнатоўскі. Цяпер ажыццяўляе арганізацыю, правядзенне і каардынацыю фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў у галіне прыродазнаўчых, тэхнічных, гуманітарных, сацыяльных навук і мастацтваў. З 2013 г. старшыня Прэзідыума НАН Беларусі – акадэмік У. Гусакоў.

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі** – вядучая бібліятэка Рэспублікі Беларусь. Заснавана ў 1922 г. як Беларуская дзяржаўная бібліятэка і бібліятэка БДУ, з 1926 г. рэарганізавана ў Беларускую дзяржаўную бібліятэку, у 1932–1992 г. – Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У.І. Леніна.

Цяпер бібліятэчны фонд складае каля 10 млн. адзінак захавання, у тым ліку больш 90 тыс. рэдкіх кніг і старадрукаў, пачынаючы з XIV–XV стст., збор выданняў Ф. Скарыны. Дырэктарам бібліятэкі з’яўляецца прафесар Р. Матульскі.

**Нацыянальная кінастудыя “Беларусьфільм”** – кінастудыя Рэспублікі Беларусь. Створана ў 1928 годзе кінаарганізацыяй “Белдзяржкіно” пад назвай “Савецкая Беларусь” у Ленінградзе, з 1939 г. у Мінску, з 1946 г. атрымала назву “Беларусьфільм”.

**Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь** – тэатр Беларусі. 25 мая 1933 г. быў адкрыты Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР. Унёс значны ўклад у развіццё беларускага мастацтва. З 2009 г. генеральным дырэктарам з’яўляецца У. Грыдзюшка, галоўным рэжысёрам з 2010 г. – М. Панджавідзэ.

**Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь (Мінскі сацыяльна-гістарычны музей** у 1930–1941 гг., **Дзяржаўны музей БССР** у 1945–1992 гг., **Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі** ў 1992–2009 гг.) – музей Беларусі. Створаны ў Мінску ў 1923 г. на базе Мінскага абласнога музея (1919–1923 гг.).

**Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага** – тэатр Рэспублікі Беларусь. Створаны ў 1932 г. у Бабруйску. З 1935 г. працаваў у Магілёве, Гродне, з 1947 г. пераехаў у Мінск. Унёс значны ўклад у развіццё беларускага тэатральнага мастацтва. З 2013 г. мастацкім кіраўніком тэатра з’яўляецца С. Кавальчык.

**Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Коласа (**з 1926 г. – **Другі беларускі дзяржаўны тэатр (БДТ-2),** з 1944 г. – **Беларускі дзяржаўны тэатр імя Я. Коласа)** – тэатр Рэспублікі Беларусь. Адкрыты 21 лістапада 1926 г. у Віцебску на базе выпускнога курса Беларускай драматычнай студыі пры Маскоўскім мастацкім акадэмічным тэатры, якую ўзначальваў В. Смышляеў. Тэатр унёс значны ўклад у развіццё беларускай культуры. З 2012 г. мастацкім кіраўніком з’яўляецца В. Анісенка.

**Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы (**з 1920 г. – **Беларускі дзяржаўны тэатр (БДТ),** з 1926 г. – **Першы беларускі дзяржаўны тэатр (БДТ-1)**, у 1944–1993 гг. – **Беларускі дзяржаўны тэатр імя Я. Купалы)** – найстарэйшы тэатр у Рэспубліцы Беларусь. Урачыста адкрыты 14 верасня 1920 г. у Мінску. Спачатку аснову тэатра склалі акцёры Першага беларускага таварыства драмы і камедыі пад кіраўніцтвам Ф. Ждановіча. Напрамкі і шляхі развіцця тэатра ў 1921–1931 гг. вызначаў яго мастацкі кіраўнік Е. Міровіч. Тэатр унёс значны ўклад у развіццё і папулярызацыю нацыянальнай драматургіі. Яго візітоўнай карткай з’яўляецца спектакль “Паўлінка” Я. Купалы. З 2008 г. мастацкім кіраўніком з’яўляецца рэжысёр М. Пінігін.

**Сацыялістычны рэалізм (сацрэалізм)** – асноўны творчы метад у савецкай літаратуры, мастацтве ў 1930-я – пачатку 1990-х гг. Тэарэтычна абапіраўся на прынцыпы гістарызму і дыялектычнага разумення быцця, часткова ўвабраў у сябе рэалістычную традыцыю, адчуваў уплыў камуністычнай ідэалогіі і марксісцкай эстэтыкі.

**Дзеячы культуры, мастацтва**

**Аладаў Мікалай Ільіч** (1890–1972) – кампазітар. Народны артыст Беларусі. Аўтар опер "Тарас на Парнасе", "Андрэй Касцень", кантаты "Над ракой Арэсай" і іншых музычных твораў.

**Александроўская Ларыса Пампееўна** (1904–1980) – оперная спявачка. Народная артыстка БССР і СССР. У 1951–1960 гг. з'яўлялася галоўным рэжысёрам Беларускага тэатра оперы і балета.

**Багатыроў Анатоль Васільевіч** (1913–2003) – кампазітар. Народны артыст БССР і РСФСР. Адзін з заснавальнікаў нацыянальнай беларускай оперы. Аўтар опер "У пушчах Палесся", "Надзея Дурава", араторыі "Бітва за Беларусь", кантат "Беларускім партызанам", "Беларусь" і інш.

**Воінаў Аляксандр Пятровіч** (1902–1987) – архітэктар. Аўтар праектаў гасцініцы "Свіслач", Палаца піянераў і школьнікаў, Інстытута фізкультуры, Тэатра юнага гледача, будынкаў ЦК КПБ і Мінскага абкама КПБ, забудовы Ленінскага праспекта (цяперашняга праспекта Незалежнасці) у Мінску і іншых буйных помнікаў архітэктуры.

**Галубок (Голуб) Уладзіслаў Іосіфавіч** (1882–1937) – драматург, рэжысёр. Першы народны артыст Беларусі (1928 г.). У 1920–1931 гг. – заснавальнік і мастацкі кіраўнік тэатральнай трупы (Беларускага дзяржаўнага вандроўнага тэатра), з 1931 г. – дырэктар і акцёр гэтага тэатра. Аўтар каля 40 п'ес на сацыяльныя, бытавыя і гістарычныя тэмы: "Апошняе спатканне", "Суд", "Белы вянок", "Ганка", "Пінская мадонна" і інш.

**Гарэцкі Максім Іванавіч** (1893–1938) – пісьменнік. Адзін з пачынальнікаў нацыянальнай мастацкай прозы. Аўтар раманаў "Віленскія камунары" і "Камароўская хроніка", зборніка "На імперыялістычнай вайне", аповесці "Дзве душы", даследаванняў "Гісторыя беларускай літаратуры", "Маладняк" за пяць гадоў. 1923–1928", "Хрэстаматыі беларускай літаратуры. XI век–1905 г." і іншых прац.

**Ігнатоўскі Усевалад Макаравіч** (1881–1931) – грамадскі дзеяч, гісторык. Акадэмік Беларускай акадэміі навук. У 1926–1928 гг. з'яўляўся старшынёй (прэзідэнтам) Інбелкульта, у 1928–1931 гг. – прэзідэнтам Беларускай акадэміі навук, дырэктарам яе Інстытута гісторыі. Аўтар кніг "Кароткі нарыс нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі", "Кароткі нарыс гісторыі Беларусі", "Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецьця", "1863 год на Беларусі" і іншых прац па гісторыі Беларусі.

**Корш-Саблін (Саблін) Уладзімір Уладзіміравіч (**1900–1974) – кінарэжысёр. Народны артыст СССР. Адзін з заснавальнікаў беларускага кіно. Здымаў першы гукавы мастацкі фільм “Першы ўзвод” (1933 г.), фільмы “Шукальнік шчасця” (1936 г.), “Канстанцін Заслонаў” (1949 г., разам з А. Файнцымерам), “Чырвонае лісце” (1958 г.), “Масква-Генуя” (1964 г., разам з А. Спешневым і П. Армандам) і інш.

**Кузьма Чорны (Раманоўскі Мікалай Карлавіч)** (1900–1944) – пісьменнік. Класік беларускай літаратуры. Аўтар раманаў “Сястра”, “Зямля”, “Пошукі будучыні”, “Млечны Шлях”, аповесці “Лявон Бушмар” і іншых твораў.

**Лангбард Іосіф Рыгоравіч** (1882–1951) – архітэктар. Паводле яго праектаў узводзіліся Дом урада (1934–1937 гг.), Дом Чырвонай Арміі (1934–1939 гг.), Беларускі тэатр оперы і балета (1934–1937 гг.), галоўны корпус АН БССР у Мінску (1935–1939 гг.), Дом Саветаў у Магілёве (1938–1939 гг.), праводзілася пасляваеннае аднаўленне і рэканструкцыя Мінска, Гомеля.

**Лаўроў Георгій Лаўрэнцьевіч** (1895–1967) – архітэктар. Аўтар праектаў галоўнага корпуса і корпуса факультэтаў БДУ (1928–1931 гг.), будынкаў Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І. Леніна (1930–1932 гг.), Беларускага політэхнічнага інстытута (1934 г.) і іншых грамадскіх пабудоў.

**Лёсік Язэп (Іосіф) Юр’евіч** (1883–1940) – грамадскі дзеяч, пісьменнік. Акадэмік Беларускай акадэміі навук. Аўтар падручнікаў па беларускай мове “Практычная граматыка”, “Беларуская мова. Пачатковая граматыка”, “Беларуская мова. Правапіс”, шэрагу літаратурных твораў, навуковых прац па мовазнаўстве, гісторыі Беларусі.

**Міровіч (Дунаеў) Еўсцігней Афінагенавіч** (1878–1952) – драматург, тэатральны рэжысёр. Народны артыст Беларусі. Адзін са стваральнікаў беларускага савецкага тэатра. У 1921–1931 гг. быў мастацкім кіраўніком БДТ-1, у 1932–1935 гг. – мастацкім кіраўніком Гомельскага тэатра рабочай моладзі (з 1935 г. – Першы калгасна-саўгасны тэатр), у 1937–1940 гг. – мастацкім кіраўніком Беларускага тэатра юнага гледача імя Н. Крупскай. Аўтар п’ес “Машэка”, “Кастусь Каліноўскі”, “Каваль-ваявода” і інш.

**Міхась Чарот (Кудзелька Міхаіл Сымонавіч)** (1896–1937) – паэт, пісьменнік. Адзін з лідараў беларускай савецкай літаратуры 1920-х гг. Аўтар паэм “Карчма”, “Ленін”, “Марына”, “Беларусь лапцюжная”, “Чырванакрылы вяшчун”, аповесці “Свінапас”, п’ес “Мікітаў лапаць”, “Дажынкі”, “На Купалле” і іншых твораў.

**Пічэта Уладзімір Іванавіч** (1878–1947) – гісторык. Акадэмік Беларускай акадэміі навук. У 1921–1929 гг. з’яўляўся рэктарам БДУ. Аўтар каля 150 прац па айчыннай гісторыі, гістарыяграфіі, археалогіі, архівазнаўстве, краязнаўстве, гісторыі права, сярод якіх “Гісторыя Беларусі”,

"Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве", "Белоруссия и Литва, XV–XVI вв." і інш.

**Тарыч (Аляксееў) Юрый Віктаравіч** (1885–1967) – кінарэжысёр. Заснавальнік беларускага кіно. У 1926 г. зняў першы беларускі мастацкі фільм "Лясная быль" паводле аповесці М. Чарота "Свінапас", у 1929 г. – "Да заўтра" (сумесна з І. Бахарам).

**Цікоцкі Яўген Карлавіч** (1893–1970) – кампазітар. Народны артыст Беларусі. Адзін з заснавальнікаў беларускай оперы і сімфоніі ў БССР. Аўтар опер "Міхась Падгорны", "Алеся" і іншых музычных твораў.

**Цішка Гартны (Жылуновіч Зміцер Хведаравіч)** (1887–1937) – грамадскі дзеяч, пісьменнік. Друкавацца пачаў у 1908 г. у газеце "Наша ніва". Аўтар рамана "Сокі цаліны".

**Чуркін Мікалай Мікалаевіч** (1869–1964) – кампазітар, фальклорыст. Народны артыст Беларусі. Адзін з заснавальнікаў беларускай прафесійнай музыкі. Аўтар оперы "Вызваленне працы", "Раскіданае гняздо" (паводле Я. Купалы), радыёоперы для дзяцей "Рукавічка" і іншых музычных твораў.

**Шчакаціхін Мікалай Мікалаевіч** (1896–1940) – мастацтвазнавец. Адзін з заснавальнікаў беларускага мастацтвазнаўства. Аўтар манаграфіі "Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва" (т. 1, 1928) і шэрагу іншых прац па гісторыі мастацкай культуры Беларусі.

## Тэма 9. Культура Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг.

***Асвета. Гісторыка-этнаграфічныя даследаванні.*** У культурным жыцці заходнебеларускіх зямель вызначальнае месца займала грамадска-культурная дзейнасць беларусаў як большасці карэннага насельніцтва. З-за непісьменнасці і малапісьменнасці, нізкага ўзроўню грамадскай і нацыянальнай свядомасці насельніцтва, слабасці сацыяльна-культурнай сферы пераважала культурна-асветніцкая праца, якая праводзілася грамадскімі арганізацыямі, навучальнымі ўстановамі, інтэлігенцыяй рознай ідэйна-палітычнай накіраванасці.

З 514 беларускіх пачатковых школ, якія дзейнічалі ў Заходняй Беларусі да 1921 г., да 1923 г. засталіся толькі 32. Хоць прыняты польскім сеймам 31 ліпеня 1924 г. "Закон аб мове і арганізацыі школьнай справы для нацыянальных меншасцей" фармальна дазваляў ствараць дзяржаўныя нацыянальныя школы, аднак была адкрыта нязначная колькасць польска-беларускіх школ.

З усталяваннем ў 1926 г. рэжыма "санацыі" Ю. Пілсудскага пачала праводзіцца палітыка дзяржаўнай асіміляцыі, якая часова ўтрымлівала асобныя ліберальна-дэмакратычныя палажэнні, але з канца 1920-х фактычна адбылося вяртанне да папярэдняй палітыкі нацыянальнай асіміляцыі. З 25 беларускіх і 49 польска-беларускіх школ у 1928 г.

засталося да 1938 г. толькі 5 польска-беларускіх. Польскія ўлады закрылі 8 беларускіх гімназій, 2 настаўніцкія семінарыі. Адзіная беларуская гімназія ў Вільні была пераўтворана ў філіял польскай гімназіі.

Школьная рэформа пачатку 1930-х гг. яшчэ больш абмежавала доступ заходнебеларускай моладзі да сярэдняй, вышэйшай адукацыі. Сярод студэнтаў Віленскага ўніверсітэта імя С. Баторыя доля беларусаў не перавышала 3%. Не было забяспечана ўсеагульнае навучанне нават у пачатковых польскіх школах. У 1938/1939 навучальным годзе ў Заходняй Беларусі не наведвалі заняткі больш 100 тыс. дзяцей. У многіх паветах былі "бясшкольныя акругі". У 1939 г. каля 35% насельніцтва заставалася непісьменным.

Вялікую ролю ў абароне нацыянальных правоў заходнебеларускага насельніцтва сыгралі культурна-асветніцкія арганізацыі – Таварыства беларускай школы (ТБШ), Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (БІГіК). У вытокаў стварэння ТБШ былі Б. Тарашкевіч, А. Луцкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі, А. Станкевіч і інш. У першай палове 1920-х гг. таварыства засяродзілася на пытаннях утрымання беларускіх гімназій, пачатковых школ. Пад уплывам Беларускай сялянска-работніцкай грамады ТБШ з 1926 г. стала буйной культурна-асветніцкай арганізацыяй: 12 акруговых упраў у сярэдзіне 1930 г. налічвалі больш 500 гурткоў, у якіх знаходзілася больш 15 тыс. чалавек. Асноўнымі напрамкамі культурна-асветніцкай працы ТБШ былі наступныя: асветніцтва (ліквідацыя непісьменнасці; самаадукацыя дарослых; навучанне і выхаванне ў беларускіх пачатковых школах, гімназіях; пазашкольная асвета); арганізацыйна-масавая работа (правядзенне кампаніі па збору подпісаў за адкрыццё беларускіх школ – да 1928 г. было пададзена больш за 30 тыс. заяў на 1229 школ, аднак абсалютная большасць з іх была беспадстаўна праігнаравана польскімі ўладамі); выдавецкая дзейнасць і бібліятэчная справа (наладжванне друку, распаўсюджванне вучэбнай літаратуры, перыёдыкі, утрыманне бібліятэк-чытальняў); культурна-мастацкая дзейнасць (арганізацыя самадзейных мастацкіх калектываў).

Асветніцкая праца ТБШ праводзілася ў святліцах (клубах), бібліятэках-чытальнях (хатах-чытальнях), народных дамах. Для прапаганды асветы актыўна выкарыстоўваўся друк таварыства – "Бюлетэнь ТБШ", газета "Шлях", часопіс "Летапіс ТБШ".

Аднак пад уздзеяннем рэпрэсій польскіх улад адбыўся заняпад дзейнасці ТБШ – восенню 1932 г. налічвалася толькі 150 гурткоў (каля 4 тыс. чалавек), вясной 1934 забаронена адзіная акруговая ўправа ў Беластоку, амаль спынілася існаванне гурткоў. Адмоўны ўплыў аказвалі і сталінскія рэпрэсіі, ахвярамі якіх сталі Б. Тарашкевіч, Я. Гаўрылік,

І. Дварчанін, П. Мятла, С. Рак-Міхайлоўскі і іншыя лідары заходнебеларускага руху.

БІГіК быў створаны дзеячамі Беларускай хрысціянскай дэмакратыі ў 1926 г. як альтэрнатыўная ТБШ арганізацыя. Асноўнымі формамі яе культурна-асветніцкай дзейнасці былі лекцыі, урачыстыя мерапрыемствы (“акадэміі”) і інш. У пачатку 1930-х гг. назіралася ажыўленне дзейнасці БІГіК. У 1934–1935 гг. налічвалася больш за 80 яго гурткоў (каля 1,2 тыс. чалавек), амаль пры кожным гуртку працавала бібліятэка-чытальня.

У лютым 1936 г. было заключана пагадненне паміж ТБШ і БІГіК аб адзінстве дзеянняў у школьнай справе. Сумесны Школьны сакратарыят праводзіў кампанію за адкрыццё беларускіх школ. Аднак у снежні 1936 г. была забаронена дзейнасць гэтых арганізацый. Польскія ўлады актывізавалі дзеянні па далейшай паланізацыі і нацыянальна-культурнай асіміляцыі насельніцтва Заходняй Беларусі.

Асноўнымі напрамкамі дзейнасці польскіх устаноў культуры, грамадскіх арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі была палітычная і культурна-асветніцкая работа, якая была накіравана на прапаганду дзяржаўнай ідэалогіі, паланізацыю беларусаў. У сваёй дзейнасці яны абмяжоўваліся пераважна пытаннямі ліквідацыі непісьменнасці, простымі і агульнадаступнымі формамі культурна-асветніцкай працы, якую разгортвалі ў асноўным у святліцах. Польска мацеж школьна мела ў 1938 г. у Палескім ваяводстве 116 польскіх пачатковых школ (5658 вучняў), у Беластоцкім ваяводстве – 15 гурткоў (1387 чалавек), Навагрудскім ваяводстве – 7 (894 чалавекі).

На тэрыторыі Заходняй Беларусі дамінавалі польскія бібліятэкі па колькасці ўстаноў і аб’ёму фондаў. Самыя буйныя бібліятэкі знаходзіліся ў Вільні: бібліятэка Віленскага ўніверсітэта імя С. Баторыя – 598 тыс. экз. (1939 г.), Дзяржаўная публічная бібліятэка імя Я. і Э. Урублеўскіх – каля 200 тыс. адзінак (1939 г.), бібліятэка рымска-каталіцкай семінарыі – 56,3 тыс. экз. (1937 г.). Бібліятэка рымска-каталіцкай семінарыі ў Пінску ў 1939 г. налічвала 42,3 тыс. экз., сярод якіх было 4 тыс. старадрукаў, больш 600 рукапісаў XVII–XIX стст., уласны кнігазбор біскупа З. Лазінскага. Сярод буйных прыватнаўласніцкіх бібліятэк былі кнігазборы Радзівілаў у Нясвіжы, Скірмунтаў у Моладаве, С. Касакоўскага ў Вялікай Бераставіцы, Віславухаў у Пярковічах, Г. Грабоўскага ў Грушаўцы, пісьменніцы М. Радзевіч у Грушаве і інш. Беднасць, непісьменнасць былі перашкодамі ў карыстанні кнігамі. У Палескім ваяводстве ў 1934 г. паслугамі польскіх бібліятэк карысталіся ўсяго 1,3% насельніцтва.

Нешматлікая заходнебеларуская інтэлігенцыя прыкладала намаганні ў справе навуковага даследавання гісторыка-культурнай спадчыны. Адпаведную працу праводзіла Беларускае навуковае таварыства (БНТ) у

Вільні, якое займалася распрацоўкай беларускай навуковай тэрміналогіі, падрыхтоўкай і выданнем вучэбнай, навукова-папулярнай літаратуры, прапагандай гістарычных ведаў. Пры БНТ быў заснаваны ў 1921 г. Віленскі беларускі гісторыка-этнаграфічны музей імя І. Луцкевіча, дырэктарам якога да верасня 1939 г. быў А. Луцкевіч.

Пад уплывам ідэй польскага рэгіяналізму ажывіўся на заходнебеларускіх землях краязнаўчы рух. Зборам і даследаваннем традыцыйнай культуры займаўся этнаграфічны музей Віленскага ўніверсітэта імя С. Баторыя. Былі створаны гістарычны і прыродазнаўчы музеі ў Гродне, Палескі музей у Пінску, краязнаўчыя музеі ў Слоніме, Ваўкавыску, Баранавічах, музей А. Міцкевіча ў Навагрудку.

***Літаратура і друк.*** Заходнебеларуская літаратура была прасякнута пафасам вызваленчай барацьбы, працягвала дэмакратычныя і адраджэнскія традыцыі. У 1920-я гг. пераважала развіццё лірыкі, малой прозы, драматургіі, эсэістыкі, у 1930-я гг. – паэзіі. У. Жылка аб'ядноўваў у сваёй паэзіі ідэі сацыяльнага і нацыянальнага адраджэння. Прыродаапісальнай, інтымнай была ранняя лірыка Н. Арсенневай. На нацыянальныя, агульначалавечыя каштоўнасці, апалітычны эстэтызм арыентаваліся Х. Ільяшэвіч, Ф. Грышкевіч і інш. Выразнай была рэвалюцыйна-дэмакратычная плынь літаратуры (М. Васілёк, А. Салагуб, П. Пястрак, В. Таўлай, М. Машара, М. Засім і інш.). У зборніках М. Танка "На этапах", "Журавінавы цвет", "Пад мачтай", у паэме "Нарач" цэнтральнай фігурай быў прафесійны рэвалюцыянер. У вершаваных творах, публіцыстычных артыкулах паэт заклікаў маладых літаратараў ісці дарогай праўды, свабоды, служыць змаганню народа. Яркай старонкай публіцыстыкі былі выступленні Б. Тарашкевіча ў польскім сейме. Высокім узроўнем публіцыстыкі вызначаўся У. Самойла. І. Абдзіраловіч (І. Канчэўскі) сваёй кнігай "Адвечным шляхам" (Вільня, 1921) зрабіў моцны ўплыў на грамадскую думку Заходняй Беларусі.

Асноўным цэнтрам выдавецкай справы была Вільня, дзе размяшчаліся друкарні і выдавецтвы: Беларускае выдавецкае таварыства, выдавецтвы У. Знамяроўскага, Б. Клецкіна, ТБШ, БІГіК, Беларускае каталіцкае выдавецтва, Беларуская друкарня імя Ф. Скарыны і інш. Перыёдыка выходзіла падпольна ці ў прыватных друкарнях таксама ў Беластоку, Гродне, Брэсце і іншых гарадах. Заходнебеларускі друк знаходзіўся ў даволі складаных умовах. Камуністычная партыя Заходняй Беларусі ў сваіх падпольных друкарнях выпускала газету "Чырвоны сцяг", часопіс "Бальшавік" і іншую перыёдыку. У 1926–1928 гг. выдаваўся прагрэсіўны сатырычны часопіс "Маланка", у 1934 г. – "Асва". Дзеячы беларускага хрысціянска-дэмакратычнага руху выдавалі газету "Крыніца" ("Беларуская крыніца"), часопісы "Хрысціянская думка", "Шлях моладзі" і

інш. У 1935–1939 гг. выдаваўся літаратурна-навуковы і грамадскі часопіс “Калоссе”, на старонках якога змяшчаліся творы аўтараў розных поглядаў. Недахоп сродкаў, цэнзура і рэпрэсіўныя дзеянні польскіх улад, узмацненне паланізацыі, непісьменнасць насельніцтва вялі да згортвання дзейнасці беларускіх кнігавыдавецтваў.

***Мастацкая культура. Тэатр і музыка.*** Мастацкае жыццё беларускага насельніцтва абмяжоўвалася пераважна самадзейнымі формамі музычна-тэатральнай дзейнасці. Агульнадаступнасць, дэмакратызм, нацыянальна-культурная арыентацыя надавалі папулярнасць самадзейным творчым калектывам. У 1922 г. была заснавана ў Вільні аматарская тэатральная студыя – Беларуская драматычная майстроўня. Шырокую папулярнасць музычна-тэатральная дзейнасць набыла ў ТБШ, БІГіК, Беларускім студэнцкім саюзе (БСС), беларускіх гімназіях. Створаныя пры гуртках ТБШ калектывы мастацкай самадзейнасці ставілі п’есы пераважна сацыяльнай тэматыкі беларускіх, рускіх, украінскіх, польскіх драматургаў. Сярод іх былі “Паўлінка” і “Прымакі” Я. Купалы, “Модны шляхцюк” К. Каганца, “Збянтэжаны Саўка” Л. Родзевіча, “Мікітаў лапаць” М. Чарота і іншыя творы. Асаблівую вядомасць атрымалі хоры гурткоў ТБШ у Вілейцы, Навагрудку, Заполлі Навагрудскага павета, Вялікіх Грынках Ваўкавыскага павета, Ярэмічах, Старым і Новым Свержані Стаўбцоўскага павета і інш. У маі 1926 г. быў створаны Беларускі народны тэатр, які неўзабаве быў пераўтвораны ў Вандроўны беларускі народны тэатр пры Віленскім аддзеле БІГіК. У мастацкай самадзейнасці БІГіК пераважаў беларускамоўны рэпертуар нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі, вострыя сацыяльныя праблемы не закраналіся, у жанравых адносінах вылучаліся камедыі, вадэвілі – “Хам” Э. Ажэшкі, “Залёты” В. Дуніна-Марцінкевіча, “Паўлінка” Я. Купалы, “Заручыны Паўлінкі” Ф. Аляхновіча і інш. Добрую рэпутацыю мелі хоры БІГіК пры цэнтральнай управе ў Вільні, у мястэчку Будслаў Вілейскага павета.

Зборам і апрацоўкай беларускага песеннага фальклору займаліся А. Грыневіч, Р. Шырма. А. Стаповіч змяшчаў сабраныя народныя песні ў заходнебеларускім друку.

Асаблівую папулярнасць у Заходняй Беларусі меў хор БСС у Вільні пад кіраўніцтвам Р. Шырмы. Вялікі рэзананс мелі сумесныя выступленні хору БСС з оперным спеваком М. Забэйда-Суміцкім, асабліва ў час яго канцэртаў у Вільні 13 снежня 1936 г. і ў маі 1937 г. Запісаныя М. Забэйдам-Суміцкім грампласцінкі ўключалі беларускія песні ў апрацоўцы А. Туранкова, А. Грачанінава, К. Галкоўскага: “Малады дубочак”, “Чаму ж мне не пець”, “Лявоніха” і інш.

Найбольш вядомыя прафесійныя польскія тэатральныя калектывы дзейнічалі пераважна ў Вільні, сярод якіх вылучаліся Вялікі тэатр на

Пагулянцы, тэатр імя У. Сыракомлі. Акрамя Вільні і Беластока, уласны будынак меў толькі гарадскі тэатр імя Э. Ажэшкі ў Гродне.

***Жывапіс.*** У выяўленчым мастацтве Заходняй Беларусі арганічна спалучалася прафесійная і самадзейная (інсітная) творчасць, пашыралася нацыянальна-рамантычная і мадэрнісцкая плыні, назіралася разнастайнасць відаў і жанраў, тэматыкі і сюжэтаў. Фарміраванню ў Вільні рэгіянальнага мастацкага асяродку спрыяў мастацкі факультэт Віленскага ўніверсітэта імя С. Баторыя, дзе выкладалі мастакі Ф. Рушчыц, Л. Слядзінскі, Б. Кубіцкі, Б. Ямант і інш. Сярод таленавітых выпускнікоў былі беларускія мастакі П. Сергіевіч, М. Сеўрук, якія ўваходзілі ў Віленскае таварыства незалежных мастакоў. З Вільняй звязана таксама творчасць Я. Горыда, П. Жынгеля, В. Пракаповіч, К. Чурыла і іншых беларускіх мастакоў. З мастацкай студыі Віленскай беларускай гімназіі выйшлі жывапісцы Р. Семашкевіч, М. Васілеўскі, В. Сідаровіч і інш.

Палотны Я. Драздовіча гістарычнай тэматыкі (“Скарыніяна” і інш.) вылучаліся рамантычнымі матывамі. У яго творчасці наватарскі характар мела касмічная тэма, адлюстраваная ў цыклах карцін “Жыццё на Марсе”, “Жыццё на Сатурне”, “Жыццё на Месяцы”. Вялікую сацыяльную значнасць мела палатно П. Сергіевіча “Шляхам жыцця” (“Падарожныя”). Своеасаблівым гімнам чалавеку зямлі была кампазіцыя М. Сеўрука “Жніво”, прадстаўленая на выставе ў Варшаве, а потым набытая беларускім музеем у Вільні. Шмат фатаграфій па заходнебеларускай культурнай спадчыне пакінулі Я. Булгак, Ю. Шыманчык, Д. Георгіеўскі і іншыя фотамайстры.

Пераважна патрыярхальна-натуральны ўклад побыту заходнебеларускага сялянства, нізкі ўзровень урбанізацыі, адсутнасць індустрыялізацыі, непрыманне гвалтоўнай паланізацыі не дазволілі разбурыць традыцыйную культуру. Шырокую вядомасць мелі нарачанска-дзісенскія маляваныя дываны. На Палессі былі пашыраны ганчарныя, ткацкія, вышывальныя, гарбарна-аўчынныя і іншыя промыслы. Вырабы ганчароў з Гарадной, Пружан, Ружан, Пагоста-Загародскага і іншых мясцін задавальнялі патрэбу ў керамічным посудзе гаспадарчага і мастацкага прызначэння.

***Архітэктура.*** Слабы ўзровень развіцця прамысловасці і транспарту стрымлівалі рост горадабудаўніцтва, але знешняе аблічча заходнебеларускіх гарадоў і мястэчак змянялася. Разнастайныя новыя будынкі (пераважна ў стылі канструктывізму, функцыяналізму) сфарміравалі цэнтральную частку Гродна, моцна паўплывалі на планіроўку Брэста і іншых гарадоў, мястэчак Заходняй Беларусі. У стылі неакласіцызму ўзведзены архітэктарам С. Філясевічам будынак Польскага банка ў Брэсце. У стылі функцыяналізму ўзведзены гмах Палескага

ваяводскага ўпраўлення (Брэст), Дом афіцэраў (Гродна), паштамт і гімназія імя К. Хадкевіча (Ліда), жылы дом для афіцэрскага саставу ў Паставах. Былі пабудаваны калоніі па тыпавых праектах для чыноўнікаў ў Навагрудку, Браславе і іншых гарадах. Папулярным у сядзібным будаўніцтве стаў "закапанскі стыль" (пераважна драўляная архітэктура). Архітэктар Ю. Лісецкі ўзводзіў такія асабнякі ў Брэсце (цяпер у іх размяшчаюцца музей "Выратаваныя каштоўнасці" і Музей гісторыі горада), а таксама праектаваў жылы дом для ваеннаслужачых Корпуса аховы памежжа ў Маладзечне. Архітэктар Ю. Клос узводзіў дом павятовага старасты ў Браславе, касцёл Маці Божай Анёльскай у Мяжанах на Браслаўшчыне. Рысы "закапанскага стылю" мае чыгуначны вакзал у Стоўбцах, касцёл Найсвяцейшага Сэрца Ісуса ў Канвелішках (сучасны Воранаўскі раён), дзе таксама прысутнічаюць элементы неаготыкі. Архітэктарам А. Дубановічам быў пабудаваны ў стылі мадэрну касцёл Маці Божай Ружанцовай у Солах на Смаргоншчыне.

Новым метадам апрацоўкі дрэва, арыгінальнымі драўлянымі пабудовамі была адметна творчасць віленскага архітэктара Л. Вітан-Дубейкаўскага, які аднаўляў кляштар у Друі, праектаваў царкву ў Відзах, Петрапаўлаўскі касцёл у Дрысвятах, іншыя пабудовы на Віленшчыне.

***Культура нацыянальных супольнасцей***. Польскія ўлады праводзілі асімілятарскую, абмежавальную палітыку ў адносінах не толькі беларусаў, але і іншых нацыянальных супольнасцей (рускіх, украінцаў, яўрэяў, татараў, літоўцаў). У сваю чаргу яны імкнуліся захаваць нацыянальна-культурную і рэлігійную тоеснасць, выкарыстоўваючы пераважна патэнцыял уласных грамадскіх структур.

Пры аддзелах Рускага дабрачыннага таварыства (РДТ) у Брэсце, Пінску, Лунінцы, Гродне, Навагрудку, Баранавічах, Стаўбцах, Слоніме, Верцялішках Гродзенскага павета, Дабромыслі і Новай Мышы Баранавіцкага павета гуртавалася мясцовая руская інтэлігенцыя, ствараліся літаратурныя, тэатральныя гурткі і іншыя творчыя аб'яднанні. Аддзелы РДТ займаліся ўтрыманнем адзінкавых рускіх школ, бібліятэк, правядзеннем культурна-асветніцкай працы. Наладжваліся Дні рускай культуры, розныя юбілейныя ўрачыстасці. Акрамя свецкіх рускамоўных газет "Русский голос", "Наше время", "Новая искра", "Русское слово", што выдаваліся ў міжваеннай Польшчы, распаўсюджвалася і рэлігійная перыёдыка – часопіс "Воскресное чтение", праваслаўная газета "Слово" і інш. Пад кіраўніцтвам Вышэйшага стараабрадніцкага савета ў Польшчы праводзілася рэлігійна-асветніцкая праца ў пачатковых школах, бібліятэках-чытальнях, маладзёжных рэлігійна-асветніцкіх гуртках.

Культурнае жыццё ўкраінцаў разгортвалася пераважна ў паўднёвых паветах Палескага ваяводства. Намаганнямі мясцовай украінскай

інтэлігенцыі была створана рэгіянальнае культурна-асветніцкага таварыства "Просвіта на Поліссі" з цэнтральнай управай у Брэсце, якое ажыццяўляла культурна-асветніцкую працу праз бібліятэкі-чытальні і народныя дамы, утрымлівала нешматлікія ўкраінскія школы. Колькасць гурткоў "Просвіты" на тэрыторыі Палескага ваяводства ў 1929 г. складала 127 (1754 чалавекі). Там наладжваліся тэатральныя пастаноўкі, урачыстасці ў гонар Т. Шаўчэнкі, распаўсюджваўся ўкраінскамоўны друк – газеты і часопісы "Діло", "Сельроб", "Наше життя" і іншыя выданні з Львова. У пачатку 1932 г. налічваліся 44 украінскія гаспадарчыя пляцоўкі, 53 чытальні "Просвіты". Аднак з-за рэпрэсій польскіх улад украінскі рух на Палессі прыйшоў у 1930-я гг. у заняпад.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі была створана сетка яўрэйскіх культурна-асветніцкіх таварыстваў (Цэнтральная яўрэйская школьная арганізацыя, "Тарбут", "Культур-Ліга", "Хорэў" і інш.), якія займаліся адкрыццём і ўтрыманнем школ, бібліятэк, правядзеннем асветніцкай работы, культурна-масавых мерапрыемстваў, падтрымкай аматарскага мастацкага руху. Сіяніцкія арганізацыі праводзілі мэтанакіраваную культурна-асветніцкую працу па падрыхтоўцы да эміграцыі яўрэяў, якія павінны былі ўключыцца ў аднаўленне будучай яўрэйскай дзяржавы ў Палясціне. Асноўным цэнтрам культурнага жыцця яўрэяў з'яўлялася Вільня", "літоўскі Іерусалім". Там з 1925 г. дзейнічаў Яўрэйскі навуковы інстытут, які займаўся гуманітарнымі даследаваннямі, навуковымі выданнямі, меў архіў і бібліятэку (больш 40 тыс. экз.), пры ім дзейнічаў яўрэйскі музей. У Вільні працавалі яўрэйскія мастакі Б. Цукерман, Б. Залкінд, М. Ляйбоўскі і інш. Там сфарміраваўся адзін з цэнтраў літаратуры ідыш, якую прадстаўляла група паэтаў і празаікаў "Юнг Вільне" – Х. Градэ, А. Суцкевер і інш. У 1924 г. быў створаны Яўрэйскі музычны інстытут, адзіная ў Еўропе кансерваторыя з выкладаннем на ідыш. У Вільні дзейнічалі Яўрэйскі драматычны тэатр, Яўрэйскі народны тэатр, тэатр марыянетак "Майдзім" і іншыя нацыянальныя тэатральныя калектывы. Сярод яўрэяў распаўсюджваліся газеты і часопісы на ідыш, іўрыце, польскай мове, якія выдаваліся ў Варшаве, Вільні і іншых гарадах.

Літоўскі культурна-асветніцкі рух разгортваўся пераважна ў Віленскім ваяводстве. Літоўскае таварыства "Рытас"праводзіла культурна-асветніцкую дзейнасць пераважна ў падкантрольных літоўскіх школах (з 91 школы ў 1926/1927 навучальным годзе ў Лідскім павеце былі 21, Гродзенскім – 18, Браслаўскім – 5, Ашмянскім – 4), а пасля закрыцця школ – у бібліятэках-чытальнях. Уплывовай арганізацыяй сярод вяскоўцаў-літоўцаў з'яўлялася Літоўскае таварыства выхавання і апекі моладзі імя Св. Казіміра (таварыства Св. Казіміра). Пры яго аддзелах у Ашмянскім, Браслаўскім, Гродзенскім паветах ствараліся бібліятэкі-чытальні,

прыватныя літоўскія школы, праводзілася мастацкая самадзейнасць. У кастрычніку 1935 г. таварыства Св. Казіміра мела 131 бібліятэку, з якіх большасць размяшчалася ў Свянцянскім павеце, а ў Браслаўскім – толькі 5. У 1925–1937 гг. у Вільні выходзіла да 10 літоўскіх перыядычных выданняў.

Акрамя рэлігійных дзеячаў, да грамадска-культурнай працы мясцовых татараў далучылася свецкая інтэлігенцыя, моладзь. З 24 створаных у 1926–1937 гг. аддзелаў Культурна-асветніцкага саюза татараў Польшчы большасць размяшчалася на тэрыторыі Заходняй Беларусі: Відзы, Глыбокае, Докшыцы, Мядзел, Навагрудак, Слонім, Ляхавічы, Іўе, Клецк, Асмолава, Мір, Гродна, Крушыняны, Багонікі, Скідзель і іншыя населеныя пункты. У іх святліцах дзейнічалі аматарскія мастацкія калектывы, праводзіліся лекцыі. У Вільні быў заснаваны татарскі музей, выдаваўся польскамоўны часопіс “Татарскае жыццё”. Пад рэдакцыяй Л. Крычынскага па-польску былі выдадзены 3 тамы навуковага, літаратурнага часопіса “Татарскі штогоднік”.

Такім чынам, культурнае жыццё заходнебеларускіх зямель у 1921–1939 гг. праходзіла ў даволі складаных умовах. На яго адмоўна ўплывалі заняпад эканомікі, цяжкі нацыянальны і сацыяльны прыгнёт. У такіх прыгнятальных абставінах палітычныя партыі, культурна-асветніцкія арганізацыі, інтэлігенцыя Заходняй Беларусі імкнуліся захаваць і прадоўжыць нацыянальныя традыцыі. Заходнебеларускія духоўныя каштоўнасці арганічна дапоўнілі агульнанацыянальную спадчыну.

**Паняцці**

**Беларускае навуковае таварыства (БНТ)** – грамадска-культурная арганізацыя ў Заходняй Беларусі ў 1918–1939 гг. Займалася навукова-асветніцкай, кнігавыдавецкай дзейнасцю, утрыманнем беларускага музея ў Вільні.

**Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (БІГіК)** – культурна-асветніцкая арганізацыя ў Заходняй Беларусі ў 1926–1936 гг. Асноўная мэта БІГіК – правядзенне культурна-асветніцкай працы і гаспадарчай дзейнасці шляхам стварэння бібліятэк, клубаў, сельскагаспадарчых кааператываў, пашырэння сельскагаспадарчых ведаў. У 1927 г. налічвалася 50 гурткоў (каля 800 чалавек).

**Віленскі беларускі гісторыка-этнаграфічны музей імя І. Луцкевіча** – навукова-асветніцкая ўстанова ў Вільні ў 1921–1945 гг. У пачатку 1937 г. там налічвалася 4,2 тыс. адзінак захавання па археалогіі, этнаграфіі, нумізматыцы, выяўленчаму мастацтву, народных промыслах і інш. У бібліятэцы музея, куды ўваходзілі калекцыі кніг і стärадрукаў І. Луцкевіча, частка бібліятэкі Е. Раманава, кнігазбор Б. Даніловіча, да

пачатку 1930-х гг. налічвалася каля 14 тыс. кніг, сярод якіх былі рукапісныя фаліянты (Жухавіцкае евангелле XIV ст., кітаб XVI ст. і інш.), старадрукі (Трыёдзь каляровая 1491 г., частка пражскага выдання Бібліі Ф. Скарыны 1517 г., кнігі друкарняў Беларусі XVI–XVIII стст. і інш.), разнастайныя перыядычныя выданні. Багатым быў архіў музея – каля 6 тыс. адзінак (помнікі пісьменнасці XIV–XV стст., граматы XIV–XIX стст., матэрыялы асабістага паходжання, дакументы заходнебеларускіх арганізацый і ўстаноў і інш.). Цяпер яго матэрыялы знаходзяцца ў архівах, музеях і бібліятэках Літвы, Беларусі, Расіі.

**Таварыства беларускай школы (ТБШ)** – культурна-асветніцкая арганізацыя ў Заходняй Беларусі ў 1921–1936 гг. Асноўная мэта дзейнасці была абвешчана ў яго статуце: “пашыраць і памагаць асвеце ў беларускім нацыянальным, людскім і хрысціянскім духу”. ТБШ выступала супраць паланізацыі, сацыяльнага прыгнёту, праводзіла шырокую дзейнасць па адкрыцці беларускіх школ, павышала агульнаадукацыйны і культурны ўзровень насельніцтва, яго нацыянальную свядомасць. Стала масавай арганізацыяй – у сярэдзіне 1930 г. мела больш 500 гурткоў (звыш 15 тыс. чалавек). У 1930-я гг. з-за праследаванняў польскіх улад назіраўся заняпад дзейнасці.

**Дзеячы культуры, мастацтва**

**Арсеннева (Кушаль) Наталля** (1903–1997) – паэтэса. Аўтар зборнікаў паэзіі “Пад сінім небам” (Вільня, 1927), “Між берагамі” (Нью-Ёрк-Таронта, 1979).

**Вітан-Дубейкаўскі Лявон Іванавіч** (1869–1940) – грамадскі дзеяч, архітэктар. Актывіст БІГіК. Праектаваў царкву ў Відзах, касцёл у Дрысвятах і іншыя культавыя, грамадзянскія будынкі на Віленшчыне.

**Драздовіч Язэп Нарцызавіч** (1888–1954) – мастак, этнограф, педагог. Самабытны майстар нацыянальнага гістарычнага жанру, партрэту. Выкладаў маляванне ў беларускіх гімназіях у Вільні, Навагрудку, Радашковічах. Збіраў матэрыялы для Віленскага беларускага музея, запісваў фальклор, апрацоўваў народную лексіку Дзісеншчыны і Піншчыны, займаўся археалагічнымі даследаваннямі. Аўтар брашуры па астраноміі “Нябесныя бегі”. Напісаў графічныя партрэты полацкіх і смаленскіх князёў, жывапісныя карціны “Усяслаў Чарадзей у парубе пад палатамі кіеўскага князя”, “Пагоня Ярылы”, графічныя серыі, прысвечаныя гарадзішчам, замкам і культавым збудаванням (“Мір”, “Навагрудак і Навагрудчына”, “Ліда”, “Крэва”, “Гальшаны”, “Глыбокае”, “Піншчына” і інш.), партрэты Ф. Скарыны, Ф. Багушэвіча. З’яўляецца пачынальнікам касмічнай тэмы ў беларускім выяўленчым мастацтве: серыі “Жыццё на Марсе”, “Артаполіс”, “Жыццё на Венеры”, “Жыццё на Сатурне”, “Жыццё

на Месяцы”. Маляваў арыгінальныя насценныя дываны, займаўся скульптурай.

**Жылка Уладзімір Адамавіч** (1900–1933) – паэт. Друкаваўся ў заходнебеларускіх выданнях. Аўтар паэмы “Уяўленне”, зборніка вершаў “На ростані”, цыкла “Вершы аб Вільні”. З 1926 г. займаўся навуковай і літаратурнай творчасцю ў БССР. У 1927 г. выдаў зборнік “З палёў Заходняй Беларусі”.

**Засім Мікалай Арцёмавіч** (1908–1957) – паэт. Публікаваў вершы ў заходнебеларускім друку. У пасляваенны час выдаў зборнікі паэзіі “Ад шчырага сэрца”, “Вершы”, “Выбранае”, “А за намі Белавежа”.

**Ігнат Абдзіраловіч (Канчэўскі Ігнат Уладзіміравіч)** (1896–1923) – паэт, публіцыст. Аўтар філасофскага эсэ “Адвечным шляхам” (Вільня, 1921), вершаў і артыкулаў.

**Ільяшэвіч Хведар** (1910–1948) – грамадскі дзеяч, паэт, гісторык. Публікаваўся ў заходнебеларускіх выданнях. Аўтар паэтычных зборнікаў “Веснапесні”, “Зорным шляхам”, “Захварбаваныя вершы”, кнігі пра творчасць Ядвігіна Ш.

**Казімір Сваяк (Стаповіч Канстанцін Мацвеевіч)** (1890–1926) – каталіцкі святар, паэт. Аўтар зборніка вершаў “Мая ліра” (Вільня, 1924), публіцыстычных і драматычных твораў.

**Максім Танк (Скурко Яўген Іванавіч)** (1912–1995) – грамадскі дзеяч, паэт, класік беларускай літаратуры. Народны паэт Беларусі, акадэмік АН БССР. Рэдагаваў часопіс “Полымя”, узначальваў Саюз пісьменнікаў БССР. У заходнебеларускі перыяд супрацоўнічаў з шэрагам часопісаў і газет, надрукаваў паэтычныя зборнікі “На этапах”, “Журавінавы цвет”, “Пад мачтай», паэму “Нарач”.

**Машара Міхаіл Антонавіч** (1902–1976) – паэт, празаік. Аўтар зборнікаў паэзіі “Малюнкі” (напісаны ў віленскай турме Лукішкі), “На сонечны бераг!”, “Напрадвесні”, “З-пад стрэх саламяных” (канфіскаваны польскімі ўладамі). У пасляваенныя дзесяцігоддзі напісаў раманы “Крэсы змагаюцца”, “Сонца за кратамі”, “Лукішкі”, “Ішоў дваццаты год”, “І прыйдзе час …” пра нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі.

**Міхась Васілёк (Касцевіч Міхаіл Восіпавіч) (**1905–1960) – паэт. Друкаваўся ў заходнебеларускіх выданнях. Яго першы зборнік вершаў “Шум баравы” (Вільня, 1929) быў канфіскаваны паліцыяй. Аўтар паэтычнага зборніка “З сялянскіх ніў”.

**Пястрак Піліп Сямёнавіч** (1903–1978) – паэт, празаік. Аўтар зборніка вершаў “На варце”, рамана “Сустрэнемся на барыкадах”.

**Рак-Міхайлоўскі Сымон Аляксандравіч** (1885–1938) – грамадскі дзеяч, публіцыст, педагог. Адзін з кіраўнікоў ТБШ. У 1922–1927 гг. з’яўляўся дэпутатам (паслом) польскага сейма. Уваходзіў у Беларускі

пасольскі клуб, з'яўляўся намеснікам старшыні ЦК Беларускай сялянска-работніцкай грамады, адным з ініцыятараў стварэння яе пасольскага клуба. З 1931 г. у БССР дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея. Аўтар "Арыфметычнага задачніка для пачатковых школ", напісаў музыку да раманса на словы М. Багдановіча "Зорка Венера".

**Родзевіч Леапольд Іванавіч** (1895–1938) – грамадскі дзеяч, драматург. З'яўляўся ў 1925–1934 гг. рэдактарам газеты "Чырвоны сцяг", часопіса "Бальшавік", рэдагаваў выданні Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Аўтар п'ес "Збянтэжаны Саўка", "Пасланец", "Конскі партрэт", "Пакрыўджаныя", "Блуднікі", "Багаты і бедны", шэрагу зборнікаў вершаў, апавяданняў і іншых твораў.

**Салагуб Алесь Феафілавіч** (1906–1934) – паэт. Публікаваўся ў заходнебеларускім друку. Аўтар зборніка турэмнай лірыкі "Лукішкі".

**Самойла Уладзімір Іванавіч** (1878–1941) – публіцыст, філосаф. Аўтар кніг "Праф. Здзяхоўскі аб беларускай душы", "Які "самаўрад" гатуе беларускаму народу польская рэспубліка?", "Новы" і "навейшы" курс польскай палітыкі па беларускім пытанні" (на польскай мове), шэрагу філасофскіх, культуралагічных, літаратуразнаўчых артыкулаў, нарысаў, рэцэнзій. Працаваў бібліятэкарам у беларускім музеі ў Вільні.

**Сергіевіч Пётр Аляксандравіч** (1900–1984) – мастак. Майстар пейзажу, партрэту і манументальнага роспісу. Гістарычнае мінулае адлюстравана ў яго карцінах "Усяслаў Полацкі", "Кастусь Каліноўскі сярод паўстанцаў 1863 года", "Скарына ў друкарні" і інш. Жыццю сялян Заходняй Беларусі прысвечаны палотны "За прасніцай", "Жыццё", "Залёты", "Беларусы", "Шляхам жыцця" ("Падарожныя"), "Араты" і інш. Стварыў шэраг партрэтаў грамадскіх дзечаў, працаваў у станковай і кніжнай графіцы, выканаў роспісы ў касцёлах у Гродне, Солах, Смаргоні, Шарашове.

**Сеўрук Міхаіл Канстанцінавіч** (1905–1979) – мастак. Заснаваў Віленскае таварыства мастакоў. Працоўнай тэматыцы прысвечаны яго тэматычныя кампазіцыі "На ўборцы буракоў", "Жніво" і інш. Займаўся кніжнай графікай.

**Станкевіч Адам Вікенцьевіч** (1891–1949) – грамадскі дзеяч, выдавец, гісторык, публіцыст, каталіцкі святар. У 1922–1928 гг. з'яўляўся дэпутатам (паслом) польскага сейма, намеснікам старшыні Беларускага пасольскага клуба да 1925 г. Фактычна кіраваў БІГіК. Займаўся заснаваннем у Вільні беларускай друкарні імя Ф. Скарыны, рэдагаваў у 1926–1940 гг. часопіс "Хрысціянская думка". Адзін з заснавальнікаў і лідараў Хрысціянскай дэмакратычнай злучнасці (Беларускай хрысціянскай дэмакратыі). Прыхільнік беларусізацыі каталіцкай царквы. Пытанням гісторыі, культуры, рэлігіі прысвяціў працы "Вітаўт Вялікі і беларусы",

“Доктар Францішак Скарына – першы друкар беларускі (1525–1925)”, “Кастусь Каліноўскі, „Мужыцкая праўда” і ідэя незалежнасці Беларусі”, “Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення”, “Беларускі хрысціянскі рух”, “Хрысціянства і беларускі народ” і інш.

**Стаповіч Альбін Мацвеевіч** (1894–1934) – грамадскі дзеяч, публіцыст, дырыжор. У 1928–1930 гг. з’яўляўся дэпутатам (паслом) польскага сейма. Ініцыятар стварэння, сакратар, намеснік старшыні БІГіК. Публікаваўся ў заходнебеларускім друку. Аўтар музыкі да вершаў Я. Купалы, М. Машары, К. Сваяка, А. Гурло, песні “Дзе чутны мовы нашай гукі”.

**Тарашкевіч Браніслаў Адамавіч** (1892–1938) – грамадскі дзеяч, мовазнавец. Акадэмік Беларускай акадэміі навук. У 1922–1927 гг. з’яўляўся дэпутатам (паслом) польскага сейма. Узначальваў Беларускі пасольскі клуб, у 1925–1927 гг. быў старшынёй ЦК Беларускай сялянска-работніцкай грамады, лідэрам яе пасольскага клуба. У 1927–1930 і 1931–1933 гг. знаходзіўся ў польскіх турмах. Падрыхтаваў і выдаў у 1918 г. у Вільні першую “Беларускую граматыку для школ”, якая стала ў Заходняй Беларусі, БССР (у 1920-я гг.), у асяроддзі беларускай эміграцыі галоўным падручнікам па беларускай мове. Перакладаў на беларускую мову паэмы “Іліяда” Гамера, “Пан Тадэвуш” А. Міцкевіча.

**Таўлай Валянцін Паўлавіч** (1914–1947) – паэт. Друкаваўся ў заходнебеларускіх выданнях. Аўтар паэмы “Неператможная”. У пасляваенны час апублікаваны шэраг зборнікаў яго паэзіі, літаратуразнаўчых прац.

**Шырма Рыгор Раманавіч** (1892–1978) – грамадскі дзеяч, дырыжор, фалькларыст. Народны артыст БССР і СССР. У 1939–1970 гг. з’яўляўся мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР (цяпер – Заслужаны калектыў “Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла Рэспублікі Беларусь імя Р. Шырмы”). У заходнебеларускі перыяд займаўся збіраннем беларускага музычнага фальклору, выдаў зборнікі “Беларускія народныя песні”, “Наша песня”, супрацоўнічаў з ТБШ, стварыў хор Беларускага саюза студэнтаў у Вільні.

## Тэма 10. Культурнае жыццё ў БССР у 1940–1980-я гг.

***Агульная характарыстыка.*** У культурным жыцці ў БССР 1940-х – 1980-х гг. можна вылучыць некалькі перыядаў: 1941–1945 гг.; 1945 г. – першая палова 1950-х гг.; другая палова 1950-х – першая палова 1960-х гг.; другая палова 1960-х – першая палова 1980-х гг.; другая палова 1980-х гг. – 1991 г.

У час Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг. беларуская культура панесла незлічоныя і незваротныя страты. Велізарны ўдар быў нанесены па

генафонду беларускай нацыі, яе інтэлігенцыі. Дашчэнту былі разбураны і спалены беларускія гарады і вёскі, поўнасцю ці вельмі моцна былі разрабаваны і знішчаны бібліятэкі, музеі, архівы, навуковыя і культурна-асветніцкія ўстановы. Вялікія пашкоджанні атрымалі Сафійскі сабор у Полацку, Камянецкая вежа, палац Румянцавых-Паскевічаў у Гомелі і многія іншыя помнікі архітэктуры. Асноўнай задачай беларускай літаратуры, мастацтва была барацьба супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Тэма вайны стала асноўнай у нацыянальнай мастацкай культуры на ўсе наступныя дзесяцігоддзі да сённяшняга часу, бо яна была спаўна выпакутавана беларускім народам.

Першае пасляваеннае дзесяцігоддзе (1945 г. – першая палова 1950-х гг.) характарызавалася складанасцю і супярэчлівасцю ў культурным жыцці не толькі БССР, але і ўсяго савецкага грамадства. З аднаго боку, адбывалася аднаўленне разбуранай і знішчанай у гады вайны матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў навукі, адукацыі, культуры, стваральным пафасам была прасякнута дзейнасць навуковай і творчай інтэлігенцыі. Сярод новых ВНУ быў і заснаваны ў 1945 г. Беларускі дзяржаўны тэатральны інстытут (цяпер – Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў). З другога боку, ва ўмовах культу асобы І. Сталіна значна ўзмацніўся ідэалагічны кантроль, стала яшчэ большай цэнтралізацыя па кіраўніцтву за творчым працэсам з боку партыйных і дзяржаўных органаў, рэгламентацыя дзейнасці ўстаноў культуры, адбыўся шэраг буйнамаштабных ідэалагічных кампаній (барацьбы з “бязродным касмапалітызмам”, фармалізмам і інш.), разгортвалася чарговая хваля рэпрэсій супраць дзеячаў навукі, адукацыі і культуры, праводзілася далейшае закрыццё храмаў ва ўсходніх абласцях і атэістычная прапаганда. Аднак у пасляваеннае дзесяцігоддзе было шмат зроблена па аднаўленні і далейшым развіцці культуры. Назіраўся значны ўздым агульнаадукацыйнага і культурнага ўзроўняў насельніцтва. Цэлы шэраг навуковых распрацовак ажыццявілі вучоныя. Нягледзячы на цяжкасці, рэалістычнымі творамі папоўнілася мастацкая культура. Разам з пасрэднымі працамі, у якіх назіралася ўсхваленне і перабольшванне з’яў сацыялістычнай рэчаіснасці, былі выкананы высокамастацкія творы, у якіх закраналіся агульначалавечыя каштоўнасці, праўдзіва адлюстроўваліся падзеі мінулага і сучаснасці.

У час “хрушчоўскай адлігі” у другой палове 1950-х – першай палове 1960-х гг. у культурным жыцці рэспублікі, як і ўсяго Савецкага Саюза, перапляліся 2 асноўныя тэндэнцыі. З аднаго боку, выразнай стала дэмакратычная тэндэнцыя, якая была вынікам дэсталінізацыі ва ўсіх сферах жыцця. Адбылася палітычная рэабілітацыя ахвяр сталінізму, вярнуліся да творчай працы ўцалелыя дзеячы, публікаваліся творы рэпрэсіраваных аўтараў, зменшыўся ўціск партыйна-ідэалагічнага кантролю, актывізавалася грамадска-культурнае жыццё, новыя трактоўкі набывала тэма Вялікай

Айчыннай вайны ў літаратуры і мастацтве. Пад уплывам працэсаў дэмакратызацыі, выкліканай вынікамі XX з'езда КПСС, з'явілася новае пакаленне савецкай інтэлігенцыі – "шасцідзесятнікі". З другога боку, кансерватыўная тэндэнцыя імкнулася зберагчы і прыстасаваць старыя рычагі да новых рэалій грамадскай свядомасці. Дэсталінізацыя была непаслядоўнай і абмежаванай, не былі рэабілітаваны многія дзеячы беларускай нацыянальна-дэмакратычнай інтэлігенцыі (У. Ігнатоўскі, З. Жылуновіч, Я. Лёсік, В. Ластоўскі і інш.), пашырылася празмерная ідэалагізацыя і ўмяшанне ў творчы працэс, абмежаванне правоў на свабоду творчасці. У краіне праводзілася ваяўнічая атэістычная палітыка.

У другой палове 1960-х – першай палове 1980-х гг. кансерватыўная тэндэнцыя ў духоўным жыцці савецкага грамадства ўзмацнялася. Панаванне марксісцка-ленінскай ідэалогіі прадвызначыла правядзенне масавых шырокамаштабных кампаній, прысвечаных да святочных і юбілейных дат. Узмацніліся пазіцыі метаду сацыялістычнага рэалізму. Інтэрнацыяналізацыя духоўнага жыцця ў межах усяго СССР пры разгортванні масавай урбанізацыі і міжрэспубліканскіх міграцыйных працэсаў паспрыяла рэзкаму звужэнню сферы выкарыстання беларускай мовы. Нягледзячы на гэта, менавіта ў 1950-я – 1980-я гг. у выніку плённай дзейнасці беларускай інтэлігенцыі былі атрыманы значныя дасягненні ў беларускай літаратуры, мастацтве, навуцы, якія заслужана атрымалі як усесаюзнае, так і міжнароднае прызнанне. Пра беларускую літаратуру, кіно, балет, тэатр і музыку, скульптуру і іншыя віды мастацкай культурнай спадчыны даведаліся ва ўсім свеце. У 1970-я гг. у рэспубліцы была ўведзена ўсеагульная сярэдняя адукацыя. За 1960–1985 гг. колькасць ВНУ у БССР вырасла з 24 да 33. Сярод новых устаноў быў адкрыты ў 1975 г. у Мінску інстытут культуры (цяпер – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў). На працягу 1956–1985 гг. колькасць навуковых устаноў вырасла з 76 да 167. Вядучую ролю выконвалі інстытуты Акадэміі навук. Па шэрагу напрамкаў фундаментальных навук распрацоўкі беларускіх вучоных мелі ўсесаюзны і міжнародны ўзровень. Значных поспехаў яны дасягнулі ў матэматыцы, спектраскапіі, люмінесцэнцыі, квантавай электроніцы, ядзернай фізіцы, парашковай металургіі, біялогіі, геалогіі і іншых галінах.

У другой палове 1980-х гг. – 1991 г. у культурным жыцці СССР і БССР назіраўся новы перыяд, абумоўлены спробамі рэфармаваць сацыялістычнае грамадства. У рэспубліцы адбывалася вызваленне ад ідэалагічнага ўмяшальніцтва ў творчасць інтэлігенцыі, пачаліся працэсы нацыянальна-культурнага і рэлігійнага адраджэння. Праводзілася перабудова дзейнасці творчых арганізацый, з'явіліся неафіцыйныя творчыя аб'яднанні, легалізавалася нефармальнае, альтэрнатыўнае мастацтва. У літаратуры і мастацтве ішло пашырэнне праблемна-тэматычнага поля за кошт новых тэм

ці пераасэнсавання традыцыйных, узмацненне цікавасці да айчыннай гісторыі і культуры, вярталіся забароненыя творы і імёны дзеячаў культуры і навукі, з'явіліся новыя жанры і формы, пашырыліся стылявыя напрамкі, распаўсюджаныя на Захадзе. Адкрыліся новыя магчымасці для далейшага ўключэння беларускай спадчыны ў сусветную культурную прастору. Пад уплывам складаных сацыяльна-эканамічных умоў разгортвалася камерцыялізацыя культуры і мастацтва.

***Літаратура.*** Беларуская літаратура ў 1940-я – 1980-я гг. набыла ўсесаюзнае і міжнароднае прызнанне. Цэлы шэраг твораў беларускіх пісьменнікаў, паэтаў і драматургаў быў адзначаны самымі высокімі літаратурнымі ўзнагародамі Савецкага Саюза – Сталінскімі прэміямі (у 1966 г. іх прыраўнялі да Дзяржаўных прэмій СССР), Ленінскімі прэміямі, Дзяржаўнымі прэміямі СССР. У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе Сталінскія прэміі атрымалі А. Куляшоў за паэмы "Сцяг брыгады" і "Новае рэчышча", Я. Колас – за вершы і паэму "Рыбакова хата", П. Броўка – за вершы і паэму "Хлеб", зборнік вершаў "Дарога жыцця", І. Шамякін – за раман "Глыбокая плынь", М. Танк – за зборнік вершаў "Каб ведалі", К. Крапіва – за п'есу "Пяюць жаваранкі", Я. Брыль – за аповесць "У Забалацці днее". Ленінскімі прэміямі былі ўганараваны П. Броўка за кнігу "А дні ідуць..." (1962 г.), І. Мележ – за раманы "Людзі на балоце" і "Подых навальніцы" (1977 г. ), М. Танк – за зборнік "Нарачанскія сосны" (1978 г.) і В. Быкаў – за аповесць "Знак бяды" (1986 г.). Дзяржаўную прэмію СССР атрымалі В. Быкаў за аповесці "Абеліск" і "Дажыць да світання" (1974 г.) і А. Дудараў за п'есу "Радавыя" (1985 г.). Яшчэ больш унушальны спіс узнагароджаных самымі высокімі рэспубліканскімі ўзнагародамі – Дзяржаўнай прэміяй імя Я. Купалы і Дзяржаўнай прэміяй імя Я. Коласа. Самым высокім прызнаннем заслуг у развіцці літаратурна-мастацкай творчасці ў рэспубліцы з'яўляецца прысуджэнне творцам ганаровых званняў "Народны паэт Беларусі" і "Народны пісьменнік Беларусі". Акрамя Я. Купалы і Я. Коласа, у 1950-я – 1980-я гг. яго атрымалі К. Крапіва, М. Лынькоў, П. Броўка, М. Танк, А. Куляшоў, І. Мележ, І. Шамякін, П. Панчанка, А. Макаёнак, Я. Брыль, а ў 1990-я гг. – Н. Гілевіч, Р. Барадулін, І. Навуменка, І. Чыгрынаў.

Зборы твораў і асобныя кнігі беларускіх пісьменнікаў выходзілі і распаўсюджваліся ва ўсіх рэспубліках СССР. У пашырэнні беларускай літаратуры станоўчую ролю сыграла руская мова – мова міжнацыянальных зносін у Савецкім Саюзе і адна з міжнародных моў. Дзякуючы перакладам беларуская літаратура выйшла на еўрапейскі і сусветны ўзровень. Паводле звестак ЮНЕСКА, у 1980-я гг. В. Быкаў стаў самым перакладальным пісьменнікам свету.

Тэма вайны, партызанскай барацьбы заставалася асноўнай у беларускай літаратуры. У першае пасляваенае дзесяціголдзе з'явіліся раманы "Векапомныя дні" М. Лынькова, "Мінскі напрамак" І. Мележа, "Глыбокая плынь" І. Шамякіна і іншыя значныя творы. З 1960-х гг. беларускія празаікі А. Адамовіч, В. Быкаў, Я. Брыль, І. Навуменка, І. Чыгрынаў, І. Шамякін і іншыя сталі лідарамі ва ўсёй савецкай літаратуры ў распрацоўцы ваеннай тэмы. Асобнае месца ў беларускай прозе займаюць творы В. Быкава, у якіх вызначальнай рысай стала горкая і крывавая праўда вайны: аповесці "Жураўліны крык", "Здрада", "Трэцяя ракета", "Альпійская балада", "Мёртвым не баліць", "Сотнікаў", "Абеліск", "Яго батальён", "Знак бяды" і інш. Адметнае месца ў празаічных творах пра вайну займаюць раман "Птушкі і гнёзды" Я. Брыля, трылогія "Сасна пры дарозе", "Вецер у соснах" і "Сорак трэці" І. Навуменкі, "Хатынская аповесць" А. Адамовіча, кніга-памяць "Я з вогненнай вёскі..." А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка, кніга С. Алексіевіч "У вайны не жаночы твар" і інш.

Адным з самых значных дасягненняў беларускай літаратуры стала трылогія "Палеская хроніка" І. Мележа, куды ўвайшлі раманы "Людзі на балоце", "Подых навальніцы", "Завеі, снежань". Па-майстэрску раскрыты праблемы сучаснасці ў раманах "Сэрца на далоні", "Атланты і карыятыды", "Вазьму твой боль" І. Шамякіна. Гістарычная тэма ў беларускай прозе знайшла сваё яскравае ўвасабленне ў творах У. Караткевіча. Яго раманы "Каласы пад сярпом тваім", "Дзікае паляванне караля Стаха", "Чорны замак Альшанскі" і іншыя творы садзейнічалі выхаванню цікавасці і вывучэнню айчыннай гісторыі.

Шматгранная беларуская паэзія А. Куляшова, П. Броўкі, П. Панчанкі, Н. Гілевіча, Р. Барадуліна, Г. Бураўкіна і іншых творцаў вылучалася сваёй самабытнасцю, лірызмам. Сапраўднымі дыяментамі прыгожага пісьменства з'яўляюцца раман у вершах "Родныя дзеці" Н. Гілевіча, яго кніга паэзіі "Песня ў дарогу", зборнікі паэзіі "Неруш", "Адам і Ева" Р. Барадуліна, "Млечны Шлях", "Дзе начуе жаўранак" П. Панчанкі, "У роднай хаце", "Пахне чабор" П. Броўкі і інш. Многія вершы паэтаў даўно сталі папулярнымі, сапраўднымі народнымі песнямі.

На развіццё ўсёй савецкай драматургіі аказалі плённы ўплыў драмы і камедыі К. Крапівы, А. Макаёнка, М. Матукоўскага, А. Дударава. "Хто смяецца апошнім", "Мілы чалавек", "Пяюць жаваранкі", "Людзі і д'яблы", "Брама неўміручасці" і іншыя творы К. Крапівы паказваліся па ўсёй краіне, па іх здымаліся кінафільмы, а яго лепшыя байкі перажылі свой час. Сваёй актуальнасцю праблем, грамадзянскай смеласцю, наватарствам шырокую папулярнасць у Беларусі і за яе межамі атрымалі п'есы А. Макаёнка "Таблетку пад язык", "Лявоніха на арбіце", "Зацюканы апостал", "Трыбунал", "Святая прастата", "Верачка" і інш. З канца 1970-х гг. ва ўвесь

голас заявіў аб сабе малады драматург А. Дудараў. Адна за другой выйшлі яго п'есы "Выбар", "Парог", "Апошні ўзлёт", "Вечар", "Радавыя".

***Тэатр. Музыка.*** Нацыянальнае тэатральнае і музычнае мастацтва ў 1940-я – 1980-я гг. стала вядомым далёка за межамі Беларусі. Яго лепшыя дасягненні атрымалі высокую ацэнку на ўсесаюзным узроўні. У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе Сталінскія прэміі атрымалі Беларускі дзяржаўны тэатр імя Я. Купалы за спектаклі "Канстанцін Заслонаў" А. Маўзона і "Пяюць жаваранкі" К. Крапівы, Беларускі дзяржаўны тэатр імя Я. Коласа – за спектакль "Несцерка" В. Вольскага, Беларускі дзяржаўны тэатр імя М. Горкага – за спектакль "Разлом" Б. Лаўранёва, Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета – за балетную пастаноўку "Князь-возера" В. Залатарова. Пазней Беларускі дзяржаўны тэатр імя Я. Купалы атрымаў і Дзяржаўную прэмію СССР за спектакль "Радавыя" А. Дударава. На рэспубліканскім узроўні дасягненні акцёраў, рэжысёраў, кампазітараў адзначаліся Дзяржаўнымі прэміямі БССР, ганаровым званнем "Народны артыст Беларусі".

Пасля вайны ў тэатральным мастацтве пашырыліся стылявыя пошукі, абнаўлялася і ўзбагачалася вобразная палітра спектакляў. Дабратворны ўплыў на тэатральнае мастацтва аказала ў 1960–80-я гг. драматургія А. Макаёнка, У. Караткевіча, М. Матукоўскага, А. Петрашкевіча, А. Дударава і іншых нацыянальных аўтараў. Пошукі выразных сцэнічных сродкаў і форм працягвалі рэжысёры новага пакалення – В. Раеўскі, Б. Луцэнка, В. Мазынскі, В. Маслюк, М. Пінігін і інш.

У Беларускім дзяржаўным тэатры імя Я. Купалы плённа працавалі майстры старэйшага пакалення (Г. Глебаў, У. Дзядзюшка, Б. Платонаў, Л. Ржэцкая, С. Станюта, Г. Макарава, З. Стома, П. Кармунін і інш.), прыйшло новае пакаленне таленавітых акцёраў (Г. Аўсяннікаў, Г. Гарбук, М. Захарэвіч, Л. Давідовіч, М. Яроменка, В. Тарасаў і інш.) і рэжысёраў (В. Раеўскі, Б. Луцэнка, В. Мазынскі, М. Пінігін). З 1944 г. да сённяшняга часу візітоўнай карткай тэатра з'яўляецца славутая "Паўлінка" Я. Купалы.

У сузор'і майстроў Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Коласа трэба адзначыць акцёрскі талент А. Ільінскага, Ц. Сяргейчыка, П. Малчанава, З. Канапелькі, Ф. Шмакава. Цікавыя вобразы, якія сфарміравалі аблічча коласаўскага тэатра, стварылі таленавітыя акцёры У. Куляшоў, Г. Маркіна, І. Матусевіч, А. Трус, А. Шэлег і інш. У 1970-я гг. рэжысёр В. Мазынскі пачаў ставіць п'есы У. Караткевіча "Званы Віцебска" і "Кастусь Каліноўскі". Калектыў плённа супрацоўнічаў з А. Дударавым, творы якога і цяпер у рэпертуары тэатра.

Супрацоўнічаў з беларускімі драматургамі і Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР імя М. Горкага. Разам з савецкай і заходняй класікай тут былі пастаўлены спектаклі паводле твораў А. Адамовіча, В. Быкава, М.

Матукоўскага, А. Петрашкевіча і інш. У гэтым творчым калектыве працавалі славутыя акцёры – А. Клімава, Р. Янкоўскі, Ю. Сідараў, Ю. Ступакоў і інш.

Колькасць тэатраў у рэспубліцы павялічылася з 9 у 1955 г. да 17 у 1985 г. Сярод новых тэатраў былі Магілёўскі абласны тэатр драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча ў Бабруйску, Тэатр-студыя кінаакцёра, Дзяржаўны маладзёжны тэатр у Мінску, лялечныя тэатры ў абласных гарадах і інш.

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе былі створаны оперы “Надзея Дурава” А. Багатырова, “Кастусь Каліноўскі” Д. Лукаса, “Алеся” Я. Цікоцкага, опера для дзяцей “Марынка” Р. Пукста. Беларуская музыка ў 1960-я – 1980-я гг. вылучалася дынамічнасцю развіцця, паралельным існаваннем розных мастацкіх тэндэнцый, пошукамі новых жанравых і індывідуальна-стылёвых вырашэнняў. Сярод створаных тады высокамастацкіх, яркіх твораў на гістарычную і філасофска-маральную тэматыку трэба адзначыць оперы “Калючая ружа”, “Зорка Венера”, “Новая зямля” Ю. Семянякі, “Джардана Бруна” С. Картэса, “Сівая легенда”, “Францыск Скарына” Д. Смольскага, “Сцежкаю жыцця” Г. Вагнера, “Дзікае паляванне караля Стаха” У. Солтана і інш. Шэраг балетаў стварылі Я. Глебаў, Г. Вагнер, А. Мдзівані і інш. Больш паспяхова працавалі кампазітары ў іншых жанрах, асабліва ў песенным. Н. Сакалоўскі быў аўтарам музыкі Дзяржаўнага гімна БССР і многіх папулярных песень. У песенным жанры актыўна працавалі І. Лучанок, Ю. Семяняка, Э. Ханок, У. Буднік, Л. Захлеўны, В. Іваноў, В. Раінчык і інш.

У пасляваенныя гады рэпертуар Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР папоўніўся творамі балетнай класікі, працягвалася праца над стварэннем арыгінальнага рэпертуару. Значнай падзеяй стала пастаноўка балета “Князь-возера” В. Залатарова. У 1950-я – 1960-я гг. працягваліся пошукі нацыянальнай адметнасці, рэпертур узбагачаўся новымі класічнымі і сучаснымі творамі. У 1970-я гг. беларуская школа балету атрымала міжнароднае прызнанне, што звязваецца ў многім з новым галоўным балетмайстрам В. Елізар’евым. Тэматычная разнастайнасць, схільнасць да ўвасаблення складанай філасофскай тэматыкі, раскрыццё з’яў у гістарычнай перспектыве выявілася ў пастаноўках балетаў “Кармэн-сюіта” Ж. Бізэ – Р. Шчадрына, “Спартак”, “Вясна свяшчэнная”, “Жар-птушка” І. Стравінскага, “Рамэо і Джульета” С. Пракоф’ева і інш.

Актыўна прапагандавалі нацыянальную музыку філарманічныя калектывы. Адным з вядучых харавых калектываў была Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла БССР, створаная яшчэ ў 1939 г. Яе заснавальнікам, мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам да 1970 г. з’яўляўся Р. Шырма, вядомы збіральнік і знаўца беларускай народнай песні. Арганізатарам і мастацкім кіраўніком Дзяржаўнага акадэмічнага народнага

хора БССР у 1952–1974 гг. быў вядомы дзеяч харавога мастацтва, этнамузыказнавец Г. Цітовіч. У рэпертуары калектыва вялікае месца займалі беларускія народныя песні, песні народаў СССР і творы беларускіх кампазітараў. Падмурак развіцця прафесійнага музычнага выканальніцтва на народных інструментах быў закладзены створаным яшчэ ў 1930 г. Дзяржаўным народным аркестрам БССР, мастацкім кіраўніком і дырыжорам якога ў 1946–1974 гг. з'яўляўся І. Жыновіч. З гэтым калектывам звязана адраджэнне народных інструментаў: цымбалаў, ліры, жалейкі, дуды і інш. Аб значнасці фігур гэтых 3-х названых неардынарных асоб сведчыць тое, што заснаваныя імі калектывы цяпер носяць іх імя. Іх працу дастойна падхапілі паслядоўнікі – М. Казінец, М. Дрынеўскі, Л. Яфімава, якія ўжо шмат гадоў з'яўляюцца мастацкімі кіраўнікамі і дырыжорамі. Танцавальныя і інструментальныя групы, выканаўцаў народных песень аб'яднаў створаны ў 1974 г. беларускі фальклорна-харэаграфічны ансамбль "Харошкі" пад мастацкім кіраўніцтвам В. Гаявой. Усе гэтыя творчыя калектывы атрымалі заслужаную славу і прызнанне ва ўсім свеце.

Вялікую працу па папулярызацыі старадаўніх песень і песень беларускіх кампазітараў праводзілі вакальна-інструментальныя ансамблі – "Песняры", "Сябры", "Верасы". Заснавальнікам і мастацкім кіраўніком ВІА "Песняры" з 1970 г. з'яўляўся У. Мулявін. У рэпертуары "Песняроў" былі апрацоўкі беларускіх народных песень ("Касіў Ясь канюшыну", "Купалінка", "А ў полі вярба", "Рэчанька", "Перапёлачка" і інш.), творы беларускіх кампазітараў ("Спадчына", "Алеся", "Мой родны кут", "Жураўлі на Палессе ляцяць" і інш.), якія выконваліся як у Беларусі, так і за мяжой. Не меншую папулярнасць набыў ВІА "Сябры", створаны ў 1974 г. А. Ярмоленка. Рэпертуар ансамбля пераважна складалі народныя песні, песні беларускіх кампазітараў ("Майскі вальс", "Шуміце, бярозы" і інш.). Адначасова з "Сябрамі" у 1974 г. быў заснаваны В. Раінчыкам ансамбль "Верасы", які таксама набыў усесаюзную і міжнародную вядомасць. Сярод песенных хітоў "Верасоў" – "Малінаўка", "Завіруха", "Я ў бабулі жыву" і іншыя папулярныя цяпер песні.

***Кіно.*** У гісторыі беларускага кіно 1950-я – 1980-я гг. без перабольшвання былі зорным часам. Тады працягвалі працаваць майстры старэйшага пакалення (У. Корш-Саблін, М. Фігуроўскі, А. Файнцымер і інш.), з'явіліся маладыя таленавітыя кінарэжысёры (В. Тураў, М. Пташук, В. Нікіфараў, Б. Сцяпанаў, В. Рубінчык і інш.). Ім удалося стварыць шмат арыгінальных, змястоўных фільмаў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне, гістарычнаму мінуламу і сучаснага стану грамадства, маральна-этычным праблемам. На кінастудыі "Беларусьфільм" былі створаны творчыя аб'яднанні "Тэлефільм" і "Летапіс", майстэрня мультыплікацыйных фільмаў, Тэатр-студыя кінаакцёра.

Творы беларускіх кінематаграфістаў былі адзначаны самымі высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі СССР: Сталінскую прэмію атрымаў фільм "Канстанцін Заслонаў" рэжысёраў У. Корш-Сабліна і А. Файнцымера, Ленінскую прэмію – фільм "Людзі на балоце" В. Турава і цыкл дакументальных фільмаў В. Дашука. Шэраг прац "Беларусьфільма" адзначаны Дзяржаўнымі прэміямі БССР. На 1 студзеня 1984 г. 45 мастацкіх і 104 дакументальныя стужкі Беларусі былі адзначаны прэміямі на міжнародных і ўсесаюзных кінафестывалях.

На кінастудыі "Беларусьфільм" ішла актыўна экранізацыя твораў беларускай літаратуры (В. Быкава, І. Мележа, І. Шамякіна, У. Караткевіча і інш.). Рэжысёр В. Тураў здымаў "Палескую хроніку" І. Мележа, фільмы "Праз могілкі", "Сыны ідуць у бой", "Я родам з дзяцінства", "Чорны бусел", "Шляхціч Завальня" і інш. Найбольш значныя мастацкія стужкі таго часу М. Пташука – "Час выбраў нас", "Вазьму твой боль", "Чорны замак Альшанскі", "Знак бяды". Сярод найбольш выніковых напрамкаў беларускага кінематографа трэба адзначыць камедыйнае кіно, кінадакументалістыку, дзіцячае і анімацыйнае кіно і інш. Лірычную, сапраўды народную камедыю рэжысёра І. Дабралюбава "Белыя Росы" паглядзела больш за 36 мільёнаў чалавек. Лепшыя з анімацыйных фільмаў "Прыгоды Бураціна" і "Пра чырвоны Каптурок" трансліравалі тэлеканалы дзясяткаў краін свету.

Паводле спісу ЮНЕСКА (1995 г.), сярод 100 найбольш значных фільмаў свету аб Другой сусветнай вайне ёсць фільм В. Турава "Праз могілкі" (1963 г.). У складзены ў 2014 г. "Залаты тузін Беларусьфільма" увайшлі знакавыя беларускія фільмы, якія любілі многія пакаленні гледачоў: "Маё каханне (1940 г.) рэжысёра У. Корш-Сабліна, "Нашы суседзі" (1957 г.) С. Сплашнова, "Гадзіннік спыніўся апоўначы (1958 г.) М. Фігуроўскага, "Горад майстроў" (1965 г.) У. Бычкова, "Я родам з дзяцінства" (1966 г.) В. Турава, "Прыгоды Бураціна" (1975 г.) і "Пра чырвоны Каптурок" (1977 г.) Л. Нячаева, "Вянок санетаў" (1976 г.) і "Дзікае паляванне караля Стаха" (1979 г.) В. Рубінчыка, "Белыя росы" (1983 г.) І. Дабралюбава, "Знак бяды" (1986 г.) і "У жніўні 44-га …" (2000 г.) М. Пташука. Як бачым, усе фільмы, акрамя апошняга ў гэтым спісе, былі створаны якраз у 1940–1980-я гг. І гэтыя дасягненні беларускага кінематографа трэба ўлічваць дзеля сучаснай і будучай стваральнай працы.

***Выяўленчае мастацтва.*** Беларускі жывапіс, скульптура таксама былі адзначаны высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі. Сталінскую прэмію двойчы атрымліваў З. Азгур за скульптурныя партрэты рэвалюцыйных дзеячаў і герояў вайны. Ленінскую прэмію 1970 г. атрымалі скульптар С. Селіханаў, архітэктары Ю. Градаў, В. Занковіч, Л. Левін – за мемарыяльны комплекс "Хатынь". Дзяржаўнай прэміяй СССР узнагароджваўся М. Савіцкі – за цыкл твораў жывапісу "Гераічная Беларусь" і роспісы музея Вялікай Айчыннай

вайны ў Мінску (1973 г.), скульптары А. Заспіцкі, І. Міско, М. Рыжанкоў і архітэктар А. Трафімчук – за помнік савецкай маці-патрыётцы Н. Купрыянавай і яе пяці сынам, якія не вярнуліся з вайны, у Жодзіне (1977 г.). Лепшыя творы былі адзначаны на рэспубліканскім узроўні Дзяржаўнымі прэміямі БССР і званнем “Народны мастак Беларусі”.

Ваенная тэма стала вышэйшай меркай майстэрства для мастакоў, скульптараў. У 1945–1950-я гг. тэме вайны былі прысвечаны палотны “Мінск. 3 ліпеня 1944 года” В. Волкава, “Парад беларускіх партызан у 1944 годзе ў Мінску” “Стаяць насмерць”, “Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 годзе” Я. Зайцава, “Партызаны ў разведцы” Я. Ціхановіча, “За родную Беларусь” У. Сухаверхава, “Памром, але з крэпасці не пойдзем!” Ф. Зільберта, “Абаронцы Брэсцкай крэпасці” І. Ахрэмчыка і інш. Адным са значных твораў на нацыянальна-гістарычную тэму была карціна “Кастусь Каліноўскі” А. Гугеля і Р. Кудрэвіч.

З 1960-х гг. новае пакаленне мастакоў узбагачала вобразныя і выразныя сродкі ўсіх відаў і жанраў, актыўна перабудоўвала выяўленчыя мовы жывапісу, графікі, скульптуры. Стала больш выразным імкненне да індывідуалізаванага прачытвання гістарычных падзей і сучаснасці, трактоўкі вобраза ў героіка-ўзвышаным, манументальным плане. Падзеі Вялікай Айчыннай вайны заставаліся ў цэнтры ўвагі беларускіх мастакоў, але іх трактоўка набыла іншае выяўленчае і сэнсавае адценне.

Адметнай з’явай выяўленчага мастацтва была творчасць М. Савіцкага. Партызанскі рух адлюстраваны на яго палотнах “Партызаны”, “Віцебскія вароты”, “Пакаранне смерцю” і інш. Яго “партызанскія мадонны” сімвалізавалі вобраз рэспублікі-партызанкі, увасаблялі ідэі вечнасці жыцця. У славутым цыкле палотнаў “Лічбы на сэрцы” М. Савіцкі паказаў жахі фашысцкіх канцлагераў, асабіста перажытых мастаком. Роздумам пра лёс роднай зямлі, каштоўнасць мірнай працы прасякнуты яго палотны “Ураджай”, “Хлябы”, “Рабочыя”, “Збожжа” і інш.

Сярод прызнаных майстроў пейзажу трэба назваць П. Масленікава. Яго палотны “Золата бярозы”, “Беларускі пейзаж”, “Над возерам”, “Азёрны край”, “На раўнінах Палесся” перадаюць зачараванасць аўтара краявідамі Беларусі. У розных жанрах станковага жывапісу працаваў Л. Шчамялёў. Ваеннай тэме прысвечаны яго палотны “Цяжкія гады”, “Генерал Даватар”, “Першы дзень міру” і інш. Ім жа створаны партрэты гістарычных дзеячаў (“Кастусь Каліноўскі”, “Рэпін у Здраўнёве” і інш.), шматлікія пейзажы. Сярод пачынальнікаў гарадскога пейзажу быў М. Данцыг з карцінамі, прысвечанымі Мінску: “Руіны Мінска”, “Стары і новы Мінск”, “Мой горад старажытны, малады” і інш. Сапраўдным гімнам чалавеку-земляробу з’яўляецца карціна “Спадчына” М. Данцыга. Яму належыць і цэлая галерыя партрэтаў славутых дзеячаў культуры, літаратуры, мастацтва. Працы

Г. Вашчанкі вылучаюцца жанравай і тэматычнай разнастайнасцю, роздумам над праблемамі сучаснасці і мінулага: “Маё Палессе”, “Дума пра хлеб”, “Мацярынскія крылы” і інш. З найбольш важных твораў гістарычнага жанру трэба адзначыць яго палотны “Грунвальдская бітва”, трыпціх пра паўстанне К. Каліноўскага “За зямлю, за волю” і інш. У 1970–1980-я гг. у выяўленчае мастацтва прыйшлі А. Марачкін, М. Селяшчук, У. Тоўсцік, У. і М. Басалыгі, М. Купава, Ф. Янушкевіч і інш.

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе самым значным дасягненнем манументальнага мастацтва стаў завершаны ў 1954 г. велічны ансамбль плошчы Перамогі ў Мінску з абеліскам-помнікам воінам Савецкай Арміі і партызанам, загінуўшым у баях з фашызмам. Яго аўтарамі былі скульптары З. Азгур, А. Бембель, А. Глебаў, С. Селіханаў, С. Адашкевіч, архітэктары У. Кароль, Г. Заборскі.

З. Азгур працягваў заставацца цэнтральнай фігурай у беларускай партрэтнай пластыцы. Найбольш шматлікай і разнастайнай была створаная ім галерэя партрэтаў дзеячаў сусветнай навукі і культуры, а таксама персаналій гісторыі Беларусі, нацыянальных пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў, акцёраў і інш. Адным з яго значных твораў манументальнага мастацтва быў помнік Я. Коласу (1972 г.), усталяваны на аднайменнай плошчы ў Мінску.

Сярод шэрагу тэматычных напрамкаў А. Глебава – “Скарыніяна”. Яго драўляная скульптура першадрукара экспанавалася ў 1955 г. на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве. Створаную мадэль помніка Ф. Скарыне ў Полацку адліць з бронзы не паспеў – гэта зрабілі ўжо вучні, скульптары А. Заспіцкі і І. Глебаў (1974 г.).

У 1960-я – 1980-я гг. разам з майстрамі старэйшага пакалення (З. Азгурам, А. Бембелем, С. Селіханавым, А. Глебавым) плённа працавалі маладыя скульптары – А. Анікейчык, С. Вакар, Л. Гумілеўскі, А. Шатэрнік і інш. Вайна па-ранейшаму моцна ўплывала на развіццё манументальнай скульптуры. Былі ўзведзены буйныя мемарыяльныя комплексы: у 1969 г. – “Хатынь” (стваральнікі ўжо пералічаны вышэй) і Курган Славы Савецкай Арміі – вызваліцельніцы Беларусі (скульптары А. Бембель, А. Арцімовіч, архітэктары Л. Міцкевіч, А. Стаховіч), у 1971 г. – “Брэсцкая крэпасць-герой” (скульптары А. Кібальнікаў, А. Бембель, У. Бабыль, архітэктары У. Кароль, В. Волчак, В. Занковіч, Ю. Казакоў, А. Стаховіч, Г. Сысоеў), у 1985 г. – “Мінск – горад-герой” (скульптар В. Занковіч, архітэктары В. Крамарэнка, В. Яўсееў, У. Раманенка) і інш.

А. Анікейчык стварыў мемарыяльны комплекс “Прарыў” у г.п. Ушачы Віцебскай вобласці (1974 г.). Яму таксама належыць аўтарства шматлікіх партрэтаў, сярод якіх асабліва трэба адзначыць помнікі Я. Купале ў Мінску

(1972 г.), у Эроў-парку ў паўночна-амерыканскім штаце Нью-Ёрк (1973 г.), у Ляўках Аршанскага раёна (1982 г.) і інш.

***Архітэктура.*** У час пасляваеннага аднаўлення Мінска і іншых беларускіх гарадоў пры распрацоўцы новых генпланаў намеціўся падыход да вызначэння галоўнай горадабудаўнічай канцэпцыі – увасабленне ўсімі магчымымі сродкамі пафасу вялікай Перамогі, узвелічэнне здзейсненага народам подзвігу. Менавіта ў рэчышчы гэтай эстэтыкі праектавалася і забудоўвалася галоўная магістраль Мінска – цяперашні праспект Незалежнасці (раней – Сталіна, Ленінскі, Ф. Скарыны). Пры ўзвядзенні буйных адміністрацыйных, грамадскіх і жылых пабудоў архітэктарамі выкарыстоўваліся формы і кампазіцыі неакласіцызму (у папулярнай літаратуры яго называюць сталінскім ампірам). Сярод іх трэба адзначыць будынкі МДБ (цяпер – КДБ Рэспублікі Беларусь) (1947 г.) і Дзяржаўнага банка (цяпер – Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь) (1952 г.) архітэктара М. Паруснікава, Мінскага гарадскога ўнівермага (1951 г.) архітэктараў Р. Гегарта і Л. Мілегі, галоўнага паштамта (1953 г.) архітэктараў А. Духана і У. Караля, Палац культуры прафсаюзаў (1954 г.) архітэктара У. Яршова і інш. Цяпер гэтая ўнікальная архітэктура цэнтральнай часткі Мінска прэтэндуе на ўключэнне ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

У 1950–1960-я гг. горадаўтваральную ролю замест гістарычных цэнтраў з помнікамі старажытнага дойлідства ўзялі на сябе архітэктурныя ансамблі ў стылі неакласіцызму. Сярод страчаных у той час помнікаў архітэктуры трэба адзначыць узарваны ў 1953 г. касцёл Св. Станіслава XVII ст. у Пінску, знесеную ў 1961 г. Дабравешчанскую царкву XII ст. у Віцебску і ўзарваны тады ж касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі (Фару Вітаўта) XIV–XVI стст. у Гродне і некаторыя іншыя.

У наступныя дзесяцігоддзі становішча з ахoвай архітэктурнай спадчыны пачало паступова паляпшацца. У 1965 г. было створана Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. У рэспубліцы былі прыняты законы “Аб ахове помнікаў культуры” (1969 г.), “Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры” (1978 г.). Было разгорнута навуковае даследаванне помнікаў архітэктуры. У 1970–1980-я гг. была праведзена рэстаўрацыя Сафійскага сабора ў Полацку, кальвінскіх збораў у Заслаўі, Смаргоні і іншых помнікаў. Буйнамаштабным праектам была рэстаўрацыя заходняй часткі Траецкага прадмесця ў Мінску, праведзеная ў 1982–1985 гг. архітэктарамі Л. Левіным, Ю. Градавым, С. Багласавым.

Архітэктура і горадабудаўніцтва развівалася пад уплывам функцыяналізму на аснове традыцыйных рашэнняў і наватарскіх ідэй. Многія нацыянальныя традыцыі горадабудаўніцтва знайшлі працяг у планіровачнай структуры гарадоў і іх забудове. Разам з тыпавым праектаваннем адбываўся зварот да нацыянальнай спадчыны, дасягненняў

сусветнага дойлідства. У планіроўцы гарадоў пачала надавацца ўвага прыродна-ландшафтнаму фактару, захаванню гістарычных помнікаў і гарманічнаму іх уключэнню ў гарадское асяроддзе. У 1960–1970-я гг. у вялікіх гарадах фарміравалася поліцэнтрычная лінейна-восевая кампазіцыя з зорчатай структурай, якая складвалася на аснове планіроўкі радыяльна-кальцавой (Мінск, Віцебск, Гомель), ці веернай, якая развівалася на базе існуючай асіметрычнай кампазіцыі цэнтра (Брэст, Пінск). У 1980-я гг. у буйных гарадах складвалася разгалінаваная шматвузлавая поліцэнтрычная структура грамадскіх цэнтраў.

У цэлым, культурнае жыццё рэспублікі ў 1940–1980-я гг. вызначалася разнароднасцю і складанасцю. Беларускае грамадства здолела вытрымаць ваеннае ліхалецце і пераадолець пасляваенныя цяжкасці, перайсці да мірнай стваральнай працы. Атрыманыя тады значныя поспехі ў развіцці адукацыі і культуры, усесаюзнае і міжнароднае прызнанне дасягненняў беларускай літаратуры, мастацтва і таленту іх творцаў сталі залогам паступальнага і дынамічнага развіцця нацыянальнай культуры ў незалежнай Рэспубліцы Беларусь.

**Дзеячы культуры, мастацтва**

**Азгур Заір Ісакавіч** (1903–1995) – скульптар. Народны мастак СССР. Акадэмік Акадэміі мастацтваў СССР. Удзельнічаў у стварэнні Манумента Перамогі ў Мінску і іншых значных помнікаў у Беларусі і за мяжой. Стварыў шматлікую і разнастайную галерэю партрэтаў дзеячаў сусветнай і айчыннай культуры, навукі, грамадскіх дзеячаў – А. Пушкіна, Р. Тагора, Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі і інш. Аўтар кніг “Незабыўнае”, “Тое, што помніцца...” і артыкулаў.

**Алексіевіч Святлана Аляксандраўна** (1948 г.н.) – журналістка, пісьменніца. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры 2015 г. Аўтар твораў “У вайны не жаночы твар”, “Зачараваныя смерцю”, “Цынкавыя хлопчыкі”, “Чарнобыльская малітва”, “Час second-hand (Канец чырвонага чалавека)” і інш.

**Алоўнікаў Уладзімір Уладзіміравіч** (1919–1996) – кампазітар. Народны артыст Беларусі. Аўтар кантаты і араторыі, сімфанічных паэм, харавой і камерна-інструментальнай музыкі. Вядомы лірыка-патрыятычнымі песнямі “Радзіма мая дарагая”, “Песня пра Мінск” і інш.

**Анікейчык Анатоль Аляксандравіч** (1932–1989) – скульптар. Народны мастак Беларусі. Аўтар мемарыяльных комплексаў “Прарыў” і “Праклён фашызму”, помнікаў Я. Купалу ў Мінску і ў штаце Нью-Ёрк (ЗША), партрэтаў шэрагу культурных і дзяржаўных дзеячаў.

**Барадулін Рыгор Іванавіч** (1935–2014) – паэт. Народны паэт Беларусі. Аўтар зборнікаў паэзіі “Неруш”, “Адам і Ева”, “Маўчанне перуна”, “Трэба дома бываць часцей”, “Евангелле ад Мамы”, “Ксты” і інш.

**Бембель Андрэй Ануфрыевіч** (1905–1986) – скульптар. Народны мастак Беларусі. Працаваў у манументальнай і манументальна-дэкаратыўнай пластыцы. Удзельнічаў у стварэнні Манумента Перамогі ў Мінску, Кургана Славы, мемарыяльнага комплекса “Брэсцкая крэпасць-герой” і іншых значных помнікаў, партрэтаў дзеячаў культуры.

**Брыль Янка (Іван Антонавіч)** (1917–2006) – пісьменнік. Народны пісьменнік Беларусі. Аўтар рамана “Птушкі і гнёзды”, аповесці “Я з вогненнай вёскі…” (разам з А. Адамовічам і У. Калеснікам) і іншых твораў.

**Быкаў Васіль Уладзіміравіч** (1924–2003) – грамадскі дзеяч, пісьменнік. Народны пісьменнік Беларусі. Вядомы сваімі творамі пра вайну. Аўтар аповесцей “Жураўліны крык”, “Трэцяя ракета”, “Альпійская балада”, “Мёртвым не баліць”, “Сотнікаў”, “Абеліск”, “Дажыць да світання”, “Воўчая зграя”, “Яго батальён”, “Знак бяды” і інш.

**Вашчанка Гаўрыла Харытонавіч** (1928–2014) – мастак. Народны мастак Беларусі. Працаваў у галіне станковага жывапісу, акварэлі, манументальных роспісаў, вітражоў. Пісаў карціны пра вайну і пасляваенную стваральную працу, на нацыянальна-гістарычную тэму (“Грунвальдская бітва”, трыпціх пра паўстанне К. Каліноўскага “За зямлю, за волю” і інш.), стварыў серыю партрэтаў дзеячаў беларускай культуры і дзяржавы, асветнікаў і іншыя творы.

**Волкаў Валянцін Віктаравіч** (1881–1964) – мастак. Народны мастак Беларусі. Майстар тэматычных карцін, партрэтаў, пейзажаў, нацюрмортаў. Аўтар велізарнай кампазіцыі “Мінск 3-га ліпеня 1944 года”, карцін “Кастусь Каліноўскі”, “Партызаны”, “Студэнты” і інш.

**Гаявая Валянціна Іванаўна** (1936 г.н.) – харэограф. Народная артыстка Беларусі. З 1974 г. мастацкі кіраўнік і галоўны балетмайстар Беларускага дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля “Харошкі”.

**Гілевіч Ніл Сымонавіч** (1931–2016) – паэт, грамадскі дзеяч. Народны паэт Беларусі. Аўтар рамана ў вершах “Родныя дзеці”, зборнікаў паэзіі “Песня ў дарогу”, “Падвесне ідзе па зямлі”, “Лісце трыпутніку”, “Запаветнае”, “Повязь” і інш.

**Глебаў Аляксей Канстанцінавіч** (1908–1968) – скульптар. Народны мастак Беларусі. Працаваў у галіне партрэтнай, сюжэтна-кампазіцыйнай і манументальнай пластыкі. Аўтар помніка Ф. Скарыне ў Полацку і шэрагу іншых скульптурных кампазіцый, партрэтаў.

**Дашук Віктар Нічыпаравіч** (1938 г.н.) – кінарэжысёр. Народны артыст Беларусі. Зняў больш 80 дакументальных стужак.

**Дрынеўскі Міхаіл Паўлавіч** (1941 г.н.) – дырыжор. Народны артыст Беларусі. З 1975 г. мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусі імя Г. Цітовіча.

**Елізар’еў Валянцін Мікалаевіч** (1947 г.н.) – балетмайстар. Народны артыст БССР і СССР. У 1973–1992 гг. з’яўляўся галоўным балетмайстрам, у 1992–1996 гг. – мастацкім кіраўніком балетнай трупы тэатра оперы і балета Беларусі, у 1996–2009 гг. – мастацкім кіраўніком-дырэктарам Тэатра балета Рэспублікі Беларусь. У 1996 г. яго пастаноўка балета “Рагнеда” (“Страсці”) (кампазітар – А. Мдзівані) прызнана лепшай у свеце Міжнароднай асацыяцыяй танца ў Парыжы.

**Жыновіч (Жыдовіч) Іосіф Іосіфавіч** (1907–1974) – кампазітар, дырыжор. Народны артыст БССР і СССР. У 1946–1974 гг. быў мастацкім кіраўніком і дырыжорам Дзяржаўнага народнага аркестра БССР.

**Зайцаў Яўген Аляксеевіч** (1907–1992) – мастак. Народны мастак Беларусі. Працаваў ў станковым жывапісе ў жанры сюжэтна-тэматычнай карціны. Аўтар карцін “Парад беларускіх партызан у 1944 годзе ў Мінску”, “Стаяць насмерць” “Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 годзе”, “Заслонаў” і інш.

**Кандрат Крапіва (Атраховіч Кандрат Кандратавіч)** (1896–1991) – пісьменнік, драматург. Народны пісьменнік Беларусі. Акадэмік АН БССР. Аўтар кніг сатыры і гумару, зборнікаў прозы, п’ес “Хто смяецца апошнім”, “Мілы чалавек”, “Пяюць жаваранкі”, “Людзі і д’яблы”, “Брама неўміручасці” і інш.

**Казінец Міхаіл Антонавіч** (1938 г.н.) – дырыжор, педагог. Народны артыст Беларусі. З 1975 г. мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Дзяржаўнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча.

**Караткевіч Уладзімір Сямёнавіч** (1930–1984) – пісьменнік, драматург. Майстар гістарычнага жанру, плённа працаваў і ў іншых жанрах. Яго творчасць вылучалася глыбокім нацыянальна-рамантычным пафасам і гуманізмам, высокай мастацкай культурай. Аўтар раманаў “Нельга забыць”, “Каласы пад сярпом тваім”, “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”, “Чорны замак Альшанскі”, аповесцей “Дзікае паляванне караля Стаха”, “Сівая легенда”, нарыса “Зямля пад белымі крыламі”, зборнікаў вершаў “Матчына душа”, “Вячэрнія ветразі”, “Мая Іліяда”, “Быў. Ёсць. Буду” і іншых твораў.

**Куляшоў Аркадзь Аляксандравіч** (1914–1978) – паэт. Народны паэт Беларусі. Аўтар зборнікаў паэзіі, паэм “Сцяг брыгады”, “Грозная пушча”, “Хамуціус” і інш.

**Луцэнка Барыс Іванавіч** (1937 г.н.) – тэатральны рэжысёр. Народны артыст Беларусі. У 1973–1981 гг. – галоўны рэжысёр, у 1991–2007 гг. – мастацкі кіраўнік, з 2007 г. – рэжысёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага, у 1982–1991 гг. – галоўны рэжысёр

Тэатра-студыі кінаакцёра. Паставіў “Макбет” і “Гамлет” У. Шэкспіра, “Трагедыя чалавека” І. Мадача, “Сон на кургане” Я. Купалы і іншыя творы.

**Лучанок Ігар Міхайлавіч** (1938 г.н.) – кампазітар. Народны артыст БССР і СССР. Працуе ў розных жанрах, асабліва ў песенным. Аўтар кантат “Курган”, “Салдацкае сэрца”, паэм “Гусляр”, “Вайна не патрэбна” і іншых музычных твораў. Яго музыка вылучаецца яркай меладычнасцю і нацыянальнай самабытнасцю.

**Лынькоў Міхась (Міхаіл Ціханавіч)** (1899–1975) – пісьменнік. Народны пісьменнік Беларусі. Акадэмік АН БССР. Аўтар зборнікаў прозы “Андрэй Лятун”, рамана “На чырвоных лядах”, рамана-эпапеі “Векапомныя дні” і інш.

**Макаёнак Андрэй Ягоравіч** (1920–1982) – драматург. Народны пісьменнік Беларусі. Аўтар п’ес “Лявоніха на арбіце”, “Трыбунал”, “Таблетку пад язык”, “Зацюканы апостал” і інш.

**Макарава Галіна (Агата) Кліменцьеўна (**1919–1993) – актрыса. Народная артыстка БССР і СССР. Працавала з 1938 г. у БДТ-1 у Мінску (цяпер Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы).

**Масленікаў Павел Васільевіч** (1914–1995) – мастак. Народны мастак Беларусі. Майстар пейзажу, тэатральнай дэкарацыі. Аўтар даследавання “Беларускі савецкі тэматычны жывапіс” і іншых навуковых прац.

**Мележ Іван Паўлавіч** (1921–1976) – празаік, драматург. Народны пісьменнік Беларусі. Аўтар трылогіі “Палеская хроніка” (раманаў “Людзі на балоце”, “Подых навальніцы”, “Завеі, снежань”), рамана “Мінскі напрамак” і іншых твораў.

**Мулявін Уладзімір Георгіевіч** (1941–2003) – спявак, кампазітар. Народны артыст БССР і СССР. З 1968 г. – заснавальнік і мастацкі кіраўнік ВІА “Песняры” (да 1970 г. – “Лявоны”).

**Навуменка Іван Якаўлевіч** (1925–2006) – пісьменнік. Народны пісьменнік Беларусі. Акадэмік НАН Беларусі. Аўтар літаратуразнаўчых прац, кніг апавяданняў, аповесцей “Сямнаццатай вясной”, “Таполі юнацтва”, “Вераніка”, “Замець жаўталісця”, раманаў “Сасна пры дарозе”, “Сорак трэці” і інш.

**Панчанка Пімен Емяльянавіч** (1917–1995) – паэт. Народны паэт Беларусі. Аўтар паэмы “Патрыятычная песня”, зборнікаў паэзіі “За шчасце, за мір!”, “Пры святле маланак”, “Млечны Шлях”, “Дзе начуе жаўранак” і інш.

**Пташук Міхаіл Мікалаевіч** (1943–2002) – кінарэжысёр. Народны артыст Беларусі. Здымаў мастацкія фільмы “Час выбраў нас”, “Вазьму твой боль”, “Чорны замак Альшанскі”, “Знак бяды”, “Наш бранявоезд”, “У жніўні 44-га…”, “У чэрвені 41-га…” і інш.

**Пятрусь (Пётр Усцінавіч) Броўка** (1905–1980) – грамадскі дзеяч, пісьменнік. Народны паэт Беларусі. Акадэмік АН БССР. Аўтар кніг паэзіі “Дарогі жыцця”, “У роднай хаце”, “Пахне чабор”, “А дні ідуць…” і інш.

**Раеўскі Валерый Мікалаевіч** (1939–2011) – тэатральны рэжысёр. Народны артыст Беларусі. У 1973–2008 гг. быў галоўным рэжысёрам і мастацкім кіраўніком Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы. Паставіў “Радавыя” А. Дударава, “Мудрамер” М. Матукоўскага, “Трыбунал” А. Макаёнка, “Брама неўміручасці” К. Крапівы і іншыя творы.

**Раінчык Васіль Пятровіч** (1950 г.н.) – кампазітар. Народны артыст Беларусі. З 1974 г. заснавальнік і мастацкі кіраўнік ВІА “Верасы”. Аўтар балета “Крылы над Расіяй”, араторыі “Хлапчук-Кібальчыш” і іншых музычных твораў.

**Савіцкі Міхаіл Андрэевіч** (1922–2010) – мастак. Герой Беларусі. Народны мастак БССР і СССР. Акадэмік Акадэміі мастацтваў СССР і НАН Беларусі. Майстар станкавага і манументальнага жывапісу, партрэту. Аўтар цыклаў “Гераічная Беларусь”, “Лічбы на сэрцы”, “Чорная быль”, карцін “Партызанская мадонна”, “Дзеці вайны”, “Партызаны”, “Хлябы”, “Цуд пра хлябы” і іншых твораў.

**Селіханаў Сяргей Іванавіч** (1917–1976) – скульптар. Народны мастак Беларусі. Удзельнічаў у стварэнні Манумента Перамогі ў Мінску, мемарыяльнага комплекса “Хатынь” і іншых значных помнікаў, партрэтаў дзеячаў культуры.

**Семяняка Юрый Уладзіміравіч** (1925–1990) – кампазітар. Народны артыст Беларусі. Аўтар опер “Калючая ружа”, “Калі ападае лісце”, “Зорка Венера”, “Новая зямля”, больш 300 песень і іншых музычных твораў. Працаваў у вакальна-сімфанічным, камерна-інструментальным, камерна-вакальным і песенным жанрах. З яго твораў складваліся рэпертуары ВІА “Песняры”, “Верасы”.

**Станюта Стэфанія Міхайлаўна** (1905–2000) – актрыса. Народная артыстка БССР і СССР. Працавала ў 1920–1926 і з 1931 г. у БДТ-1 у Мінску (цяпер Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы), у 1926–1931 гг. – у БДТ-2 у Віцебску (цяпер Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Коласа).

**Тураў Віктар Цімафеевіч** (1936–1996) – кінарэжысёр. Народны артыст БССР і СССР. Экранізаваў “Палескую хроніку” І. Мележа, здымаў мастацкія фільмы “Праз могілкі”, “Сыны ідуць у бой”, “Я родам з дзяцінства”, “Чорны бусел”, “Шляхціч Завальня” і інш.

**Ханок Эдуард Сямёнавіч** (1940 г.н.) – кампазітар. Народны артыст Беларусі. Працуе ў розных жанрах, асабліва ў песенным. Яго песні складалі рэпертуары ВІА “Верасы”, “Сябры”, “Песняры”.

**Цітовіч Генадзь Іванавіч** (1910–1986) – музычны дзеяч, дырыжор. Народны артыст БССР і СССР. У 1952–1974 гг. мастацкі кіраўнік створанага

ім Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь. Збіраў і вывучаў беларускі музычны фальклор, запісаў каля 3 тыс. народных песень і танцаў. Аўтар шэрагу даследаванняў пра беларускія народныя песні.

**Чыгрынаў Іван Гаўрылавіч** (1934–1996) – пісьменнік. Народны пісьменнік Беларусі. Аўтар раманаў "Плач перапёлкі", "Апраўданне крыві", "Свае і чужыя", "Вяртанне да віны", "Не ўсе мы згінем" і іншых твораў.

**Шамякін Іван Пятровіч** (1921–2004) – пісьменнік, грамадскі дзеяч. Народны пісьменнік Беларусі. Акадэмік НАН Беларусі. Аўтар раманаў "Глыбокая плынь", "Сэрца на далоні", "Атланты і карыятыды", "Вазьму твой боль", "Петраград-Брэст", п'ес, кніг апавяданняў, аповесцей і інш.

**Шмакаў Фёдар Іванавіч** (1917–2009) – акцёр. Народны артыст БССР і СССР. Працаваў з 1939 г. у Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР у Магілёве, з 1941 – у БДТ-2 у Віцебску (цяпер Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Коласа).

**Шчамялёў Леанід Дзмітрыевіч** (1923 г.н.) – мастак. Народны мастак Беларусі. Майстар станковага жывапісу. Аўтар карцін "Першы дзень міру", "Кастусь Каліноўскі", "Рэпін у Здраўнёве", "Леся Украінка" і інш.

**Ярмоленка Анатоль Іванавіч** (1947 г.н.) – спявак. Народны артыст Беларусі. З 1974 г. мастацкі кіраўнік ВІА "Сябры".

## Тэма 11. Сучаснае культурнае жыццё Беларусі

***Дзяржаўная палітыка.*** Дэмакратызацыя грамадскага жыцця ў другой палове 1980-х гг. – пачатку 1990-х гг. і абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі аказалі моцны ўплыў на змест і напрамкі развіцця нацыянальнай культуры, адукацыі, навукі. У сучасных умовах пашырэння глабалізацыі нацыянальная культура набывае ўсё большае значэнне як надзейны гарант захавання ідэнтычнасці і самабытнасці народа. "Мы разглядаем яе як стратэгічны рэсурс краіны, краевугольны камень нашай незалежнасці, без якога не можа быць суверэннай, квітнеючай дзяржавы", – падкрэсліў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка 8 студзеня 2011 г. на цырымоніі ўручэння прэзідэнцкіх прэмій "За духоўнае адраджэнне" і спецыяльных прэмій дзеячам культуры і мастацтва.

Пры разглядзе тэмы лекцыі неабходна спачатку адзначыць асноўныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры на сучасным этапе:

– стварэнне і ўдасканальванне нарматыўна-прававой базы;

– далейшае развіццё прафесійнага мастацтва;

– захаванне і развіццё традыцыйнай культуры беларускага народа;

– зберажэнне гісторыка-культурнай спадчыны;

– умацаванне існуючых і стварэнне новых устаноў, арганізацый культуры, мастацтва;

– падтрымка культурнага жыцця нацыянальных супольнасцей;

– пашырэнне міжнародных культурных сувязей;

– разгорванне супрацоўніцтва з беларускай дыяспарай.

У краіне распрацавана і ўдасканалена заканадаўча-прававая база – законы, Указы Прэзідэнта, пастановы ўрада, якія ствараюць добрыя магчымасці для захоўвання і развіцця культуры. Сярод іх законы “Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь”, “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь”, “Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь”, “Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь”, “Аб кінематаграфіі ў Рэспубліцы Беларусь”, “Аб творчых саюзах і творчых работніках”, “Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь”. На іх падставе быў упершыню распрацаваны і ў 2016 г. уведзены ў дзеянне Кодэкс аб культуры, які не мае аналагаў на постсавецкай прасторы. Моўная сфера ў краіне рэгулюецца законам “Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь”, прынятым у 1990 г. У адпаведнасці з вынікамі агульнарэспубліканскага рэферэндума 1995 г. у яго былі ўнесены дапаўненні і змяненні – беларуская і руская мовы былі былі зацверджаны дзяржаўнымі. Паводле артыкула 2 гэтага закона, Рэспубліка Беларусь забяспечвае ўсебаковае развіццё і функцыянаванне беларускай і рускай моў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, праяўляе дзяржаўны клопат аб свабодным развіцці і ўжыванні ўсіх нацыянальных моў, якімі карыстаецца насельніцтва рэспублікі.

Мэтамі Дзяржаўнай праграмы “Культура Беларусі” на 2016–2020 гг. з’яўляюцца наступныя: захаванне гістарычнай памяці беларускага народа, яго нацыянальна-культурнай самабытнасці і традыцый; актыўнае далучэнне грамадзян Беларусі да культурнага жыцця краіны, рэалізацыя творчага патэнцыялу нацыі; забеспячэнне якаснага фарміравання, захаванасці і выкарыстання дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь як часткі інфармацыйнага рэсурсу краіны; спрыянне захаванню нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларускай дыяспары. Дзяржаўная праграма ўключае падпраграмы “Спадчына”, “Мастацтва і творчасць”, “Архівы Беларусі”, “Беларусы ў свеце”.

Асноўная матэрыяльная падтрымка сферы культуры аказваецца дзяржавай на рэспубліканскім, мясцовым (абласным, раённым, гарадскім) узроўнях. Ужо стала добрай традыцыяй практыка штогадовага прысуджэння прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь: прэміі “За духоўнае адраджэнне”, спецыяльных прэмій дзеячам культуры і мастацтва і “Беларускі спартыўны Алімп”. Акрамя таго, цяпер для фінансавання культуры ў Беларусі выкарыстоўваюцца і небюджэтныя крыніцы, спонсарства, партнёрства.

***Ахова гісторыка-культурнай спадчыны.*** Дзяржаўная палітыка ў сферы аховы спадчыны накіравана на ахову духоўных, мастацкіх і дакументальных уласцівасцей гісторыка-культурнай спадчыны, на

адраджэнне і захаванне патэнцыялу культурнай спадчыны і яго развіццё, захаванне самабытнасці культуры беларускага народа і нацыянальных традыцый, павышэнне адказнасці ўласнікаў і ўладальнікаў гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Былі праведзены рэстаўрацыйна-аднаўленчыя працы на многіх знакавых аб’ектах архітэктуры Беларусі, сярод якіх замкавы комплекс “Мір” і палацава-паркавы ансамбль у Нясвіжы, якія ўключаны ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Праведзена рэстаўрацыя цэлага шэрагу замкаў, палацаў, будынкаў тэатраў, бібліятэк, музеяў і іншых устаноў культуры, аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны: Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы, палаца Румянцавых-Паскевічаў у Гомелі, ратушы ў Нясвіжы, рэканструкцыя Беларускага дзяржаўнага цырка і інш. Адбываюцца рэстаўрацыйныя працы ў будынках Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь дзеля стварэння музейнага квартала. У межах дзяржаўных праграм “Культура Беларусі”, “Замкі Беларусі” выконвалася рэстаўрацыя Лідскага і Навагрудскага замкаў, кансервацыя і добраўпарадкаванне руін замкаў у Гальшанах, Крэве і іншых помнікаў архітэктуры. У 2015 г. рэстаўрацыйныя працы праводзіліся на такіх значных аб’ектах спадчыны Беларусі, як Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку і Свята-Пакроўскі сабор у Талачыне (Віцебская вобласць), палац Друцкіх-Любецкіх у Шчучыне, Стары замак у Гродне (Гродзенская вобласць), Косаўскі і Ружанскія палацы (Брэсцкая вобласць), а таксама ішла рэканструкцыя палаца ў Жылічах (Магілёўская вобласць).

Сярод найбольш значных праектаў па аднаўленні мастацкай спадчыны трэба адзначыць творы М. Кузьміча, празванага “Лазарам Богшай з Брэста”, па аднаўленні крыжа Е. Полацкай 1161 г. (1997 г.), ракі для захавання яе мошчаў (2007 г.), рэстаўрацыю фрэсак XII ст. Спаса-Прэабражэнскай царквы У. Ракіцкім, Ю. Маліноўскім і іншымі майстрамі. З’явіліся факсімільныя выданні Тураўскага Евангелля XI ст., Слуцкага Евангелля XVI ст. і іншых кніжных фаліянтаў. Да 500-годдзя айчыннага кнігадрукавання Нацыянальная бібліятэка Беларусі і ААТ “Банк БелЗЭБ” рэалізуюць буйны выдавецкі праект – 20-томнае факсімільнае выданне кніг Ф. Скарыны. На працягу апошніх дзесяцігоддзяў у краіне праводзіцца мэтанакіраваная праца па пошуку, уліку і вывучэнні беларускай спадчыны за мяжой.

Вялікае значэнне на сучасным этапе надаецца адраджэнню промыслаў і рамёстваў. Штогод праходзяць адпаведныя міжнародныя, нацыянальныя і рэгіянальныя выстаўкі, фестывалі, ярмаркі, творчыя акцыі. Сярод іх – Міжнародны пленэр ганчароў у Столінскім раёне і свята-конкурс майстроў ганчарства “Гліняны звон” у Валожынскім раёне, Рэспубліканскі фестываль-ярмарка “Вясновы букет“ у Мінску, свята-конкурс майстроў ткацтва

“Матчыны кросны” у Старых Дарогах і інш. Ужо рэалізавана дзяржаўная праграма аднаўлення тэхналогій і традыцый вырабу слуцкіх паясоў.

Вялікую працу па зберажэнні і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны праводзяць музеі. У 2015 г. у Рэспубліцы Беларусь дзейнічалі 152 музеі сістэмы Міністэрства культуры, каля 200 – іншых ведамстваў, 1479 – сістэмы Міністэрства адукацыі, 7 – створаных грамадскімі аб’яднаннямі, 14 – прыватных. Штогод адкрываюцца новыя музеі, філіялы ці экспазіцыі музеяў. У апошнія гады значна павялічылася наведванне музеяў. Напрыклад, у 2012 г. Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік “Нясвіж” стаў самым папулярным беларускім музеем (431 тыс. наведванняў). У спіс самых папулярных музеяў увайшлі таксама мемарыяльны комплекс “Брэсцкая крэпасць-герой” (355,4 тыс. наведванняў), Гомельскі палацава-паркавы ансамбль (309,2 тыс.), замкавы комплекс “Мір” (275,5 тыс.), Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (234,9 тыс.), Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік (223,9 тыс.), Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь (215,8 тыс.), Дзяржаўны мемарыяльны комплекс “Хатынь” (204,5 тыс.). З 2012 г. пачалі праводзіцца агульнарэспубліканскія форумы музеяў Беларусі.

Захаваннем і даследаваннем дакументальных крыніц актыўна займаюцца як рэспубліканскія архіўныя ўстановы (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску і Гродне, Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва і інш.), так і абласныя, занальныя архівы.

Свой пачэсны ўклад у задавальненне культурных патрэб людзей уносяць бібліятэкі, культурна-асветніцкія ўстановы. Бібліятэчная сістэма краіны ўключае цяпер каля 7,7 тыс. публічных і спецыяльных бібліятэк з агульным аб’ёмам фонду каля 180 млн. экзэмпляраў. З іх у сістэме Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь знаходзяцца каля 2,9 тыс. бібліятэк, у тым ліку Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 6 абласных. Сетка ўстаноў культуры клубнага тыпу па ўсіх абласцях уключае каля 2,8 тыс. клубных устаноў: клубаў, дамоў і палацаў культуры, цэнтраў культуры і вольнага часу, дамоў і цэнтраў фальклору, народнай творчасці, рамёстваў і народных майстроў і інш. Нягледзячы на станоўчыя вынікі рэалізацыі Праграмы адраджэння і развіцця вёскі, што яскрава відаць на прыкладзе ажыўлення культурнага жыцця аграгарадкоў, з-за пастаяннага памяншэння колькасці сельскага насельніцтва назіраецца няўхільная тэндэнцыя скарачэння сеткі сельскіх бібліятэк і клубных устаноў.

У Рэспубліцы Беларусь створаны спрыяльныя ўмовы для захавання і развіцця культуры розных нацыянальных супольнасцей. Так, на базе Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур працуе 8 самадзейных мастацкіх калектываў, сярод якіх народны рускі хор імя А. Нікіцінай,

народны хор украінскай песні “Крыныця”, ансамбль польскай песні “Тэнча”, ансамбль карэйскага танца “Арыран”, армянскі фальклорны ансамбль “Эрыбуні”, фальклорны ансамбль “Украінская песня”, тэатр украінскай песні і абраду “Ватра”, шматнацыянальны эстрадны ансамбль “Шматгалоссе”. Ужо стаў традыцыйным Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур, які праводзіцца з 1996 г. у Гродне.

Адметнай стала акцыя штогадовага абрання таго ці іншага горада Беларусі цэнтрам культурнага жыцця краіны – “Культурная сталіца Беларусі”. Гэта надае значны імпульс культурнаму жыццю рэгіёнаў, актывізуе культурніцкія ініцыятывы мясцовай грамадскасці, спрыяе развіццю турызму. Узначаліў спіс культурных сталіц Беларусі Віцебск, пасля яго эстафета пераходзіла да Полацка (2010 г.), Гомеля (2011 г.), Нясвіжа (2012 г.), Магілёва (2013 г.), Гродна (2014 г.), Брэста (2015 г.), Маладзечна (2016 г.). Мабілізуючае значэнне для захавання і памнажэння нацыянальнай спадчыны, яе папулярызацыі мелі абвяшчэнні на самым высокім дзяржаўным узроўні ў Беларусі 2012 г. Годам кнігі, 2016 г. – Годам культуры.

Важную ролю ў вывучэнні і зберажэнні культурнай спадчыны іграюць навукова-даследчыя ўстановы НАН Беларусі (Інстытуты гісторыі, філасофіі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры), БДУ і іншыя ВНУ рэспублікі. Падрыхтоўкай высокапрафесійных кадраў у галіне культуры займаюцца Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Беларуская акадэмія мастацтваў, Беларуская акадэмія музыкі, Інстытут культуры Беларусі, цэлы шэраг сярэдніх спецыяльных устаноў. Шмат робяць для папулярызацыі беларускай культуры і мастацтва сродкі масавай інфармацыі – газеты і часопісы, тэлебачанне і радыё. Зберажэнню духоўнасці і маральнасці спрыяюць існуючыя ў краіне рэлігійныя аб’яднанні. Свой уклад у нацыянальна-культурнае адраджэнне ўносяць грамадскія арганізацыі. Галоўная задача Таварыства беларускай мовы, якое пачало дзейнічаць з 1989 г. намаганнямі Н. Гілевіча, Г. Бураўкіна, А. Трусава і іншых актыўных дзеячаў нацыянальнай інтэлігенцыі – гэта адраджэнне беларускай мовы ў дзяржаўным, грамадскім і духоўным жыцці народа.

***Літаратура.*** За 1990-я гг. – пачатак ХХ ст. нямала зроблена ў галіне прозы, паэзіі, драматургіі. У беларускай літаратуры працягваецца асваенне новых тэм, стылістычныя і жанравыя пошукі, далучэнне яе да сусветнага літаратурнага працэсу. Сучасная літаратура адчула больш багатую і разнастайную нацыянальна-культурную аснову. Чалавек на вайне, трагедыя сталіншчыны, гісторыя і культура Беларусі, трагедыя Чарнобыля, хрысціянскія каштоўнасці, вострыя праблемы сучаснасці – гэтыя і іншыя тэмы хвалявалі літаратараў. В. Быкаў напісаў аповесці “Пакахай мяне, салдацік”, “Ваўчыная яма”, “Балота”, кнігі прозы “Сцяна”, “Пахаджане” і іншыя творы, у якіх імкнуўся пазнаць магчымасці чалавека, выявіць у ім

ступень духоўнасці і меру чалавечнасці. Вынікі свайго жыцця і творчасці В. Быкаў падсумаваў у кнізе ўспамінаў "Доўгая дарога дадому". Сярод найбольш значных твораў прозы трэба адзначыць раманы "Злая зорка" І. Шамякіна, "Аперацыя "Кроў" М. Чаргінца, публіцыстыку А. Адамовіча, працы І. Навуменкі, У. Гніламёдава, У. Ліпскага, Г. Марчука, Б. Сачанкі, В. Казько, Т. Бондар, А. Глобуса, А. Федарэнкі, А. Наварыча і іншых творцаў. Добры плён далі аўтары гістарычнага жанру Г. Далідовіч, Л. Дайнека, В. Іпатава, А. Дудараў, Р. Баравікова, З. Дудзюк, В. Чаропка і інш. Цікавыя кнігі на гістарычныя тэмы створаны У. Арловым: "Мой радавод да пятага калена", "Таямніцы полацкай гісторыі", "Адкуль наш род", "Сны імператара", "Каханак яе вялікасці", "Сланы Ганібала", "Дзесяць стагоддзяў беларускай гісторыі" (разам з Г. Сагановічам), ілюстраваныя гісторыі "Краіна Беларусь" і "Вялікае Княства Літоўскае" (разам з Дз. Герасімовічам). Важнай міжнароднай падзеяй стала прысуджэнне С. Алексіевіч Нобелеўскай прэміі па літаратуры 2015 г. "за шматгалосую творчасць – помнік пакутам і мужнасці ў наш час" – за цыкл твораў "Галасы Утопіі", куды ўвайшлі яе 6 кніг: "У вайны не жаночы твар", "Цынкавыя хлопчыкі", "Зачараваныя смерцю", "Апошнія сведкі", "Чарнобыльская малітва", "Час second-hand (Канец чырвонага чалавека)".

У беларускай паэзіі плённа працавалі прадстаўнікі розных пакаленняў: М. Танк, Н. Гілевіч, Р. Барадулін, У. Карызна, У. Разанаў, Л. Дранько-Майсюк, У. Някляеў, Л. Пранчак, В. Шніп, Л. Рублеўская, У. Марук, У. Мазго, А. Бадак, Г. Пашкоў, Н. Гальпяровіч, М. Мятліцкі, Н. Мацяш, Д. Бічэль-Загнетава, С. Законнікаў і інш. У іх паэтычнай творчасці перапляліся разнастайныя напрамкі мастацкіх пошукаў. Многія з вершаў пакладзены на музыку і часта ўспрымаюцца як папулярныя народныя песні. Так, У. Карызна стварыў тэкст да Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь. Больш за 200 яго вершаў пакладзена на музыку лепшымі беларускімі кампазітарамі, многія з іх складаюць залаты фонд беларускай культуры – "Маміна вішня", "Люблю цябе, Белая Русь", "Беларусь мая сінявокая", "Азёры дабрыні", "Зорачка мая" і інш. У канцы 2013 г. выйшла апошняя кніга з 23-томнага збору твораў Н. Гілевіча. У Р. Барадуліна выйшлі паэтычныя зборнікі "Трэба дома бываць часцей", "Евангелле ад Мамы", "Ксты", "Рымскі трыпціх", "Руны Перуновы" і інш.

У сучаснай драматургіі пераважаюць творы пра гістарычнае мінулае Беларусі, назіраюцца павевы мадэрнізму і постмадэрнізму. Сярод цэлага шэрагу аўтараў нельга не адзначыць творы А. Дударава "Песня пра зубра" па матывах паэмы М. Гусоўскага, "Палачанка", "Чорная панна Нясвіжа" і іншыя, якія складаюць рэпертуар беларускіх тэатральных калектываў.

Цяпер пісьменнікі, паэты, журналісты і іншыя дзеячы літаратуры аб'яднаны ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі (старшыня – М. Чаргінец) і Саюзе

беларускіх пісьменнікаў (старшыня – Б. Пятровіч), якія актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім і культурным жыцці краіны, займаюцца развіццём і прапагандай беларускай літаратуры.

Традыцыйным з 1994 г. ужо стала агульнацыянальнае Рэспубліканскае свята “Дзень беларускага пісьменства”. Штогод яно наладжваецца ў новых гарадах з багатай гісторыка-культурнай спадчынай. Геаграфія яго правядзення ахоплівае ўсе рэгіёны Беларусі – Полацк, Тураў, Навагрудак, Нясвіж, Орша, Пінск, Заслаўе, Мсціслаў, Мір, Камянец, Паставы, Шклоў, Барысаў, Смаргонь, Хойнікі, Ганцавічы, Глыбокае, Быхаў, Шчучын, Рагачоў.

***Тэатр. Музыка.*** У тэатральным мастацтве Беларусі на сучасным этапе працягваюць пашырацца пошукі новых мастацкіх форм, прыёмаў, сродкаў выразнасці, творчыя эксперыменты, цікавасць да авангардысцкіх, постмадэрнісцкіх і іншых стылявых напрамкаў. У сваёй дзейнасці тэатры актыўна засвойваюць нацыянальную культурную спадчыну і лепшыя дасягненні сусветнага мастацтва, імкнуцца да стварэння арыгінальных сцэнічных твораў і фарміравання на гэтай аснове свайго адметнага рэпертуару. Праводзяцца разнастайныя фестывалі, сярод якіх Міжнародны фестываль тэатральнага мастацтва “Панарама”, “Міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў “Тэатральны куфар”, “Беларускі міжнародны фестываль тэатраў лялек у Мінску, Міжнародны тэатральны фестываль “Белая вежа” ў Брэсце і інш. У 2015 г. у Рэспубліцы Беларусь дзейнічалі 29 дзяржаўных прафесійных тэатраў, з іх 28 – сістэмы Міністэрства культуры і 1 – сістэмы Міністэрства абароны (Драматычны тэатр Беларускай Арміі). Сярод іх 8 тэатраў маюць рэспубліканскае падпарадкаванне (у тым ліку 4 – статус “нацыянальны”), 21 – мясцовае падпарадкаванне.

У дзейнасці Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы ідэя нацыянальна-культурнага адраджэння па-ранейшаму з’яўляецца стрыжнявой. З 1973 г. на працягу 35 гадоў яго галоўным рэжысёрам і мастацкім кіраўніком з’яўляўся В. Раеўскі, які быў натхняльнікам творчых пошукаў. З канца 2008 г. яго змяніў М. Пінігін, які ужо добра вядомы ў Беларусі і за мяжой. Менавіта ім былі пастаўлены ў пачатку 1990-х гг. творы класікі нацыянальнай драматургіі – “Тутэйшыя” Я. Купалы, “Ідылія” В. Дуніна-Марцінкевіча і інш. Цяпер у рэпертуары тэатра “Вечар” і “Чорная панна Нясвіжа” А. Дударава, “Дзве душы” М. Гарэцкага, “Пан Тадэвуш” А. Міцкевіча, “Пінская шляхта” В. Дуніна-Марцінкевіча, “Выкраданне Еўропы, альбо Тэатр Уршулі Радзівіл”М. Пінігіна і іншыя творы.

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Коласа ў сваім рэпертуары мае творы беларускай, рускай і замежнай драматургіі. У 1990-я гг. тэатральны калектыў узначальваў В. Маслюк. З 2012 г. мастацкім кіраўніком стаў В. Анісенка. Лепшымі пастаноўкамі тэатра апошніх дзесяцігоддзяў сталі “Залёты” В. Дуніна-Марцінкевіча, “Чорная панна Нясвіжа” А. Дударава і

інш. У плённых пошуках новых форм сцэнічнай выразнасці калектыў спавядае фундаментальныя творчыя прынцыпы: жыццёвая і мастацкая праўда, яскравая выразная форма, вернасць народным эстэтычным і маральным прынцыпам. Паводле слоў В. Анісенкі, "тэатр – гэта шлях да душы, да сэрца, … гэта спасціжэнне нейкай таямніцы, судакрананне да яе". Цяпер у тэатры ставяцца "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", "Дзікае паляванне караля Стаха", "Нельга забыць" У. Караткевіча, "Несцерка" В. Вольскага, "Белы анёл з чорнымі крыламі" Д. Балыкі і іншыя творы.

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага застаецца вядомым далёка па-за межамі Беларусі. Немалая заслуга ў гэтым Б. Луцэнкі, які доўгі час быў яго галоўным рэжысёрам і мастацкім кіраўніком. Яго паслядоўніку С. Кавальчыку, які стаў у 2013 г. мастацкім кіраўніком, удалося захаваць дасягнутае і ўнесці новае творчае дыханне. Даволі значнымі падзеямі сталі пастаноўкі "Бег" М. Булгакава, "Пане Каханку" А. Курэйчыка. Зараз у рэпертуары тэатра "Дванаццатая ноч" У. Шэкспіра, "Пане Каханку" А. Курэйчыка, "Ідэальны муж" О. Уайльда, "Круг кахання" С. Моэма і іншыя творы сусветнай і айчыннай драматургіі.

Дзейнасць тэатра оперы і балета ў Мінску ў 1990-я гг. характарызавалася пастаянным узбагачэннем рэпертуару шэдэўрамі класікі, паступовым зваротам да нацыянальнай спадчыны, працягваннем творчых пошукаў. Вялікае прызнанне атрымалі оперы "Дзікае паляванне караля Стаха", "Князь Наваградскі" і інш. Далейшае міжнароднае прызнанне атрымала творчасць знакамітага балетмайстра В. Елізар'ева. Яго балетная пастаноўка "Страсці" ("Рагнеда") (кампазітар А. Мдзівані) у 1996 г. была прызнана лепшай у свеце па сваёй харэаграфіі. На працягу 1996–2009 гг. існавалі 2 самастойныя тэатры (оперы і балета). У 2009 г. пасля праведзенай рэканструкцыі тэатральнага будынка трупы зноў аб'ядналіся ў адзіны Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета.

У сучасным музычным мастацтве разам з захаваннем нацыянальных традыцый адбываецца развіццё стылявых напрамкаў, што пашыраны ў свеце. Творы беларускіх кампазітараў, сусветнай класічнай і эстраднай музыкі выконваюцца як прафесійнымі, так і самадзейнымі музыкантамі. Зараз у Беларусі існуе 21 дзяржаўная канцэртная арганізацыя рэспубліканскага і мясцовага падпарадкавання, 2 цыркі. Актыўна і даволі паспяхова дзейнічаюць буйнейшыя творчыя аб'яднанні – Заслужаны калектыў "Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь" (мастацкі кіраўнік – В. Бабарыкін), Заслужаны калектыў "Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі" (мастацкі кіраўнік – М. Фінберг), Заслужаны калектыў "Дзяржаўны ансамбль танца Беларусі" (мастацкі кіраўнік – В. Дудкевіч), Беларускі дзяржаўны заслужаны харэаграфічны ансамбль "Харошкі" (мастацкі кіраўнік – В. Гаявая), Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь

"Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Р. Шырмы" (мастацкі кіраўнік – Л. Яфімава), Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр (мастацкі кіраўнік – А. Анісімаў), Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча (мастацкі кіраўнік – М. Дрынеўскі), Дзяржаўны акадэмічны народны аркестр Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча (мастацкі кіраўнік – М. Казінец), Беларускі дзяржаўны ансамбль "Песняры" (мастацкі кіраўнік – В. Шарапаў) і інш.

У 1990-я гг. – пачатку XXI ст. у галіне музыкі, асабліва ў песенным жанры, актыўна працавалі кампазітары, якіх цяпер добра ведаюць не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі: І. Лучанок, Э. Ханок, Э. Зарыцкі, В. Іваноў, Л. Захлеўны, У. Буднік, А. Елісеенкаў, З. Яўтуховіч, В. Раінчык і інш. Сярод найболып вядомых і папулярных выканаўцаў трэба адзначыць В. Вуячыча, Я. Еўдакімава, Я. Паплаўскую і А. Ціхановіча, А. Ярмоленка, В. Дайнеку, І. Афанасьеву, І. Дарафееву, А. Саладуху і інш.

Штогод у Беларусі праходзіць каля 60 міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў. Буйнейшыя з іх ужо сталі традыцыйнымі – Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар" у Віцебску, Міжнародны фестываль духоўнай музыкі "Магутны божа" у Магілёве, Міжнародны фестываль класічнай музыкі "Студзеньскія музычныя вечары" ў Брэсце, Міжнародны фестываль мастацтваў "Беларуская музычная восень", Міжнароднае свята традыцыйнай культуры "Браслаўскія зарніцы", Міжнародны фестываль народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік", Міжнародны фестываль харэаграфічнага мастацтва "Сожскі карагод", Міжнародны фестываль народнай творчасці "Вянок дружбы", Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне, Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва "Берагіня", фестываль народнага гумару "Аўцюкі", свята "Купалле" ("Александрыя збірае сяброў") і інш. У сферы прафесійнай мастацкай творчасці рэалізаваны новыя маштабныя праекты – рэспубліканскія конкурсы "Нацыянальная тэатральная прэмія" і "Нацыянальная музычная прэмія".

***Кіно.*** У 1990-я гг. – пачатку XXI ст. беларускія кінематаграфісты імкнуліся асвойваць новыя тэмы, арыентавацца на пераасэнсаванне гістарычнага мінулага, праблем сучаснасці. Сярод значных мастацкіх фільмаў трэба адзначыць "Сын за бацьку" (рэжысёр М. Яроменка-малодшы), "Павадыр" (рэжысёр А. Яфрэмаў), "Анастасія Слуцкая" (рэжысёр Ю. Ялхоў) і інш. Рэжысёр М. Пташук, які ўжо стаў добра вядомым сваёй экранізацыяй аповесці В. Быкава "Знак бяды" (1986 г.) і іншых фільмаў, у 1990-я гг. прадоўжыў тэмы рэпрэсій і вайны – у стужках "Кааператыў "Палітбюро", ці Будзе доўгім развітанне" (1992 г.), "У жніўні 44-га..." (2000 г.), "У чэрвені 41-га…" (2003 г.).

Аднак айчыннае кінамастацтва перажывала сур'ёзныя крызісныя працэсы, хоць у 1997 г. кінастудыя "Беларусьфільм" атрымала статус Нацыянальнай. Менавіта таму пытанні развіцця кінагаліны былі ўзяты пад пільную ўвагу на самым высокім дзяржаўным узроўні. Была ўведзена новая сістэма дзяржаўнага фінансавання кінавытворчасці. У апошнія гады выразнай стала тэндэнцыя адраджэння айчыннага кіно. Адметным быў 2007 г., калі "Беларусьфільм" выпусціла 7 мастацкіх і 5 анімацыйных фільмаў, студыя "Летапіс" – 29 дакументальных стужак, а беларускія кінематаграфісты атрымалі каля 30 узнагарод на міжнародных і рэспубліканскіх кінафестывалях. Найбольш значнымі сучаснымі мастацкімі фільмамі з'яўляюцца сумесныя беларуска-расійскія стужкі – "Брэсцкая крэпасць" (2010 г., рэжысёр А. Кот), "Снайпер: Зброя адплаты" (2009 г., рэжысёр А. Яфрэмаў), фільмы "Масакра" (2010 г., рэжысёр У. Кудзіненка), "Сляды апосталаў" (2013 г., рэжысёр С. Талыпаў), "Белыя росы. Вяртанне" (2014 г., рэжысёр А. Бутар). У Беларусі праводзяцца Мінскі міжнародны кінафестываль "Лістапад", Міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў "Анімаёўка" у Магілёве і іншыя кінафестывалі. Фільм паводле аповесці В. Быкава "У тумане", зняты рэжысёрам С. Лазніцай сумесна з замежнымі партнёрамі, атрымаў у 2012 г. спецыяльны прыз Міжнароднай федэрацыі кінапрэсы FIPRESCI на Канскім кінафестывалі. Сучаснае беларускае кіно працягвае традыцыі папярэдніх пакаленняў, шукае новыя шляхі развіцця. Распрацаваная Стратэгія развіцця кінематаграфіі Рэспублікі Беларусь на 2015–2020 гг. нацэлена на стварэнне ўмоў для развіцця сучаснай канкурэнтназдольнай беларускай кінематаграфіі, якая забяспечыць вытворчасць і распаўсюджванне айчынных фільмаў высокага мастацкага ўзроўню і навейшых тэхнічных стандартаў у краіне і за мяжой.

***Выяўленчае мастацтва.*** Сучаснае выяўленчае мастацтва даволі разнастайнае па стылях, напрамках і жанрах. Сярод адметных асаблівасцей трэба адзначыць камерцыялізацыю ў мастацтве, дапаўненне традыцыйных форм жывапісу, графікі, скульптуры новымі відамі сродкаў масавай камунікацыі, шматварыянтнасць і стылявы плюралізм, уключэнне ў сусветны мастацкі працэс. Для жывапісу ўласцівы перапляценне традыцый мастацтва рэалізму і мадэрнісцкіх плыняў, засваенне інсталяцыі, канцэптуальнага мастацтва, нярэдка свядомае змяшэнне некалькіх стыляў і напрамкаў, сінтэз жанраў, размыванне іх межаў, схільнасць да адлюстравання асабістага, да інтэрпрэтацыі нацыянальнай праблематыкі, міфалагізацыі. Рэгулярна праводзяцца розныя міжнародныя і рэгіянальныя мастацкія пленэры, якія прысвячаюцца В. Бялыніцкаму-Бірулю, Я. Драздовічу, Ф. Рушчыцу, І. Хруцкаму, М. Шагалу, К. Малевічу, П. Масленікаву і іншым выдатным творцам.

За апошнія дзесяцігоддзі мастакамі М. Савіцкім, Л. Шчамялёвым, Г. Вашчанка, У. Стальмашонкам, В. Шматавым, В. Альшэўскім, А. Марачкіным, Ф. Янушкевічам, У. Тоўсцікам, А. Кузьмічом, М. Селяшчуком і іншымі майстрамі жывапісу створаны непаўторныя жывапісныя выявы. М. Савіцкі звярнуўся да чарнобыльскай, біблейскай тэм. У вялікім цыкле карцін “Запаведзі” ён акцэнтаваў увагу на дабрыні і міласэрднасці. Яго палотны “Пахаванне Ефрасінні Полацкай”, “Зняцце з крыжа”, “Нясенне крыжа” і іншыя сцвярджаюць запаведзі хрысціянства. Г. Вашчанка напісаў цэлую серыю партрэтаў дзеячаў айчыннай гісторыі – Е. Полацкай, К. Тураўскага, С. Буднага, Я. Купалы, Я. Коласа і інш. В. Шматаў пакінуў пасля сябе серыю “Чарнобыльская трагедыя”, галерэю партрэтаў, сярод якіх карціна “Маці”, якая знаходзіцца ў штаб-кватэры Еўрапарламента ў Бруселі, навуковыя працы па беларускай кніжнай гравюры XVI–XVIII стст. Цэнтральнай тэмай творчасці А. Кузьміча сталі “беларускія мадонны”, ён стварыў цэлы шэраг псіхалагічных партрэтаў вядомых дзеячаў культуры Беларусі. Найбольш значным творам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва стаў “Габелен стагоддзя” (1991–1995 гг.; 9х14 м) А. Кішчанкі, які трапіў у Кнігу рэкордаў Гінэса

Асноўныя дасягненні ў скульптуры звязаны з творчым асэнсаваннем нацыянальнай гісторыі. Характэрнымі яе асаблівасцямі з’яўляюцца развіццё традыцыйных напрамкаў сучаснай скульптуры, эксперымент з новымі матэрыяламі і тэхналогіямі, большая ўвага на выяўленне выразнасці сі-луэта, яго знакавасці. Гістарычныя вобразы найперш адлюстраваны ў манументальнай пластыцы: помнікі А. Міцкевічу ў Навагрудку, Ф. Скарыне ў Лідзе, М. Агінскаму ў Маладзечне В. Янушкевіча, К. Тураўскаму ў Тураве У. Інькова, Я. Драздовічу ў Мінску, Н. Ордзе ў Іванаве, Е. Полацкай у Полацку І. Голубева, С. Полацкаму ў Полацку А. Фінскага, Усяславу Чарадзею ў Полацку і полацкаму князю Ізяславу ў Заслаўі А. Прохарава, князю Альгерду ў Віцебску С. Бандарэнкі, У. Мулявіну ў Екацярынбургу С. Логвіна і інш. Помнік Ф. Скарыну А. Дранца быў пастаўлены ў 2006 г. побач з будынкам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. У двары галоўнага корпуса БДУ у Мінску размясцілася цэлая галерэя помнікаў (К. Тураўскаму, Е. Полацкай, Ф. Скарыне, М. Гусоўскаму, С. Буднаму, В. Цяпінскаму). Арыгінальнымі творамі манументальна-дэкаратыўнай пластыкі сталі творы У. Жбанава: “Дойлід”, “Брычка”, “Прыкурваючы цыгарэту”, “Дзяўчынка з парасонам”, “Дама на лаўцы” у Мінску, скульптура-фантан “Залаты трыліснік” у Маладзечне. Сярод цікавых твораў сучаснай скульптуры трэба адзначыць помнік пасажырцы-студэнцы у Маладзечне, алею “літаратурных” і іншых каваных ліхтароў у Брэсце і г.д.

***Архітэктура.*** Разнастайнай з’яўляецца сучасная архітэктура Беларусі. Можна выдзеліць яе адметнасці: уплыў постмадэрнізму, у якім знайшло

ўвасабленне спалучэнне рэалістычнага і авангарднага напрамкаў; рэтраспектыўная тэндэнцыя (асабліва ў культавым дойлідстве); імкненне да гарманічнага спалучэння гістарычнай забудовы, высокашчыльных шматпавярховых пабудоў жылых раёнаў, індывідуальнага будаўніцтва, рэкрэацыйна-паркававых зон; аднаўленне гістарычных цэнтраў гарадоў; шматфункцыянальнасць, шырокае выкарыстанне новых тэхнічных прыёмаў, канструкцый і матэрыялаў; адпаведнасць сучасным эстэтычным патрабаванням і гарманічнае ўпісанне праектаў у гарадское акружэнне; стварэнне грамадска-культурных, спартыўных і іншых значных аб'ектаў, транспартных камунікацый. Сярод буйных архітэктурных праектаў трэба назваць пабудовы В. Крамарэнкі і М. Вінаградава – чыгуначны вакзал у Мінску (2001 г.), Нацыянальная бібліятэка Беларусі (2006 г.), Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (2014 г.), М. Пірагова – Палац Рэспублікі (2000 г.), групы архітэктараў на чале з М. Гаўхфельдам – рэканструкцыя плошчы Незалежнасці з падземным грамадска-гандлёвым комплексам "Сталіца" (2006 г.), А. Зафатаева – рэканструкцыя Летняга амфітэатра ў Віцебску (2007 г.), В. Куцко, У. Будаева, А. Ніціеўскага, А. Шабаліна – спартыўны комплекс "Мінск-Арэна" (2009 г.), У. Архангельскага – Палац Незалежнасці у Мінску (2013 г.) і інш.

У цэлым, сучаснае культурнае жыццё Беларусі з'яўляецца даволі дынамічным, разнастайным у жанравых, стылістычных і тэматычных напрамках. Створаны належныя ўмовы для духоўнага ўдасканалення беларускага народа ў адпаведнасці з нацыянальнымі традыцыямі і агульначалавечымі каштоўнасцямі. Адбываецца інтэграцыя беларускай культуры ў сусветны культурны працэс і ўмацаванне пазітыўнага культурнага іміджу краіны.

**Паняцці**

**Глабалізацыя** – працэс сусветнай эканамічнай, палітычнай і культурнай уніфікацыі і інтэграцыі. У галіне культуры мае як станоўчыя (узаемаўзбагачэнне культур, шырокае азнаямленне з культурнымі здабыткамі), так і адмоўныя бакі (страта культурнай самабытнасці ў выніку акультурацыі і асіміляцыі).

**Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь** – найвышэйшая прэмія Беларусі. З'яўляецца вышэйшым прызнаннем заслуг дзеячаў навукі і тэхнікі, літаратуры, мастацтва і архітэктуры перад грамадствам і дзяржавай.

**Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь** – пералік аб'ектаў архітэктуры, гісторыі, археалогіі, мастацтва, паркавыя комплексы, музейныя калекцыі і кнігі, якія знаходзяцца пад дзяржаўнай аховай Рэспублікай Беларусь. У 2015 г. у яго былі ўключаны 5527 аб'ектаў і нематэрыяльных элементаў спадчыны.

**Званне “Герой Беларусі**” – найвышэйшая ступень адрознення ў Рэспубліцы Беларусь. Уведзена ў 1995 г. Прысвайваецца за выключныя заслугі перад дзяржавай і грамадствам, звязаныя з подзвігам, здзейсненым у імя свабоды, незалежнасці і росквіту краіны. Званне “Героя Беларусі” атрымалі вучоны і канструктар у галіне машынабудавання, акадэмік НАН Беларусі М. Высоцкі, народны мастак БССР і СССР, акадэмік Акадэміі мастацтваў СССР і НАН Беларусі М. Савіцкі, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі ў 1978–2013 гг., ганаровы Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт, біятланістка, трохразовая алімпійская чэмпіёнка 2014 г. Д. Домрачава і іншыя славутыя прадстаўнікі беларускага народа.

**Званне “Народны артыст Беларусі”** – ганаровае званне ў Рэспубліцы Беларусь. Прысвойваецца артыстам, рэжысёрам, балетмайстрам, дырыжорам, хормайстрам, музычным выканаўцам, якія стварылі высокамастацкія выявы, спектаклі, кінафільмы, тэлеспектаклі, тэлефільмы, канцэртныя, эстрадныя, цыркавыя праграмы, музычныя, тэлевізійныя і радыётворы, унеслі значны ўклад у айчынную культуру і атрымалі шырокае грамадскае прызнанне. Упершыню гэтае званне ў 1928 г. было нададзена У. Галубку. У незалежнай Рэспубліцы Беларусь званне атрымалі рэжысёры В. Раеўскі, Б. Луцэнка, кампазітары Э. Ханок, Э. Зарыцкі, А. Мдзівані, акцёры Г. Арлова, У. Гасцюхін, В. Манаеў, спевакі Я. Навуменка, В. Кавальчук, балерыны В. Гайко, Л. Кудраўцава і іншыя вядомыя дзеячы мастацтва.

**Званне “Народны мастак Беларусі”** – ганаровае званне ў Рэспубліцы Беларусь. Прысвойваецца мастакам, якія стварылі выдатныя творы жывапісу, скульптуры, графікі, манументальнага, дэкаратыўна-прыкладнага, тэатральнага, кіна- і тэлемастацтва, унеслі значны ўклад у айчынную культуру і атрымалі шырокае грамадскае прызнанне. Званне атрымалі І. Ахрэмчык, А. Бембель, В. Бялыніцкі-Біруля, В. Грамыка, Л. Гуміleўскі, П. Масленікаў, М. Савіцкі, С. Селіханаў, Л. Шчамялёў, А. Бараноўскі, І. Міско.

**Званне “Народны паэт Беларусі**” – ганаровае званне ў Рэспубліцы Беларусь. Уведзена ў 1956 г. Прысвойваецца за асаблівыя заслугі ў развіцці паэтычнай творчасці, стварэнне высокамастацкіх твораў, якія ўнеслі выдатны ўклад у айчынную літаратуру і атрымалі шырокае грамадскае прызнанне. Званне атрымалі Я. Купала, Я. Колас, П. Броўка, А. Куляшоў, М. Танк, П. Панчанка, Н. Гілевіч, Р. Барадулін.

**Званне “Народны пісьменнік Беларусі**” – ганаровае званне ў Рэспубліцы Беларусь. Уведзена ў 1956 г. Надаецца пісьменнікам, якія стварылі выдатныя творы мастацкай літаратуры і маюць вялікія дасягненні ў развіцці беларускай літаратуры. Званне атрымалі К. Крапіва, М. Лынькоў, І. Мележ, І. Шамякін, А. Макаёнак, В. Быкаў, Я. Брыль, І. Чыгрынаў, І. Навуменка.

**“Масавая культура”** – разнавіднасць культуры індустрыяльнага і постіндустрыяльнага грамадства. Ахоплівае культуру побыту, забавы і адпачынку, сродкі распаўсюджвання інфармацыі. Арыентавана на задавальненне культурных патрэб масавага спажыўца.

**Медаль Францыска Скарыны** – дзяржаўная ўзнагарода Беларусі. Заснавана ў 1989 г. Медалём узнагароджваюцца работнікі навукі, адукацыі і культуры за выдатныя дасягненні ў прафесійнай дзейнасці, значны асабісты ўклад у развіццё і павелічэнне духоўнага і інтэлектуальнага патэнцыялу, культурнай спадчыны беларускага народа.

**Нобелеўская прэмія** – адна з найбольш прэстыжных міжнародных узнагародаў, якая паводле волі яе заснавальніка А. Нобеля з 1901 г. штогод уручаецца за самыя значныя дасягненні ў навуцы і тэхніцы, культуры, грамадскай дзейнасці. На Беларусі нарадзіліся нобелеўскія лаўрэаты С. Кузнец, М. Бегін, Ж. Алфёраў. Беларуская пісьменніца С. Алексіевіч стала лаўрэатам Нобелеўскай прэміі па літаратуры 2015 г.

**Ордэн Францыска Скарыны** – адна з найвышэйшых дзяржаўных узнагарод у Рэспубліцы Беларусь. Заснавана ў 1995 г. Ордэнам узнагароджваюцца грамадзяне за значныя поспехі ў справе нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння Беларусі, дасягненні ў галіне нацыянальнай мовы, літаратуры, мастацтва, за прапаганду культурнай спадчыны, выключныя заслугі ў гуманітарнай і дабрачыннай дзейнасці. Ордэнам узнагароджаны ганаровы Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт, мастак М. Савіцкі, кампазітар В. Раінчык, дырыжор М. Фінберг, спевакі У. Мулявін, А. Ярмоленка, акцёры Р. Янкоўскі, Л. Пісарава, журналіст П. Якубовіч, гісторык У. Адамушка і іншыя знакамітыя дзеячы культуры, мастацтва, навукі.

**Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь** – найвышэйшыя прэміі Беларусі. Прысуджаюцца прадстаўнікам творчай інтэлігенцыі, дзеячам навукі, культуры і мастацтва, якія дабіліся значных вынікаў у творчай, культурна-асветніцкай, навуковай, педагагічнай дзейнасці, што атрымалі вялікае грамадскае прызнанне, а таксама спартсменам за значны ўклад у развіццё масавага фізкультурнага руху і спорту. Штогод прысуджаюцца прэміі “За духоўнае адраджэнне”, Спецыяльныя прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва, спецыяльная прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “Беларускі спартыўны Алімп”.

**Рэстаўрацыя** – аднаўленне ў першапачатковым (ці блізкім да першапачатковага) выглядзе помнікаў архітэктуры, выяўленчага і іншых відаў мастацтва, культуры.

**Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА** – пералік выдатных вусных традыцый і форм праяўлення нематэрыяльнай культурнай спадчыны, выканальніцкага мастацтва, звычаяў, абрадаў, святаў,

традыцыйных рамёстваў народаў свету. У яго ўключаны беларускі народны абрад “Калядныя цары” в. Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці.

**Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА** – пералік выдатных культурных і прыродных каштоўнасцей, якія складаюць здабытак усяго чалавецтва. У яго ўключаны аб’екты прыроднай і культурнай спадчыны Беларусі – Белавежская пушча, Мірскі замак, Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс, геадэзічная дуга Струвэ.

**ЮНЕСКА (Арганізацыя ААН па пытаннях адукацыі, навукі і культуры)** – міжнародная міжурадавая арганізацыя, спецыялізаваная арганізацыя ААН. Заснавана ў 1945 г. Беларусь уваходзіць у арганізацыю з 1954 г.

## Тэма 12. Культура беларускага замежжа

***Асноўныя этапы беларускай эміграцыі. Эвалюцыя ўзаемаадносін Бацькаўшчыны і дыяспары.*** Перасяленне беларусаў па-за межы этнічнай тэрыторыі назіралася на працягу многіх стагоддзяў, пачынаючы з сярэднявечча, і было выклікана эканамічнымі, палітычнымі і іншымі прычынамі. У перыяд ВКЛ людзі ўцякалі ў Расію ад сацыяльнага прыгнечання, нацыянальна-рэлігійнага ўціску, траплялі ў ваенны палон. У другой палове XVII ст. выхадцы з беларускіх і ўкраінскіх зямель складалі 20% насельніцтва Масквы, кампактна пражывалі ў Мяшчанскай слабадзе гэтага горада. Беларускія майстры прынеслі ў рускае мастацтва новыя рамёствы, тэхналогіі (паліхромную кафлю, ажурную разьбу, майстэрства ліцця гармат, вырабу зброі і інш.), узводзілі і аздаблялі палац у Каломенскім, Новадзявочы, Данскі і Нова-Іерусалімскі манастыры, церамы Маскоўскага Крамля і іншыя помнікі архітэктуры. Беларускія перасяленцы склалі тады касцяк трупы першага рускага тэатра.

У канцы XVIII–XIX стст. у далёкія рэгіёны Расійскай імперыі (Сібір, Поўнач, Казахстан, Далёкі Усход) высылаліся асуджаныя ўдзельнікі нацыянальна-вызваленчага руху, паўстанняў. Некаторыя з іх займаліся там даследаваннямі прыроды, культуры, побыту, мовы мясцовых народаў (І. Чэрскі, В. Кавалеўскі, Э. Пякарскі і інш.). Частка ўраджэнцаў беларускіх зямель, нязгодных з палітыкай царызму, выязджала на Захад. Некаторыя з іх уключыліся ў рэвалюцыйны і вызваленчы рух у Еўропе і Паўночнай Амерыцы (Т. Касцюшка, В. Урублеўскі, М. Судзілоўскі, З. Мінейка і інш.), садзейнічалі развіццю культуры, навукі краін свайго пражывання, займаліся творчай дзейнасцю (І. Дамейка, А. Міцкевіч, М. Агінскі, Н. Орда і інш.).

Аднак масавая эміграцыя з Беларусі пачалася толькі ў канцы XIX ст. Можна вылучыць некалькі этапаў (хваляў) масавай эміграцыі беларусаў:

1) канец XIX – пачатак XX стст. (дзеля заробкаў беларускія сяляне ехалі ў краіны Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі, Аўстралію, ва ўсходнім напрамку – паводле сталыпінскай аграрнай рэформы перасяляліся ў Сібір і іншыя далёкія рэгіёны Расійскай імперыі);

2) 1914–1939 гг. – з пачатку Першай сусветнай вайны і да пачатку Другой сусветнай вайны (бежанцы; эмігранты з Заходняй Беларусі – перасяляліся ў краіны Еўропы, Паўночнай і асабліва Паўднёвай Амерыкі; з БССР людзі перамяшчаліся добраахвотна (ехалі на будоўлі першых пяцігодак) ці прымусова (у ходзе палітычных рэпрэсій, высялення) па ўсёй прасторы СССР); у міжваенны час найбольшая нацыянальна-культурная дзейнасць беларускай эміграцыі назіралася ў Літве, Латвіі, Чэхаславакіі, ЗША, Францыі, Аргенціне, дзе існавалі беларускія арганізацыі, выдаваліся газеты і часопісы;

3) 1939–1991 гг. – хваля эміграцыі, выклiканая падзеямі Другой сувeтнай вайны, якая ў пасляваенныя дзесяцігоддзі мела нязначны памер (склаліся асноўныя цэнтры сучаснай заходняй беларускай дыяспары).

Нярэдка выдзяляюць яшчэ і хвалю эміграцыі 1990-х гг. пад уплывам негатыўных сацыяльна-эканамічных наступстваў распаду СССР і іншых прычын.

Паводле розных ацэнак, цяпер за межамі Рэспублікі Беларусь пражывае ад 2,5 да 3,5 мільёнаў беларусаў. Найбольш з іх знаходзіцца ў суседніх і гістарычна звязаных з Беларуссю краінах – Расіі, Украіне, краінах Балтыі (Літве, Латвіі, Эстоніі), Польшчы, Казахстане, Малдове. Беларуская дыяспара таксама прысутнічае ў ЗША, Канадзе, Вялікабрытаніі Аўстраліі, Аргенціне, Германіі, Францыі і іншых краінах свету.

Узаемаадносіны Бацькаўшчыны і беларускай дыяспары прайшлі складаную эвалюцыю. На працягу савецкага перыяду паняцце “беларуская дыяспара” не выкарыстоўвалася. Негатыўныя адносіны праяўляліся да заходняй дыяспары, якая ўтварылася пераважна ў межах хвалі эміграцыі, выкліканай падзеямі Другой сувeтнай вайны.

Толькі з канца 1980-х гг. пад уплывам працэсаў дэмакратызацыі і асабліва пасля абвяшчэння ў 1991 г. незалежнасці Рэспублікі Беларусь узаемаадносіны з беларусамі замежжа перайшлі на якасна новы ўзровень. У 1990 г. была створана міжнародная грамадская арганізацыя “Згуртаванне беларусаў свету”. Пашырыла сваю дзейнасць Беларускае таварыства па культурных сувязях з суайчыннікамі за мяжой (таварыства “Радзіма”). Разгарнуўся працэс гуртавання беларусаў у новых незалежных дзяржавах на постсавецкай прасторы. Пачаліся праводзіцца сходы, з’езды, сустрэчы беларусаў блізкага замежжа, краін Балтыі, Расіі. Адметнымі агульнанацыянальнымі мерапрыемствамі сталі з’езды беларусаў свету, якія праводзіліся ў Беларусі ў 1993, 1997, 2001, 2005, 2009, 2013 гг. з удзелам

прадстаўнікоў розных, але непадзельных састаўных частак беларускай дыяспары.

У Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца праграма супрацоўніцтва з беларусамі замежжа “Беларусы ў свеце”. Беларуская дыяспара разглядаецца як значны нацыянальны, інтэлектуальны, сацыяльна-культурны, дэмаграфічны і эканамічны рэсурс Рэспублікі Беларусь для развіцця гандлёва-эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва з замежнымі краінамі, павышэння міжнароднага прэстыжу беларускай дзяржавы, нацыянальнай культуры на міжнародным узроўні. Законам Рэспублікі Беларусь “Аб беларусах замежжа” ад 16 чэрвеня 2014 г. вызначаны асноўныя прынцыпы, мэты і напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў галіне адносін з беларусамі замежжа ў мэтах забеспячэння салідарнасці беларусаў ва ўсім свеце, захавання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларусаў замежжа і ўмацавання іх сувязей з Рэспублікай Беларусь.

Пры падтрымцы дзяржавы рэалізуюцца асобныя праекты па развіцці супрацоўніцтва з грамадскімі аб’яднаннямі беларусаў замежжа у галіне культуры, адукацыі. Праводзяцца шматлікія творчыя акцыі, конкурсы, народныя святы, адзначаюцца юбілеі вядомых суайчыннікаў, пастаянна аказваецца дапамога беларусам замежжа метадычнай літаратурай, касцюмамі, кнігамі, газетамі, часопісамі і інш., пачаў дзейнічаць Культурны цэнтр Беларусі ў Польшчы, адкрыты дзелавыя і культурныя цэнтры ў Расіі і іншых краінах. Арганізацыі беларускай дыяспары разглядаюцца ў якасці партнёраў у справе папулярызацыі нацыянальнай культуры за мяжой.

***Грамадска-культурная дзейнасць беларусаў замежжа (арганізацыі і цэнтры, друк, літаратура, мастацтва, навуковыя даследаванні).*** Беларуская дыяспара назапасіла ўжо багаты вопыт захавання роднай мовы, культуры, нацыянальнай самабытнасці, унесла свой уклад у папулярызацыю беларускай культуры, літаратуры, мастацтва. Гэтаму садзейнічалі створаныя ў замежжы працай і самаахвярнасцю многіх беларусаў грамадскія, культурна-асветніцкія, навуковыя, рэлігійныя арганізацыі, суполкі мастакоў, нацыянальны друк і асвета, культурныя цэнтры, музеі і архівы, мастацкія калектывы, пабудаваныя храмы. Асаблівую актыўнасць ў гэтым напрамку праяўляла беларуская дыяспара на Захадзе – у ЗША, Канадзе, Аўстраліі, Вялікабрытаніі, Францыі і іншых краінах. З пачатку 1990-х гг. ажывілася нацыянальна-культурная дзейнасць беларусаў і ў краінах на постсавецкай прасторы.

Паводле падлікаў В. Кіпеля, у ЗША у выніку трох хваль эміграцыі пасялілася больш за 600 тыс. беларусаў і іх нашчадкаў. Пасля Другой сусветнай вайны там быў створаны цэлы шэраг грамадскіх аб’яднанняў – Беларуска-амерыканскае задзіночанне (БАЗА), Арганізацыя беларуска-

амерыканскай моладзі, Беларуская жаночая арганізацыя, грамадска-культурныя цэнтры ў Саут-Рыверы, Чыкага і каля Кліўленда, Беларускі (Вялікалітоўскі) фонд імя Л. Сапегі, Фундацыя імя П. Крачэўскага і інш. Дзейнічае кафедральны сабор Св. К. Тураўскага ў Нью-Ёрку, у Саўт-Рыверы ў 1972 г. была пабудавана царква Св. Е. Полацкай, існавалі беларускія праваслаўныя прыходы ў шэрагу іншых амерыканскіх гарадоў, грэка-каталіцкая царква ў Чыкага.

Буйнейшым навуковым цэнтрам беларускай дыяспары на Захадзе стаў створаны ў 1951 г. у Нью-Ёрку Беларускі інстытут навукі і мастацтва (БІНіМ), які ажыццяўляе даследаванні ў галіне беларусістыкі, праводзіць навукова-асветніцкую і выдавецкую дзейнасць, кнігаабмен з многімі заходнімі ўніверсітэтамі і бібліятэкамі.

Беларусы ў ЗША наладзілі выданне шэрагу газет, часопісаў. БАЗА выдае з 1950 г. у Нью-Ёрку газету “Беларус”, якая распаўсюджваецца ў асяроддзі беларускай дыяспары свету. Сярод перыёдыкі вылучаюцца часопісы “Беларускі свет”, “Беларуская думка”, “Запісы”, “Полацак” і інш.

З 1982 г. БІНІМ узначаліў Вітаўт Кіпель. Яму належыць аўтарства фундаментальнага даследавання па гісторыі амерыканскай беларускай дыяспары – “Беларусы ў ЗША”, якое спачатку было апублікавана на англійскай мове, а ў 1933 г. яго беларускі пераклад выйшаў у Мінску. Разам са сваёй жонкай Зорай, якая была загадчыкам славянскага аддзела Нью-Ёркскай публічнай бібліятэкі, падрыхтаваў і выдаў некалькі даведнікаў, сярод якіх найбольш грунтоўным з’яўляецца “Бібліяграфія беларускага і беларусаведнага друку на Захадзе”.

Янка Запруднік доўгі час працаваў у беларускай службе радыё “Свабода”, рэдагаваў газету “Беларус”, напісаў цэлы шэраг прац па гісторыі Беларусі. У 1993 г. была выдадзена на англійскай мове яго кніга “Беларусь на гістарычных скрыжаваннях” (яе беларускі пераклад з’явіўся ў 1996 г.). Ім таксама быў падрыхтаваны англамоўны “Гістарычны слоўнік Беларусі” (Бостан, 1998), што выйшаў у вядомай серыі “Еўрапейскія гістарычныя слоўнікі”. На старонках гэтага выдання зацікаўлены чытач знойдзе звесткі па гісторыі, палітыцы, эканоміцы, археалогіі, мастацтве, рэлігіі і культуры Беларусі.

У свеце добра вядома імя вучонага Б. Кіта, які працаваў ў аэракасмічнай галіне ЗША, шмат зрабіў там для наладжвання нацыянальна-культурнага жыцця беларусаў. Актыўнай грамадскай дзейнасцю займаліся А. Шукелойць, С. Карніловіч і інш. Гісторыка-культуралагічныя даследаванні праводзіў В. Тумаш, мовазнаўчыя працы выдаваў Я. Станкевіч, некалькі навуковых прац па гісторыі беларускай музыкі напісаў кампазітар М. Куліковіч-Шчаглоў. Сярод літаратараў

вызначыліся паэты Н. Арсеннева, Я. Золак, перакладчык Я. Пятроўскі і іншыя дзеячы беларускай дыяспары.

Акрамя ЗША, у Паўночнай Амерыцы беларуская прысутнасць назіраецца ў Канадзе – каля 8 тыс. беларусаў (паводле перапісу насельніцтва 2011 г.). У 1948 г. было створана Згуртаванне беларусаў Канады. Грамадска-культурнай працай займаліся Беларускае нацыянальнае аб’яднанне, Беларускае задзіночанне ў Квебеку, Беларускі грамадскі цэнтр у Таронта, Беларускі саюз моладзі і іншыя арганізацыі. У Таронта дзейнічалі праваслаўныя прыходы. Сярод перыядычных выданняў трэба адзначыць газету “Беларускі голас”, часопіс “Зважай”. Сярод актывістаў у грамадскай працы вызначыліся В. і Р. Жук-Грышкевічы, І. Сурвіла і інш. Цяпер беларусістыкай займаецца З. Гімпелевіч.

У Аўстраліі пражывае каля 2 тыс. беларусаў (2011 г.), што сведчыць аб пашырэнні іх асіміляцыі на сучасным этапе. Аднак на працягу многіх дзесяцігоддзяў там дзейнічалі розныя грамадскія аб’яднанні, якія цяпер уваходзяць у Федэральную раду беларускіх арганізацый у Аўстраліі, праваслаўныя прыходы ў Мельбурне, Адэлаідзе і інш. Свой уклад у грамадска-культурнае жыццё беларусаў у гэтай далёкай ад Беларусі краіны ўнеслі М. Лужынскі, М. Раецкі, У. Шнэк, Я. Ролсан і інш.

У Вялікабрытаніі зараз пражывае каля 5 тыс. беларусаў (паводле ацэнкі А. Надсана). Адной са старэйшых арганізацый беларускага замежжа з’яўляецца Згуртаванне беларусаў Вялікабрытаніі, заснаванае ў 1946 г. У гэтай краіне існуюць праваслаўныя беларускія прыходы ў Лондане, Манчэстэры і Нотынгеме, у Лондане размяшчаецца Каталіцкая місія для замежных беларусаў-каталікаў. Сярод выданняў варта адзначыць часопіс “Голас часу”, англамоўны “Часопіс беларускіх даследаванняў” і інш. Некаторыя грамадска-культурныя аб’яднанні існуюць у Германіі (Згуртаванне беларусаў гэтай краіны і беларускі музей у г. Ляймене, адкрыты ў 1983 г.), Францыі (беларуская суполка “Хаўрус” у Парыжы, якую ўзначальваюць А. Гуджон, В. Шыманец).

Пасля БІНіМ у Нью-Ёрку другім навуковым цэнтрам заходняй беларускай дыяспары з’яўляецца Беларуская бібліятэка і музей імя Ф. Скарыны у Лондане. Заснавальнікам і кіраўніком з 1971 г. да сваёй смерці ў красавіку 2015 г. быў айцец А. Надсан, аўтар шэрагу даследаванняў пра малітоўную традыцыю К. Тураўскага, М. Радзівіл, Ч. Сіповіча, Друйскі кляштар марыянаў і інш. У бібліятэцы знаходзіцца каля 40 тыс. кніг, у тым ліку старадрукаў, рукапісаў беларусазнаўчай тэматыкі на розных мовах. Каштоўнымі калекцыямі кніг, манет, твораў мастацтва, этнаграфічных экспанатаў і іншых культурных артэфактаў выдзяляецца музей.

Прадстаўнікі мастацкай інтэлігенцыі беларускага замежжа ўзбагацілі сваёй творчасцю культурнае жыццё краін пражывання, пашыралі нацыянальную спадчыну на міжнародным узроўні. Мастакі В. Жаўняровіч, М. Навумовіч, У. Шыманец, Н. Кудасава, А. і Л. Махнюкі, Г. Русак, Т. Стагановіч-Кольба, Ю. Андрусішына і іншыя неаднаразова экспанавалі свае творы ў розных краінах свету. Прага, Варшава, Мілан і многія іншыя еўрапейскія гарады ў сярэдзіне XX ст. былі знаёмы з беларускімі песнямі дзякуючы творчасці опернага спевака Міхася Забэйды Суміцкага. З 1958 г. на працягу 27 гадоў у ЗША салістам хору данскіх казакоў С. Жарава з'яўляўся спявак Пётр Конюх, які выконваў і беларускія песні. У пасляваеннае дзесяцігоддзе займаўся музычнай творчасцю, арганізаваў хор беларускіх студэнтаў у Бельгіі кампазітар М. Равенскі. Папулярызатарам беларускай песні стаў народжаны ў ЗША бард Данчык (Багдан Андрусішын). Добра вядомы ў яго мілагучным выкананні песні "Беларусачка", "Зорка Венера", "Зорачкі", "Я ад Вас далёка …", "Аксамітны вечар" і інш.

Прадстаўнічай з'яўляецца беларуская дыяспара ў Польшчы: паводле вынікаў перапісу насельніцтва 2011 г. там пражывала 46 тыс. беларусаў, пераважна на Беласточчыне і Падляшшы. Нацыянальны грамадска-культурны рух у Польшчы пачаў разгортвацца ў другой палове 1950-х гг. У Беластоку ў 1956 г. створана Беларуска-грамадскае культурнае таварыства, друкаваным органам якога стала газета "Ніва". Там жа было заснавана літаратурнае аб'яднанне "Белавежа", з якім звязаны імёны пісьменнікаў і паэтаў А. Баршчэўскага, С. Яновіча, У. Гайдука, В. Шведа, Я. Чыквіна і інш. Можна сцвярджаць аб фарміраванні навуковай школы па вывучэнні гісторыі беларускага народа (Ю. Туронак, Я. і А. Мірановічы, А. Латышонак, А. Глагоўская і інш.). Значныя дасягненні ў вывучэнні беларусазнаўства маюць кафедра беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта, кафедра беларускай культуры Беластоцкага ўніверсітэта і некаторыя іншыя навуковыя пляцоўкі. Сярод грамадскіх аб'яднанняў трэба таксама назваць Беларускі саюз у Польшчы, Асацыяцыю беларускіх журналістаў, Беларускае гістарычнае таварыства, Задзіночанне беларускіх студэнтаў, Беларускае культурнае таварыства "Хатка" у Гданьску і інш.

Буйнымі цэнтрамі беларускай культуры і асветы ў Польшчы з'яўляюцца Бельск-Падляскі і Гайнаўка. У Бельску-Падляскім штогод праводзіцца фестываль беларускай аўтарскай песні "Бардаўская восень", дзейнічаюць самадзейныя музычныя калектывы, агульнаадукацыйны ліцэй з беларускай мовай навучання імя Б. Тарашкевіча, комплекс школаў з дадатковай беларускай мовай навучання. У Гайнаўцы дзейнічае музей і асяродак беларускай культуры. Родная мова як абавязковы прадмет прысутнічае ў гайнаўскім комплексе школаў (ліцэй і гімназія) з

дадатковым вывучэннем беларускай мовы. Таксама яе засвойваюць дзеці ў некалькіх дзесятках пачатковых школ Беласточчыны і Падляшша. Ужо сталі традыцыйнымі міжнародны фестываль царкоўнай музыкі ў Гайнаўцы, музычны фестываль "Басовішча" у Гарадку каля Беластока.

Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь, працэсы дэмакратызацыі і нацыянальна-культурнага адраджэння ў канцы XX – пачатку XXI стст. прывялі да актывізацыі грамадска-культурнай дзейнасці беларусаў у новых краінах на постсавецкай прасторы. З іх найбольшая колькасць беларусаў пражывае ў Расійскай Федэрацыі: паводле вынікаў перапісу насельніцтва 2010 г. – каля 520 тыс. чалавек. Касманаўты П. Клімук, У. Кавалёнак, А. Навіцкі, лаўрэат Нобелеўскай прэміі Ж. Алфёраў і многія іншыя беларусы ці выхадцы з Беларусі спаўна праявілі там свой талент у розных сферах жыццядзейнасці (палітыцы, навуцы, адукацыі, культуры, мастацтве, спорце), з'яўляюцца гонарам нашых брацкіх славянскіх народаў.

На сучасным этапе ў многіх рэгіёнах Расійскай Федэрацыі (Маскве і Маскоўскай вобласці, Санкт-Пецярбургу і вобласці, Карэліі, Сібіры і інш.) дзейнічаюць беларускія грамадска-культурныя аб'яднанні, клубы, зямляцтвы, нядзельныя школы, самадзейныя музычныя калектывы. У 1999 г. створаны іх каардынуючы орган – Федэральная нацыянальна-культурная аўтаномія беларусаў Расіі, якую цяпер узначальвае вядомы вучоны ў галіне ваеннай і сацыяльнай псіхалогіі, педагогікі С. Кандыбовіч. У працы яго VI з'езда ў маі 2015 г. прынялі ўдзел дэлегаты ад 29 нацыянальна-культурных аўтаномій, членаў гэтай структуры. Мэтамі і задачамі названага каардынуючага аб'яднання з'яўляюцца захаванне і развіццё самабытнасці беларусаў Расіі як прадстаўнікоў беларускага этнасу і як аднаго з народаў Расійскай Федэрацыі, іх культуры, мовы, народных традыцый, звычаяў, умацаванне сяброўства паміж народамі і ўзаемаўзбагачэнне іх культур, выхаванне падрастаючага пакалення беларусаў на прыкладах сваёй нацыянальнай гісторыі, культурных традыцый, духоўных і маральных каштоўнасцей.

Сярод шэрагу актыўных аб'яднанняў трэба адзначыць Іркуцкае таварыства беларускай культуры імя І. Чэрскага, пры якім створана 10 філіялаў ва Усходняй Сібіры, паспяхова дзейнічаюць 11 фальклорных ансамбляў, народны хор, 3 танцавальныя групы, маладзёжны і дзіцячы клубы, бібліятэка беларускай літаратуры. Да грамадска-культурнай справы актыўна далучаецца моладое пакаленне мясцовых беларусаў. Ініцыятар стварэння дадзенай арганізацыі ў Прыбайкаллі і яе першы старшыня А. Рудакоў патлумачыў гэта наступным чынам: "Мы выхоўвалі ў нашай моладзі гістарычны гонар за беларускі народ. … Мы тлумачым і вывучаем беларускую мову".

Сібірскія беларусы А. Сілівончык, М. Сулкоўскі і наш суайчыннік А. Лук’янчык з ЗША аказвалі фінансавую дапамогу ў стварэнні копіі нацыянальнай каштоўнасці – крыжа Е. Полацкай, Спаса-Ефрасіннеўскаму манастыру ў Полацку.

Намаганнямі М. Улашчыка, Я. Шыраева, А. Каўкі, В.ТГрыцкевіча, М. Нікалаева. Ю. Лабынцава, Л. Шчавінскай і многіх іншых вучоных, грамадскіх дзеячаў у Расіі праводзіліся і працягваюцца цяпер даследаванні гісторыі, культуры беларускага народа. Сярод беларускіх музеяў і грамадска-культурных цэнтраў трэба адзначыць мемарыяльны музей-кватэру Я. Купалы ў в. Печышчы ў Татарстане, музей М. Багдановіча ў Яраслаўлі, беларускі культурна-асветніцкі цэнтр імя Св. Е. Полацкай і цэнтр беларускай культуры ў Новасібірску і інш.

Адчувальная прысутнасць беларусаў у краінах Балтыі: у Літве – каля 43 тыс. чалавек (2001 г.), Латвіі – каля 67 тыс. чалавек (2015 г.), Эстоніі – каля 21 тыс. чалавек (1999 г.). Яны ўжо засведчылі сваё імкненне да захавання нацыянальна-культурнай тоеснасці. У Літве актыўна займаліся і працягваюць праводзіць грамадска-культурную працу Л. Луцкевіч, Х. Нюнька, А. Анішчык, Л. Плыгаўка, Г. Сівалава і іншыя беларускія дзеячы. Дзейнічаюць Згуртаванне беларускіх грамадскіх суполак Літвы, Таварыства беларускай культуры ў Літве, Таварыства беларускай школы, Таварыства беларускай мовы Віленскага краю, Згуртаванне беларускай моладзі Віленшчыны, Віленскі гарадскі клуб “Сябрына” і іншыя арганізацыі. Яны знаходзяцца не толькі ў Вільнюсе, але і ў шэрагу іншых гарадоў Літвы (Клайпеда, Каўнас, Шальчынінкай, Швянчоніс, Шаўляй, Друскенінкай, Вісагінас). Намаганнямі віленскіх беларусаў у 1994 г. была адкрыта ў Вільнюсе беларускамоўная гімназія імя Ф. Скарыны, якая прадоўжыла традыцыі знакамітай Віленскай беларускай гімназіі, што дзейнічала ў 1919–1944 гг. Класы з навучаннем на беларускай мове былі створаны ў Вісагінасе. Таксама рэалізуецца праект па навуковай рэканструкцыі былога беларускага музея ў Вільні.

У Латвіі існуюць Саюз беларусаў Латвіі, Таварыства беларускай мовы “Прамень”, Латвійскае таварыства беларускай культуры “Світанак”, Аб’яднанне мастакоў-беларусаў Балтыі “Маю гонар” і іншыя арганізацыі. Геаграфія іх размяшчэння – Рыга, Венстпілс, Даўгаўпілс і іншыя латвійскія гарады. З устаноў нацыянальнай адукацыі – Рыжская беларуская асноўная школа, якая пачала працу ў 1994 г. Сярод лідараў беларускай грамадска-культурнай дзейнасці ў Латвіі трэба адзначыць В. Целеша, В. Піскунову, І. Кузьміч і іншых самаадданых гэтай справе асоб.

У суседняй Эстоніі адной з першых арганізацый стала заснаванае ў 1989 г. Беларуска-эстонскае згуртаванне на чале з З. Клыга. Зараз там дзейнічаюць беларуска-эстонскае культурна-асветніцкае згуртаванне

"Спадчына" у Нарве, Беларускі цэнтр у Эстоніі, у Таліне працуе нядзельная школа беларускай культуры імя У. Караткевіча. Свой уклад у нацыянальна-культурнае адраджэнне ў гэтай краіне ўнёс беларускамоўны пісьменнік У. Дзехцярук, аўтар кнігі вершаў і апавяданняў "Сярод белых эстонскіх начэй".

Шматлікай з'яўляецца беларуская дыяспара ва Украіне – каля 276 тыс. чалавек (2001 г.). У 2000 г. быў створаны Усеўкраінскі саюз беларусаў, які выступае за захаванне і развіццё нацыянальнай культуры, побыту, традыцый беларускай культуры, папулярызацыю і вывучэнне дзецьмі беларускай мовы. Сярод яго ганаровых членаў класік беларускай літаратуры У. Караткевіч, які ў канцы 1940-х – 1950-я гг. вучыўся ва ўніверсітэце ў Кіеве і настаўнічаў на Кіеўшчыне, а таксама вядомыя прадстаўнікі навуковай, творчай інтэлігенцыі, грамадскія дзеячы Украіны, якія паходзяць з Беларусі. Зараз беларускія грамадскія аб'яднанні, зямляцтвы, суполкі дзейнічаюць як у Кіеве, так і ў Львове, Вінніцы, Данецку, Луганску, Жытоміры, Івана-Франкоўску, Палтаве, Харкаве, Чарнаўцах, Чарнігаве і многіх іншых гарадах Украіны. У 2009 г. быў адкрыты Цэнтр беларускай мовы і культуры ў Кіеўскім нацыянальным універсітэце імя Т. Шаўчэнкі. У в. Гусарка Запарожскай вобласці дзейнічае краязнаўчы музей беларускага побыту і прыкладнога мастацтва.

Сярод іншых краін СНД, дзе назіраецца нацыянальная грамадска-культурная дзейнасць, трэба адзначыць Казахстан (каля 112 тыс. беларусаў), Малдову (каля 6 тыс. беларусаў), Узбекістан (20 тыс. беларусаў). Яшчэ ў 1990-я гг. былі створаны культурныя цэнтры беларусаў у Астане, Паўладары, Карагандзе, Кастанаі, Усць-Каменагорску і іншых гарадах Казахстана. Цяпер таксама дзейнічаюць Рэгіянальнае грамадскае аб'яднанне "Беларускі культурны цэнтр" у Алматы, Фонд беларускай культуры "Спадчына" у Карагандзе, суполка Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны ў Прыазёрску, культурныя цэнтры "Беларусь" і "Радзіма". У сталіцы Малдовы – Кішынёве – існуюць Асацыяцыя "Беларусь", Беларускі культурны рух Малдовы, беларуская абшчына. Беларускія абшчыны, таварыствы беларускай культуры размешчаны ў шэрагу іншых гарадоў гэтай краіны. У Ташкенце дзейнічае Беларускі культурны цэнтр "Світанак".

Падсумоўваючы культурныя дасягненні беларускага замежжа, варта адзначыць і яго сучасныя праблемы: пашырэнне асіміляцыйных працэсаў ва ўмовах іншаэтнічнага асяроддзя, якія вядуць да страты нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларусаў; непрыхільнае стаўленне да нацыянальна-культурных патрэбаў беларусаў, абмежаванне іх грамадзянскіх правоў у шэрагу краін; адсутнасць у некаторых краінах свету арганізаванага грамадска-культурнага жыцця беларусаў, іх сувязей з

суайчыннікамі на Бацькаўшчыне; змена пакаленняў ў беларускай дыяспары, праяўленне часткай новых эмігрантаў з Беларусі нацыянальнага нігілізму і абыякавасці да грамадска-культурнай працы ў краінах свайго пражывання; патрабуецца сістэмны падыход адносна развіцця супрацоўніцтва з беларусамі замежжа з боку Рэспублікі Беларусь.

У цэлым, сумеснымі намаганнямі грамадскіх аб’яднанняў, неабыякавых беларусаў замежжа, пры падтрымцы дзяржаўных і грамадскіх структур Рэспублікі Беларусь беларуская дыяспара працягвае захоўваць сваю нацыянальна-культурную адметнасць. Культурныя здабыткі беларускай дыяспары з’яўляюцца неад’емнай часткай культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі. Беларусы блізкага і далёкага замежжа валодаюць велізарным культурным, навуковым і эканамічным патэнцыялам, працягваюць займацца папулярызацыяй дасягненняў беларускай культуры, мастацтва на міжнароднай арэне.

**Паняцці**

**“Беларус”** – газета. Выдаецца Беларуска-амерыканскім задзіночаннем з 1950 г. на беларускай мове ў Нью-Ёрку. Публікуюцца матэрыялы аб жыцці заходняй беларускай дыяспары, па гісторыі Беларусі, творы пісьменнікаў-эмігрантаў, успаміны і інш.

**Беларуска-амерыканскае задзіночанне (БАЗА)** – грамадская арганізацыя беларускай дыяспары ў ЗША. Узнікла ў 1949 г. у Брукліне. Займаецца захаваннем нацыянальна-культурных традыцый беларусаў.

**Беларуска-амерыканскі культурны цэнтр ў Саўт-Рыверы** – грамадская арганізацыя беларускай дыяспары ў ЗША. Заснаваны у 1972 г. пры царкве Св. Е. Полацкай. Наладжвае мастацкія выставы, праводзіць культурна-асветніцкую дзейнасць.

**Беларускае аб’яднанне ў Аўстраліі** – грамадская арганізацыя беларускай дыяспары. Заснавана ў 1950 г. у Сіднеі. Праводзіць культурна-асветніцкую дзейнасць.

**Беларускае грамадска-культурнае таварыства ў Польшчы** – грамадская арганізацыя беларускай дыяспары. Дзейнічае з 1956 г. у Беластоку. Выступае за адраджэнне, папулярызацыю культуры, гісторыі і традыцый беларусаў у Польшчы. Выдае газету “Ніва”, праводзіць культурна-асветніцкую дзейнасць.

**Беларускае літаратурнае таварыства “Белавежа”** – творчая арганізацыя. Заснавана ў 1958 г. у Беластоку. Аб’ядноўвае беларускіх пісьменнікаў Польшчы. Актыўны ўдзел у яго працы прымалі Я. Чыквін, В. Швед, А. Баршчэўскі, У. Гайдук, Н. Артымовіч, М. Лукша, С. Яновіч і іншыя беларускамоўныя аўтары. Займаецца друкаваннем мастацкіх твораў, выпускае часопіс “Тэрмапілы”.

**Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за мяжой (Беларускае таварыства “Радзіма”)** – грамадскае аб’яднанне. Створана ў 1964 г. у Мінску для падтрымання і пашырэння культурных сувязей з выхадцамі з Беларусі па-за межамі СССР. Праводзіць супрацоўніцтва з замежнымі аб’яднаннямі землякоў, асобнымі суайчыннікамі, выдае газету “Голас Радзімы”.

**Беларуская бібліятэка і музей імя Ф. Скарыны** – грамадска-культурная ўстанова у Лондане, заснавана ў 1979 г. У бібліятэцы, аснову якой склалі прыватныя зборы беларускіх святароў Ч. Сіповіча і Л. Гарошкі, захоўваецца каля 40 тыс. экз. кніг і камплектаў перыёдыкі: кнігі Ф. Скарыны, Статут ВКЛ 1588 г., кнігі друкарняў Беларусі XVI–XVIII стст., выданні і рукапісы беларускіх пісьменнікаў, дзеячаў культуры і мастацтва, эмігранцкіх аўтараў. У музеі экспануюцца слуцкія паясы, калекцыі нумізматыкі, народнага мастацтва, творы мастакоў К. Каганца, П. Сергіевіча, П. Мірановіча, М. Навумовіча і інш. Праводзіцца значная навукова-асветніцкая, выдавецкая праца.

**Беларускі інстытут навукі і мастацтва (БІНіМ) у Нью-Ёрку** – грамадская навукова-культурная арганізацыя беларускай эміграцыі ў ЗША. Заснаваны ў 1951 г. Друкаваны орган – навуковы штогоднік “Запісы”. Праводзіць разнастайныя беларусазнаўчыя даследаванні, навукова-асветніцкую і выдавецкую дзейнасць, міжнароднае супрацоўніцтва.

**Дыяспара –** частка народа (этнаса), якая пражывае па-за дзяржавай (гістарычнай тэрыторыяй) свайго паходжання, утварае згуртаваныя і ўстойлівыя этнічныя групы ў краіне пражывання, мае сацыяльныя інстытуты для захавання і развіцця сваёй ідэнтычнасці.

**Згуртаванне беларусаў Вялікабрытаніі –** грамадская арганізацыя беларускай дыяспары. Заснавана ў 1946 г.

**Згуртаванне беларусаў Канады** – грамадская арганізацыя беларускай дыяспары. Створана ў 1948 г. у Таронта.

**Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына”** – міжнароднае грамадскае аб’яднанне. Створана ў Мінску ў 1990 г. Займаецца каардынацыяй супрацоўніцтва з беларускай дыяспарай. З 1993 г. праводзіць з’езды беларусаў свету.

**Іркуцкае таварыства беларускай культуры імя І. Чэрскага** – грамадска-культурнае аб’яднанне беларускай дыяспары. Створана ў 1996 г. Праводзіць значную культурна-асветніцкую дзейнасць ва Усходняй Сібіры.

**Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы** – грамадская арганізацыя беларускай дыяспары ў Польшчы. Дзейнічае з 1984 г.

**“Ніва”** – газета. Выдаецца Беларускім грамадска-культурным таварыствам у Беластоку з 1956 г. на беларускай мове. Друкуюцца матэрыялы аб жыцці беларусаў у Польшчы.

**“Полацак”**– грамадска-культурны цэнтр беларускай дыяспары ў ЗША. Размешчаны каля г. Кліўленд. Заснаваны ў 1968 г. Праводзіць культурна-асветніцкую, дабрачынную дзейнасць.

**Таварыства беларускай культуры ў Літве** – грамадская арганізацыя беларускай дыяспары. Заснавана ў 1989 г. у Вільні.

**Федэральная нацыянальна-культурная аўтаномія беларусаў Расіі** – грамадская арганізацыя беларускай дыяспары. Створана ў 1999 г. Каардынуе дзейнасць рэгіянальных нацыянальна-культурных аўтаномій беларусаў (“Беларусы Масквы”, “Беларусы Югры” і інш.), беларускіх зямляцтваў, культурных цэнтраў і клубаў у Расіі, праводзіць працу па захаванні, развіцці і папулярызацыі ў расійскіх рэгёнах беларускай мовы, традыцый і нацыянальнай культуры.

**Дзеячы культуры, мастацтва**

**Грыцкевіч Валянцін Пятровіч** (1933–2013) – грамадскі дзеяч, гісторык. Адзін з заснавальнікаў і кіраўнік Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу. Аўтар прац па гісторыі культуры беларускай дыяспары, музеязнаўстве.

**Данчык (Андрусішын Багдан)** (1958 г.н.) – спявак, журналіст, грамадскі дзеяч беларускай дыяспары. Папулярызатар беларускай песні. Добра вядомы ў яго выкананні песні “Беларусачка”, “Мы адной табе належым”, “Я ад вас далёка” і інш.

**Забэйда-Суміцкі Міхаіл (Міхась) Іванавіч** (1900–1981) – спявак. Выступаў на сцэне Харбінскай оперы, удасканальваў майстэрства ў Мілане, спяваў у Познаньскім оперным тэатры, на варшаўскім радыё, з 1940 г. жыў у Празе, быў салістам Народнага тэатра, канцэртным выканаўцам. Яго рэпертуар ахопліваў песенныя і музычныя скарбы многіх народаў свету, найперш славянскіх. Папулярызатар беларускай музычнай спадчыны – “патрапіў вывесці беларускую народную песню ў шырокі свет” (паводле Р. Шырмы).

**Запруднік Янка (Сяргей Вільчыцкі)** (1926 г.н.) – грамадскі дзеяч беларускай дыяспары ў ЗША, публіцыст, гісторык. Аўтар даследавання “Беларусь на гістарычных скрыжаваннях”, даведачнага выдання “Гістарычны слоўнік Беларусі” і шэрагу іншых беларусазнаўчых прац, дакументальнай аповесці “Дванаццатка”.

**Кіпель Вітаўт** (1927 г.н.) – грамадскі дзеяч беларускай дыяспары ў ЗША, гісторык. З 1982 г. узначальвае БІНІМ у Нью-Ёрку. Аўтар манаграфіі “Беларусы ў ЗША” і іншых беларусазнаўчых прац. Разам з

жонкай З. Кіпель падрыхтаваў шэраг даведачных, бібліяграфічных выданняў: “Я. Купала і Я. Колас на Захадзе”, “Беларусістыка ў замежных мовах”, “Беларускі друк на Захадзе: 1920–1995”, “Бібліяграфія беларускага і беларусаведнага друку на Захадзе” і інш.

**Кіт (Кіта) Барыс Уладзіміравіч (**1910 г.н.) – грамадскі дзеяч беларускай дыяспары, матэматык, канструктар. Акадэмік Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі. Працаваў у аэракасмічнай галіне ЗША, выкладаў у заходніх універсітэтах. З 1972 г. жыве ў Германіі. Аўтар шэрагу прац па ракетным паліве, гісторыі савецкай касманаўтыкі. З 1972 г. – у Германіі. Заўсёды ганарыўся, што паходзіць з Беларусі, з беднай вёскі на Навагрудчыне.

**Надсан (Бочка) Аляксандр Антонавіч** (1926–2015) – грэка-каталіцкі святар, грамадскі дзеяч беларускай дыяспары ў Вялікабрытаніі. З’яўляўся апостальскім візітатарам для беларусаў-католікаў у замежжы. У 1971–2015 гг. быў дырэктарам бібліятэкі імя Ф. Скарыны ў Лондане. Аўтар шэрагу даследаванняў па гісторыі і культуры Беларусі, малітоўніка “Госпаду памолімся”, беларускага перакладу “Псалтыра”.

**Нікалаеў Мікалай Віктаравіч** (1955 г.н.) – грамадскі дзеяч, гісторык. Адзін са стваральнікаў Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу. Аўтар кніг “Беларускі Пецярбург”, “Палата кнігапісная”, “Гісторыя беларускай кнігі” і іншых даследаванняў па гісторыі культуры, мастацтва Беларусі.

**Равенскі Мікалай Якаўлевіч** (1886–1953) – кампазітар, дырыжор. Кіраваў хорам беларускіх студэнтаў у Бельгіі. Аўтар апрацовак беларускіх народных песень і песень на вершы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, К. Буйло і іншых беларускіх паэтаў, музыкі на тэксты царкоўных малітваў.

**Русак Галіна** (1930–2000) – мастак, грамадскі дзеяч беларускай дыяспары ў ЗША. Яе творы неаднаразова выстаўляліся ў розных галерэях свету.

**Стагановіч-Кольба Тамара** (1930 г.н.) – мастак. Прадстаўнік беларускай дыяспары ў ЗША. Наладзіла больш 100 выстаў у розных краінах свету. Аўтар партрэтаў, графічных прац.

**Тарасевіч Лявон** (1957 г.н.) – мастак, грамадскі дзеяч беларускай дыяспары ў Польшчы. Супрацоўнічае з прэстыжнымі мастацкімі галерэямі. Яго творы высока ацэньваюцца на міжнародных аўкцыёнах.

**Целеш Вячка (Вячаслаў) Міхайлавіч** (1938 г.н.) – мастак, пісьменнік. Прадстаўнік беларускай дыяспары ў Латвіі. Удзельнік больш чым 100 выстаў. Аўтар партрэтаў, экслібрысаў дзеячаў культуры Беларусі.

# ТЭМАТЫКА СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ

## Тэма 1. Культура, побыт, вераванні насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў эпоху першабытнасці

1. Першыя творы першабытнага мастацтва.
2. Татэмізм, фетышызм, анімізм як дахрысціянскія вераванні і ўяўленні.
3. Вытокі беларускага народнага календара.

***Літаратура***


1. Беларусы : у 8 т. – Т. 5. Сям'я. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 375 с.; Т. 7. Вусная паэтычная творчасць. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 586 с.
2. Беларускі народны каляндар / аўт.-уклад. А. Лозка. – Мінск : Полымя, 1993. – 205 с.
3. Гісторыя Беларусі : вучэб дапам. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Мацуля : у 2 ч. – Ч. 1. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 416 с.
4. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 1. – Мінск : Экаперспектыва, 2000. – 351 с.
5. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. – Т. 1. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 304 с.
6. Крук, Я. Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – Мінск : Беларусь, 2003. – 350 с.
7. Культура Беларусі : энцыкл. : у 6 т. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010–2015.
8. Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва : у 2-х т. – Т. 1. – Мінск : Беларусь, 2007. – 252 с.
9. Ліс, А. Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў: сістэма жанраў; эстэтычны аспект / А. Ліс – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 188 с.
10. Ліцьвінка, В. Д. Святы і абрады беларусаў / В. Д. Ліцьвінка. – 3-е выд. – Мінск : Беларусь, 2001. – 190 с.
11. Лыч, Л. М. Гісторыя культуры Беларусі са старажытных часоў да 1569 г. / Л. Лыч. – Віцебск : Выд-ва ВДТУ, 2005. – 122 с.
12. Народная культура Беларусі : энцыкл. давед. – Мінск : БелЭн, 2002. – 432 с.
13. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. – Ч. 1. – Мінск : Беларусь, 1994. – 527 с.
14. Парашкоў, С. А. Культура Старажытнай Беларусі ад засялення да сярэдзіны XIII ст. / С. А. Парашкоў – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2003. – 132 с.

**Тэма 2. Культура беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст.**

1. Увядзенне хрысціянства на Беларусі.

2 Дойлідства.

3. Пісьменнасць і помнікі пісьменства.

4. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

***Літаратура***


1. Архітэктура Беларусі : нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. – Т. 1. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 392 с.
2. Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. – Мінск : БелЭн, 1993. – 620 с.
3. Архітэктурныя помнікі Полацка / Т. А. Джумантаева. – Мінск : Беларусь, 2001. – 32 с.
4. Асветнікі зямлі беларускай X–XX ст. : энцыкл. давед. – Мінск : БелЭн, 2001. – 492 с.
5. Баландзін, К. І. Гісторыя культуры Беларусі : дапаможнік / К. І. Баландзін. – Мінск : БНТУ, 2014. – 239 с.
6. Гісторыя Беларусі : вучэб дапам. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Мацуля : у 2 ч. – Ч. 1. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 416 с.
7. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 1. – Мінск : Экаперспектыва, 2000. – 351 с.
8. Гісторыя беларускай літаратуры: старажытны перыяд. – Мінск : Выш. школа, 1998. – 351 с.
9. Казакова, І. В. Гісторыя культуры Беларусі : вучэб.-метад. дапам. для студэнтаў ВНУ / І. В. Казакова. – Мінск : РІВШ, 2009. – 71 с.
10. Качаноўскі, У. У. Гісторыя культуры Беларусі : вучэб. дапаможнік для студэнтаў ВНУ / У. У. Качаноўскі. – Мінск : Экаперспектыва, 1994. – 162 с.
11. Культура Беларусі : энцыкл. : у 6 т. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010–2015.
12. Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва : у 2-х т. – Т. 1. – Мінск : Беларусь, 2007. – 252 с.
13. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – 3-е выд., дап. – Мінск : Современная школа, 2008. – 511 с.
14. Лыч, Л. М. Гісторыя культуры Беларусі са старажытных часоў да 1569 г. / Л. Лыч. – Віцебск : Выд-ва ВДТУ, 2005. – 122 с.
15. Парашкоў, С. А. Гісторыя культуры Беларусі / С. А. Парашкоў. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 444 с.
16. Парашкоў, С. А. Культура Старажытнай Беларусі ад засялення да сярэдзіны XIII ст. / С. А. Парашкоў – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2003. – 132 с.
17. Страчаная спадчына. – Мінск : Беларусь, 2003. – 351 с.

18. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1984–1987.

19. Яскевіч, А. Падзвіжнікі і іх святыні : духоўная культура старажытнай Беларусі / А. Яскевіч. – Мінск : Полымя, 2001. – 367 с.

**Тэма 3. Культура беларускіх зямель у другой палове XIII – XV ст.**

1. Рукапісная кніга і летапісанне.
2. Дойлідства.
3. Выяўленчае мастацтва.

***Літаратура***

1. Архітэктура Беларусі : нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. – Т. 1. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 392 с.

2. Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. – Мінск : БелЭн, 1993. – 620 с.

3. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г. – Мінск : Народная асвета, 1985. – 463 с.

4. Баландзін, К. І. Гісторыя культуры Беларусі : дапаможнік / К. І. Баландзін. – Мінск : БНТУ, 2014. – 239 с.

5. Беларускія пісьменнікі : біябібліяграф. слоўнік : у 6 т. – Мінск, 1992–1995.

6. Вялікае княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. – Мінск : БелЭн, 2005–2006.

7. Гісторыя Беларусі : вучэб дапам. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Мацуля : у 2 ч. – Ч. 1. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 416 с.

8. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 2. – Мінск : Экоперспектива, 2008. – 688 с.

9. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. – Т. 1. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 304 с.

10. Гісторыя беларускай кнігі : у 2 т. – Т. 1. Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага / М. В. Нікалаеў. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – 424 с.

11. Качаноўскі, У. У. Гісторыя культуры Беларусі : вучэб. дапаможнік для студэнтаў ВНУ / У. У. Качаноўскі. – Мінск : Экаперспектыва, 1994. – 162 с.

12. Культура Беларусі : энцыкл. : у 6 т. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010–2015.

13. Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва : у 2-х т. – Т. 1. – Мінск : Беларусь, 2007. – 252 с.

14. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – 3-е выд., дап. – Мінск : Современная школа, 2008. – 511 с.

15. Лыч, Л. М. Гісторыя культуры Беларусі са старажытных часоў да 1569 г. / Л. Лыч. – Віцебск : Выд-ва ВДТУ, 2005. – 122 с.

16. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. – Ч. 1. – Мінск : Беларусь, 1994. – 527 с.

17. Парашкоў, С. А. Гісторыя культуры Беларусі / С. А. Парашкоў. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 444 с.

18. Страчаная спадчына. – Мінск : Беларусь, 2003. – 351 с.

19. Ткачоў, М. А. Замкі і людзі / М. А. Ткачоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 184 с.

20. Ткачоў, М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII – XVIII стст. / М. А. Ткачоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 142 с.

21. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1993–2001.

22. Яскевіч, А. Падзвіжнікі і іх святыні : духоўная культура старажытнай Беларусі / А. Яскевіч. – Мінск : Полымя, 2001. – 367 с.

**Тэма 4. Культура эпохі Адраджэння і Рэфармацыі на Беларусі (XVI ст.)**

1. Агульнае і адметнае ў айчынным і заходнееўрапейскім Рэнесансе.
2. Кнігадрукаванне.
3. Дойлідства.
4. Выяўленчае мастацтва.

***Літаратура***

1. Асветнікі зямлі беларускай X–XX ст. : энцыкл. давед. – Мінск : БелЭн, 2001. – 492 с.

2. Баландзін, К. І. Гісторыя культуры Беларусі : дапаможнік / К. І. Баландзін. – Мінск : БНТУ, 2014. – 239 с.

3. Беларускія пісьменнікі : біябібліяграф. слоўнік : у 6 т. – Мінск, 1992–1995.

4. Вялікае княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. – Мінск : БелЭн, 2005–2006.

5. Галенчанка, Г. Я. Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар / Г. Я. Галенчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 280 с.

6. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 2. – Мінск : Экоперспектива, 2008. – 688 с.

7. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. – Т. 1. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 304 с.

8. Гісторыя беларускай кнігі : у 2 т. – Т. 1. Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага / М. В. Нікалаеў. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – 424 с.

9. Дубянецкі, Э. Культуралогія : энцыкл. давед. / Э. Дубянецкі. – Мінск : БелЭн, 2003. – 384 с.

10. Качаноўскі, У. У. Гісторыя культуры Беларусі : вучэб. дапаможнік для студэнтаў ВНУ / У. У. Качаноўскі. – Мінск : Экаперспектыва, 1994. – 162 с.

11. Конан, У. М. Беларуская мастацкая культура эпохі Сярэдневякоўя і Рэнесансу / У. М. Конан. – Мінск : БДПУ, 2006. – 176 с.

12. Культура Беларусі : энцыкл. : у 6 т. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010–2015.

13. Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва : у 2-х т. – Т. 1. – Мінск : Беларусь, 2007. – 252 с.

14. Лазука, Б. А. Гісторыя мастацтваў : вучэб. дапам. / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2003. – 400 с.

15. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – 3-е выд., дап. – Мінск : Современная школа, 2008. – 511 с.

16. Лыч, Л. М. Гісторыя культуры Беларусі са старажытных часоў да 1569 г. / Л. М. Лыч. – Віцебск : Выд-ва ВДТУ, 2005. – 122 с.

17. Мысліцелі і асветнікі Беларусі : энцыкл. давед. – Мінск : БелЭн, 1995. – 671 с.

18. Парашкоў, С. А. Гісторыя культуры Беларусі / С. А. Парашкоў. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 444 с.

19. Саверчанка, І. Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока / І. Саверчанка. – Мінск : Тэхналогія, 1998. – 319 с.

20. Шматаў, В. Мастацтва беларускіх старадрукаў (XVI–XVIII стст.) / В. Шматаў. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – 131 с.

21. Шматаў, В. М. Беларуская кніжная гравюра XVI–XVIII стст. / В. М. Шматаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 183 с.

22. Шматов, В. Ф. Искусство книги Франциска Скорины / В. Ф. Шматов. – М. : Книга, 1990. – 207 с.

23. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1993–2001.

24. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1984–1987.

## Тэма 5. Культура Контррэфармацыі і барока. Асветніцтва на Беларусі

1. Асвета і навука.
2. Дойлідства.
3. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.
4. Музыка і тэатр.
5. Побыт.

***Літаратура***

1. Архітэктура Беларусі : нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. – Т. 2. – Мінск : Беларус. навука, 2006. – 626 с.

2. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г. – Мінск : Народная асвета, 1985. – 463 с.

3. Баландзін, К. І. Гісторыя культуры Беларусі : дапаможнік / К. І. Баландзін. – Мінск : БНТУ, 2014. – 239 с.

4. Барока ў беларускай культуры і мастацтве. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 308 с.

5. Беларускія пісьменнікі : біябібліяграф. слоўнік : у 6 т. – Мінск, 1992–1995.

6. Беларусы : у 8 т. – Т. 2. Дойлідства. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – 390 с.; Т. 8. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Грамадскія традыцыі. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 351 с.; Т. 11. Музыка. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 699 с.

7. Вялікае княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. – Мінск : БелЭн, 2005–2006.

8. Габрусь, Т. В. Мураваныя харалы: сакральная архітэктура беларускага барока / Т. В. Габрусь. – Мінск : Ураджай, 2001. – 287 с.

9. Гісторыя Беларусі : вучэб дапам. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Мацуля : у 2 ч. – Ч. 1. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 416 с.

10. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 3. – Мінск : Экаперспектыва, 2004. – 344 с.

11. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. – Т. 1. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 304 с.; Т. 2. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 384 с.

12. Гісторыя беларускага тэатра : у 3 т. – Т. 1. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 496 с.

13. Качаноўскі, У. У. Гісторыя культуры Беларусі : вучэб. дапаможнік для студэнтаў ВНУ / У. У. Качаноўскі. – Мінск : Экаперспектыва, 1994. – 162 с.

14. Культура Беларусі : энцыкл. : у 6 т. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010–2015.

15. Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва : у 2-х т. – Т. 1. – Мінск : Беларусь, 2007. – 252 с.; Т. 2. – Мінск : Беларусь, 2007. – 351 с.

16. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – 3-е выд., дап. – Мінск : Современная школа, 2008. – 511 с.

17. Лыч, Л. М. Гісторыя культуры Беларусі ў перыяд Рэчы Паспалітай (1569–1795 гг.) / Л. М. Лыч. – Віцебск : Выд-ва ВДТУ, 2006. – 166 с.

18. Мальдзіс, А. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: нарысы быту і звычаяў / А. Мальдзіс. – Мінск : Маст. літ., 1982. – 256 с.

19. Мысліцелі і асветнікі Беларусі : энцыкл. давед. – Мінск : БелЭн, 1995. – 671 с.

20. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. – Ч. 1. – Мінск : Беларусь, 1994. – 527 с.

21. Парашкоў, С. А. Гісторыя культуры Беларусі / С. А. Парашкоў. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 444 с.

22. Слуцкія паясы: адраджэнне традыцый / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2013. – 127 с.

23. Цеханавецкі, А. Міхал Казімір Агінскі і яго "сядзіба музаў" у Слоніме / А. Цеханавецкі. – Мінск : Беларусь, 1993. – 176 с.

24. Якімовіч, А. Ю. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся: XVII – XIX стст. / А. Ю. Якімовіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 152 с.

25. Яніцкая, М. М. Беларускае мастацкае шкло (XVI – XVIII стст.) / М. М. Яніцкая. – Мінск : Навука і тэхніка, 1977. – 88 с.

**Тэма 6. Культура беларускіх зямель у канцы XVIII – XIX ст.**

1. Асвета і навука.
2. Літаратура, друк, бібліятэкі.
3. Тэатр і музыка.
4. Дойлідства.
5. Выяўленчае мастацтва.
6. Матэрыяльная культура і побыт.

***Літаратура***

1. Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. – Мінск : БелЭн, 1993. – 620 с.

2. Баландзін, К. І. Гісторыя культуры Беларусі : дапаможнік / К. І. Баландзін. – Мінск : БНТУ, 2014. – 239 с.

3. Беларускае народнае жыллё. – Мінск : Навука і тэхніка, 1973. – 127 с.

4. Беларускае народнае адзенне. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 134 с.

5. Беларусь у малюнках Напалеона Орды. Другая палова XIX стагоддзя. – Мінск : Ураджай, 2001. – 143 с.

6. Гісторыя Беларусі : вучэб дапам. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Мацуля : у 2 ч. – Ч. 1. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 416 с.

7. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 4. – Мінск : Экаперспектыва, 2005. – 519 с.

8. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. – Т. 3. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 448 с.

9. Гісторыя беларускага тэатра : у 3 т. – Т. 1. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 496 с.

10. Дробаў, Л. М. Беларускія мастакі XIX стагоддзя / Л. М. Дробаў. – Мінск : Беларусь, 1971. – 111 с.

11. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі : Брэсцкая вобл.; Віцебская вобл.; Гомельская вобл.; Гродзенская вобл.; Магілёўская вобл.; Мінская вобл. – Мінск, 1984–1988.

12. Качаноўскі, У. У. Гісторыя культуры Беларусі : вучэб. дапаможнік для студэнтаў ВНУ / У. У. Качаноўскі. – Мінск : Экаперспектыва, 1994. – 162 с.

13. Кулагін, А. М. Каталіцкія храмы на Беларусі / А. М. Кулагін. – Мінск : БелЭн, 2000. – 216 с.

14. Кулагін, А. М. Праваслаўныя храмы на Беларусі / А. М. Кулагін. – Мінск : БелЭн, 2001. – 328 с.

15. Культура Беларусі : энцыкл. : у 6 т. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010–2015.

16. Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва : у 2-х т. – Т. 2. – Мінск : Беларусь, 2007. – 351 с.

17. Лазука, Б. А. Гісторыя мастацтваў : вучэб. дапам. / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2003. – 400 с.

18. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – 3-е выд., дап. – Мінск : Современная школа, 2008. – 511 с.

19. Лыч, Л. М. Гісторыя культуры Беларусі пад уладай Расійскай імперыі : (канец XVIII ст. – 1917 г.) / Л. М. Лыч. – Віцебск : Выд-ва ВДТУ, 2007. – 245 с.

20. Маленка, Л. І. Беларускі народны касцюм / Л. І. Маленка. – Мінск : Ураджай, 2001. – 160 с.

21. Народная культура Беларусі : энцыкл. давед. – Мінск : БелЭн, 2002. – 432 с.

22. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. – Ч. 1. – Мінск : Беларусь, 1994. – 527 с.

23. Несцярчук, Л. М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў (гісторыя, стан, перспектывы) / Л. М. Несцярук. – 2-е выд., дап. – Мінск : БЕЛТА, 2005. – 334 с.

24. Парашкоў, С. А. Гісторыя культуры Беларусі / С. А. Парашкоў. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 444 с.

25. Сахута, Я. Беларуская народная кераміка / Я. Сахута. – Мінск : Полымя, 1987. – 111 с.

26. Федорук, А. Т. Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т. Федорук. – Минск : БелЭн, 2004. – 576 с.

27. Цітоў, В. С. Народная спадчына: матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці / В. С. Цітоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 300 с.

**Тэма 7. Культура Беларусі ў пачатку ХХ ст.**

1. Друк. Кнігадрукаванне.
2. Асвета і навука.
3. Літаратура.
4. Музыка і тэатр.
5. Дойлідства.
5. Выяўленчае мастацтва.

***Літаратура***

1. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г. – Мінск : Народная асвета, 1985. – 463 с.
2. Баландзін, К. І. Гісторыя культуры Беларусі : дапаможнік / К. І. Баландзін. – Мінск : БНТУ, 2014. – 239 с.
3. Беларускія пісьменнікі : біябібліяграф. слоўнік : у 6 т. – Мінск, 1992–1995.
4. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. – Т. 3. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 448 с.
5. Гісторыя беларускага тэатра : у 3 т. – Т. 1. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 496 с.
6. Дубянецкі, Э. Культуралогія : энцыкл. давед. / Э. Дубянецкі. – Мінск : БелЭн, 2003. – 384 с.
7. Культура Беларусі : энцыкл. : у 6 т. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010–2015.
8. Гісторыя Беларусі : вучэб дапам. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Мацуля : у 2 ч. – Ч. 1. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 416 с.
9. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 4. – Мінск : Экаперспектыва, 2005. – 519 с.
10. Качаноўскі, У. У. Гісторыя культуры Беларусі : вучэб. дапаможнік для студэнтаў ВНУ / У. У. Качаноўскі. – Мінск : Экаперспектыва, 1994. – 162 с.
11. Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва : у 2-х т. – Т. 2. – Мінск : Беларусь, 2007. – 351 с.
12. Лыч, Л. М. Гісторыя культуры Беларусі пад уладай Расійскай імперыі : (канец XVIII ст. – 1917 г.) / Л. М. Лыч. – Віцебск : Выд-ва ВДТУ, 2007. – 245 с.
13. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. – Ч. 1. – Мінск : Беларусь, 1994. – 527 с.

14. Несцярчук, Л. М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў (гісторыя, стан, перспектывы) / Л. М. Несцярук. – 2-е выд., дап. – Мінск : БЕЛТА, 2005. – 334 с.

15. Нікалаеў, М. В. Беларускі Пецярбург / М. В. Нікалаеў. – Санкт-Пецярбург : Агентство “ВиТ-принт”, 2009. – 535 с.

16. Няфёд, У. Ігнат Буйніцкі – бацька беларускага тэатра: вачыма сучаснікаў і ў памяці нашчадкаў / У. Няфёд. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 123 с.

17. Парашкоў, С. А. Гісторыя культуры Беларусі / С. А. Парашкоў. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 444 с.

18. Тэатральная Беларусь : энцыкл. : у 2 т. – Т. 1. – Мінск : БелЭн, 2002. – 566 с.

19. Федорук, А. Т. Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т. Федорук. – Минск : БелЭн, 2004. – 576 с.

20. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1993–2001.

21. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1984–1987.

**Тэма 8. Культурнае жыццё ў БССР у 20–30-я гг. XX ст.**

1. Палітыка беларусізацыі.
2. Асвета і навука.
3. Дойлідства.
4. Выяўленчае мастацтва.
5. Музыка. Тэатр. Кіно.

***Літаратура***

1. Архітэктура Беларусі : нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. – Т. 4, кн. 2. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 790 с.

2. Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. – Мінск : БелЭн, 1993. – 620 с.

3. Баландзін, К. І. Гісторыя культуры Беларусі : дапаможнік / К. І. Баландзін. – Мінск : БНТУ, 2014. – 239 с.

4. Беларускія пісьменнікі : біябібліяграф. слоўнік : у 6 т. – Мінск, 1992–1995.

5. Беларусы : у 8 т. – Т. 12. Экраннае мастацтва. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 687 с.

6. Гісторыя Беларусі : вучэб дапам. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Мацуля : у 2 ч. – Ч. 2. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 464 с.

7. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 5. – Мінск : Экаперспектыва, 2006. – 613 с.

8. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. – Т. 4. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 352 с.

9. Гісторыя кінамастацтва Беларусі : у 4 т. – Т. 1. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 278 с.

10. Казакова, І. В. Гісторыя культуры Беларусі : вучэб.-метад. дапам. для студэнтаў ВНУ / І. В. Казакова. – Мінск : РІВШ, 2009. – 71 с.

11. Качаноўскі, У. У. Гісторыя культуры Беларусі : вучэб. дапаможнік для студэнтаў ВНУ / У. У. Качаноўскі. – Мінск : Экаперспектыва, 1994. – 162 с.

12. Культура Беларусі : энцыкл. : у 6 т. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010–2015.

13. Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва : у 2-х т. – Т. 1. – Мінск : Беларусь, 2007. – 252 с.; Т. 2. – Мінск : Беларусь, 2007. – 351 с.

14. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – 3-е выд., дап. – Мінск : Современная школа, 2008. – 511 с.

15. Лыч, Л. М. Гісторыя культуры Беларусі : (1917 – чэрвень 1941 г.) / Л. М. Лыч. – Віцебск : Выд-ва ВДТУ, 2007. – 193 с.

16. Музычны тэатр Беларусі: 1917–1959 гг. / И. В. Глушаков, Т. А. Дубкова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 432 с.

17. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. – Ч. 2. – Мінск : Беларусь, 1995. – 560 с.

18. Парашкоў, С. А. Гісторыя культуры Беларусі / С. А. Парашкоў. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 444 с.

19. Тэатральная Беларусь : энцыкл. : у 2 т. – Т. 1. – Мінск : БелЭн, 2002. – 566 с.; Т. 2. – Мінск : БелЭн, 2003. – 572 с.

20. Ходзін, С. М. Гісторыя культуры Беларусі ў 1920–1930-я гг. : дапам. для вузаў / С. М. Ходзін. – Мінск : БДУ, 2001. – 70 с.

21. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1993–2001.

22. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1984–1987.

**Тэма 9. Культура Заходняй Беларусі ў 1920–30-я гг.**

1. Асвета.
2. Гісторыка-этнаграфічныя даследаванні.
3. Літаратура і друк.
4. Мастацкая культура.

***Літаратура***

1. Архітэктура Беларусі : нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. – Т. 4, кн. 2. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 790 с.

2. Беларускія пісьменнікі : біябібліяграф. слоўнік : у 6 т. – Мінск, 1992–1995.

3. Вабішчэвіч, А. М. Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2004. – 116 с.

4. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2008. – 319 с.

5. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 5. – Мінск : Экаперспектыва, 2006. – 613 с.

6. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. – Т. 4. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 352 с.

7. Гісторыя беларускага тэатра : у 3 т. – Т. 2. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 607 с.

8. Культура Беларусі : энцыкл. : у 6 т. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010–2015.

9. Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва : у 2-х т. – Т. 2. – Мінск : Беларусь, 2007. – 351 с.

10. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. – Ч. 2. – Мінск : Беларусь, 1995. – 560 с.

11. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1993–2001.

12. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1984–1987.

**Тэма 10. Культурнае жыццё ў БССР у 1940–1980-я гг.**

1. Асвета і навука.
2. Літаратура.
3. Тэатр.
4. Музыка.
5. Кіно.
6. Выяўленчае мастацтва.
7. Дойлідства.

***Літаратура***

1. Архітэктура Беларусі : нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. – Т. 4, кн. 2. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 790 с.

2. Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. – Мінск : БелЭн, 1993. – 620 с.

3. Баландзін, К. І. Гісторыя культуры Беларусі : дапаможнік / К. І. Баландзін. – Мінск : БНТУ, 2014. – 239 с.

4. Гісторыя Беларусі : вучэб дапам. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Мацуля : у 2 ч. – Ч. 2. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 464 с.

5. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 6. – Мінск : Экаперспектыва, 2011. – 728 с.

6. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. – Т. 5. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 256 с.; Т. 6. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 376 с.

7. Гісторыя беларускага тэатра : у 3 т. – Т. 3, кн. 1. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 278 с.; Т. 3, кн. 2. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 431 с.

8. Гісторыя кінамастацтва Беларусі : у 4 т. – Т. 1. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 278 с.; Т. 2. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 372 с.; Т. 3. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 374 с.

9. Качаноўскі, У. У. Гісторыя культуры Беларусі : вучэб. дапаможнік для студэнтаў ВНУ / У. У. Качаноўскі. – Мінск : Экаперспектыва, 1994. – 162 с.

10. Кузьменко, В. И. В суровые сороковые: интеллигенция Беларуси в Великой Отечественной войне (1941–1945 гг.) / В. И. Кузьменко. – Минск : Ин-т ист. НАН Беларуси, 2006. – 260 с.

11. Культура Беларусі : энцыкл. : у 6 т. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010–2015.

12. Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва : у 2-х т. – Т. 2. – Мінск : Беларусь, 2007. – 351 с.

13. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – 3-е выд., дап. – Мінск : Современная школа, 2008. – 511 с.

14. Музычны тэатр Беларусі: 1917–1959 гг. / И. В. Глушаков, Т. А. Дубкова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 432 с.

15. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. – Ч. 2. – Мінск : Беларусь, 1995. – 560 с.

16. Парашкоў, С. А. Гісторыя культуры Беларусі / С. А. Парашкоў. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 444 с.

17. Современное белорусское кино. – Минск : Наука и техника, 1985. – 310 с.

18. Тэатральная Беларусь : энцыкл. : у 2 т. – Т. 1. – Мінск : БелЭн, 2002. – 566 с.; Т. 2. – Мінск : БелЭн, 2003. – 572 с.

19. Цітоў, В. С. Этнаграфічная спадчына: Беларусь: краіна і людзі / В. С. Цітоў. – 2-е выд. – Мінск : Беларусь, 2001. – 208 с.

20. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1993–2001.

21. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1984–1987.

**Тэма 11. Сучаснае культурнае жыццё Беларусі**

1. Заканадаўчая база.
2. Сучасная музычная культура на Беларусі.
3. Сучаснае выяўленчае мастацтва: асноўныя тэмы, імёны.
4. Сучаснае тэатральнае мастацтва Беларусі.
5. Сучаснае беларускае кіно.

6. Глабалізацыя і беларуская культура.

***Літаратура***

1. Архітэктура Беларусі : нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. – Т. 4, кн. 2. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 790 с.

2. Беларусы : у 8 т. – Т. 11. Музыка. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 699 с.; Т. 12. Экраннае мастацтва. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 687 с.

3. Гісторыя Беларусі : вучэб дапам. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Мацуля : у 2 ч. – Ч. 2. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 464 с.

4. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 6. – Мінск : Экаперспектыва, 2011. – 728 с.

5. Гісторыя кінамастацтва Беларусі : у 4 т. – Т. 4. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 335 с.

6. Дубянецкі, Э. Культуралогія : энцыкл. давед. / Э. Дубянецкі. – Мінск : БелЭн, 2003. – 384 с.

7. Культура Беларусі : энцыкл. : у 6 т. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010–2015.

8. Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва : у 2-х т. – Т. 2. – Мінск : Беларусь, 2007. – 351 с.

9. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – 3-е выд., дап. – Мінск : Современная школа, 2008. – 511 с.

10. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. – Ч. 2. – Мінск : Беларусь, 1995. – 560 с.

11. Парашкоў, С. А. Гісторыя культуры Беларусі / С. А. Парашкоў. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 444 с.

12. Слуцкія паясы: адраджэнне традыцый / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2013. – 127 с.

13. Тэатральная Беларусь : энцыкл. : у 2 т. – Т. 1. – Мінск : БелЭн, 2002. – 566 с.; Т. 2. – Мінск : БелЭн, 2003. – 572 с.

14. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1993–2001.

**Тэма 12. Культура беларускага замежжа**

1. Буйныя цэнтры беларускай дыяспары.

2. Эвалюцыя ўзаемаадносін Бацькаўшчыны і дыяспары.

3. Навуковыя даследаванні.

4. Друк. Літаратура. Мастацкае жыццё.

***Літаратура***

1. Беларуская дыяспара : нарысы гісторыі і сучаснага стану / БДУ, фак-т міжнар. адносін ; аўт.-склад.: М. М. Бацян [і інш.]. – Мінск : Трыалета, 2006. – 159 с.

2. Беларускае замежжа = Белорусское зарубежье. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – 479 с.

3. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 6. – Мінск : Экаперспектыва, 2011. – 728 с.

4. Кіпель, В. Беларусы ў ЗША / В. Кіпель. – Мінск : Беларусь, 1993. – 350 с.

5. Культура беларускага замежжа. – Кн. 1. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 191 с.; Кн. 2 – Мінск : Навука і тэхніка, 199 с.; Кн. 3 – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 192 с.

6. Нікалаеў, М. В. Беларускі Пецярбург / М. В. Нікалаеў. – Санкт-Пецярбург : Агентство “ВиТ-принт”, 2009. – 535 с.

7. Мальдис, А. И. Соотечественники : очерки о белорусах и уроженцах Беларуси, обогативших мировую культуру / А. Мальдис. – Минск : Звязда, 2013. – 335 с.

8. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. – Ч. 2. – Мінск : Беларусь, 1995. – 560 с.

9. Хто ёсць хто сярод беларусаў свету : энцыкл. давед. – Ч. 1. Беларусы і ўраджэнцы Беларусі ў памежных краінах. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2000. – 321 с.

10. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1993–2001.

## Кантрольныя пытанні да экзамену (заліку)

1. Творы мастацтва першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі.
2. Язычніцкія вераванні і ўяўленні.
3. Вытокі беларускага народнага календара. Фальклор.
4. Прынядце і распаўсюджванне хрысціянства, яго ўплыў на культуру беларускіх зямель (X – першая палова XIII ст.).
5. Дойлідства беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст.
6. Пісьменнасць і помнікі пісьменства беларускіх зямель (X – першая палова XIII ст.).
7. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі IX – першай паловы XIII ст.
8. Летапісанне, пісьмовыя помнікі Беларусі другой паловы XIII – XV ст.
9. Дойлідства Беларусі другой паловы XIII – XV ст.
10. Выяўленчае мастацтва Беларусі другой паловы XIII – XV ст.
11. Перадумовы, спецыфіка айчыннага Адраджэння і Рэфармацыі.
12. Нараджэнне кнігадрукавання на Беларусі (XVI ст.).
13. Дойлідства Беларусі эпохі Рэнесансу і Рэфармацыі.
14. Выяўленчае мастацтва Беларусі XVI ст.
15. Дойлідства Беларусі перыяду Контрэфармацыі і барока (канец XVI – першая палова XVIII ст.).
16. Выяўленчае мастацтва Беларусі канца XVI – першай паловы XVIII ст.
17. Музычнае і тэатральнае жыццё Беларусі (канец XVI – першая палова XVIII ст.).
18. Побыт (XVII – першая палова XVIII ст.).
19. Распаўсюджванне ідэй Асветніцтва на Беларусі.
20. Асвета і навука (другая палова XVIII ст.).
21. Музычнае і тэатральнае мастацтва Беларусі другой паловы XVIII ст.
22. Дойлідства і выяўленчае мастацтва Беларусі другой паловы XVIII ст.
23. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі (сярэдзіна і другая палова XVIII ст.).
24. Умовы, асноўныя накірункі развіцця культуры Беларусі ў канцы XVIII – XIX ст.
25. Асвета і навука (першая палова XIX ст.).
26. Тэатральнае і музычнае мастацтва Беларусі (першая палова XIX ст.).

27. Дойлідства і выяўленчае мастацтва Беларусі (першая палова XIX ст.).
28. Асвета і навука (другая палова XIX ст.).
29. Выяўленчае мастацтва Беларусі другой паловы XIX ст.
30. Дойлідства Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст.
31. Тэатр і музыка (другая палова XIX ст.).
32. Бібліятэкі, музеі на Беларусі ў XIX ст., іх лёс.
33. Традыцыйная культура беларусаў, іх побыт (XIX ст.).
34. Узмацненне шавінізму ў палітыцы царызму ў пачатку XX ст.
35. Друк Беларусі ў пачатку XX ст. Газета "Наша ніва".
36. Музычнае, тэатральнае мастацтва Беларусі пачатку XX ст.
37. Выяўленчае мастацтва Беларусі пачатку XX ст.
38. Асвета і навука (пачатак XX ст.).
39. Палітыка беларусізацыі (1920-я гг.).
40. Інстытут беларускай культуры. Развіццё навукі (1920-я гг.).
41. Выяўленчае мастацтва БССР (1920-я гг.).
42. Музычнае і тэатральнае мастацтва БССР у 1920-я гг. Нараджэнне беларускага кіно.
43. Дойлідства і выяўленчае мастацтва БССР (канец 1920-х – пачатак 1940-х гг.).
44. Тэатр, музыка і кіно БССР (канец 1920-х – пачатак 1940-х гг.).
45. Асвета. Гісторыка-этнаграфічныя даследаванні ў Заходняй Беларусі (1920–1930-я гг.).
46. Мастацкая культура Заходняй Беларусі (1920–1930-я гг.).
47. Культурнае жыццё на Беларусі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.
48. Стан асветы, навукі Беларусі (другая палова 1950-х – сярэдзіна 1980-х гг.).
49. Мастацкае і літаратурнае жыццё Беларусі другой паловы 1950-х – сярэдзіны 1980-х гг.
50. Мастацкае жыццё Беларусі на сучасным этапе.
51. Навуковыя даследаванні беларускай дыяспары. Грамадска-культурныя арганізацыі і цэнтры.
52. Друк. Літаратурнае і мастацкае жыццё беларускага замежжа.

# ЛІТАРАТУРА

***Вучэбныя дапаможнікі***

1. Баландзін, К. І. Гісторыя культуры Беларусі : дапаможнік / К. І. Баландзін. – Мінск : БНТУ, 2014. – 239 с.
2. Гісторыя Беларусі : вучэб дапам. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Мацуля : у 2 ч. – Ч. 1. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 416 с.; Ч. 2. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 464 с.
3. Казакова, І. В. Гісторыя культуры Беларусі : вучэб.-метад. дапам. для студэнтаў ВНУ / І. В. Казакова. – Мінск : РІВШ, 2009. – 71 с.
4. Качаноўскі, У. У. Гісторыя культуры Беларусі : вучэб. дапаможнік для студэнтаў ВНУ / У. У. Качаноўскі. – Мінск : Экаперспектыва, 1994. – 162 с.
5. Лазука, Б. А. Гісторыя мастацтваў : вучэб. дапам. / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2003. – 400 с.
6. Лыч, Л. М. Гісторыя культуры Беларусі : (1917 – чэрвень 1941 г.) / Л. М. Лыч. – Віцебск : Выд-ва ВДТУ, 2007. – 193 с.
7. Лыч, Л. М. Гісторыя культуры Беларусі пад уладай Расійскай імперыі : (канец XVIII ст. – 1917 г.) / Л. М. Лыч. – Віцебск : Выд-ва ВДТУ, 2007. – 245 с.
8. Лыч, Л. М. Гісторыя культуры Беларусі са старажытных часоў да 1569 г. / Л. Лыч. – Віцебск : Выд-ва ВДТУ, 2005. – 122 с.
9. Лыч, Л. М. Гісторыя культуры Беларусі ў перыяд Рэчы Паспалітай (1569–1795 гг.) / Л. Лыч. – Віцебск : Выд-ва ВДТУ, 2006. – 166 с.
10. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – 3-е выд., дап. – Мінск : Современная школа, 2008. – 511 с.
11. Парашкоў, С. А. Гісторыя культуры Беларусі / С. А. Парашкоў. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 444 с.
12. Ходзін, С. М. Гісторыя культуры Беларусі ў 1920–1930-я гг. : дапам. для вузаў / С. М. Ходзін. – Мінск : БДУ, 2001. – 70 с.

***Манаграфічная і даведачная літаратура***

1. Архітэктура Беларусі : нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. – Т. 1. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 392 с.; Т. 2. – Мінск : Беларус. навука, 2006. – 626 с.; Т. 3, кн. 1. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – 502 с.; Т. 3, кн. 2. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – 549 с.; Т. 4, кн. 1. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 495 с.; Т. 4, кн. 2. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 790 с.
2. Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. – Мінск : БелЭн, 1993. – 620 с.
3. Архітэктурныя помнікі Полацка / Т. А. Джумантаева. – Мінск : Беларусь, 2001. – 32 с.
4. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г. – Мінск : Народная асвета, 1985. – 463 с.

5. Асветнікі зямлі беларускай X–XX ст. : энцыкл. давед. – Мінск : БелЭн, 2001. – 492 с.

6. Барока ў беларускай культуры і мастацтве. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 308 с.

7. Беларускае замежжа = Белорусское зарубежье. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – 479 с.

8. Беларускае народнае адзенне. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 134 с.

9. Беларускае народнае жыллё. – Мінск : Навука і тэхніка, 1973. – 127 с.

10. Беларуская дыяспара : нарысы гісторыі і сучаснага стану / БДУ, фак-т міжнар. адносін ; аўт.-склад.: М. М. Бацян [і інш.]. – Мінск : Трыалета, 2006. – 159 с.

11. Беларускі народны каляндар / аўт.-уклад. А. Лозка. – Мінск : Полымя, 1993. – 205 с.

12. Беларускія пісьменнікі : біябібліяграф. слоўнік : у 6 т. – Т. 1. – Мінск : БелЭн, 1992. – 542 с.; Т. 2. – Мінск : БелЭн, 1993. – 541 с.; Т. 3. – Мінск : БелЭн, 1994. – 585 с.; Т. 4. – Мінск : БелЭн, 1994. – 524 с.; Т. 5. – Мінск : БелЭн, 1995. – 480 с.; Т. 6. – Мінск : БелЭн, 1995. – 684 с.

13. Беларусы : у 8 т. – Т. 1. Прамысловыя і рамесныя заняткі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 351 с.; Т. 2. Дойлідства. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – 390 с.; Т. 4. Вытокі і этнічнае развіццё. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 433 с.; Т. 5. Сям'я. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 375 с.; Т. 7. Вусная паэтычная творчасць. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 586 с.; Т. 8. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Грамадскія традыцыі. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 351 с.; Т. 10. Славянскія этнакультурныя традыцыі. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – 514 с.; Т. 11. Музыка. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 699 с.; Т. 12. Экраннае мастацтва. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 687 с.

14. Беларусь у малюнках Напалеона Орды. Другая палова XIX стагоддзя. – Мінск : Ураджай, 2001. – 143 с.

15. Вабішчэвіч, А. М. Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2004. – 116 с.

16. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2008. – 319 с.

17. Вялікае княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. – Т. 1. – Мінск : БелЭн, 2005. – 687 с.; Т. 2. – Мінск : БелЭн, 2006. – 790 с.; Т. 3. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – 694 с.

18. Габрусь, Т. В. Мураваныя харалы: сакральная архітэктура беларускага барока / Т. В. Габрусь. – Мінск : Ураджай, 2001. – 287 с.

19. Галенчанка, Г. Я. Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар / Г. Я. Галенчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 280 с.

20. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 1. – Мінск : Экаперспектыва, 2000. – 351 с.; Т. 2. – Мінск : Экоперспектива, 2008. – 688 с.; Т. 3. – Мінск : Экаперспектыва,

2004. – 344 с.; Т. 4. – Мінск : Экаперспектыва, 2005. – 519 с.; Т. 5. – Мінск : Экаперспектыва, 2006. – 613 с.; Т. 6. – Мінск : Экаперспектыва, 2011. – 728 с.

21. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. – Т. 1. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 304 с.; Т. 2. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 384 с.; Т. 3. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 448 с.; Т. 4. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 352 с.; Т. 5. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 256 с.; Т. 6. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 376 с.

22. Гісторыя беларускага тэатра : у 3 т. – Т. 1. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 496 с.; Т. 2. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 607 с.; Т. 3, кн. 1. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 278 с.; Т. 3, кн. 2. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 431 с.

23. Гісторыя беларускай кнігі : у 2 т. – Т. 1. Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага / М. В. Нікалаеў. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – 424 с.; Т. 2. Кніжнасць новай Беларусі / М. В. Нікалаеў [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – 436 с.

24. Гісторыя беларускай літаратуры: старажытны перыяд. – Мінск : Выш. школа, 1998. – 351 с.

25. Гісторыя кінамастацтва Беларусі : у 4 т. – Т. 1. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 278 с.; Т. 2. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 372 с.; Т. 3. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 374 с.; Т. 4. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 335 с.

26. Дробаў, Л. М. Беларускія мастакі ХІХ стагоддзя / Л. М. Дробаў. – Мінск : Беларусь, 1971. – 111 с.

27. Дубянецкі, Э. Культуралогія : энцыкл. давед. / Э. Дубянецкі. – Мінск : БелЭн, 2003. – 384 с.

28. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі : Брэсцкая вобласць. – Мінск : БелСЭ, 1984. – 368 с.; Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі : Віцебская вобласць. – Мінск : БелСЭ, 1985. – 496 с.; Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі : Гомельская вобласць. – Мінск : БелСЭ, 1985. – 384 с.; Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі : Гродзенская вобласць. – Мінск : БелСЭ, 1986. – 317 с.; Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі : Магілеўская вобласць. – Мінск : БелСЭ, 1986. – 407 с.; Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі : Мінская вобласць. – Мінск : БелСЭ, 1987. – 308 с.; Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі : Мінск. – Мінск : БелСЭ, 1988. – 333 с.

29. Кіпель, В. Беларусы ў ЗША / В. Кіпель. – Мінск : Беларусь, 1993. – 350 с.

30. Конан, У. М. Беларуская мастацкая культура эпохі Сярэдневякоўя і Рэнесансу / У. М. Конан. – Мінск : БДПУ, 2006. – 176 с.

31. Крук, Я. Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – Мінск : Беларусь, 2003. – 350 с.

32. Кузьменко, В. И. В суровые сороковые: интеллигенция Беларуси в Великой Отечественной войне (1941–1945 гг.) / В. И. Кузьменко. – Минск : Ин-т ист. НАН Беларуси, 2006. – 260 с.

33. Кулагін, А. М. Каталіцкія храмы на Беларусі / А. М. Кулагін. – Мінск : БелЭн, 2000. – 216 с.

34. Кулагін, А. М. Праваслаўныя храмы на Беларусі / А. М. Кулагін. – Мінск : БелЭн, 2001. – 328 с.

35. Культура Беларусі : энцыкл. : у 6 т. – Т. 1. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – 703 с.; Т. 2. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – 543 с.; Т. 3. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2012. – 687 с.; Т. 4. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2013. – 660 с.; Т. 5. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2014. – 663 с.; Т. 6. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2015. – 485 с.

36. Культура беларускага замежжа. – Кн. 1. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 191 с.; Кн. 2 – Мінск : Навука і тэхніка, 199 с.; Кн. 3 – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 192 с.

37. Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва : у 2-х т. – Т. 1. – Мінск : Беларусь, 2007. – 252 с.; Т. 2. – Мінск : Беларусь, 2007. – 351 с.

38. Лакотка, А. І. Драўлянае сакральна-манументальнае дойлідства Беларусі / А. І. Лакотка. – Мінск : Беларусь, 2003. – 63 с.

39. Ліс, А. Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў: сістэма жанраў; эстэтычны аспект / А. Ліс – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 188 с.

40. Ліцьвінка, В. Д. Святы і абрады беларусаў / В. Д. Ліцьвінка. – 3-е выд. – Мінск : Беларусь, 2001. – 190 с.

41. Маленка, Л. І. Беларускі народны касцюм / Л. І. Маленка. – Мінск : Ураджай, 2001. – 160 с.

42. Мальдзіс, А. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: нарысы быту і звычаяў / А. Мальдзіс. – Мінск : Маст. літ., 1982. – 256 с.

43. Мальдис, А. И. Соотечественники : очерки о белорусах и уроженцах Беларуси, обогативших мировую культуру / А. Мальдис. – Минск : Звязда, 2013. – 335 с.

44. Музычны тэатр Беларусі: 1917–1959 гг. / И. В. Глушаков, Т. А. Дубкова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 432 с.

45. Мысліцелі і асветнікі Беларусі : энцыкл. давед. – Мінск : БелЭн, 1995. – 671 с.

46. Народная культура Беларусі : энцыкл. давед. – Мінск : БелЭн, 2002. – 432 с.

47. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. – Ч. 1. – Мінск : Беларусь, 1994. – 527 с.; Ч. 2. – Мінск : Беларусь, 1995. – 560 с.

48. Несцярчук, Л. М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў (гісторыя, стан, перспектывы) / Л. М. Несцярук. – 2-е выд., дап. – Мінск : БЕЛТА, 2005. – 334 с.

49. Нікалаеў, М. В. Беларускі Пецярбург / М. В. Нікалаеў. – Санкт-Пецярбург : Агентство “ВиТ-принт”, 2009. – 535 с.

50. Няфёд, У. Ігнат Буйніцкі – бацька беларускага тэатра: вачыма сучаснікаў і ў памяці нашчадкаў / У. Няфёд. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 123 с.

51. Парашкоў, С. А. Культура Старажытнай Беларусі ад засялення да сярэдзіны XIII ст. / С. А. Парашкоў – Магілеў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2003. – 132 с.

52. Саверчанка, І. Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока / І. Саверчанка. – Мінск : Тэхналогія, 1998. – 319 с.

53. Сахута, Я. Беларуская народная кераміка / Я. Сахута. – Мінск : Полымя, 1987. – 111 с.

54. Слуцкія паясы: адраджэнне традыцый / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2013. – 127 с.

55. Современное белорусское кино. – Минск : Наука и техника, 1985. – 310 с.

56. Страчаная спадчына. – Мінск : Беларусь, 2003. – 351 с.

57. Ткачоў, М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII – XVIII стст. / М. А. Ткачоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 142 с.

58. Ткачоў, М. А. Замкі і людзі / М. А. Ткачоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 184 с.

59. Тэатральная Беларусь : энцыкл. : у 2 т. – Т. 1. – Мінск : БелЭн, 2002. – 566 с.; Т. 2. – Мінск : БелЭн, 2003. – 572 с.

60. Федорук, А. Т. Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т. Федорук. – Минск : БелЭн, 2004. – 576 с.

61. Францыск Скарына і яго час : энцыкл. давед. – Мінск : БелСЭ, 1988. – 608 с.

62. Хто ёсць хто сярод беларусаў свету : энцыкл. давед. – Ч. 1. Беларусы і ўраджэнцы Беларусі ў памежных краінах. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2000. – 321 с.

63. Цеханавецкі, А. Міхал Казімір Агінскі і яго “сядзіба музаў” у Слоніме / А. Цеханавецкі. – Мінск : Беларусь, 1993. – 176 с.

64. Цітоў, В. С. Народная спадчына: матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці / В. С. Цітоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 300 с.

65. Цітоў, В. С. Этнаграфічная спадчына: Беларусь: краіна і людзі / В. С. Цітоў. – 2-е выд. – Мінск : Беларусь, 2001. – 208 с.

66. Шматаў, В. М. Беларуская кніжная гравюра XVI–XVIII стст. / В. М. Шматаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 183 с.

67. Шматаў, В. Мастацтва беларускіх старадрукаў (XVI–XVIII стст.) / В. Шматаў. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – 131 с.

68. Шматов, В. Ф. Искусство книги Франциска Скорины / В. Ф. Шматов. – М. : Книга, 1990. – 207 с.

69. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Т. 1. – Мінск : БелЭн, 1993. – 496 с.; Т. 2. – Мінск : БелЭн, 1994. – 539 с.; Т. 3. – Мінск : БелЭн, 1996. – 524 с.; Т. 4. – Мінск : БелЭн, 1997. – 431 с.; Т. 5. – Мінск : БелЭн, 1999. – 591 с.; Т. 6, кн. 1. – Мінск : БелЭн, 2001. – 591 с.; Т. 6, кн. 2. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2003. – 615 с.

70. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Т. 1. – Мінск : БелСЭ, 1984. – 727 с.; Т. 2. – Мінск : БелСЭ, 1985. – 702 с.; Т. 3. – Мінск : БелСЭ, 1986. – 751 с.; Т. 4. – Мінск : БелСЭ, 1987. – 742 с.; Т. 5. – Мінск : БелСЭ, 1987. – 703 с.

71. Якімовіч, А. Ю. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся: XVII – XIX стст. / А. Ю. Якімовіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 152 с.

72. Яніцкая, М. М. Беларускае мастацкае шкло (XVI – XVIII стст.) / М. М. Яніцкая. – Мінск : Навука і тэхніка, 1977. – 88 с.

73. Яскевіч, А. Падзвіжнікі і іх святыні : духоўная культура старажытнай Беларусі / А. Яскевіч. – Мінск : Полымя, 2001. – 367 с.

### *Пералік карысных сайтаў*

1. Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь http://www.kultura.by/
2. Дзяржаўная ўстанова “Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа”, г. Віцебск http://kolastheatre.by/
3. Дзяржаўная ўстанова “Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы”, г. Мінск http://kupalauski.by/
4. Дзяржаўная ўстанова “Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага”, г. Мінск http://www.rustheatre.by/
5. Дзяржаўная ўстанова “Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі”, г. Мінск http://rtbd.by/
6. Дзяржаўная тэатральна-відовішчная ўстанова “Маладзёжны тэатр эстрады”, г. Мінск http://www.estrada.by/
7. Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, г. Мінск www.buk.by
8. Установа адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі”, г. Мінск http://www.bgam.edu.by/
9. Установа адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”, г. Мінск http://bdam.by/by/
10. Інстытут культуры Беларусі http://inbelkult.by/by/
11. Праект “Музеі Беларусі” http://museum.by/
12. Установа “Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь”, г. Мінск http://artmuseum.by/
13. Дзяржаўная ўстанова “Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі”, г. Мінск http://history.museum.by/be
14. Установа “Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны”, г. Мінск http://war.museum.by/be

15. Дзяржаўная ўстанова "Мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой" http://fortress.brest.museum.by/

16. Дзяржаўная ўстанова "Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік "Нясвіж" http://nesvizh-zapovednik.by/

17. Установа "Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы", г. Мінск http://kupala-museum.by/

18. Установа "Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа", г.Мінск http://kolas.museum.by/be

19. Дзяржаўная ўстанова "Літаратурны музей М. Багдановіча", г. Мінск http://bagdanovich.museum.by/ru

20. Установа "Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры", г. Мінск http://musey.moy.su/

21. Установа "Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь", г. Мінск http://museum.by

22. Установа "Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту", г. Мінск http://etna.museum.by

23. Дзяржаўная ўстанова "Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г.І. Цітовіча", г. Мінск http://www.belhor.by/

24. Установа "Беларуская дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія", г. Мінск http://philharmonic.by

25. Дзяржаўная ўстанова "Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь Дзяржаўны ансамбль танца Беларусі", г. Мінск http://www.beladance.org/

26. Дзяржаўная ўстанова "Беларускі дзяржаўны ансамбль "Песняры", г. Мінск http://pesnyary.by

27. Дзяржаўная ўстанова "Нацыянальная бібліятэка Беларусі", г.Мінск http://www.nlb.by

28. Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага http://brl.by/

29. Дзяржаўная ўстанова "Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур", г. Мінск http://centrkult.iatp.by

30. Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва", г. Мінск http://www.kimpress.by

31. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм", г. Мінск www.belarusfilm.by

32. Беларускае радыё, канал "Культура" http://www.tvr.by/radio/kanal-kultura/

33. Тэлеканал "Беларусь-3" Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь http://www.tvr.by/televidenie/belarus-3/

34. Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" http://zbsb.org/

35. Газета "Голас Радзімы" http://golas.sb.by/

*Вучэбнае выданне*

**Вабішчэвіч** Аляксандр Мікалаевіч

ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

Вучэбна-метадычны комплекс

Падпісана ў друк 19.09.2016. Фармат 60 $84^{1}/i_{6}$- Папера афсетная.
Гарнітура Таймс. Рызаграфія. Ум. друк. арк. 11,39. Ул.-выд. арк. 12,81.
Тыраж 100 экз. Заказ № 399.
Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/55 ад 14.10.2013.
Вул. Міцкевіча, 28, 224016, Брэст.